Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава”

**І.У. Мандрык**

# Гістарычная абумоўленасць будаўніцтва ў Беларусі сацыяльна арыентаванай мадэлі рыначнай эканомікі: пазначаны курс, складанасці, вынікі

***Манаграфія***

Репозиторий ВГУ

*Віцебск
ВДУ імя П.М. Машэрава
2017*

УДК 94(476)“1991/2010”:351:338.22
ББК 63.3(4Беи)64-2
М23

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 3 ад 28.02.2017 г.

Адобрана навукова-тэхнічным саветам ВДУ імя П.М. Машэрава. Пратакол № 8 ад 25.09.2017 г.

Аўтар: прафесар кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава, доктар гістарычных навук **І.У. Мандрык**

Р э ц э н з е н т ы :
доктар філасофскіх навук, прафесар *М.А. Слямнёў;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.М. Дулаў;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *М.М. Пархімовіч*

**Мандрык, І.У.**
**М23** Гістарычная абумоўленасць будаўніцтва ў Беларусі сацыяльна арыентаванай мадэлі рыначнай эканомікі: пазначаны курс, складанасці, вынікі : манаграфія / І.У. Мандрык. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2017. – 156 с.
ISBN 978-985-517-633-7.

Манаграфія знаходзіцца ў рэчышчы разгорнутых на сучасным этапе навуковых даследаванняў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця беларускага грамадства ў перыяд 1990–2015 гг. Падзеі, якія адбываліся ў гэты час, іх змест, складанасці і канчатковыя вынікі асвятляюцца ў гістарычным кантэксце сусветнага і айчыннага (савецкага) вопыту арганізацыі аптымальнага тыпу грамадскага ўладкавання на аснове сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі. Сцвярджаецца, што такі накірунак улічваў гістарычную традыцыю і ніколі не знікаючае імкненне насельніцтва Беларусі на забеспячэнне стабільна высокага ўзроўню свайго дабрабыту, стварэнне сучасных і даступных сістэм адукацыі, аховы здароўя, культуры, сацыяльнай абароны.

Навуковае выданне будзе карысным выкладчыкам, аспірантам, студэнтам, шырокаму колу чытачоў, якія зацікаўлены дадзенай праблемай.

**УДК 94(476)“1991/2010”:351:338.22**
**ББК 63.3(4Беи)64-2**

**ISBN 978-985-517-633-7**

© Мандрык І.У., 2017
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2017

Репозиторий ВГУ

# ПРАДМОВА

Згодна са сваёй Канстытуцыяй, якая з’яўляецца базай для развіцця ўсяго заканадаўства, Рэспубліка Беларусь уступіла на шлях будаўніцтва сацыяльнай дзяржавы на аснове рыначных адносін. Такая ўстаноўка замацавана ў яе першым раздзеле з назвай “Асновы канстытуцыйнага ладу”. Тут даецца характарыстыка беларускай дзяржавы як унітарнай дэмакратычнай **сацыяльнай** прававой. Сацыяльная накіраванасць дзяржавы выражаецца ў гарантаванасці кожнаму чалавеку годнага ўзроўню жыцця, стварэння належных умоў для бесперашкоднай рэалізацыі канстытуцыйных правоў грамадзян на працу, сацыяльнае забеспячэнне, адукацыю, ахову свайго жыцця і здароўя.

Канстытуцыя – асноўны закон дзяржавы, ядро яе прававой сістэмы. Палажэнні канстытуцыі валодаюць вяршэнствам у адносінах да ўсіх другіх прававых актаў, яны з’яўляюцца праграмным дакументам для ўсіх органаў улады і кіравання, бізнеса, навукі, інстытутаў грамадзянскай супольнасці. Уся іх дзейнасць пры вызначэнні і правядзенні ўнутранай і знешняй палітыкі павінна быць скіравана на стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць годнае жыццё і свабоднае развіццё чалавека. У Канстытуцыі таксама замацавана роля і адказнасць кожнага чалавека і грамадзяніна краіны за рэалізацыю праграмных мэт сацыяльна-эканамічнай палітыкі.

Паколькі сацыяльная дзяржава з рыначнай гаспадарчай сістэмай – найбольш мэтазгодны спосаб аб’яднання пачаткаў свабоды і ўлады ў мэтах забеспячэння дабрабыту асобы і росквіту насельніцтва, сацыяльнай справядлівасці і салідарнасці ў размеркаванні прадуктаў працы, такое канстытуцыйнае вызначэнне беларускай дзяржавы не выклікала супярэчнасцей у беларускім грамадстве як на стадыі яе абмеркавання, так і пасля прыняцця. З 1991 года ў Беларусі наглядалася агульнае паразуменне неабходнасці ўвядзення рыначных адносін і пабудовы ў краіне сацыяльнай дзяржавы. На гэты конт у рэспубліцы дэманстравалася адзінства дзяржаўнага, палітычнага кіраўніцтва, навуковага супольніцтва і насельніцтва.

Ідэі рыначнай дзяржавы з моцнай сацыяльнай палітыкай у Беларусі знаходзілі адлюстраванне ў прынятых сярэднетэрміновых і доўгатэрміновых Праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця. Але з разрывам эканамічных сувязей на савецкай прасторы, няпоўным выкарыстаннем вытворчых магутнасцей у структуры эканомікі рэспублікі пачатку 90-х гадоў выявіліся праблемы і дыспрапорцыі, якасць жыццёвага дабрабыту насельніцтва адчувальна знізілася. Пазначаны на гэтым этапе курс сацыяльнай арыентацыі патрабаваў неадкладных змен.

У сярэдзіне 90-х гадоў новае палітычнае і дзяржаўнае кіраўніцтва заявіла аб тым, што Беларусь пры будаўніцтве сацыяльна арыентаванай дзяржавы выбірае іншы шлях, яна павінна зыходзіць з уласнай мадэлі (*ад фр.* modele – узор, мера) эканамічнага развіцця. Указвалася, што пераход да свабоднай эканомікі павінен станоўча адбіцца на вытворчасці, прывесці да хуткага і якаснага росту рэальных даходаў, забеспячэння найвышэйшых сацыяльных стандартаў жыцця

Рэпазіторый ВДУ

насельніцтва. Пераўтварэнні ў такім накірунку падтрымліваліся прафсаюзамі, якія ўваходзілі ў склад ФПБ, саюзам прамыслоўцаў і наймальнікаў, іншымі грамадскімі арганізацыямі. Згодна з прынятымі рашэннямі ў краіне зроблена шэраг важных крокаў у галіне сацыяльнай палітыкі, у тым ліку па рэалізацыі прыярытэтных нацыянальных праектаў у сферы аховы здароўя, адукацыі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аграпрамысловага комплексу, дэмаграфічнай палітыкі, аховы навакольнага асяроддзя.

Зразумела, што дзяржава, якая стварае ўмовы для забеспячэння годнага жыцця чалавеку, свабоднага развіцця і самарэалізацыі творчага патэнцыялу асобы, у Беларусі была запатрабавана. Праблематыка сацыяльнай дзяржавы знаходзілася ў полі зроку навукоўцаў. У Акадэміі навук Беларусі, вышэйшых навучальных установах па ёй вяліся фундаментальныя даследаванні. Падрыхтавана Канцэпцыя сацыяльнага аўдыту і сістэма для адзнакі вынікаў сацыяльнай дзейнасці розных дзяржаўных структур.

У даследаваннях беларускіх навукоўцаў распрацоўка канцэпцыі сацыяльнай дзяржавы з сацыяльнай рыначнай эканомікай знаходзіцца ў ліку найпершых. Па зместу яна мала чым адрозніваецца ад поглядаў на гэтую праблему навукоўцаў іншых краін. У той жа час у замежнай і айчыннай навуковай літаратуры апошніх дваццаці год прававыя асновы і механізмы рэалізацыі беларускай мадэлі эканамічнага развіцця выклікаюць розныя адзнакі. Дыскусіі ў асноўным звязаны з выбарам курсу і захаваннем у краіне ўсіх тых фактараў, на аснове якіх магчыма ажыццявіць грандыёзную гістарычную задачу, – дабіцца стварэння эфектыўнай шматукладнай сацыяльна арыентаванай эканомікі і забяспечыць механізмы функцыявання па зацверджанню канстытуцыйных асноў на годнае жыццё ў паўсядзённую практыку. Розныя тлумачэнні сярод замежных навукоўцаў і палітыкаў падымае таксама пытанне аб здольнасцях існуючага рэжыму беларускай дзяржавы праводзіць неабходныя для краіны рэформы.

Усё гэта вызначае актуальнасць дадзенай тэмы, а таксама сцвярджае запатрабаванасць і настойлівую неабходнасць даследавання розных аспектаў канцэпцыі сацыяльнай дзяржавы на рыначных асновах і выданні комплекснай работы, у якой будзе зроблены аналіз наяўных у Рэспубліцы Беларусь тэарэтычных распрацовак, раскрыта практычная дзейнасць рэспубліканскіх і рэгіянальных устаноў у сферы эканамічнай палітыкі і дэмаграфіі, заработнай платы, стан і рэфармаванне сістэмы сацыяльнага страхавання, рынку працы і занятасці, аховы навакольнага асяроддзя, падрыхтоўкі кадраў.

Неабходнасць распрацоўкі дадзенай тэмы абумоўлена шэрагам іншых прычын: адсутнасцю гістарычных прац, якія раскрывалі б вытокі стварэння і этапы станаўлення сацыяльна арыентаванай дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама крытэрыяў ацэнкі сацыяльнасці дзяржавы і комплексных распрацовак тэарэтыка-метадалагічных асноў фарміравання адпаведнай эфектыўнай сацыяльнай палітыкі; патрэбамі ў раскрыцці механізму кіравання сацыяльнымі працэсамі і сацыяльным развіццём; выяўленнем агульных заканамернасцей і спецыфічных рэгіянальных асаблівасцей. У сувязі з гэтым тэма “Гістарычная абумоўленасць будаўніцтва ў Беларусі сацыяльна арыентаванай мадэлі рыначнай эканомікі: пазначаны курс, складанасці, вынікі” з’яўляецца адной з

Рэпазіторый ВДУ

ключавых у станаўленні беларускай дзяржаўнасці, афармленні і ўмацаванні суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Відавочную актуальнасць даследуемай тэмы ў такой рэдакцыі надае яшчэ і тое, што патрабуецца тлумачэнне змешчанай у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь характарыстыкі дзяржавы як сацыяльнай: ёсць неабходнасць на навуковым узроўні абгрунтаваць, што такую трактоўку варта разумець не як у поўнай меры завершаны выраз яго сучаснай сутнасці, а толькі як пастулова рэалізуемая мэта яго фарміравання ў ходзе пастаянных пераўтварэнняў.

**Мэта дадзенага даследавання** – высвятленне і адзнака тых падзей, якія адбываліся падчас пераходу краіны да рынычных адносінаў у кантэксце наяўных канцэпцый развіцця сацыяльных дзяржаў у Еўропе і рэспубліках, якія раней уваходзілі ў СССР.

У адпаведнасці з мэтай у даследаванні пастаўлены для вырашэння асноўныя задачы:

– даследаваць гістарычны працэс утварэння і станаўлення дзяржаўнасці і дзяржаў у розных частках планеты і працэс фарміравання сацыяльных дзяржаў ва ўмовах капіталістычнай эканомікі;

– растлумачыць і пацвердзіць гістарычную абумоўленасць пераходу Беларусі да сацыяльна арыентаванай мадэлі рыначнай эканомікі, паказаць наяўныя пры гэтым складанасці;

– ахарактарызаваць сутнасць беларускай эканамічнай мадэлі развіцця ў кантэксце сфарміраваных тэорый і вопыту станаўлення і функцыянавання сацыяльных дзяржаў у сучасным свеце, выявіць яе асаблівасці;

– раскрыць змест асноўных напрамкаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі ў рэспубліцы і вынікі яе практычнай рэалізацыі ў вядучых сацыяльных сегментах;

– выявіць супярэчнасці паміж суб'ектамі, якія вызначаюць сацыяльна-эканамічную палітыку ў Рэспубліцы Беларусь (дзяржаўнымі структурамі, наймальнікамі і прафсаюзамі) на пачатковым этапе пераходу да рыначных адносін (1991–2002 гг.);

– пацвердзіць карыснасць цывілізаваных формаў ажыццяўлення сацыяльнага партнёрства паміж дзяржаўнымі структурамі, наймальнікамі і прафсаюзамі ў сацыяльна-працоўнай сферы ў перыяд 2003–2015 гг .;

– вызначыць прычыны структурнага характару, якія зніжаюць эфектыўнасць беларускай эканамічнай мадэлі развіцця і стрымліваюць на цяперашнім этапе развіццё краіны ў выбраным напрамку;

– зрабіць высновы і прапановы па ўдасканаленні формаў і метадаў у дзейнасці дзяржаўных структур, калегіяльных органаў наймальнікаў і грамадскіх арганізацый у час станаўлення сацыяльнай дзяржавы.

Ацэнка поспехаў і недахопаў працэсу фарміравання беларускай сацыяльнай дзяржавы, заканамернасці яе станаўлення на сучасным этапе вызначаюцца ў даследаванні ў кантэксце айчынных і сусветных падзей на аснове фундаментальных гістарычных матэрыялаў і крыніц. У ходзе падрыхтоўкі працы вывучаны шматлікія айчынныя і замежныя крыніцы, у тым ліку канстытуцыі буржуазна-дэмакратычных краін (Германіі, Швецыі, Францыі, Ізраіля, Італіі, Іспаніі, Канады), якія сталі ў пасляваенныя гады на шлях стварэння сацыяльных дзяржаў з сацыяльнай рыначнай гаспадаркай; канстытуцыі постсавецкіх

Рэпазіторый ВДУ

рэспублік (Расіі, Украіны, Казахстана, Узбекістана, Арменіі), якія абралі гэты ж парадак сацыяльна-эканамічнага развіцця; комплексныя працы навукоўцаў, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў з рэкамендацыямі асноўных напрамкаў па рэалізацыі канстытуцыйных палажэнняў аб сацыяльнай дзяржаве ў адпаведнасці з сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй.

Аўтар абапіраўся на Указы Прэзідэнта, асноўныя рашэнні беларускага ўрада, у якіх закладзена канцэпцыя ўстойлівага і дынамічнага развіцця рэспублікі. Пры правядзенні даследавання вывучаны афіцыйныя дзяржаўныя дакументы, прынятыя ў рэгіёнах у 1990–2015 гадах, статыстычныя зборнікі і матэрыялы навуковых выданняў, у якіх маецца характарыстыка беларускай эканамічнай мадэлі развіцця. Асноўная ўвага нададзена аналізу дакументаў, прынятых у Рэспубліцы Беларусь на першапачатковым этапе пераходу да рыначных адносінаў, іх узаемасувязі з сацыяльнымі прынцыпамі, раней дзеючымі ў савецкай Беларусі.

Комплексна вывучаны дакументы самай масавай арганізацыі працоўных рэспублікі – прафсаюзаў, якія ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі (ФПБ), выступаюць ад імя працоўных, маючы ў сваім арсенале дзейсныя механізмы, здольныя аказваць уплыў на зацвярджэнне сацыяльнай справядлівасці ў сістэме сацыяльна-працоўных адносін.

Храналагічныя рамкі даследавання абумоўлены 1991–2015 гг. У межах гэтага перыяду Рэспубліка Беларусь прайшла пэўны шлях па фарміраванню сацыяльнай дзяржавы. У дзяржаве адбыліся пазітыўныя зрухі сацыяльна-эканамічнага, навукова тэхнічнага і культурнага характару. Ад глыбокага крызісу ў эканоміцы і сацыяльнай сферы, звязанага з распадам СССР і арыентацыяй на ліберальную эканамічную мадэль на пачатку гэтага перыяду, у далейшым у краіне (пачынаючы з 1995 года) сфарміраваліся перадумовы для паскоранага развіцця беларускага грамадства.

У манаграфіі на аснове асэнсавання найважнейшых заканамернасцей сацыяльнай рыначнай эканомікі развітых краін аналізуецца дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў у працэсе станаўлення беларускай мадэлі сацыяльна арыентаванай дзяржавы. Вывучаны дакументы, распрацаваныя і прынятыя дзяржаўнымі структурамі Рэспублікі Беларусь і іх сацыяльнымі партнёрамі на дадзеным этапе аб пабудове дэмакратычнай сацыяльнай дзяржавы з рыначнай эканомікай і сацыяльнымі функцыямі, а таксама эфектыўнасць іх практычнага прымянення ў пераадоленні праблем пераходнага перыяду.

Даследаванне праводзілася на аснове агульнанавуковых і гісторыка-сістэмных метадах, якія дазваляюць разглядаць праблему комплексна. Ужываліся таксама іншыя агульнанавуковыя метады: аналіз, сінтэз, індукцыя (па фактах зроблены абагульненні).

Праведзены аналіз дазволіў высветліць і вызначыць складанасці, звязаныя з пераходам ад сацыялістычных дырэктыўна-планавых метадаў гаспадарання да рыначных.

З даследавання вынікае, што пераход да рынку ў 1990 годзе, з мэтай станаўлення новай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, адбываўся ў рэспубліцы без навукова абгрунтаванай праграмы і выверaных механізмаў яе рэалізацыі. У кіраўніцтва рэспублікі і ў часткі насельніцтва, у сілу навізны таго,

Рэпазіторый ВДУ

што адбывалася на пачатку 90-х гг., пераважала вера ў магчымасць хуткай трансфармацыі грамадскага развіцця, заснаваная на перакананасці ў тым, што рынак сам па сабе вырашае эканамічныя і сацыяльныя праблемы. Удзел дзяржавы ў кіраванні экономікай і сацыяльнай сферай у гэты час быў мінімізаваны.

З распадам Савецкага Саюза і набыццём рэспублікай статуса суверэннай дзяржавы ў структуры экономікі выявіўся шэраг праблем і дыспрапорцый. Асноўнымі з іх былі недакладнасці структуры вытворчасці ўнутранаму і знешняму попыту, якое выражалася ў няпоўным выкарыстанні вытворчых магутнасцей, створаных раней для задавальнення агульнасаюзных патрэб, у з'яўленні значных аб'ёмаў нерэалізаванай прадукцыі, захаванні значнай удзельнай вагі стратных прадпрыемстваў. Пазначаны на гэтым этапе курс пераходу да рынку, што канстатуецца ў манаграфіі, сябя не апраўдаў. Ён не атрымаў падтрымкі сярод большай часткі насельніцтва краіны.

У сярэдзіне 1990-х гадоў кіраўніцтва рэспублікі на чале з першым Прэзідэнтам А.Р. Лукашэнка прапанавала праграму ўласнабеларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця. У праграме пабудовы сацыяльна арыентаванай дзяржавы, заснаванай на паступовым эвалюцыйным шляху эканамічных пераўтварэнняў, былі ўлічаны гістарычныя, культурныя, ідэалагічныя і бягучыя палітычныя фактары ў жыцці карэннага насельніцтва. Рэалізацыя беларускай мадэлі эканамічнага развіцця ў перыяд 1996–2008 гадоў суправаджалася даволі высокімі тэмпамі эканамічнага росту, павышэннем якасці жыцця людзей, спрыяла стабілізацыі грамадска-палітычнага становішча ў рэспубліцы.

У манаграфіі вызначаны аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны структурнага характару, якія зніжалі эфектыўнасць беларускай эканамічнай мадэлі развіцця ў вывучаемым перыядзе (асабліва гэта праявілася ў 2009–2015 гг.). Несвоечасовая іх ліквідацыя прадоўжыла аказваць негатыўны ўплыў на развіццё рэспублікі ў далейшым.

Асаблівая ўвага пры даследаванні тэмы, звязанай з пераходам да рыначных адносінаў і станаўленнем беларускай эканамічнай мадэлі развіцця, нададзена дзейнасці прафсаюзных камітэтаў і арганізацый, уключаных у структуру адзінага нацыянальнага прафсаюзнага цэнтра – Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі, якія з'яўляюцца самым значным грамадскім фарміраваннем у сістэме сацыяльна арыентаванай дзяржавы і сацыяльнымі партнёрамі дзяржавы і наймальнікаў. Будучы грамадскім аб'яднаннем людзей працы, прафсаюзны рух па прыродзе сваёй з'яўляецца носьбітам каштоўнасцей (сумленнай і добрасумленнай працы, справядлівага размеркавання сумесна выпрацаванага прадукту, калектывізму, сяброўства, узаемадапамогі і інш.), якія адлюстроўваюць справядлівае дзяржаўнае ўладкаванне і маласхільныя да дэвальвацыі. У даследаванні прысутнічае думка, што на пачатковым этапе пераходу да рынку, у час, калі дзейнасць КПБ-КПСС была прыпынена, іншыя палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі сябе не выяўлялі, прафсаюзы, як важнейшы грамадскі інстытут у палітычнай сістэме краіны і сацыяльных адносін, не змаглі рэалізаваць сваю асноўную функцыю – абарону правоў і інтарэсаў працоўных. Самі яны знаходзіліся ў стадыі арганізацыйнай

Рэпазіторый ВДУ

мадэрнізацыі, што замінала вядзенню канструктыўнага дыялогу са сваімі сацыяльнымі партнёрамі.

Асноўным у даследаванні з'яўляўся аналіз таго, як з пераходам да рынку заяўлены курс на стварэнне новай сацыяльна-эканамічнай сістэмы з дынамічным развіццём гаспадарчага комплексу, рэалізоўваўся ў дзеяннях дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў Рэспублікі Беларусь.

Манаграфія – вынік комплекснага даследавання актуальнай на цяперашнім этапе праблемы станаўлення, развіцця і ўмацавання сацыяльных дзяржаў. Яна падрыхтавана на кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава*. Высновы і прапановы аўтара па існуючых праблемах адрасаваны дзяржаўным і грамадскім арганізацыям.

Репозиторий ВГУ

* Распрацоўка тэмы з'ўлялася часткай дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. "Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі" (навуковы кіраўнік праграмы – доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт А.А. Каваленя), падпраграмы № 1 "Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа (Гісторыя і культура)" (навуковыя кіраўнікі падпраграмы – доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт А.А. Каваленя; кандыдат гістарычных навук, дацэнт В.В. Даніловіч; доктар гістарычных навук, прафесар В.С. Кошалеў; доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт А.І. Лакотка).

# Г Л А В А 1
# Працэс дзяржаваўтварэння. Экскурс у мінулае

Для высвятлення гістарычнай абумоўленасці будаўніцтва ў Беларусі сацыяльнай дзяржавы патрабуецца перш-наперш паставіць на разгляд пытанне аб узнікненні такога суб'екта як дзяржава, устанавіць яе месца і ролю ў ходзе гістарычнага развіцця чалавецтва. Дзеля гэтага неабходна звярнуцца да пісьмовых дакументаў, прадметаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія непасрэдна адлюстроўваюць гістарычны працэс дзяржаваўтварэння. Навуковы аналіз крыніц па дадзенай праблемы дае магчымасць сцвярджаць, што політагенез (паняцце, якое пазначае генезіс і развіццё палітычнай падсістэмы грамадства, якая можа трансфармавацца ў дзяржаву або яе аналаг), заўсёды займаў лепшыя розумы і настрой навукоўцаў. Распрацоўка тэарэтычных асноў аб стварэнні дзяржаў, аб трансфармацыі іх эканамічных, палітычных і ідэалагічных канструкцый вялася праз тысячагоддзі, пачынаючы ад старажытнасці. На сёння склаліся розныя версіі аб паходжанні дзяржавы і яе эвалюцыі. Ёсць меркаванне, што ў рускай мове этымалогія слова "дзяржава" паходзіць ад старажытнарускага "гаспадар". (так называлі князя – кіраўніка на старажытнай Русі), якое звязана са словам "гаспадар". У сваю чаргу, старажытнарускае "гаспадар", на думку навукоўцаў, паходзіць ад слова "гасподзь". Такім чынам, практычна ўсе даследчыкі сыходзяцца ў думках аб цеснай сувязі слоў "дзяржава" і "гасподзь". Можна меркаваць, што паколькі вытворныя "дзяржава", "аспадарства" з'яўляюцца пазней, чым ўстойлівыя значэнні "гасудар", "гаспадар", то ў сярэднія вякі "дзяржава" звычайна ўспрымалася як непасрэднае ўладанне "гасудара".

У найноўшы час паняцце "дзяржава" атрымала дзясяткі паняццяў. Асноўная сутнасць паняцця дзяржавы зводзіцца навукоўцамі да таго, што – гэта ўніверсальная самастойная цэнтралізаваная сацыяльна-палітычная арганізацыя, якая мае сваю тэрыторыю, валодае адмысловымі механізмамі кіравання і прымусу для рэгулявання сацыяльных адносін і ажыццяўлення ўнутраных і знешніх функцый. Дзяржава – гэта неабходны інстытут, без якога не можа існаваць і развівацца чалавечае грамадства. На дзяржаву ўскладаюцца важныя функцыі, якія неабходныя людзям для нармальнага жыцця: уключанасць чалавека ў грамадства, сацыялізацыю яго праз працоўную, сямейна-бытавую, дасуговую, грамадска-палітычную жыццядзейнасць.

Экскурс у гістарычнае мінулае паказвае, што калыскай сучаснай цывілізацыі з'яўляюцца дзяржавы Старажытнага Усходу Егіпет і Шумер. Яны сфарміраваліся першымі, прыблізна ў адзін час (5 тыс. гадоў назад або некалькі раней). Тут развіваліся пісьменнасць, каменная архітэктура, сусветныя рэлігіі і шмат іншых атрыбутаў без якіх немагчыма ўявіць цяперашняе чалавечае грамадства.

Стварэнне і развіццё дзяржаўнасці і дзяржавы як інстытута кіравання грамадствам было доўгім. Абставіны, якія абумовілі дадзены працэс, зводзяцца ў асноўным да наступных прычын:



Рэпазіторый ВДУ

– неабходнасць падтрымання ў грамадстве парадку, які забяспечваў бы функцыянаванне грамадскай вытворчасці, сацыяльную ўстойлівасць грамадства, яго стабільнасць, у тым ліку і ў адносінах да знешняга ўплыву з боку суседніх дзяржаў ці плямёнаў. Гэта забяспечвалася, у прыватнасці, падтрыманнем правапарадку, прымяненнем розных мер, у тым ліку прымушэння, для таго каб усе члены грамадства захоўвалі нормы правапарадку, асабліва і тыя, якія ўспрымаюцца імі як несправедлівыя, не адказваючыя іх інтарэсам;

– неабходнасць вядзення войнаў, як абаронных так і захопніцкіх. Назапашванне грамадскага багацця ў "першых людзей племені" ў гэты перыяд прыводзіць да таго, што становіцца выгадным жыць за кошт рабавання, захопліваючы каштоўнасці, рабоў, абкладаючы суседзяў данінай, прыгнятаючы іх. У плане падрыхтоўкі і вядзенне войнаў дзяржава валодае значна большымі магчымасцямі чым неструктураванае першабытнае грамадства. Таму з'яўленне якой-небудзь дзяржавы непазбежна прыводзіць да таго, што яе суседзі занявольваюцца, ці ў сваю чаргу арганізуюцца ў дзяржаву;

– неабходнасць падаўлення супраціву эксплуатуемых, паколькі працэсы, якія адбываліся пры разлажэнні першабытнага грамадства, з непазбежнасцю прыводзілі да раздзелу на багатых і бедных, да ўзнікнення эксплуатацыі меншасцю большасці, а разам з тым да з'яўлення сацыяльных антаганізмаў і супраціву той часткі грамадства, якая эксплуатавалася.

У большасці выпадкаў указаныя вышэй прычыны дзейнічалі сукупна ў розных спалучэннях, з улікам пэўных умоў (гістарычных, сацыяльных, геаграфічных, прыродных, дэмаграфічных і інш.) галоўнымі, вырашальнымі маглі стаць любыя з указаных прычын. Так, для большасці ўсходніх дзяржаў найбольшае значэнне мела неабходнасць удасканальванне кіравання і арганізацыя буйных грамадскіх работ. Для ўзнікнення Афінскай і Рымскай дзяржаў значна большую роль адыгралі працэсы класаўтварэння і неабходнасць у гэтай сувязі падаўлення эксплуатуемых класаў. Заканадаўства ў дзяржавах фарміравалася адначасова і паралельна з дзяржаўнасцю (а ў вызначаным сэнсе і раней дзяржавы). Іх узнікненне ўзаемазвязана і ўзаемазалежна. Кожны новы крок у развіцці дзяржавы прыводзіў да далейшага развіцця прававой сістэмы і наадварот.

Самым істотным чынам на характар і змест дзяржаў і прававых сістэм, якія нараджаліся, аказвала ўплыў пануючая ў грамадстве форма ўласнасці на асноўныя сродкі вытворчасці. Так, прыватная ўласнасць прывяла да неабходнасці стварэння механізмаў, забяспечваючых узгадненне інтарэсаў і волі ўласнікаў. Адсюль рэспубліканскія формы кіравання і развіццё рабаўладальніцкай дэмакратыі, а таксама шырокае заканадаўчае рэгуляванне грамадскіх адносін, якія склаліся ў Афінах і Рыме. Фактычна дзяржаўная форма ўласнасці на зямлю пры абшчынным землекарыстанні ў Кітаі, Індыі і іншых азіяцкіх дзяржавах прывяла да ўзнікнення дэспатычных, аўтарытарных сістэм, пры чым роль законаў тут выконвалі маральна-рэлігійныя догмы і прававыя звычаі. Дзяржаўная ўласнасць на зямлю, якая спалучаецца з яе раздзелам паміж членамі грамадскай эліты ў Спарце, стала прычынай існавання там арыстакратычнай рэспублікі.



Репозиторий ВГУ

Пры аналізе своеасаблівасці і дынамікі працэсаў дзяржаваўтварэнняў у розных народаў неабходна ўлічваць палажэнні, сфармуляваныя Ф. Энгельсам у працах "Происхождение семьи, частной собственности и государства", "Анти-Дюринг" і інш., дзе ён зрабіў выснову, што "усялякая палітычная ўлада засноўваецца першапачаткова на якой-небудзь эканамічнай, грамадскай функцыі і ўзрастае па меры таго, як члены грамадства з прычыны разлажэння першабытных абшчын ператвараюцца ў прыватных вытворцаў і, такім чынам, яшчэ больш павялічваецца адчужанасць паміж імі і носьбітамі агульных, грамадскіх функцый". У другіх працах Энгельс зноў звяртаецца да гэтай думкі: "Першапачаткова грамадства шляхам простага падзелу працы стварыла сабе асобыя органы для абароны сваіх агульных інтарэсаў. Але з цягам часу гэтыя органы, і галоўны з іх – дзяржаўная ўлада, служачы сваім асобым інтарэсам, са слуг грамадства ператварылася ў яго ўладара, пры чым узнікненне апарата дзяржаўнай улады не з'яўляецца вынікам толькі пануючага класа, гэта прадукт грамадства ўвогуле на вядомай ступені яго развіцця. У першых дзяржавах у межах пэўнай тэрыторыі мелася арганізацыя палітычнай улады, якая садзейнічала пераважнаму ажыццяўленню канкрэтных класавых, нацыянальных, рэлігійных, расавых інтарэсаў".

Упершыню тэрмін "дзяржава" быў ужыты ў XV стагоддзі італьянскім мысліцелем, філосафам, палітычным дзеячам Нікколо Макіявелі (1469–1527). Ён вызначыў дзяржаву як агульнае дабро, якое ўзнікае ад увасаблення ў жыццё рэальных дзяржаўных інтарэсаў. На думку Макіявелі, максімальна жыццяздольнымі дзяржавамі ў гісторыі цывілізаванага свету былі рэспублікі, грамадзяне якіх валодалі найбольшай ступенню свабоды, самастойна вызначаючы свой далейшы лёс. Макіявелі зрабіў спробу стварыць завершанае вучэнне пра дзяржаву, выступаў прыхільнікам моцнай дзяржаўнай улады. У яго працах, працах іншых навукоўцаў гэтага перыяду паказана, што стварэнне дзяржаўнасці і дзяржаў адбывалася з вылучэннем інстытута, які прадстаўляе сабой канкрэтную форму ўлады па ажыццяўленню сукупных функцый, неабходных у жыцці народа. Уладныя дзяржаўныя інстытуты забяспечвалі уключанасць чалавека ў грамадства, сацыялізавалі яго ў працоўную, сямейна-бытавую, грамадска-палітычную жыццядзейнасць.

Кажучы аб паходжанні дзяржавы, большасць навукоўцаў прытрымліваюцца тэорыі заканамернага пераходу першабытнага грамадства да дзяржаўна арганізаванага. Галоўнымі прычынамі пераходу ад родаплемяннога ладу да класавага і дзяржаўнага яны называюць сацыяльна-эканамічныя фактары.

На беларускіх землях дзяржава з часу свайго стварэння з'яўлялася моцным інстытутам станаўлення беларускага этнасу. На працягу стагоддзяў у працэсе гістарычнага развіцця тут, як і ў іншых частках зямлі, адбывалася эвалюцыя палітычнай улады, структурызацыя грамадства і фарміраванне развітых інстытутаў кіравання.

Полацкая зямля-княства набыла права і магчымасць ажыццяўлення ўнутранай і знешней палітыкі ад імя ўсяго грамадства ўнутры і па-за сваёй тэрыторыі, стала ажыццяўляць такія ўласцівыя для сябе прыметы як: наяўнасць пэўных механізмаў (асобай сістэмы органаў і ўстаноў), якія рэалізуюць функцыі

Рэпазіторый ВДУ

дзяржаўнай улады; замацаванне пэўнай сістэмы норм, санкцыянаваных дзяржавай (права), распаўсюджванне юрысдыкцыі дзяржавы на канкрэтную тэрыторыю. У наступныя гады ў Вялікім Княстве Літоўскім – Рускім і Жамойцкім, а затым у БССР адбывалася ўдасканальванне дзейнасці дзяржаўных структур. Дзяржава дэкларавала агульнанацыянальныя каштоўнасці, вызначала меру і формы рэальнага ўдзелу насельніцтва ў палітычным жыцці, што заўсёды ажыццяўлялася пад кантролем (часта жорсткім) дзяржаўнага апарата.

Прыметамі беларускай дзяржавы на ўсіх этапах (акрамя родаплемяннога ладу) з’яўляліся: па-першае, наяўнасць асобнай групы людзей, занятых выключна кіраўніцтвам усім грамадствам і абаронай яго эканамічнай і сацыяльнай структуры. Па-другое, наяўнасць манаполіі на прымусовую ўладу ў адносінах да ўсяго насельніцтва. Па-трэцяе, права і магчымасць ажыццяўлення ўнутранай і знешняй палітычна-эканамічнай, сацыяльнай, ваеннай – ад імя ўсяго грамадства. Па-чацвёртае, суверэннае права выдання законаў і правіл, абавязковых для ўсяго насельніцтва. Па-пятае арганізацыя ўлады па вызначанаму тэрытарыяльнаму падзелу. Па-шостае, манапольнае права на здыманне падаткаў і збораў з усяго насельніцтва, на фарміраванне грамадскага бюджэту і т.п.

Як бачна, дзяржава – гэта адмысловая арганізацыя грамадства, аб’яднаная агульнымі сацыякультурнымі інтарэсамі, якая займае пэўную тэрыторыю, мае ўласную сістэму кіравання і якая валодае функцыямі для вырашэння ўнутраных і знешніх задач. Дзяржава – гэта неабходны інстытут, без якога не можа існаваць і развівацца чалавечае грамадства. Неад’емнай прыметай цэнтральнага інстытута ўлады з’яўляецца наяўнасць сродкаў, якія забяспечваюць прадстаўніцтва і абарону грамадства, яго інтарэсаў і дабра.

На дзяржаву ў любой краіне ўскладаюцца такія важныя функцыі, як стварэнне неабходных умоў для нармальнага паўсядзённага жыцця, уключэнне чалавека ў грамадства, сацыялізацыю яго праз працоўную, сямейна-бытавую, дасуговую, грамадска-палітычную жыццядзейнасць і інш.

Сучасная Беларусь увабрала ў сябе рысы розных эпох. Рэспубліка Беларусь – унітарная дзяржава, са сваёй канстытуцыяй, вышэйшым органам дзяржаўнай ўлады. Дзяржаўнае ўладкаванне Рэспублікі Беларусь мае тры ўзроўні публічнай улады: рэспубліканскі цэнтр, мясцовыя органы і арганізацыі самакіравання. Кожны ўзровень валодае ўласнавыключнай кампетэнцыяй. Паколькі інстытут улады прысутнічае ва ўсіх працэсах грамадскага жыцця, тэрмін “ўлада” з’яўляецца цэнтральным пунктам тэорыі пра дзяржаву. Дзяржаўная ўлада падзяляецца на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Дзяржаўнае ўладкаванне знаходзіць сваё выражэнне ў тэрытарыяльнай арганізацыі дзяржаўнай улады, характары ўзаемаадносін паміж часткамі дзяржавы, цэнтральнымі і мясцовымі органамі. Беларуская дзяржава ажыццяўляе сукупнасць неабходных для грамадства ўнутраных (ажыццяўленне агульнай для краіны ўнутраннай палітыкі, рэгуляванне эканамічных і грамадскіх адносін) і знешнепалітычных (абарона краіны, вядзення дыпламатычных сувязей з іншымі краінамі і г.д.) функцый.

Ажыццяўляе агульную для краіны эканамічную, фінансавую, навуковую, культурную, адукацыйную палітыку як сістэму яе дакладных праяў,

Рэпазіторый ВДУ

папярэджвае і ліквідуе сацыяльна небяспечныя канфлікты, забяспечвае абарону інтарэсаў краіны на сусветным узроўні і г.д.

Такім чынам, гісторыя паказвае, што ўлада існавала задоўга да з'яўлення дзяржавы. Дзяржава як устойлівы тып і сацыяльны інстытут сфарміравалася пазней. На асобных этапах (у перыяд свайго ўзнікнення і ранняга станаўлення) дзяржава была абаронцам эксплуататарскіх класаў і мала спрыяла дабрабыту і ўстанаўленню свабод для большасці насельніцтва. Поўнае бяспраўе рабоў і цяжкае становішча беднякоў стваралі перадумовы для праяў пратэсту ў адкрытай і рэзкай форме, прыводзілі да сацыяльных узрушэнняў, якія падточвалі асновы існуючага сацыяльна-эканамічнага ладу, часам прыводзілі да гібелі дзяржаў і фармацый. У сувязі з гэтым асобныя прадстаўнікі палітычнай думкі сталі задумвацца аб асноўных крыніцах сацыяльных бед, зыходзячага ад дзяржавы. Пастаянна ішоў пошук шляхоў зніжэння прыгнёту народных мас, устанаўлення больш прагрэсіўнага (справядлівага) грамадства. У выніку ў перадавых дзяржавах паступова складваліся тэарэтычныя распрацоўкі, а разам з гэтым – умовы для развіцця сацыяльнай актыўнасці грамадзян, сацыяльных груп і супольнасцей.

Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 2
# Навуковая распрацоўка тэарэтычных асноў фарміравання сацыяльных дзяржаў ва ўмовах рыначнай эканомікі

Як указвалася ў папярэднім раздзеле, уласцівае раннім дзяржавам несправядлівае ўладкаванне, палярнасць яго грамадства стваралі глебу для пошуку сацыяльнай сістэмы, у якой бы меліся ўмовы для самаўдасканалення асобы і самарэалізацыі ёю сваіх здольнасцей праз свабодную творчую працу. Гэтым займаліся мысліцелі многіх краін, у тым ліку, Платон, Сакрат, Арыстоцель, Н. Макіявелі, Т. Мор, Т. Кампанелла, Ф. Бэкан, Ш. Фур'е, К. Маркс, Ф. Энгельс, У. (Ульянаў) Ленін і інш. Тэарэтычныя распрацоўкі гэтых аўтараў былі прадстаўлены ў цэлым свеце. Дасканалае грамадства ім бачылася такой сістэмай, у якой няма нянавісці і варожасці, несправядлівасці і гвалту, а праца разглядалася не толькі ўсеагульнай і абавязковай справай, але і разнявольваючай асобу, развіваючай яе талент.

Аб справядлівым грамадстве марылі нават тады, калі кіраўнікі, напрыклад, рымскія цэзары, клапаціліся аб прадастаўленні плебсу "хлеба і відовішчаў". Першы праект ідэалу "дасканалага грамадства" прадставіў старажытнагрэцкі мысцель Платон (428/7–347 гг. да н.э.). Ён вызначаў дзяржаву як супольнасць людзей, дастатковую для развіцця і росквіту. З усіх тыпаў, якія склаліся да таго часу дзяржаў, Платон аддаваў перавагу манархіі і арыстакратыі як найбольш прыдатным формам ажыццяўлення ўлады лепшых. Адпаведна, ідэалам грамадства ён бачыў тую сацыяльную сістэму, у якой адсутнічаюць багацце і беднасць, але пануе справядлівасць (у духу таго часу. – *І.М.*), а кіраўнікі, ад якіх залежыць дабрабыт грамадзян дзяржавы, увасабляюць сабою праўдзівасць, розум і рашучасць у дасягненні справядлівасці. За выказванне аб тым, што "не ўсё тое да лепшага, што на карысць толькі тырану, калі той не адрозніваецца дабрадзейнасцю", Платон быў прададзены ў рабства [1, с. 63–382].

Яго вучань Арыстоцель (384–322 гг. да н.э.) вызначаў дзяржаву як "самадастатковыя зносіны грамадзян, ні ў якім іншым грамадстве не запатрабаваныя і ні ад каго іншага не залежычыя".

Па меры развіцця цывілізацыі вобраз дасканалага сацыяльнага ўладкавання знаходзіў увасабленне ў тэалагічных канцэпцыях, свецкіх утопіях і тэорыях Т. Мора, Т. Кампанелла, Ф. Бэкана, Ш. Фурье. Асаблівасцю ўсіх гэтых вучэнняў аб сацыяльным ідэале з'яўляецца тое, што ім грамадства ўяўляецца як устойлівая, дасканалая сістэма, у якой пануе прынцып справядлівасці. Вялікі нямецкі філосаф-ідэаліст Георг Вільгельм Фрыдрых Гегель (1770–1831) у сваім вучэнні быў блізкі да разумення свецкага грамадства і палітычнай дзяржавы. Развіццё грамадзянскай супольнасці, у разуменні Г. Гегеля, не магло не прывесці да заснавання дзяржавы. Грамадства і дзяржава, па гегелеўскай канцэпцыі, суадносяцца як разважанне і розум: грамадства – гэта "знешняя дзяржава",

Репозиторий ВГУ

“дзяржава патрэбы і розуму”, а сапраўднае дзяржава – разумна. Таму ў філасофска-лагічным плане таварыства разглядаецца Гегелем як момант дзяржавы, як тое, што “здымаецца” ў дзяржаве. Дыялектычны падыход да развіцця свету, як рацыянальнае зерне вучэння Гегеля, паклалі ў аснову сваёй тэорыі К. Маркс і Ф. Энгельс.

Яны лічылі, што дзяржава ёсць прадукт і праявы непрымірымых класавых супярэчнасцей. Дзяржавы ўзнікаюць там, тады і пастолькі, дзе, калі і паколькі класавыя супярэчнасці аб’ектыўна не могуць быць прыміраны. Ф. Энгельс пісаў: “Дзяржава ёсць прадукт грамадства на вызначанай ступені развіцця; дзяржава ёсць прызнанне, што гэта грамадства заблыталася ў недазволеных супярэчнасцях з самой сабой, раскалолася на непрымірымыя супрацьлегласці, пазбавіцца ад якіх яна не мае сілы. А каб гэтыя супярэчнасці, класы і з супярэчлівымі эканамічнымі інтарэсамі, не паелі адзін аднаго і грамадства ў дарэмнай барацьбе, для гэтага стала неабходнай сіла, узвышаючая, як бачна, над грамадствам, сіла, якая бы ўмерыла сутыкненне, трымала яго ў межах “парадку”. І гэта сіла, якая ўзнікла з грамадства, але ставіць сябе над ім, усё больш і больш адчужаючая сябе ад яго, ёсць дзяржава” [2, с. 169–170 ]. У апублікаваных працах К. Маркс і Ф. Энгельс раскрылі сутнасць і механізм пабудовы, як яны думалі, самага справядлівага грамадства. Канцэптуальна распрацавалі ідэал камуністычнага грамадства, паказалі, што важнейшым крытэрыем сацыяльнай гармоніі з’яўляецца не сама сістэма, а месца чалавека ў гэтай сістэме і яе адэкватнасць годнаму вобразу жыцця асобы. Яны раскрылі прычыны, няроўнасці, якія існавалі ў грамадстве, а менавіта эксплуатацыю чалавека чалавекам праз стварэнне “прибавочной стоимости”, і адчужанасць людзей ад вынікаў сваёй працы. Яны акрэслілі тэндэнцыю гістарычнага развіцця і пабудовы дзяржаў праўдзівага гуманнага сацыялістычнага ўладкавання. У. Ленін у сваёй працы “Государства и революция” падтрымаў заснавальнікаў камуністычнай ідэалогіі і прыйшоў да высновы, што змена буржуазнай дзяржавы пралетарскім немагчыма без гвалтоўнай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая прывядзе да прызнання палітычнага панавання пралетарыята, яго дыктатуры, г. зн. улады, не падзяляемай нізкім, і якая абапіраецца непасрэдна на ўзброеную сілу мас [3, с. 227–324].

Паняцце “сацыяльная дзяржава” ўпершыню з’явілася ў навуковай літаратуры ў сярэдзіне XIX стагоддзя ў працах нямецкіх навукоўцаў у выніку аналізу развіцця капіталізму і класавай барацьбы ў Германіі. Асноўны распрацоўшчык і аўтар гэтай тэорыі Лорэнс фон Штэйн у 1850 годзе ўвёў у навуку паняцце “сацыяльная дзяржава” і ўнёс у вызначэнне сацыяльнай дзяржавы шэраг прынцыповых палажэнняў, якія сталі асновай новага разумення функцый дзяржавы. Л. Штэйн пераадолеў сацыялагічны падыход да дзяржавы як арэне, на якой адбываецца класавая барацьба. Яго галоўны пасыл: атрыбутам сацыяльнай дзяржавы з’яўляецца роўнасць усіх людзей (асоб) незалежна ад іх сацыяльнай прыналежнасці. Як ён лічыў, задача дзяржавы заключаецца ў станаўленні грамадскай роўнасці і асабістай свабоды, ва ўзняцці ніжэйшых, абяздоленых класаў да ўзроўню багатых і моцных. Гэтыя ж характарыстыкі сацыяльнай дзяржавы крыху пазней падтрымалі Ю. Офнер і А. Вагнер.

Репозиторий ВГУ

Найбольш радыкальную тэарэтычную аснову інтэрвенцыянісцкай дзяржавы (дзяржава, у якой сацыяльна-эканамічная сістэма заснавана на ўмяшанні урада) прапанаваў ў 1879 годзе нямецкі эканаміст, прыхільнік дзяржаўнага і хрысціянскага сацыялізму А. Вагнер. Яго канцэпцыя прадугледжвала ператварэнне буржуазнай дзяржавы ў "дзяржаву ўсеагульнага дабрабыту" (welfare state).

Пэўны ўклад у распрацоўку праблем сацыяльнай дзяржавы ўнеслі вучоныя – А. Абендротт, Г. Геллер, Т. Маршал, Ф. Нойманн. Не цяжка заўважыць, што ў тэарэтычным плане гэтыя канцэпцыі ўбіраюць у сябе ідэі англійскага эканаміста Дж. Кейнса, абгрунтаваўшага ў свой час неабходнасць актыўнага ўмяшання дзяржавы ў эканамічнае жыццё грамадства. Прыхільнікі канцэпцыі дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту звязвалі свае надзеі з перспектывамі развіцця змешанай эканомікі, спалучэннем прыватнага і дзяржаўнага сектараў. У гэтай канцэпцыі дзяржаве адводзіцца роля нейтральнай, "надкласавай" сілы, здольнай задаволіць інтарэсы ўсіх сацыяльных слаёў шляхам устанаўлення прынцыпу справядлівага размеркавання і забеспячэння дабрабыту ўсіх членаў грамадства, пераразмеркавання даходаў, знішчыўшы такім чынам няроўнасць. Пры гэтым галоўным сродкам забеспячэння ўсіх членаў грамадства матэрыяльнымі і сацыяльнымі дабротамі, на іх думку, (што падцверджана сучаснымі навукоўцамі) з'яўляецца эканамічны рост.

З'яўленне тэрміна "сацыяльная дзяржава" было прынцыповым момантам усведамлення змяненняў прыроды дзяржаўнасці. Глыбіннай навуковай тэарэтычнай распрацоўцы канцэпцыя аб сацыяльнай дзяржаве падвергнута ў ХХ ст., што было запатрабавана жыццём. У гэты час многія дзяржавы мелі намер падкрэсліць, што для іх сацыяльныя праблемы ўваходзяць у склад прыярытэтных. Свой уклад у распрацоўку прынцыпаў сацыяльнай дзяржавы ўнеслі расійскія палітычныя дзеячы і навукоўцы П.І. Наўгародцаў, Б.Н. Чачэрын, С.С. Аляксееў. У канцы XIX – пачатку ХХ ст. па гэтай праблеме яны падрыхтавалі асобныя працы. П. Наўгародцаў лічыў неабходным ажыццяўляць сацыяльнае рэфармаванне грамадства шляхам забеспячэння кожнаму права на годнае чалавечае існаванне. У 1909 годзе ў рабоце "Крызіс сучаснай правасвядомасці" ён пісаў: "Сучасны лібералізм імкнецца прыцягнуць прынцып роўнасці ў бок кіравання сацыяльнымі ўмовамі жыцця, але гэта адкрывае для дзяржавы такую сферу дзейнасці, якая па сваіх памерах і магчымых наступствах рэзка адрозніваецца ад палітычнай практыкі яшчэ нядаўняга мінулага".

Прафесар Маскоўскага ўніверсітэта Б. Чачэрын, адмаўляючы ролю дзяржавы ў пераразмеркаванні даброт, не выключаў неабходнасці аказання падтрымкі маючым у гэтым патрэбу, крыніцай якой, на яго думку, спачатку павінна быць дабрачыннасць, а толькі потым з боку дзяржавы. Актуальнымі і для цяперашняга часу з'яўляюцца працы вядомага расійскага вучонага С. Аляксеева. У адной з іх ён перасцерагаў аб тым, што пры распрацоўцы самога паняцця "сацыяльная дзяржава", якое вынікае з абранай мадэлі яго развіцця, нельга прама пераносіць ні заходнія, ні расійскія мадэлі, распрацаваныя для іншай сацыяльна-эканамічнай рэальнасці. Трэба "ўлічваць гістарычную, сацыякультурную, геапалітычную і іншую спецыфіку развіцця расійскага сацыяльнага быцця" [4, с. 45].

Рэпазіторый ВДУ

Грунтоўную трактоўку паняцця “сацыяльная прававая дзяржава” прапанаваў у 1930 годзе Г. Геллер. Цэнтральнай ідэяй сацыяльнай прававой дзяржавы ў яго працах становіцца акцэнтаванне правоў грамадзяніна на сацыяльныя гарантыі з боку дзяржавы. З гэтага часу два паняцці – “прававая дзяржава” і “сацыяльная дзяржава” – не проста сталі непарыўныя, але некаторымі аўтарамі і сёння выкарыстоўваюцца як сінонімы.

Як бачна, вытокі вучэнняў аб стварэнні дзяржаў і справядлівых (сацыяльных) дзяржаў знаходзяцца ў далёкім мінулым. Якасна новы этап у распрацоўцы тэорыі сацыяльнай дзяржавы і яе сінонімаў “дзяржава ўсеагульнага благадзенствія” і “дзяржава ўсеагульнага дабрабыту” пачаўся ў еўрапейскіх краінах падчас Другой сусветнай вайны і, у асаблівасці, пасля яе заканчэння. Пачатак гэтага этапу ў развіцці ўяўленняў аб сацыяльнай дзяржаве быў пакладзена ў 1942 г. у Англіі. У знакамітым дакладзе В. Беверыджа парламенту Вялікабрытаніі “Поўная занятасць у свабодным грамадстве” выкладаліся асноўныя прынцыпы «дзяржавы дабрабыту» і ўпершыню вылучалася ідэя гарантаванага адзінага нацыянальнага мінімальнага даходу. Ядром плана была цесная сувязь сацыяльнай палітыкі з дзяржаўнай эканамічнай палітыкай, накіраванай на забеспячэнне поўнай занятасці. З гэтага часу тэрмін “дзяржава дабрабыту” – “welfare state” – стаў сінонімам сацыяльнай дзяржавы ў англамоўных краінах.

Пасля Другой сусветнай вайны ідэі і каштоўнасныя крытэрыі сацыяльнай дзяржавы былі тэарэтычна ўдасканалены і атрымалі сваё замацаванне ў канстытуцыях многіх краін. Першай сацыяльную прыроду сваёй дзяржавы на гэтым этапе, як бы гэта не было парадаксальна, зафіксавала Федэратыўная Рэспубліка Германія, якая ўнесла ў 1949 г. у сваю канстытуцыю палажэнні аб тым, што “Федэратыўная Рэспубліка Германія з’яўляецца дэмакратыч У 28 артыкуле Асноўнага закона Федэратыўнай Рэспублікі Германія было ўказана, што канстытуцыйны лад у землях павінен адпавядаць прынцыпам сацыяльнай прававой дзяржавы [5; 6].

Пазней (1959 г.) статус сацыяльнай дзяржавы быў замацаваны ў дзеючых канстытуцыях Францыі, Італіі [7, с. 187], у 1972 г. – у Швейцарыі, у 1975 г. – у Швецыі [8, с. 8], у 1978 г. – у Іспаніі, Турцыі [5, с. 701]. На прынцыпах сацыяльнай справядлівасці, згодна з асноўнымі дакументамі, пачалі будаваць сваю ўнутраную палітыку Румынія, Турцыя, Нідэрланды, Данія, Польшча [9, с. 295]. Гэта азначала, што дадзеныя дзяржавы ў сваёй дзейнасці падпарадкоўваюцца прынцыпу сацыяльнасці “абавязак урада ажыццяўляць палітыку, накіраваную на забеспячэнне годнага чалавека ўзроўню жыцця, задавальненне асноўных жыццёвых патрэбаў усіх сацыяльных груп”. Палітычныя партыі, якія дзейнічалі ў гэтых краінах, у праграмных дакументах таксама абвясцілі галоўнай мэтай пабудову сацыяльнай дзяржавы.

Як бачна, на працягу доўгіх стагоддзяў ішоў пошук шляхоў пабудовы ідэальнай дзяржавы, у якой бы наглядаліся прыдатныя формы для існавання чалавека. У пачатку XXI стагоддзя ў навуковай літаратуры склалася каля дзясятка розных тэорый, канцэпцый, мноства трактовак аб мадэлях сацыяльнай дзяржавы. Замежныя аўтары К. Ватрын, Г. Вільгерадот, Х.Х. Ламперт сутнасць паняцця “сацыяльная дзяржава” разумелі як здольнасць усіх кіруючых структур

Рэпазіторый ВДУ

справядліва размеркаваць і забяспечыць дабрабыт ўсіх членаў грамадства, знішчыўшы пры гэтым няроўнасць даходаў. Як яны сцвярджалі, такая дзяржава здольна радыкальна пераўтвараць грамадства, перш за ўсё ў пытаннях размеркавання ўласнасці, даходаў, арганізацыі кіравання прадпрыемствамі, а таксама функцый дзяржавы ў інтарэсах усіх яе грамадзян. Услед за ранейшымі навукоўцамі яны падцвердзілі, што галоўным сродкам забяспячэння ўсіх членаў грамадства матэрыяльнымі і сацыяльнымі дабротамі з'яўляецца эканамічны рост. Павышэнне дабрабыту людзей магчыма ажыццяўляць пры паспяховым развіцці эканомікі, пастаянным росце прадукцыйнасці працы. Несправядлівае размеркаванне вынікаў працы ў краіне можа быць асноўнай крыніцай сацыяльнай напружанасці.

Найбольш поўна вызначаюць сутнасць сацыяльнай дзяржавы ў сваіх працах расійскія вучоныя: М.М. Грыцэнка [10], Р.А. Нікалаеў [11], М.П. Бачароў [12], В.А. Камянецкі [13], Ю.Е. Ваўкоў [14], М.В. Баглай [14; 15], Б.В. Ракіцкі [17]. Вызначэнне сацыяльнай дзяржавы бачыцца расійскім навукоўцам як паняцце, закліканае падкрэсліць, што сацыяльныя праблемы ўваходзяць у якасці прыярытэтных для дадзеных дзяржаў. Сацыяльная дзяржава – у іх абагульненні – гэта дзяржава, якая праводзіць моцную сацыяльную палітыку і якая развівае айчынную рыначную эканоміку, накіраваную на стабільнае забеспячэнне высокага жыццёвага ўзроўню і занятасць насельніцтва, рэальнае ажыццяўленне правоў і свабод грамадзян, стварэнне сучасных і даступных усім грамадзянам сістэм адукацыі, аховы здароўя, культуры, сацыяльнага забеспячэння і абслугоўвання, падтрыманне немаёмных і маламаёмасных пластоў насельніцтва.

Вядучы навуковец і палітык М.В. Баглай называе сацыяльнай "дзяржаву, якая бярэ на сябе абавязак клапаціцца аб сацыяльнай справядлівасці, дабрабыце сваіх грамадзян, іх сацыяльнай абароненасці" [15, с. 118–119]. Далей ён удакладняе: сацыяльная дзяржава – гэта дзяржава, у якой кожнаму чалавеку гарантаваны годны ўзровень жыцця, створаны ўмовы для бесперашкоднай рэалізацыі канстытуцыйных правоў грамадзян на працу, сацыяльнае забеспячэнне, адукацыю, ахову свайго жыцця і здароўя [16, с. 2].

Б.В. Ракіцкі ў сваіх працах слушна заўважае, што "па сапраўднаму сацыяльнай дзяржава можа стаць пры раўнавазе сілаў палітычнага дзеяння, пры роўнай уплывовасці асноўных сіл у грамадстве. Калі сілы істотна не роўныя, то няма і сацыяльнай дзяржавы" [17, с. 93].

У ліку базісных, важнейшых асаблівасцей сацыяльнай дзяржавы ў сучасным свеце, з'яўляецца ўдзел у яе пабудове грамадскіх арганізацый, у тым ліку палітычных партый, сацыяльных рухаў, фондаў, праваслаўнай царквы і іншых традыцыйных канфесій. У навуковай літаратуры падкрэсліваецца, што правам называць сябе сацыяльнай можа тая дзяржава, дзе ўдзел улады ў рэгуляванні працоўных і сацыяльных адносін вядзецца на раўнапраўнай і роўнаадказнай аснове з іншымі суб'ектамі гэтых адносін – грамадскімі арганізацыямі, і перш за ўсё, з прафсаюзамі, як прадстаўнікамі працоўных. Сацыяльнае партнёрства называецца тут найважнейшым інструментам узгаднення інтарэсаў дзяржавы работнікаў і працадаўцаў.

У даследаванні пры вызначэнні заканамернасці будаўніцтва ў Беларусі сацыяльнай дзяржавы намі ўлічвалася гэта найважнейшае становішча: яшчэ ў



Рэпазіторый БДУ

2006 г. у навуковых аўтарскіх публікацыях адзначалася, што “сацыяльнымі” (сацыяльна арыентаванымі) можна называць дзяржавы, у якіх заканадаўча замацаваны грамадска прымальны сцэнар устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця, а рэалізацыя пастаўленых у ім мэтаў забяспечвае матэрыяльны дабрабыт і духоўнае развіццё ва ўмовах свабоды і годнасці грамадзян. У такіх дзяржавах унутраная палітыка ажыццяўляецца з улікам інтарэсаў усіх сацыяльных пластоў і груп насельніцтва краіны. Кіраўніцтва гэтых краін дэманструе палітычную волю па развіцці эканомікі ў інтарэсах грамадства, цвёрда выконвае прынцып сацыяльнай адказнасці перад людзьмі і па меры росту фінансава-эканамічных магчымасцей працягвае павялічваць памеры сацыяльных гарантый. Зыходзячы з узроўню развіцця гаспадарчага комплексу сацыяльна арыентаваная дзяржава валодае здольнасцю аптымальна збалансаваць у рамках сваёй сацыяльнай палітыкі суадносіны правоў і абавязкаў розных частак грамадства пры максімальна магчымым ўліку кожнай з іх. **У дзяржаве, якая з’яўляецца сацыяльнай па факце, рэгуляванне працоўных і сацыяльных адносін заснавана на раўнапраўнай і раўнаадказнай аснове з іншымі суб’ектамі гэтых адносін – грамадскімі арганізацыямі, і перш за ўсё з прафсаюзамі, як прадстаўнікамі працоўных** [18, с. 23–28].

Напрыканцы трэба сказаць, што тэарэтычныя напрацоўкі пра дзяржаву ўсеагульнага дабрабыту, у больш позняй фармулёўцы – сацыяльнай дзяржаве – зроблены ў выніку напружанай творчай працы навукоўцаў і палітычных дзеячаў. Вобраз дасканалага сацыяльнага ўладкавання па меры развіцця цывілізацыі знаходзіў увасабленне ў зменлівых канцэпцыях. У разуменні і тлумачэнні сацыяльна-палітычнага феномена, якім з’яўляецца сацыяльная дзяржава, ўжываемых метадах пры рэалізацыі яе асноўнай мэты, яшчэ і сёння ёсць досыць шырокі навуковы аўтарскі раскід. Але агульным, што аб’ядноўвае існуючыя тэорыі аб сацыяльнай дзяржаве з рыначнай эканомікай, ёсць – заканадаўчае замацаванне прыярытэтаў па забеспячэнню годнага ўзроўню якасці жыцця людзей ў асноватворных дакументах і рэалізацыя іх зместу ў рэчаіснасць. Гэта задача з’яўляецца найбольш актуальнай для многіх краін, у тым ліку і для Рэспублікі Беларусь, якая канстытуцыйна выбрала такую мадэль свайго развіцця.

**Літаратура**


1. Платон. Государство. Законы. Политик / пер., предисл. Е.И. Темнова. – М.: Мысль, 1998.
2. Энгельс, Ф. Происхождение семьи, частной собственности и государства / Ф. Энгельс // К. Маркс и Ф. Энгельс. Сочинения. – 2-е изд. – М., 1961. – Т. 21.
3. В.И. Ленин. Избранные произведения: в 3 т. – М.: Изд-во “Политическая литература”, 1972. – Т. 2. – 826 с.
4. Барис, В.В. Политические основания становления и развития социального государства / В.В. Барис // Социальное государство: мировой опыт и реалии России. – М.: АТиСО, 2002.
5. Основы социального государства: учебник для вузов / под общ. ред. д-ра эконом. наук, проф. Н.Н. Гриценко, д-ра эконом. наук, проф. А.А. Шулуса. – М.: Изд. дом АТиСО, 2009. – 440 с.


Репозиторий ВГУ

6. Основной закон Федеративной Республики Германия. – Бонн, 1998.
7. Гриценко, Н.Н. Конституции государств Европейского союза / Н.Н. Гриценко [и др.]. – М., 1997.
8. Конституции государств Восточной Европы. – М., 1996.
9. Конституции зарубежных государств. – М., 1996.
10. Гриценко, Н.Н. Социальное государство: краткий словарь-справочник / редкол.: Н.Н. Гриценко (рук.), Г.А. Николаев (зам. рук.), Ф.И. Шарков (зам. рук.). – М.: АТиСО, 2002; Гриценко Н.Н.: Основы социального государства: учебник для вузов / под общ. ред. Н.Н. Гриценко, А.А. Шулуса. – М.: Изд. дом «АТиСО», 2009.
11. Николаев, Г.А. К вопросу о социально-экономической функции социального государства / Г.А. Николаев // Социальное государство: мировой опыт и реалии России. – М.: АТиСО, 2002.
12. Бочаров, М.П. От социальных ценностей к социальному государству / М.П. Бочаров. – М.: Луч, 1977.
13. Каменецкий, В.А. Проблемы становления социального государства / В.А. Каменецкий, В.П. Патрекеев. – М.: АТиСО, 2001.
14. Волков, Ю.Е. Либерализм и социальное государство / Ю.Е. Волков // Социальная политика: энциклопедия / под ред. Н.А. Волгина и Т.С. Сулимовой. – М.: Альфа-Пресс, 2006.
15. Баглай, М.В. Конституционное право Российской Федерации / М.В. Баглай. – М., 1997.
16. Баглай, М.В. Государство должно быть социальным: и при рынке держава обязана заботиться о своих гражданах / М.В. Баглай // Труд. – 1993. – 3 июня.
17. Ракитский, Б.В. Роль государства в социальной политике: особенности государства как субъекта социальной политики и его конституционные обязанности в этой сфере // Социальная политика: учебник / Б.В. Ракитский. – М.: Экзамен, 2002.
18. Мандрик, И.В. Социально ориентированное государство и профсоюзы / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2006. – № 4.

Репозиторий ВГУ

# Г Л А В А 3
# Стварэнне дзяржаў сацыяльнага тыпу, паэтапнае ўзрастанне іх спецыфічных функцый

Абапіраючыся на тэкст папярэдняга раздзела, адзначым: сацыяльны тып дзяржавы (сацыяльная дзяржава) ў тэарэтычным плане ўяўляе сабой найбольш аптымальны тып арганізацыі грамадскага ўладкавання. Распрацоўшчыкі тэорый аб аптымальным тыпе арганізацыі грамадскага ўладкавання, як адзначалася вышэй, прыйшлі да высновы: сацыяльная дзяржава – ёсць прававая дэмакратычная дзяржава, якая праводзіць моцную сацыяльную палітыку на аснове паспяхова развіваючай айчыннай сацыяльна рыначнай гаспадаркі, якая дае магчымасць забяспечваць высокі жыццёвы ўзровень, занятасць насельніцтва, сацыяльную абароненасць, рэальнае ажыццяўленне правоў і свабод грамадзян, стварэнне сучасных і даступных усім грамадзянам адукацыі, аховы здароўя, культуры, сацыяльнага забеспячэння і абслугоўвання, падтрыманне немаёмасных і маламаёмасных пластоў насельніцтва. Распрацаваныя навукоўцамі тэарэтычныя палажэнні сталі актыўна ўвасабляцца ў жыццё.

Краінай, дзе дэклараванае палажэнне аб сацыяльнай дзяржаве стала ўпершыню ўкараняцца на практыцы, была Нямеччына. Гэта адбылося ў 1871 годзе. Ужо тады ў канстытуцыі Германіі прысутнічала ідэя клопату дзяржавы аб дабрабыце народа. Тут жа і ў гэты ж час пакладзены пачатак фарміраванню заканадаўства па сацыяльных пытаннях [1, с. 116]. У гэтым жа годзе нямецкая дзяржава ўпершыню ў гісторыі ўвяла дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці, у 1880 годзе Няметччыне пачынаюць фінансаваць медыцынскую дапамогу, ў 1883 годзе Германія ўводзіць заканадаўча дапамогу на час хваробы, у 1910 г. – абавязковае пенсійнае страхаванне.

Па прыкладзе Германіі ў XIX ст. дзяржаўнае страхаванне ахапіла ўсе сферы сацыяльных рызык у многіх краінах Еўропы і Амерыкі. У 1887 г. сацыяльнае страхаванне ад няшчаснага выпадку з’яўляецца ў Аўстрыі, у 1894 г. – у Нарвегіі, у 1898 г. – у Францыі, у 1900 г. – у Новай Зеландыі, у 1901 г. – у Швецыі. У 1888 г. медыцынскае страхаванне стала абавязковым у Аўстрыі, у 1891 г. – у Швецыі, ў 1909 г. – у Нарвегіі. Падобнае развіццё падзей як у Германіі, так і ў іншых краінах пры станаўленні капіталістычнага грамадства можна аднесці ў заслугу смелым ідэям нямецкіх навукоўцаў XIX ст., якія знаходзіліся тады пад уплывам філасофіі Гегеля. Рэальным увасабленнем новых якасцяў дзяржавы сталі шырокае паўсюднае ўкараненне дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, забеспячэнне сацыяльнай роўнасці, стварэнне і бюджэтнае фінансаванне дзяржаўнай сацыяльнай дапамогі і асобных сацыяльных праграм.

Лавінападобным прыняццем сацыяльных законаў і ўвядзеннем прынцыпаў, уласцівых сацыяльным дзяржавам адзначана першая трэць XX стагоддзя. Лідзіруючую пазіцыю ў развіцці сацыяльнага заканадаўства на гэтым этапе заняла Англія. З прыняццем законаў Л. Джорджа “Аб пенсіях па



Рэпазіторый ВДУ

старасці” (1908 г.), “Аб прагрэсіўным падаткаабкладанні” (1909 г.), а таксама біля “Аб нацыянальным страхаванні” (1911 г.) і інш. Англія стварыла разгалінаваную нарматыўна-прававую базу рэалізацыі прынцыпаў сацыяльнай дзяржавы. Па прыкладзе Англіі сацыяльныя гарантыі для грамадзян у заканадаўчым парадку ўводзіліся ў іншых краінах. Законы аб сацыяльным і медыцынскім страхаванні, пенсійным забеспячэнні, дапамогах па беспрацоўю і страхаванню ад няшчасных выпадкаў, аналагічныя англійскай, у гэтыя гады былі прынятыя ў Аўстрыі, Аўстраліі, Даніі, Канадзе, Італіі, Новай Зеландыі, Нарвегіі, ЗША, Францыі, Швецыі, Іспаніі і многіх іншых краінах [2, с. 187]. У Швецыі яшчэ перад Першай сусветнай вайной дзейнічалі дзве сістэмы сацыяльнага страхавання: для састарэлых і інвалідаў (пенсійнае страхаванне па старасці і інваліднасці). Гэта дазволіла разарваць абавязковую сувязь старасці і беднасці, прывяло да ўзнікнення паняцця “забяспечаная старасць”. У 30-я гады ў Швецыі і Нарвегіі афармілася размежаванне пенсіі на народную і (сацыяльную), выплачваемую кожнаму жыхару краіны па дасягненню 65 год з дзяржаўнага бюджэту, і працоўную, залежную ад стажа, характару дзейнасці і прапарцыянальную аб’ёму страхавых выплат. У той жа час тут упершыню былі ўведзены датацыі на кожнага народжанага для ўсіх бацькоў. Нованароджаны стаў аб’ектам сацыяльнай абароны, пры чым без усялякіх указанняў на ўмовы ў выглядзе шматдзетнасці, няпоўнай сям’і і г.д.

З вышэйназванага вынікае, што ў індустрыяльную эпоху, каб зрабіць працу работнікаў на вытворчасці максімальна эфектыўнай і атрымаць высокі вынік, перад наймальнікамі паўстае задача падтрымкі іх фізічнага і псіхічнага здароўя. Узнікае запатрабавальнасць у падрыхтоўцы працоўных рэзерваў, іх тэхнічным навучанні, развіцці сеткі ўстаноў адукацыі, аздараўлення і, наогул, – стварэнні механізмаў сацыяльнай абароны насельніцтва. Натуральным наступствам гэтага стала тое, што акрамя традыцыйных функцый дзяржава прымае на сябе спецыфічныя сацыяльныя функцыі. Новыя функцыі дзяржавы па задавальненню сацыяльных патрэбаў грамадства з цягам часу прыводзяцца ў сістэму. У прыватнасці дзяржава прыняла на сябе такія функцыі як: падтрымка сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва; ахова працы і здароўя людзей; падтрымка сям’і, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства; згладжванне сацыяльнай няроўнасці шляхам пераразмеркавання даходаў паміж рознымі сацыяльнымі пластамі праз падаткаабкладанне, дзяржаўны бюджэт, спецыяльныя сацыяльныя праграмы; заахвочванне дабрачыннай дзейнасці; фінансаванне і падтрымка фундаментальных навуковых даследаванняў і культурных праграм; барацьба з беспрацоўем, забеспячэнне працоўнай занятасці насельніцтва, выплата дапамог па беспрацоўі; пошук балансу паміж свабоднай рыначнай эканомікай і мерай уздзеяння дзяржавы на яе развіццё з мэтай забеспячэння годнага жыцця ўсіх грамадзян; удзел у рэалізацыі міждзяржаўных экалагічных, культурных і сацыяльных праграм, рашэнне агульначалавечых праблем; клопат аб захаванні згоды ў грамадстве.

У Расіі ў пачатку ХХ ст. заканадаўства, якое б абмяжоўвала ўсеўладдзе бюракратыі, бязмерную эксплуатацыю рабочых і сялян, было недасканалым, а па многіх пазіцыях яшчэ і не прымалася [3, с. 481]. Першы сацыяльны закон, дзеянне якога распаўсюджвалася і на Беларусь (яе тэрыторыя тады ўваходзіла ў

Рэпазіторый ВДУ

склад Расіі), “Аб абмежаванні працы дзяцей і падлеткаў” царскі ўрад прыняў у 1882 годзе, закон “Аб бясплатным медыцынскім абслугоўванні фабрычна-завадскіх рабочых” з’явіўся ў 1886 г. Толькі ў 1897 г. урад Расіі прыняў закон аб выхадных і святочных днях, скарачэнні працоўнага дня [4, с. 11–14]. У 1912 г. было ўведзена страхаванне па хваробе і ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці. Але, як указваецца ў працах гісторыкаў, эканамістаў, якія спецыяльна вывучалі гэты час, прынятыя законы значнага ўплыву на становішча рабочых (у тым ліку і беларускіх губерняў) не аказвалі. Расія ў гэтым перыядзе знаходзілася на стадыі капіталістычнай эвалюцыі, краіны “даганяючага” развіцця. У краіне перапляліся дабуржуазныя і буржуазныя формы вытворчых адносін. Па ўзроўню свайго развіцця Расія знаходзілася “на мяжы краін цывілізаваных і краін, якія ўпершыню ўцягваліся ў цывілізацыю”. Тут адбываецца нараджэнне новых класаў у асобе гандлёва-прамысловай буржуазіі і рабочых (пралетарыяту), якія знаходзіліся ў сітуацыі сацыяльных і палітычных супярэчнасцей. Буржуазія, вядучы назапашванне капіталу, звярталася да незаконных метадаў узбагачэння і крадзяжам. Вельмі хваравіта і павольна перабудоўвалася сельская гаспадарка. Большасць сялян мела невялікія надзелы і была абцяжарана разнастайнымі падаткамі і павіннасцямі, якія даходзілі да траціны ўсіх даходаў. Умовы працы ў асноўным на прадпрыемствах не адпавядалі санітарным нормам. Не надавалася ўвагі тэхніцы бяспекі, звычайнай з’явай станавіліся няшчасныя выпадкі на вытворчасці. Яшчэ ў больш бяспраўным становішчы знаходзіліся ускрайкавыя тэрыторыі, у тым ліку і Беларусь. Па прадстаўленым самімі ўладальнікамі звестках, за 1904 год толькі на 17% усіх прадпрыемстваў пяці беларускіх губерняў адбылося 24744 няшчасныя выпадкі, большасць якіх скончыліся стратай працаздольнасці або гібеллю рабочых [5, с. 19]. Заработная плата не забяспечвала нават самага мінімальнага жыццёвага ўзроўню. У Беларусі для сям’і з чатырох чалавек тады неабходна было мець прыбытак 400 рублёў у год. Але сярэднегадавая заработная плата рабочага складала толькі 138 рублёў 25 капеек. Да таго ж выплачвалася яна нерэгулярна.

Натуральна, што цяжкія жыццёвыя ўмовы расіян, беларусаў, іншых народнасцей выклікалі пратэсты. Рабочы клас пад уплывам сацыял-дэмакратычных вучэнняў усе больш і больш уцягваўся ў барацьбу за паляпшэнне свайго становішча. Усведамленне таго, што для паспяховага выніку ў супрацьстаянні з працадаўцамі неабходны аб’яднанне і салідарнасць у дзеяннях, прывяло працоўных да стварэння арганізацый па прафесійнай прыкмеце (у Беларусі гэта зроблена раней, чым у іншых рэгіёнах Расійскай імперыі). Таму наступіўшыя ў краіне зрухі ў станоўчым для працоўных плане адбываліся шмат у чым дзякуючы дзейнасці прафесійных саюзаў [6, с. 4].

Вялікі ўплыў на ўвесь свет аказалі падзеі 1917 года. Збег унутраных і знешніх абставінаў дазволіў працоўным Расіі атрымаць перамогу. Верагодна, класавы антаганізм быў у гэтых падзеях не адзіным фактарам, які вызначаў сацыяльныя ўзрушэнні. Не меншую ролю адыгралі і сацыяльная безадказнасць царскага рэжыму, і адсутнасць у расійскага бізнесу пачуццяў самазахавання. Па дадзеных гісторыка Б. Міронава, зарплата расійскага працоўнага ў 1913 годзе складала 24 руб. у месяц. Для параўнання: англійскі рабочы ў той перыяд атрымліваў суму, аналагічную 61 руб., нямецкі – каля 57 руб., а амерыканскі –

Рэпазіторый ВДУ

112 рублёў. У 1900 годзе сярэдняя працягласць жыцця ў Расіі складала 32 гады для мужчын і 34 года для жанчын; у Вялікабрытаніі – адпаведна 51 і 55 гадоў, у Нямеччыне – 47 і 51 год, у ЗША – 48 і 52 гады [7, с. 19].

Беззаконне і самавольства ў расійскім грамадстве прывялі да выбуху незадаволенасці, азлобленасці, жорсткасці працоўных мас. Радыкальныя лозунгі сацыял-дэмакратычных арганізацый, якія распальвалі нянавісць да “буржуяў”, як крыніцы ўсіх бед і цяжкасцей, здабылі папулярнасць і падтрымку. Настойлівасць бальшавіцкіх сацыял-дэмакратычных арганізацый, іх зразумелыя і папулярныя ў народзе прапановы аб міры, зямлі, фабрыках, заводах, дэмакратычных свабодах мелі поспех.

Пасля пераходу ўлады да бальшавікоў у лістападзе 1917 года ў маладой Савецкай рэспубліцы выдадзены дэкрэты аб страхаванні ад беспрацоўя; аб бясплатнай медыцынскай дапамозе; аб дапамогах з нагоды хваробы, родаў і смерці. У краіне створан Народны камісарыят працы з аддзелам аховы працы [8, с. 3]. 14 чэрвеня 1918 года Наркаматам працы разгледжаны спіс шкодных вытворчасцей і прафесій. На ўсіх шкодных і небяспечных прадпрыемствах уведзена выдача спецвопраткі.

У перыяд грамадзянскай вайны намер дзяржавы на прымальнае сацыяльнае забяспячэнне насельніцтва не быў рэалізаван на справе. Дапамога ў выглядзе пенсій і выплат аказвалася толькі інвалідам, сем’ям загінуўшых на фронце салдатам, сем’ям чырвонаармейцаў. З завяршэннем грамадзянскай вайны Савецкая краіна ўзяла на сябе вялікую (у параўнанні з папярэднім перыядам) адказнасць за дабрабыт грамадзян. Зроблен пераход ад сацыяльнага забеспячэння да сацыяльнага страхавання рабочых і служачых за кошт унёскаў прадпрыемстваў, устаноў і ўласнікаў. З 1926 года натуральнае забеспячэнне замяняецца грашовым. Выкананне ўсіх складаемых сацыяльнай палітыкі ўскладалася на Народны камісарыят сацыяльнага забеспячэння, цэнтральны камітэт сялянскіх грамадстваў і Беларускае грамадства сляпых.

З сярэдзіны 20-х гг., а рэльефна з 1927 года, з XV з’езда УКП(б)), вызначана стратэгічная мэта дзяржавы, у якой прадугледжвалася пераўтварэнне сацыялістычнага ўклада ў пераважаючы пад’ём дабрабыту і культуры працоўных праз правядзенне індустрыялізацыі народнай гаспадаркі і кааперыраванне сялянства.

Адчуўшы перамены да лепшага, што адбыліся ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі, людзі імкнуліся да рэвалюцыйнага абнаўлення краіны і жылі неадольнай прагай стварэння. Выключным напружаннем сіл ім удалося пабудаваць магутную дзяржаву. Быў створаны велізарны эканамічны і навукова-тэхнічны патэнцыял. У СССР фарміраваліся новыя атрыбуты сацыяльнай палітыкі. З 1933 г. сацыяльнае страхаванне перадаецца Усесаюзнаму цэнтральнаму савету прафсаюзаў.

У 1930-х гадах Савецкі Саюз стаў членам Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), якая створана ў 1918 годзе пры Лізе Нацый. Асноўныя прынцыпы пабудовы і дзейнасці МАП замацаваны ў яе асноватворчых дакументах – Філадэльфійскай дэкларацыі (1944 г.) і Уставе МАП. Адным з найважнейшых прынцыпаў гэтай арганізацыі стаў трыпартызм – арганізацыя дыялогу паміж працадаўцамі, прафсоюзамі і прадстаўнікамі ўлады. У дакументах МАП прапісана,

што праца не з’яўляецца таварам; свабода слова і свабода аб’яднанняў – неабходныя ўмовы пастаяннага прагрэсу; жабрацтва ў любым месцы з’яўляецца пагрозай для агульнага шчасця; усе людзі незалежна ад расы, веры, полу маюць права на матэрыяльны дабрабыт і духоўнае развіццё ва ўмовах свабоды і годнасці, эканамічнай устойлівасці і роўных магчымасцей.

Усе рэспублікі саюза павінны былі кіравацца канвенцыямі і пагадненнямі МАП, якія накіраваны на падтрыманне сацыяльнага міру ў краінах свету праз рэгуляванне сацыяльна-працоўных адносін.

СССР прыняў на сябе сацыяльную адказнасць перад сусветнай супольнасцю не выкарыстоўваць розныя формы прымусовай працы, выконваць нормы бяспекі працы, не дапускаць жанчын да цяжкіх відаў работ, абапірацца на сістэму калектыўных дагавораў у рэгуляванні працоўных адносін і г.д. Дзяржава стала дамінуючым суб’ектам сацыяльных функцый у грамадстве. Яна забяспечыла даступнасць сацыяльнай падтрымкі ўсім членам грамадства, стварыла дзяржаўную сістэму сацыяльнага забеспячэння і сацыяльнай абароны, увяла бюджэтнае фінансаванне сацыяльных праграм і новыя механізмы сацыяльнай палітыкі ў выглядзе дзяржаўнага сацыяльнага страхавання насельніцтва за выключэннем сялянства. Сялянства, у статусе калгаснікаў, не мела дзяржаўнага пенсійнага і некаторых іншых відаў сацыяльнага забеспячэння, гэты абавязак да сярэдзіны 1960-х гг. быў ускладзен на калгасы. З выхадам у 1964 г. “Закона аб пенсіях і дапамогах членам калгасаў” дзяржава цалкам узяла абавязкі па выплатах пенсій калгаснікам на сябе. Заканадаўства замацоўвала права працоўных на адпачынак, рэгламентуемы працяг рабочага часу, выхадныя і святочныя дні, аплачваемы ў кожным годзе адпачынак.

На жаль, палітычнае кіраўніцтва краіны не здолела адэкватна ажыццявіць народныя чаканні ў праграму паслядоўных і канкрэтных дзеянняў працоўных мас. У выніку не атрымалася дасягнуць тых мэтаў, якія былі пастаўлены кіруючай партыяй па пераўладкаванні грамадства і дзяржавы. Напрыканцы 20 – пачатку 30-х гадоў у СССР склаўся, а затым зацвердзіўся прынцып дырэктыўна-каманднай эканомікі і астатковы падыход да вырашэння праблем сацыяльнай сферы і ўзроўню жыцця людзей. Разгортванне капітальнага будаўніцтва, удасканальванне тэхнікі і тэхналогій вытворчасці, забеспячэнне арміі ўзбраеннем адсоўвалі на другі план фактары сацыяльнай палітыкі. Сталінская стратэгія фарсіраванага развіцця краіны ў 30–40-х гг. з перакананнем, што пераадоленне прамысловай адсталасці неабходна дабівацца, якіх бы сацыяльна-эканамічных, палітычных, ідэйна-маральных выдаткаў гэта не каштавала, разам з дасягненнем у індустрыяльным накірунку, мела негатыўныя наступствы. Культ асобы Сталіна, прымяненне прымушэння, насілля, рэпрэсій, перакрывілі воблік сацыялізму, выклікалі глыбокую дэфармацыю ў грамадстве.

Велізарныя матэрыяльныя і людскія страты СССР панёс у гады Вялікай Айчыннай вайны. У заняпад прыйшла прамысловая, сельскагаспадарчая і сацыяльная структура акупаваных тэрыторый. Безумоўна, у першую чаргу, пачалося аднаўленне прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Менш увагі надавалася сацыяльнай сферы. Аднак, нягледзячы на цяжкі час, у кароткі перыяд у БССР была наладжана праца ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, культуры і навукі. Наркамат сацыяльнага забеспячэння СССР і яго структуры на месцах у

Рэпазіторый ВДУ

першыя месяцы пасля вызвалення правялі ўлік усіх пенсіянераў. Ва ўсіх саюзных рэспубліках аднавілася выдача пенсій, побач з дапамогамі і пенсіямі стварaліся спецыяльныя фонды дапамогі сем'ям ваеннаслужачых і партызан з дабраахвотных узносаў і паступленняў грамадскіх арганізацый і грамадзян.

У верасні 1947 г. Савет Міністраў БССР зацвердзіў Палажэнне аб Міністэрстве сацыяльнага забяспячэння БССР, якое поўна і дэталёва вызначыла яго паўнамоцтвы ў ажыццяўленні кантролю за своечасовым назначэннем і выплатай пенсій і дапамог, расходаваннем сродкаў, асігнаванняў на сацыяльнае забеспячэнне, арганізацыю пратэзіравання, прафесіянальнае навучанне і перанавучанне інвалідаў [9, с. 4–10].

Але аб'ектыўнасць гістарычнага даследавання пасляваеннага аднаўлення патрабуе адзначыць, што ў сапраўднасці ў краіне не адбылося поўнага супадзення дэкларацый сацыялістычных прынцыпаў і мэтаў аб клопатах пра народны дабрабыт з рэчаіснасцю. Савецкі Саюз і іншыя краіны, якія папоўнілі пасля Другой сусветнай вайны сістэму сацыялізму, адставалі ад развітых замежных краін са свабоднай рынкавай эканомікай у забеспячэнні насельніцтва матэрыяльнымі выгадамі. Толькі з сярэдзіны 50-х гг. планы сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы сталі ў больш значнай ступені арыентаванымі на арганічнае спалучэнне вытворчасці сродкаў вытворчасці і сродкаў спажывання. Перавес жа ў развіцці галін, забяспечваючых развіццё сацыяльнай сферы, адбыўся толькі ў апошняй савецкай пяцігодцы (1986–1990 гг.).

У Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, якая з 1922 г. уваходзіла ў склад СССР, сацыяльныя функцыі рэалізоўваліся з улікам эканамічных магчымасцей і грамадска-палітычных абставін, якія ўсталяваліся ў саюзнай дзяржаве. Згодна з канстытуцыяй СССР і БССР усім грамадзянам было гарантавана права ў кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, удзелу працаўнікоў у кіраванні вытворчасцю. У сапраўднасці было ліквідавана беспрацоўе, зацвердзілася гендэрная роўнасць мужчын і жанчын. У краіне пастаянна адбывалася скарачэнне беднасці, мелася адрасная падтрымка найбольш слабых пластоў і груп насельніцтва, адбывалася духоўнае, культурнае і маральнае развіццё грамадзян і, перш за ўсё, моладзі [10, с. 4–10].

Распрацоўку сацыяльных норм ажыццяўляўлі міністэрства і ведамствы СССР і дзяржпланы саюзных рэспублік. Да гэтай працы далучаліся навукова-даследчыя інстытуты, вядучыя навукоўцы. Паказчыкі ўлічвалі забяспечанасць насельніцтва прадпрыемствамі і ўстановамі невытворчай сферы, матэрыяльнымі каштоўнасцямі і платнымі паслугамі. Так, у сферы адукацыі ўлічваўся лік дашкольных устаноў (асобна ў горадзе і на вёсцы) на 1000 дзяцей дашкольнага ўзросту; лік месцаў у ПТВ на 1000 рабочых; напоўненасць узроставых груп у дашкольных установах, класаў – у агульнаадукацыйных школах і т.п. Хуткі рост дзесяці-адзінаццацігадовай адукацыі прывёў да таго, што ўжо да сярэдзіны 80-х гг. яна стала ў БССР усеагульнай. У пачатку 80-х гг. доля працаўнікоў з вышэйшай адукацыяй ў СССР складала амаль 15%, а з сярэдняй спецыяльнай – каля 20% [11, с. 523]. Якасна змяніўся ўзровень дабрабыту насельніцтва. Па афіцыйных дадзеных, нацыянальны даход у разліку на аднаго жыхара на працягу 50–70-х гг. узрос па СССР у 5–7 разоў. БССР па гэтых і іншых паказчыках апярэджвала амаль усе саюзныя рэспублікі, аднак саступала па

Рэпазіторый ВДУ

забеспячэнні дабрабыту насельніцтва большасці краін Захаду, а таксама і тым, якія ўваходзілі ў Савет Эканамічнай Узаемадапамогі (СЭУ). Сацыяльныя нарматывы і нормы забяспечанасці насельніцтва ўсімі дабротамі і платнымі паслугамі разлічваліся як рэкамендуемыя памеры спажывання асноўных груп харчовых прадутаў: мяса і мясапрадуктаў, малака і малакапрадуктаў, яек, рыбы, алею і сметанковага масла, цукру, агародніны, садавіны ў дакладных адзінках вымярэння на аднаго жыхара ў год. Рубежныя нарматывы і нормы распрацоўваліся і ў сферы аховы здароўя, гандлю і грамадскага харчавання, у галіне культуры, у жыллёва-камунальнай гаспадарцы. БССР у агульным кантэксце несумненна была краінай, дзе дастаткова паспяхова выконваліся сацыяльныя функцыі. Пасля распаду СССР Беларусь працягвала лічыць сябе сацыяльнай, дэкларавала клопат аб сацыяльнай справядлівасці, дабрабыту грамадзян, іх сацыяльнай абароне. Па такому ж шляху пайшла большасць постсавецкіх рэспублік. Як адзначаецца ў афіцыйных дакументах, дзяржавы былога СССР мелі намер – развіваць салідарнасць і клопат самога грамадства аб сацыяльным стане гэтага грамадства [12, с. 135].

Дзяржава наўпрост названа сацыяльнай у Канстытуцыях Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Арменія, Рэспублікі Казахстан, Украіны, Рэспублікі Таджыкістан і Грузіі. Так, прынятая ўсенародным рэферэндумам 12 снежня 1993 года Канстытуцыя Расійскай Федэрацыі абвясціла: "Чалавек, яго правы і свабоды з'яўляюцца вышэйшай каштоўнасцю. Прызнанне, захаванне і абарона правоў і свабод чалавека і грамадзяніна – абавязак дзяржавы" (арт. 2). Пры гэтым палітыка Расійскай дзяржавы "накіравана на стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць годнае жыццё і свабоднае развіццё чалавека" (арт. 7).

У Канстытуцыі Рэспублікі Арменія, прынята 5 ліпеня 1995 года (арт. 4), абвешчана: "Дзяржава забяспечвае абарону правоў і свабод чалавека на аснове Канстытуцыі і законаў у адпаведнасці з прынцыпамі і нормамі міжнароднага права". У арт. 31 дадзена фармулёўка ўмоў жыцця: «Кожны грамадзянін для сябе і сваёй сям'і мае права на здавальняючы ўзровень жыцця, у тым ліку на жыллё, а таксама на паляпшэнне ўмоў жыцця». Дзяржава прадпрымае неабходныя меры для ажыццяўлення гэтага права.

Аб тым, што ў рэспубліцы будуецца сацыяльна арыентаванае грамадства, у якім клопатам і ўвагай акружаны людзі старэйшага пакалення, мацярынства і дзяцінства, моладзь, грамадства, якое забяспечвае высокую якасць і перадавыя сацыяльныя стандарты жыцця ўсіх пластоў насельніцтва краіны абвясціў у пасланні народу Казахстана яе Прэзідэнт Н. Назарбаеў [13, с. 12]. У Канстытуцыі Рэспублікі Казахстан (прынята 30 жніўня 1995 г. усенародным рэферэндумам) абвяшчаецца, што для дзяржавы "вышэйшымі каштоўнасцямі з'яўляюцца чалавек, яго жыццё, правы і свабоды" (арт. 1).

Звяртае на сябе ўвагу, што ў дакументах апошніх гадоў у постсавецкіх рэспубліках і ў многіх былых сацыялістычных краінах дэкларацыі аб будаўніцтве сацыяльнай дзяржавы, прынцыпы сацыяльнасці дзяржаў, строга кажучы, разумеюцца па-рознаму. Хутчэй за ўсё тут гаворка ідзе пра ўзмацненне ролі дзяржавы ў прыярытэтным напрамку свайго развіцця, аб сваім асноўным прызначэнні (толькі аб прызначэнні!) ісці па шляху будаўніцтва сацыяльнай дзяржавы з улікам сваёй спецыфікі. Таму было б больш правільным называць

Рэпазіторый ВДУ

дзяржавы, якія заяўляюць аб агульнанацыянальных прыярытэтах у галіне адукацыі, культуры, аховы здароўя, вырашэння жыллёвага пытання, пенсійнага забеспячэння, іншых сегментах сацыяльнай палітыкі і абароны насельніцтва, але не рэалізуюць цалкам асобныя параметры, адносіць да сацыяльна развіваючых.

Намер праводзіць паступовыя пераўтварэнні з мэтай фарміравання дзяржаў сацыяльнага тыпу заявілі (у фундаментальных дакументах) сотні краін свету. Узровень даходаў асобы ў падобных дзяржавах, стварэнне спрыяльных умоў для ўсебаковага развіцця грамадзян становяцца прэрагатывай дзяржавы і знаходзяцца пад яго пастаянным кантролем. Аднак, знаходзячыся на раннім этапе свайго развіцця, забяспечыць якасць сацыяльных патрэб свайму насельніцтву на ўзроўні развітых краін яны не могуць. Зразумела, што такія дзяржавы знаходзяцца яшчэ на стадыі не ў поўнай меры завершанага выразу сацыяльных.

У дзяржавах, якія адносяць сябе да сацыяльных па факце, унутраная палітыка накіравана на стварэнне ўмоў, забяспечваючых годнае жыццё і свабоднае развіццё чалавека. Пад годным жыццём чалавека разумеецца яго матэрыяльная забяспечанасць на ўзроўні стандартаў сучаснага развіцця грамадства, доступ да каштоўнасцей культуры, гарантаванасць правоў асабістай бяспекі, а пад свабодным развіццём чалавека – яго фізічнае, разумовае і духоўнае самаўдасканаленне. На рубяжы трэцяга тысячагоддзя назваць сябе сацыяльнымі па факце могуць не многія краіны. Да аптымальнаму тыпу арганізацыі грамадскага ладу ў вызначэнні сацыяльных дзяржаў, дзе дзяржава забяспечвае ўзровень жыцця, годны чалавека, на гэты час наблізіліся толькі каля двух дзясяткаў дзяржаў. Гэты тып дзяржаўнага ўладкавання дазваляе забяспечыць раўнамернае размеркаванне матэрыяльных і духоўных даброт аў, выраўніць з дапамогай сацыяльных стандартаў стартавыя магчымасці грамадзян, стварыць для іх годнае чалавека сацыяльна-культурны асяродак пражывання.

Гаворачы аб сацыяльнай дзяржаве, варта мець на ўвазе, што ёй уласцівыя ўсе традыцыйныя функцыі, абумоўленыя прыродай дзяржавы як такой, у той жа час на сацыяльную дзяржаву накладаецца абавязак яго сацыяльнай грунтоўнасці.

Навукоўцы засяроджваюць увагу на тым, што эфектыўна функцыянаваць дзяржава, якая мае сацыяльную арыентацыю, можа толькі ў прававым і дэмакратычным полі. Сапраўды сацыяльная дзяржава магчыма толькі ва ўмовах дэмакратыі, склаўшайся грамадзянскай супольнасці і развітога права ў сучасным значэнні гэтай характарыстыкі. Гэта значыць сапраўды сацыяльнымі магчыма называць дзяржавы, дзе не парушаюцца іншыя асноўныя прынцыпы, дзе чалавек мае магчымасць рэалізаваць сваё неад’емнае права і свабоды. Дзяржава, дзе дапускаюцца парушэнні правоў і свабод чалавека, не можа адносіцца да сацыяльных па факце. Прававая дзяржава павінна быць сацыяльнай, а сацыяльная дзяржава не можа не быць прававой. Прававая дзяржава – асобая арганізацыя публічнай палітычнай улады, заснаванай на праве і законе, рэалізуемая пераважна ў прававых нормах і прамежках, абмежаваных правам (законам). Найбольш эфектыўна функцыяніруючая дзяржава, маючая сацыяльную накіраванасць, гэта прававая дзяржава, пабудаваная на дэмакратычных прынцыпах. Сёння ў найбольшай ступені сацыяльная арыентацыя дзяржаў і практычна высокі ўзровень жыцця і сацыяльнай

Рэпазіторый ВДУ

абароненасці прысутныя ў асноўным у еўрапейскіх краінах – Германіі, Францыі і Скандынаўскіх краін, а таксама Ізраіля і Канады. Для гэтых дзяржаў характэрны такія істотныя прыкметы, як забеспячэнне стабільнага сацыяльна-эканамічнага становішча грамадзян; наяўнасць сацыяльных выплат і сацыяльнага размеркавання; індывідуальная свабода, салідарызм, справядлівасць, дэмакратыя, сацыяльны клопат і сацыяльная згода. Дзяржавы такога тыпу вылучаюць і рэалізуюць задачы па абароне кожнага чалавека ад беднасці, гарантуюць яму максімальна годнае існаванне.

Сацыяльнымі прызнаюць сябе і тыя дзяржавы, дзе грамадскі лад заснаваны на марксісцкай ідэалогіі. Яркім прыкладам такой дзяржавы можа быць Кітайская Народная Рэспубліка. Тут у адносна кароткія тэрміны створана планава-рыначная эфектыўная гаспадарчая сістэма. Эканамічны ўздым у гэтай буйнай і ў нядаўнім мінулым адсталай краіне мае велізарнае значэнне. Хуткі эканамічны рост у гэтай краіне ўспрымаецца сёння як цяперашні кітайскі "цуд". Вялізныя змены, па вартасці названыя гістарычнымі, як унутры краіны, так і за яе межамі звязаны з праваДзімай новай палітыкай "рэформаў і адкрытасці". На самай справе ніякага "кітайскага цуду", як сцвярджаюць спецыялісты, не адбылося. Эканамічны рост у Кітаі, пазітыўныя дасягненні створаны з дапамогай уласных гіганцкіх намаганняў.

Пакуль у КНР забеспячэнне сацыяльных патрэб насельніцтва ажыццяўляецца слабей, у больш абмежаваных маштабах, чым у сацыяльных дзяржавах, якія функцыянуюць са свабоднай рыначнай эканомікай з больш ранняга перыяду. Аднак тое, што тут за кароткі, па гістарычных мерках, час асноўная частка насельніцтва дасягнула сярэдняга ўзроўню заможнасці, паказвае на правільнасць прынятага і рэалізуемага ў гэтай дзяржаве курса. Тэндэнцыя ў развіцці сацыяльнай сферы ў КНР дае магчымасць называць краіну сацыяльнай па прызначэнню.

Беларусь таксама абрала сабе, як мэту свайго развіцця, гэтую ж парадыгму. Ідэя сацыяльнай дзяржавы з яе арыентацыяй на развіццё чалавека, стварэнне яму вартых умоў жыцця была пакладзена ў аснову прынятых у рэспубліцы дакументаў. Іх увасабленне з часу пераходу краіны ад сацыялістычнага дзяржаўнага ладу да рыначнай гаспадаркі ажыццяўляецца больш за 20 гадоў.

Падрабязна аб ходзе будаўніцтва сацыяльнай дзяржавы ў Беларусі гаворка пойдзе ў наступных раздзелах. Зараз, абагульняючы змест навуковых публікацый замежных і айчынных аўтараў па дадзенай тэматыцы, аналізуючы статыстычныя паказчыкі эканамічнага стану, узроўню і якасці жыцця беларускага насельніцтва, улічваючы грамадскую думку, можна зрабіць наступныя высновы: выбар дзяржаўнага ўладкавання з намерам будаўніцтва сацыяльнай дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь мае сваё тлумачэнне. Для паэтапнага ўвасаблення парадыгмы сацыяльна арыентаванай дзяржавы ў Беларусі ў пачатку 90-х гг. XX ст. меліся эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя перадумовы: па-першае, улічваўся гістарычна сфарміраваны менталітэт грамадзян краіны і запатрабаваны імі звыклы грамадскі парадак, у тым ліку савецкае сацыяльна-эканамічнае ўладкаванне. Савецкая дзяржава не толькі пастаянна дэкларавала тэзіс аб сацыяльнай абароне чалавека, але з сярэдзіны

60-х гг. досыць паспяхова выконвала перад грамадзянамі сацыяльныя абавязкі; па-другое, арыенцірам для Беларусі быў вопыт многіх еўрапейскіх краін, у тым ліку Англіі, Германіі, Іспаніі, Францыі, Швецыі, якія ўступілі ў пасляваенныя гады на шлях стварэння сацыяльных дзяржаў з сацыяльна рыначнай гаспадаркай (ці “дзяржаў усеагульнага росквіту”) і дабіліся дзякуючы гэтаму высокіх жыццёвых стандартаў і тэхніка-эканамічнага прагрэсу; па-трэцяе, рашэнне аб будаўніцтве сацыяльнай дзяржавы выклікана неабходнасцю інтэграцыі нашай краіны ў сусветнагаспадарчыя, сацыяльныя і гуманітарныя сувязі. Ва ўмовах пашырэння глабалізацыі рэспубліка павінна была арыентавацца на стандарты ўзроўню і якасці жыцця, якія закладзены ў канвенцыях і рэкамендацыях МАП, Еўрапейскай сацыяльнай хартыі, Еўрапейскім кодэксе сацыяльнага забеспячэння, Дэкларацыі правоў чалавека і іншых міжнародных дакументах.

Стваральнікі канцэпцыі пераходу да рыначных адносінаў, а таксама і тыя, хто прапанаваў ідэю беларускай мадэлі эканамічнага развіцця, уяўлялі, што ў выніку карэнных пераўтварэнняў у будучым часе (перыяд не вызначаны) у рэспубліцы ўмацуецца прагрэсіўная сацыяльная палітыка, якая дасць магчымасць кожнаму члену грамадства рэалізаваць яго важнейшыя правы і, перш за ўсё, права на ўзровень якасці жыцця, неабходны для развіцця асобы.

**Літаратура**


1. Конституцыя государств Европейского союза. – М., 1997. – С. 1871.
2. Основы социального государства: учебник для вузов / под общ. ред. д-ра эконом. наук, проф. Н.Н. Гриценко, д-ра эконом. наук, проф. А.А. Шулуса. – М.: Изд. дом АТиСО, 2009. – 440 с.
3. Энциклопедический словарь Ф.А. Брокгауз и И.А. Ефрон / под ред. К.К. Арсеньева, В.Т. Шевякова. Репринт. изд. 1907 г. – Ярославль: Изд-во “Терра” 1994. – Т. 2/ Д. – 960 с.
4. Сборник фабричных законов и постановлений, актуальных к сентябрю 1908 г. / сост. М.С. Балабанов. – СПб., 1909.
5. Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969). – Минск: Беларусь, 1974.
6. Мандрик, И.В. Профсоюзное движение Беларуси: история и современность / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2004. – № 1. – С. 4–11.
7. Миронов, Б.Н. О достоверности метрических ведомостей – важнейшего источника по исторической демографии России XVIII – начала XX века / Б.Н. Миронов // Россия в XIX–XX веках. – СПб., 1998.
8. Безопасность труда и жизни. –2004. – 25февр.
9. Савецкая Беларусія. – 1975. – 13 апр.
10. Мандрик, И.В. Генезис и развитие профсоюзного движения. От конфронтации к социальному партнерству / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2015. – № 4. – С. 4–11.
11. Народное хозяйство СССР за 70 лет. – М., 1993. – С. 523.
12. Покровский, В.А. Социальное государство в конституциях СНГ / В.А. Покровский // 10 лет СНГ: опыт, проблемы, перспективы. – М., 2001.
13. Мукашев, С. Заботиться о завтрашнем дне профсоюзов / С. Мукашев // Профсоюзы. – 2006. – № 4.


Репозиторий ВГУ

# Г Л А В А 4
# Беларусь на першапачатковым этапе пераходу да рынку (1991–1995 гг.)

Выпрацоўка беларускай эканамічнай мадэлі развіцця, заснаванай на рынічных метадах вядзення гаспадаркі, пачалася з лета 1990 года. У кастрычніку 1990 года урад БССР прыняў пастанову і зацвердзіў праграму "Аб пераходзе БССР да рыначнай эканомікі". Прадугледжвалася пачаць пераход да рынку з 1 лістапада 1990 года [1, с. 533]. Савет Міністраў рэспублікі прыступіў да яе распрацоўкі. У аснову беларускай праграмы была пакладзена новая эканамічная дактрына, падрыхтаваная ў Маскве пад кіраўніцтвам акадэміка С.С. Шаталіна, Г. Яўлінскага [2]. У працы над канцэпцыяй праграмы прымалі ўдзел прадстаўнікі 13 рэспублік, у тым ліку ад БССР – доктар эканамічных навук Л.П. Козік (да 2014 г. абіраўся старшынёй ФПБ).

Аўтары дактрыны прапанавалі стварэнне асноў рыначнай эканомікі ў краіне на працягу 1,5–2 гадоў. За гэты час вызначалася стабілізаваць эканоміку, правесці раздзяржаўленне, прыватызацыю, дэманапалізацыю ўласнасці на сродкі вытворчасці, развіваць прадпрымальніцтва, стварыць сістэму дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, рыначную інфраструктуру і механізмы яе дзейнасці. Праграма прадугледжвала сацыяльную абарону насельніцтва: увядзенне мінімальнай аплаты працы, індэксацыю даходаў, дапамогу па беспрацоўі, па перакваліфікацыі працоўных, дапамогу маламаёмасным і шматдзетным сем'ям, пенсійнае забеспячэнне. Галоўнай мэтай прапанаванай аўтарамі рэформы і прынцыпаў новай эканамічнай сістэмы для рэспублік СССР з'яўлялася эканамічная свабода грамадзян і стварэнне на гэтай аснове эфектыўнай гаспадарчай сістэмы, здольнай забяспечыць дынамічнае развіццё народнай гаспадаркі і годны ўзровень дабрабыту грамадзянам краіны, з пераадоленнем адставання ад іншых краін [2, с. 25]. Складальнікі праграмы меркавалі, што на працягу 500 дзён можна стварыць асновы рыначнай эканомікі, здольнай да самаразвіцця. У той жа час яны папярэджвалі аб небяспецы дэзінтэграцыі, якая склалася ў СССР эканамічнай сістэмы [2, с. 37]. Праграма арыентавала кіраўніцтва рэспублік на цесную каардынацыю дзеянняў і "на неабходнасць ўзгодненых дзеянняў, што дазволіла б спыніць працэс распаду міжрэспубліканскіх гаспадарчых сувязяў і не дапусціць зніжэнне дабрабыту народаў, якія ўваходзяць у эканамічны саюз" [2, с. 25]. Рыначны механізм разглядаўся на гэтым этапе як адзіны, які дазваляе злучыць розныя дзяржавы і іх эканамічныя сістэмы. Пераход да рынку дазваляў, на погляд аўтараў, стварыць аснову для добраахвотнага аб'яднання суверэнных рэспублік у рамках абноўленага Саюза. Пасля праграма і канцэпцыя па розных аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах крытыкаваліся. Эканамісты і палітыкі выказаліся аб недасканаласці праграмы, але ў той жа час яна атрымала прызнанне і падтрымку ў навуковай супольнасці і шырокай грамадскасці Расіі і Беларусі. Па сканчэнні больш за 25 гадоў (апублікавана ў жніўні 1990 года) з часу распрацоўкі і



Репозиторий ВГУ

прыняцця Канцэпцыі і Праграмы пераходу да рынку неабходна адзначыць годнасць гэтага дакумента ў тых умовах і патрыятызм яго стваральнікаў. Гісторыя, як вядома, не мае ўмоўнага ладу: адказу, якіх вынікаў пры яе ажыццяўленні можна было дасягнуць, сёння няма. Несумненна адно: яе ўвасабленне адкрывала дарогу развіццю больш цывілізаваных (у параўнанні з тым, што адбылося) рыначных адносін. У дадзеным дакуменце праектавалася правядзенне рэформы на ўсёй тэрыторыі СССР пры захаванні цеснага эканамічнага саюза рэспублік. Пераход да рыначных механізмаў гаспадарання прадугледжваў значную для народа мэту – фарміраванне сацыяльна арыентаванай эканомікі і зварот ўсіх рэсурсаў краіны на карысць народа [2, с. 99]. Аднак тагачасны кіраўнік ўрада Ягор Гайдар аддаў перавагу прапанове старшыні Дзяржкаммаёмасці Расійскай Федэрацыі Анатоля Чубайса. Разам яны лічылі, што іх варыянт з'яўляецца больш "правільна рыначным". Было жаданне правесці рэфармаванне ўласнасці хутчэй, чым за 500 дзён. Ідэйную базу пад такую прыватызацыю, якая прывяла да калапсу эканомікі, падвялі неалібералы, амерыканскія спецыялісты, якія былі прыцягнутыя для працы ва ўрадзе Расійскай Федэрацыі (з амерыканскіх эканамістаў у 1992 г. загадам старшыні Дзяржкаммаёмасці РФ Чубайса быў створаны аддзел тэхнічнай дапамогі і экспертызы). Рэалізацыя праграмы Гайдара-Чубайса прывяла да практычна бясплатнай раздачы дзяржаўнай уласнасці. Эканамісты і палітолагі Расіі (А.Д. Някіпелаў, В. Сіроткіна, С.У. Сцяпашын, Р.С. Грынберг, С.Г. Кара-Мурза, С.А. Батчыкаў, С.Ю. Глазьеў, Г. Яўлінскі, Е.Г. Ясін, А.І. Шкаратан і інш.) і сёння называюць такую прыватызацыю катастрафічным вынікам эканамічнай рэформы [3, с. 306–307; 4, с. 96; 5, с. 6; 6, с. 8; 7, с. 22]. Гэта было прызнана і лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па эканоміцы Дж. Стыгліц. У 2004 годзе, калі ўжо ярка выявіліся ўсе бакі постсавецкага развіцця, ён у сваіх выступленнях адзначаў, што прынятая расійскім кіраўніцтвам за аснову базавая эканамічная мадэль, распрацаваная міжнароднымі фінансавымі інстытутамі, мела "ў сабе вельмі глыбокія недахопы" [7].

Аляксандр Салжаніцын ахарактарызаваў расійскіх рэфарматараў як ідыётаў, якіх у свеце яшчэ не было [8, с. 22]. Ён піша: "...з велізарнай хуткасцю раздалі без уліку кошту нашы блаславёныя нетры: нафту, каляровыя металы, дыяменты, вугаль, вытворчасць. Абрабавалі Расію да ніткі" [8, с. 2]. Пачатая ўвосень 1992 года масавая прыватызацыя прывяла да таго, што ўжо да пачатку 1995 года ў Расіі больш за 70% дзяржаўных прадпрыемстваў былі перададзены прыватным уладальнікам, а да 1997 году прыватны сектар ужо складаў 95,6% усіх прадпрыемстваў [9, с. 177]. Велізарная колькасць іх апынуліся стратнымі з-за неэфектыўнага кіравання [10, с. 20]. Расія стала чэмпіёнам свету па хуткасці правядзення прыватызацыі. На працягу 1993–1999 гадоў прыватызавана больш за 133,2 тысячы розных прадпрыемстваў. Сярод іх знаходзіліся камбінаты – гіганты чорнай і каляровай металургіі, найбуйнейшыя прадпрыемствы машынабудавання, нафтавай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці, марскія і рачныя параходствы, частка ўласнасці "Газпрама" і РАТ "ЕЭС". За прададзеныя прадпрыемствы дзяржава атрымала сімвалічную суму. Ад прыватызацыі на душу насельніцтва ў Расіі было атрымана 54,6 долара, у той час як у Аўстраліі – 2560,3 дalaраў. У Венгрыі, якая адносна Расіі была менш індустрыяльнай, – 1252,8 долара [11, с. 10].

Стартавы ўзровень пераходу да рынку ў БССР быў больш пазітыўным, чым у Расійскай Федэрацыі і многіх іншых савецкіх рэспубліках. Пачынаючы пераход да рыначных прынцыпаў гаспадарання, рэспубліка мела для гэтага больш трывалую аснову, выпрацаваную ў савецкі перыяд, у тым ліку і ў час "перабудовы". З 1985 па 1990 год у працэсе эканамічнай рэформы тут прыкметнай з'явай стаў адыход ад старой каманднa-адміністратыўнай сістэмы. Назіраўся плаўны пераход да радыкальнай эканамічнай рэформы. Кіраўніцтва рэспублікі было максімальна арыентавана на прымяненне прынятага закона «Аб дзяржаўным прадпрыемстве», пастаноў аб карэннай перабудове кіравання эканомікай. На дадзеным этапе ў БССР пашыралася самастойнасць прадпрыемстваў і аб'яднанняў (яны перайшлі на поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне), павысілася роля працоўных калектываў, развівалася самакіраванне, укараняліся прагрэсіўныя формы арганізацыі працы. На аснове прынятага новага прыкладнага статута калгаса істотна пашырыліся правы агульных калгасных сходаў і саміх калгаснікаў ва ўпраўленні калектывамі. З гэтага часу вытворчая і грамадская дзейнасць у калгасе магла праходзіць толькі з улікам калектыўнага ўхвалення членаў калгаса на агульных сходах.

Галоўным дасягненнем эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1980-х гадоў у прамысловасці рэспублікі стала пераарыентацыя з вытворчасці сродкаў вытворчасці на выпуск тавараў народнага спажывання. Упершыню тавары народнага спажывання па аб'ёму сваёй вытворчасці сталі выпускацца апераджальнымі тэмпамі. Адбылося супадзенне сацыялістычных прынцыпаў і мэт з атрыбутамі сацыяльнай дзяржавы. У Беларусі ў гэты час, у параўнанні з іншымі рэспублікамі СССР, больш паспяхова развівалася эканоміка, вызначаліся зрухі ў пераадоленні негатыўных наступстваў папярэдніх, як іх называлі, "застойных" гадоў. Недарма вядучыя эканамісты адзначалі нашу рэспубліку гэтага часу як "палігон" для буйнамаштабных эканамічных эксперыментаў. Нават у апошняй XII савецкай пяцігодцы (1986–1990 гг.), калі ў СССР у цэлым нацыянальны даход меў нулявое значэнне, у БССР яго сярэднегадавы рост склаў больш за 3% [12, с. 272]. Па сутнасці на гэтым этапе зышліся, супалі два аб'ектыўныя, адносна незалежныя, але маючыя адзіную аснову грамадскіх працэсаў развіццё сацыяльных функцый дзяржавы, абумоўленае развіццём прадукцыйных сіл і зменамі ролі асобы на вытворчасці і ў грамадстве. Станоўчым (што з распадам СССР стане адмоўным) з'яўляўся профіль беларускай эканомікі. Гэта буйныя машынабудаўнічыя і станкабудаўнічыя прадпрыемствы, заводы па перапрацоўцы нафты. Многія прадпрыемствы мелі заказ абароннага ведамства. Такая структура прамысловасці падчас здабыцця незалежнасці мела свае недахопы: спрыяла паглыбленню крызісу.

З 1990 года ў рэспубліцы ішоў пошук мадэлі развіцця грамадства, якая ў найбольшай ступені змагла б задаволіць краіну на дадзеным і наступных этапах развіцця. Урадавая праграма пераходу да рынку мела альтэрнатыву. Прадставілі свае "Асноўныя прынцыпы канцэпцыі пераходу БССР на рыначную эканоміку" дэпутаты Вярхоўнага Савета рэспублікі ад апазіцыі – Беларускага Народнага Фронту. Вядучым элементам функцыянавання рынку ў іх праграме называлася высокая доля прыватнай уласнасці, у тым ліку і на зямлю. Дзяржаўны сектар згодна з праграмай БНФ у рыначных умовах не павінен быў перавышаць



Рэпазіторый ВГУ

30–40%. У праграме БНФ прапаноўвалася стварыць Балтыйска-Чарнаморскую Садружнасць (асацыяцыю) з адзінай эканамічнай прасторай, куды б увайшлі Эстонія, Літва, Латвія, Беларусь, Украіна, Малдова [12, с. 277–278].

Большасць дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР выказаліся за прыняцце праграмы, распрацаванай Саветам Міністраў БССР. Ва ўрадавай праграме пераход да рыначнай эканомікі ў рэспубліцы планавалася ажыццявіць за два гады. Прапанавалася стабілізаваць эканоміку, а ў далейшым прайсці шлях пératварэння канцэптуальнай (тэарэтычнай) мадэлі ў практычную (рэальную) мадэль, заснаваную на нарматывах сацыяльнай дзяржавы з сацыяльнай рыначнай эканомікай [13, с. 535]. Рэалізацыя праграмы рыначных адносін у БССР, як і планавалася, пачалася з 1 лістапада 1990 года. Меркавалася стварыць новую эканамічную сістэму, здольную забяспечыць дынамічнае развіццё народнай гаспадаркі і дасягнуць узроўню жыцця, як у развітых краінах.

У складанай палітычнай і эканамічнай сітуацыі, у абвясціўшай аб сваім суверэнітэце рэспубліцы (27 ліпеня 1990 г. прынята Дэкларацыя аб суверэнітэце БССР), зроблены карэнны паварот ад сацыялістычных дырэктыўна-планавых метадаў гаспадарання да рыначных. У пачатку фарміравання новай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця ў асобных палітыкаў і часткі насельніцтва рэспублікі ўзяла верх наіўна-утапічная вера ў магчымасць хуткай трансфармацыі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці ў напрамку да заходняй ліберальнай мадэлі грамадскага развіцця і стварэння ліберальна-дэмакратычнага грамадства заходняга тыпу. Пачаўся адыход, а затым і дэмантаж савецкай планава-адміністрацыйнай сістэмы кіравання. Удзел дзяржавы ў кіраванні эканомікай і сацыяльнай сферай у гэты час быў мінімізаваны. Кіраўніцтва краіны спадзявалася, што рэалізацыя намечаных у праграме пераходу да рынку рубяжоў дазволіць у самы кароткі час спыніць спад вытворчасці, а да 1993 годзе – дамагчыся яго росту.

Для ажыццяўлення праграмы пераходу да рынку спатрэбілася стварэнне ў рэспубліцы неабходнага мінімуму асноўных рыначных інстытутаў, нарматыўна-прававых дакументаў. Іх распрацоўка вялася ў спешцы: 11 снежня 1990 года прыняты закон “Аб уласнасці”, 14 снежня 1990 года – закон “Аб нацыянальным банку”, “Аб прадпрыемстве” і “Аб арэндзе”. У законах пазначаны прававыя рамкі для розных відаў дзейнасці і ўвядзенне ў прававыя адносіны паняццяў прыватнай і камунальнай уласнасці. У дадатак да праграмы аб пераходзе да рынку ў 1991 г. была зацверджана “Дзяржаўная праграма па стабілізацыі эканомікі і сацыяльнай абароны насельніцтва”. На іх аснове ў 1991–1994 гадах адбываліся рэфармаванне адносін уласнасці, лібералізацыя гаспадарчых сувязей. Узніклі таварныя і фондавыя біржы, з’явіліся тысячы прыватных фірмаў, крамачак і кіёскаў [12, с. 280]. Трансфармацыя эканамічнай сістэмы рэспублікі ў бок рыначных адносінаў выяўлялася ў перадачы ў арэнду дробных прадпрыемстваў у сферы гандлю, грамадскага харчавання, камунальных паслуг, бытавога абслугоўвання, у стварэнні асацыяцый, сумесных прадпрыемстваў, акцыянерных таварыстваў. Ужо ў пачатку 1992 года суб’ектамі недзяржаўных формаў уласнасці ў рэспубліцы з’яўляліся каля 5,5 тыс. кааператываў, амаль 2 тыс. малых прадпрыемстваў, больш за 200 сумесных прадпрыемстваў, 75 асацыяцый, 15 акцыянерных таварыстваў, 5 канцэрнаў, 25 камерцыйных банкаў [14, с. 596]. Насельніцтву была прадастаўлена магчымасць выкупляць ва ўласнасць кватэры, набываць акцыі, аблігацыі і г.д.

Репозиторий ВГУ

У аграрным сектары эканомікі таксама былі зроблены пэўныя крокі па станаўленню рынавачных адносін. На аснове Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі і закона “Аб праве ўласнасці на зямлю” праводзілася перарэгістрацыя калгасаў і саўгасаў, прадугледжвалася стварыць на іх базе высокапрыбытковыя прадпрыемствы капіталістычнага тыпу. Асобныя былі пераутвораныя ў кааператыўныя і акцыянерныя прадпрыемствы і атрымалі новыя назвы. Пачала стварацца прыватная ўласнасць у форме фермерскіх гаспадарак. У сярэдзіне 1993 года іх налічвалася 2658. Фермерскія гаспадаркі мелі ў сярэднім па рэспубліцы каля 20 га зямлі, што стрымлівала развіццё таварнай вытворчасці ў вёсцы. Ураджайнасць збожжавых і бульбы ў фермераў была ніжэй, чым у калгасах і саўгасах. Многія фермерскія гаспадаркі аказаліся нерэнтабельнымі [15, с. 410–411]. З-за адсутнасці дзяржаўнай падтрымкі і матэрыяльных рэсурсаў (а часта з-за маральнай і фізічнай непадрыхтаванасці да вельмі цяжкай працы людзей) паўсталі пытанні са збытам прадукцыі, колькасны рост фермерскіх гаспадарак запаволіўся, а некаторыя спынілі сваю дзейнасць.

Складанасці на гэтым этапе абвастраліся разрывам гаспадарчых сувязей паміж рэгіёнамі, якія склаліся ў папярэднія гады. Стварэнне эканамічнага саюза суверэнных рэспублік з самага пачатку суправаджалася вострымі канфліктамі. Эфектыўнай каардынацыі дзеянняў усіх рэспублік (з улікам наяўных спецыфічных умоў па правядзенні радыкальнай эканамічнай рэформы, заснаванай на стварэнні рыначнай эканомікі) не адбылося. Сталі відавочна праяўляцца элементы дэмантажу механізму цэнтралізаванага планавання і кіравання. Пераход да рынку ажыццяўляўся неймаверна цяжка, супярэчліва, грамадства хварэла недахопам комплекснасці [15, с. 405]. Як і пісаў вядомы эканаміст Л. Эрхард, замена планавай эканомікі свабоднай рыначнай гаспадаркай адбываецца вельмі складана, спатрэбіцца пэўны пераход, каб даць прастору свабоднаму рынку [16, с. 45]. Структура прамысловасці ў рэспубліцы, якая сфарміравалася ў савецкі час, з набыццём незалежнасці толькі паглыбляла крызісныя з’явы. З 1991 года ў краіне пачаўся спад вытворчасці, за ім наступіў эканамічны крызіс. Сведчанне гэтаму – несуцяшальныя вынікі пераходу да рынку для народнагаспадарчага комплексу ў адной з абласцей рэспублікі. У Віцебскай вобласці выпуск прамысловай прадукцыі першага «рыначнай» 1991 года ў супастаўных цэнах адносна 1990 года зменшыўся на 3,5%. 49 вытворчых прадпрыемстваў (27,4% да аб’ёму колькасці) недадалі прадукцыі на 872,8 млн руб. Значна менш выпушчана станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем, машын і абсталявання для жывёлагадоўлі і кормавытворчасці, аўтамабільнага бензіну, дызельнага паліва, нафтабітуму, валокнаў і нітак хімічных, піламатэрыялаў, драўнянавалакністых пліт, вапнавай і даламітавай мукі, паперы і інш. вырабаў. Вытворчасць тавараў народнага спажывання харчовай групы знізілася ў цэлым на 8,2%, масла – на 13%, мяса – на 16%. Знізіўся выпуск прадукцыі і нехарчовых тавараў: тэлевізараў на 4%, радыёпрыёмнікаў на 11%, тканін – на 14%, панчошна-шкарпэткавых вырабаў – на 11%, дываноў і дывановых вырабаў – на 31%. На 12% скараціліся перавозкі грузаў транспартам агульнага прызначэння [17, с. 2]. Значна менш атрымана ў гэты год збожжа (на 27%), вытворчасць мяса скарацілася на 14%. Насельніцтва недаатрымала розных вырабаў на велізарную для таго часу суму ў 423,4 млн рублёў, з-за чаго на спажывецкім



Рэпазіторый ВГУ

рынку меўся востры дэфіцыт. Агульная нестабільнасць і чаканае павышэнне коштаў у сувязі з абвешчанай іх лібералізацыяй выклікалі ажыятажны попыт на ўсе віды прадуктаў харчавання і тавараў для побыту.

Адзначаўся хуткі рост цэн на тавары і паслугі. У снежні 1991 года ў параўнанні з тым жа месяцам папярэдняга года на тавары народнага спажывання цэны выраслі ў 2 з лішнім разы, у тым ліку на прадукты харчавання – у 2,6 разы, на хлеб, хлебабулачныя і кандытарскія вырабы – амаль у 3 разы, на рыбу – у 5 разоў. На традыцыйна беларускі сельскагаспадарчы прадукт – бульбу – больш чым у 5 разоў! На нехарчовыя тавары – у 2,2 разы [18, с. 3].

У 1992 годзе становішча ў эканоміцы вобласці не палепшылася. З-за рэзкага павышэння цэн на энергарэсурсы (на адну тону нафты, напрыклад, цана ўзрасла амаль у 800 разоў) вобласць апынулася ў катастрафічным стане. У прамысловасці спад вытворчасці склаў 10,6%, а ў хімічнай – 50%. Аптовыя цэны прадпрыемстваў у параўнанні з папярэднім годам павялічыліся ў 30,6 разы. Цэны на тавары народнага спажывання і платныя паслугі насельніцтву ўзраслі ў 13 разоў. У службу занятасці звярнуліся 24,5 тысячы чалавек. Найбольшае напружанне назіралася ў сувязі з нестабільным забеспячэннем насельніцтва харчаваннем. Аб'ёмы паставак мяса і птушкі за кошт дзяржаўных рэсурсаў скараціліся на працягу года на 23%, малочных прадуктаў на – 8%, маргарынавай прадукцыі – на 37%, гародніны, цытрусавых – у 2 разы, садавіны – у 3 разы, продаж рыбы – на 36%.

Не адбывалася значных змен у эканоміцы вобласці і ў наступныя 1993–1995 гады. Разрыў эканамічных сувязяў пасля распаду СССР, істотны спад ва ўсіх галінах вытворчасці і інфляцыя, пралікі папярэдняга этапу перабудовы прывялі народную гаспадарку вобласці да глыбокага эканамічнага крызісу.

Прыкладна такая ж сітуацыя назіралася ў іншых абласцях краіны (у асобных яна было яшчэ больш складанай). Разбурэнне эканамічнага адзінства рэспублік, якое склалася раней, рост цэн на нафту і прыродны газ, якія пастаўляліся з Расіі, прывялі да таго, што у параўнанні з савецкім перыядам беларускія прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы рэзка знізілі эфектыўнасць сваёй працы. Знізіліся асноўныя эканамічныя паказчыкі рэспублікі ў цэлым: валавы ўнутраны прадукт скараціўся на 38%; прадукцыя прамысловасці за 1991–1995 гады – на 41%, прадукцыя сельскай гаспадаркі – на 27%, аб'ём капітальных укладанняў – на 60%. Удзельная вага стратных прадпрыемстваў узрасла (за гэты час) амаль на 20% [19, с. 166]. Асабліва рэзка і прыкметна паскорылася падзенне вытворчасці на прадпрыемствах зборачнага і канчатковага цыклаў, у навукаёмістых і працаёмкіх галінах. Да 1995 года ў станкабудаванні, машынабудаванні, трактарабудаванні падзенне вытворчасці склала, да 2/3. Інтэнсіўна зніжалася вытворчасць іншых відаў прамысловай прадукцыі і прадукцыі, прызначанай для задавальнення асабістых інтарэсаў насельніцтва. Спад прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці негатыўна адбіўся на працы транспартнага канвеера. Аб'ёмы перавозак грузаў у 1995 годзе (у параўнанні з 1990 г.) усімі відамі транспарту зменшыліся з 1127,5 млн. тонаў да 398,3 млн тонаў. Вядучы від транспарту рэспублікі – чыгуначны, які працаваў да гэтага часу ў напружаным і бесперабойным рытме, знізіў перавозкі грузаў на 74,4 млн тонаў, або больш чым на 38%.

У сельскай гаспадарцы таксама назіраўся спад вытворчасці – з 1990 па 1995 год істотна скарацілася колькасць занятых у калгасах і саўгасах

Репозиторий ВГУ

(з 602 тыс. чал. да 499 тыс. чал. у калгасах; з 313 тыс. да 182 тыс. чал. – у саўгасах). Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі знізілася больш чым у два разы. Вытворчасць мяса ў 1995 годзе склала 380,3 тыс. тон супраць 889,1 тыс. тон ў 1990 г. Вялізныя страты назіраліся ў вытворчасці алею, цукру і іншых прадуктаў [15, с. 318–319, 330–335]. Спад у вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі, свабоднае цэнаўтварэнне парушылі сістэму сацыяльнай падтрымкі і гарантый для насельніцтва. Рэзка знізіўся ранейшы (прымальны) савецкі жыццёвы ўзровень насельніцтва. Да 1994 года заработная плата ў краіне вырасла не больш чым у 2 разы, а рознічныя цэны на тавары народнага спажывання і платныя паслугі насельніцтва павялічыліся прыкладна ў 10–15 разоў (!) [15, с. 416]. Гэта азначала, што беларусы сталі жыць у 5–10 разоў горш, чым раней. Нарасталі іншыя сацыяльныя праблемы. Беларуская дзяржава ад пераходу да рыначных адносінаў не стала больш сацыяльнай, чым яна была да 1990 года. Колькасць людзей, чые даходы складалі 60% і ніжэй мінімальнага спажывецкага бюджэту, у 1995 г. дасягнула 63% насельніцтва краіны. Цяжкай стратай для насельніцтва стала абясцэньванне грашовых зберажэнняў.

Стала зразумела, што пераход у Рэспубліцы Беларусь да рыначнай эканомікі і сацыяльна арыентаванай палітыкі стаў новай невядомай справай. У сусветным гістарычным развіцці яшчэ не было практыкі пераходу ад сацыялістычнага тыпу гаспадарання да рыначнага. Асабліва складана адбываўся гэты працэс у 1991–1994 гадах, калі ствараліся асноўныя рыначнай структуры, нормы прававых дакументаў, сістэма татальнага дзяржаўнага кіраўніцтва эканомікай ператваралася ў ліберальную мадэль, якая ў поўнай ступені абапіраецца на рынкавыя механізмы.

Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця гэтага перыяду паказалі, што спадзяванні на рэкамендацыі Міжнароднага валютнага фонду па ўвядзенню рынку і пераўтварэнні на яго аснове эканамічных і сацыяльных адносін у краіне сябе не апраўдалі. На гэтым этапе Рэспубліка Беларусь як сацыяльна арыентаваная дзяржава слаба выконвала свае функцыі. Хоць вынікі першых гадоў у Беларусі былі не такімі драматычнымі, чым у Расіі (імгненнай абвальнай прыватызацыі ў краіне не назіралася, доля дзяржаўнай уласнасці заставалася даволі высокай), аднак яе эканоміка апынулася ў глыбокім крызісе: адбылося рэзкае падзенне вытворчасці, рост інфляцыі, зніжэнне прыбытку і, адпаведна, падатковых паступленняў, што істотна адбілася на некаторых складніках ўзроўню жыцця насельніцтва. Пацярпела эканамічна актыўнае насельніцтва, занятае ў рэальным сектары, назіраўся вялікі разрыў у даходах насельніцтва. Большасці насельніцтва ўжо стала недаступным набыццё такіх неабходных тавараў, як халадзільнікі, тэлевізары, мэбля і інш. Значная колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі аказалася беспрацоўным. Пераход да рыначных адносін у Беларусі на этапе 1991–1996 гадоў не даў беларусам нічога, акрамя істотных страт.

У той жа час неабходна адзначыць, што нягледзячы на цяжкія для насельніцтва абставіны, якія склаліся ў перыяд палітычнага і эканамічнага пералому, пераход да новага ўкладу ў рэспубліцы праходзіў (у параўнанні з дзяржавамі постсавецкай прасторы Кіргістанам, Грузіяй, Малдовай і інш.) з меншым сацыяльным напружаннем. Становішча ў краіне заставалася дастаткова стабільным. Насельніцтва знаходзілася ў стане чакання, да змен рэвалюцыйнага



Рэпазіторый ВДУ

характару не імкнулася. У гэтым бачыцца заслуга народа Беларусі, характару і менталітэту якога спрадвечна ўласцівы высокая духоўнасць, прафесіяналізм, справядлівасць, велікадушнасць і цярпенне. Да негатыўных з'яў гэтага перыяду беларусы праявілі вытрымку, як і пасля Вялікай Айчыннай вайны (параўнанне будзе да месца) палічылі сваё цяжкае становішча часовым, чакалі змен, верылі, што змен да лепшага яны змогуць дасягнуць самі, сваёй працай праз паступовы эвалюцыйны шлях эканамічных пераўтварэнняў. Што і адбылося на наступным этапе – 1996–2008 гг.. Паскоранае развіццё эканомікі на аснове навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу дазволіла беларускай дзяржаве ў гэтым перыядзе (што разгледжана ў наступнай главе) дастаткова адчувальна сарыентавацца на выкананні сацыяльных функцый.

**Літаратура**


1. Сборник законов БССР. – 1990. – № 29. – С. 533.
2. Переход к рынку. Концепция и программа. – М.: Архангельское, 1990. – С. 238.
3. Некипелов, А.Д. Очерки по экономике посткоммунизма / А.Д. Некипелов. – М., 1996. – С. 306–307.
4. Сироткин, В. Анатолий Чубайс: великий инквизитор / В. Сироткин. – М., 2006.
5. Степашин, С. Унесенные ветром / С. Степашин // Поиск. – 2006. – 10 нояб. – С. 6.
6. Гринберг, Р.С. Россия: экономический успех без развития и демократии / Р.С. Гринберг // Россия и современный мир. – 2006. – № 1. – С. 8.
7. Стиглиц, Дж. Интервью российским СМИ [Электронный ресурс] / Дж. Стиглиц. – 2004. – Режим доступа: http//www/rusref/nm/ru|stvis/htm. – Дата доступа: 21.05.2005.
8. Солженицын, А. Россия в отвале / А. Солженицын. – М., 1998. – С. 22.
9. Солженицын, А. Московский комсомолец / А. Солженицын. – 2004. – С. 2.
10. Куда идет Россия. Белая книга реформ / сост.: С.Г. Кара-Мурза, С.А. Батчиков, С.Ю. Глазьев. – М., 2008.
11. Явлинский, Г. Периферийный капитализм. Лекция об экономической системе России на рубеже XX–XXI вв. / Г. Явлинский. – М., 2003.
12. Шкаратан, О.И. Становление постсоветского неоэтакратизма / О.И. Шкаратан // Общественные науки и современность. – 2009. – № 1.
13. Эканамічная гісторыя Беларусі: курс лекцый / В.І. Галубовіч [і інш.] / пад рэд. В.І. Галубовіча. – Мінск, 1993.
14. Зборнік законаў БССР. – 1990. – № 29.
15. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск: Современная школа, 2011. – Т. 6.
16. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапаможнік: у 2 ч. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.М. Забродскі [і інш.] / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – Ч. 2: Люты 1917–2000 г.
17. Эрхард, Л. Полвека размышлений: Речи и статьи / Л. Эрхард. – М., 1996.
18. Вытворчасць: скочванне ўніз: да вынікаў работы народна-гаспадарчага комплексу Віцебшчыны за 1991 год // Віцебскі рабочы. – 1992. – 29 лют. – С. 2.
19. Гандаль, паслугі: цэны вар'яцеюць: да вынікаў работы народна-гаспадарчага комплексу Віцебшчыны за 1991 год // Віцебскі рабочы. – 1992. – 3 сак.
20. Труд и занятость в Республике Беларусь. – Минск, 2002.


Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 5
# Станаўленне беларускай сацыяльна арыентаванай эканамічнай мадэлі

Як стала відавочна, арыентацыя кіраўніцтва Беларусі пры пераходзе да рынку згодна праграме “Аб пераходзе БССР да рыначнай эканомікі”, прапанаванай урадам Кебіча, па аб’ектыўных і суб’ектых прычынах пазітыўных вынікаў не прынесла. Беларуская дзяржава слаба спраўлялася з выкананнем сацыяльных функцый. Давер народа да кіраўніцтва рэспублікі быў падарваны. Улетку 1994 года ў выбаршчыкаў ужо зацвердзілася меркаванне аб некампетэнтнасці дзяржаўных дзеячаў мінулага перыяду. Сама гісторыя пацвярджае, што для такой высновы ў народа былі падставы. Эканоміка апынулася ў глыбокім крызісе, падзенне вытворчасці, гіперінфляцыя істотна адбіліся на ўзроўні жыцця насельніцтва. Мандат на кіраўніцтва краінай у гэты складаны час быў перададзены іншым палітыкам.

З выбраннем А.Р. Лукашэнкі першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь пачаўся новы этап у правядзенні рэформаў. З гэтага часу дзяржава стала займаць актыўную ролю ў сацыяльна-эканамічных працэсах. Ужо ў першых выступленнях кіраўнік дзяржавы назваў у ліку галоўных напрамкаў сваёй працы дасягненне кансалідацыі і ўмацавання дзяржавы, барацьбу з беднасцю і забеспячэнне ўстойлівага росту дабрабыту народа.

30 верасня 1994 года ў краіне распрацавана і зацверджана Праграма неадкладных мер па выхаду рэспублікі з крызісу. У Праграме па-новаму пастаўлен цэлы шэраг пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця, улічана як уласная, так і расійская негатыўная практыка першых гадоў ліберальных рэформаў. Вызначана, што ў аснову развіцця рэспублікі закладзена сацыяльна арыентаваная мадэль рыначнай эканомікі. Сацыяльная частка праграмы прадугледжвала змяншэнне інфляцыі, недапушчэнне далейшага спаду жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

Курс на пабудову дзяржавы сацыяльнага тыпу выразна прапісаны ў Асноўным законе беларускага грамадства. Згодга з артыкулам 2 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са зменамі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 1996 г.) “чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з’яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы”. Дзяржава адказная перад грамадзянамі “за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы”, а ў арт. 21 удакладняецца: “Забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з’яўляецца вышэйшай мэтай дзяржавы”. У арт. 60 прадэклараваны абавязак дзяржаўных органаў, службовых і іншых асоб, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый, прымаць неабходныя меры для ажыццяўлення і абароны правоў і свабоды асобы [1, с. 3].

Меры, скіраваныя на стварэнне сацыяльна арыентаванай эканомікі, забеспячэнне палітычнай стабільнасці і згоды ў грамадстве з усёй відавочнасцю



Рэпазіторый ВДУ

былі канкрэтызаваны ў Асноўных напрамках сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гады.

Пры будаўніцтве сацыяльнай дзяржавы ў кіраўніцтва і грамадзян Беларусі, іншай альтэрнатывы не было. Будаваць дзяржаву з чыста капіталістычнай эканомікай, якая рэгулюецца стыхіяй рынку ў Беларусі, было немагчыма па шэрагу прычын:

– па-першае, спадчына, якая засталася ад сацыялістычнай дзяржавы, эканоміка, сфарміраваная напрацягу дзясяткаў гадоў як адзіны народнагаспадарчы комплекс на прынцыпу спецыялізацыі і кааперацыі ў маштабах Саюза ССР. У такой сістэме ўсе прадпрыемствы практычна былі манапалістамі, не здольнымі да дзеянняў у канкурэнтным асяроддзі;

– па-другое, працоўныя калектывы, якія мелі шматгадовы вопыт функцыянавання ва ўмовах пашырэння дэмакратычных асноў і развіцця самакіравання, не прынялі б чыста капіталістычную мадэль як эканамічную аснову дзяржавы, "выштурхваючую" грамадскія формы кіравання з прадпрыемстваў і ўстаноў;

– па-трэцяе, у рэспубліцы не было спецыялістаў, здольных арганізаваць сацыяльную рыначную гаспадарку на базе капіталістычнай.

У той жа час як кіраўніцтву рэспублікі, так і насельніцтву было зразумела, што па многіх прычынах вяртанне да ранейшага сацыялістычнага строю стала таксама немагчымым: за 1991–1994 гады дзяржава страціла манаполію на вылучэнне і абаснаванне агульнанацыянальных каштоўнасцей, дэмантаваны механізм планавання, перабудаваны фінансавы механізм, сістэма цэнаўтварэння, банкаўская сістэма, адбылася змена формаў уласнасці на сродкі вытворчасці ў шэрагу галін прамысловасці, транспарту, у сферы паслуг, аграпрамысловым комплексе. Улічваючы гэтыя і іншыя фактары, кіраўніцтва краіны прапанавала сімбіёзны шлях развіцця: захаванне камандных вышынь за адміністраваннем і ўключэннем некаторых элементаў канкурэнцыі ў якасці дадатковых кампанентаў эканамічнага механізму. Пачала складвацца ўласная Беларуская мадэль эканамічнага развіцця. Адрозненне дадзенай мадэлі ад папярэдняй, як было растлумачана насельніцтву, было ў тым, што пры яе стварэнні ўлічаны міжнародны вопыт і разуменне таго, што пераход да новай сацыяльна-эканамічнай сістэмы з'яўляецца крутым гістарычным паваротам і навязваць рыначныя адносіны без неабходнай для гэтага перабудовы ніжэйшых, базісных звёнаў эканамічнай мадэлі небяспечна. Выбар такой мадэлі меў сваё месца яшчэ і таму, што развіццё рэспублікі пасля атрымання незалежнасці не магло ажыццяўляцца без уліку набытага раней ўсяго комплексу палітычных, эканамічных, культурных і ідэалагічных фактараў, а таксама менталітэта гістарычна ўласцівага беларускаму народу. Пры гэтым улічваўся шматгадовы вопыт сацыяльна-эканамічнага ўладкавання ў нашай краіне, адаптаванасць беларускага грамадства і грамадзян да сацыялістычнай сістэмы, пры якой сацыяльная абарона насельніцтва на этапе 60–80-х гг. знаходзілася на добрым узроўню.

З улікам усіх названых фактараў з сярэдзіны 90-х гг. наступіў час рэзкага ўзрастання ролі дзяржавы ў вырашэнні пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. У рэспубліцы ў рамках Канстытуцыі ў цэнтры і на месцах была

Рэпазіторый ВДУ

створана скразная вертыкальная структура выканаўчых і распарадчых арганізацый. З двух асноўных мадэляў рыначнай эканомікі, вядомых у сусветнай практыцы (ліберальнай і сацыяльнай арыентацыі), у Беларусі стала рэалізоўвацца мадэль сацыяльнай арыентацыі патэрналісцкага тыпу, якая грунтуецца на свабодным суіснаванні розных формаў уласнасці, моцнай і эфектыўнай сацыяльнай функцыі дзяржавы. Дзяржава паставіла пад свой кантроль рэгуляванне прапарцыянальнага развіцця дзяржаўных і недзяржаўных формаў уласнасці, узаемаадносіны паміж гэтымі ўкладамі, падтрымку структурных прапорцый, якія забяспечваюць эканамічную стабільнасць, цэнаўтварэнне і выкарыстанне працоўных рэсурсаў, а таксама, што з'яўляецца самым галоўным, сацыяльна-эканамічную палітыку ў галіне аплаты працы і даходаў насельніцтва. Абрана мадэль рыначнай эканомікі, пры якой складваецца грамадства сацыяльнай справядлівасці, дапускаецца плюралізм форм уласнасці пры большай ступені ўдзелу дзяржавы ў эфектыўнасці эканомікі, рэгуляванні даходаў і занятасці насельніцтва, задавальняецца ў першую чаргу кола найбольш значных сацыяльных патрэб.

Кіраўніцтва краіны заявіла аб усталяванні ў рэспубліцы сацыяльнай справядлівасці праз такія рычагі, як рэгуляванне аплаты працы, пераразмеркаванне фінансавых сродкаў у форме рознай дапамогі, датацый, планавання і выпуск вострa дэфіцытных спажывецкіх тавараў і г.д. Падобны падыход з'яўляецца апраўданым для любой краіны, дзе ў аснову дзяржаўнай палітыкі пакладзены сацыяльныя прынцыпы. Рэспубліка стала ў адзін рад з дзяржавамі, дзе праводзіцца прагрэсіўная сацыяльная палітыка, якая адпавядае інтарэсам чалавека [2, с. 166].

З гэтага часу стратэгія развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь вызначалася (з улікам зменлівых у краіне ўмоў) у Праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, іншых дзяржаўных дакументах істотна дапаўняючых сутнасць канцэпцыі сацыяльнай накіраванасці ў развіцці грамадства. Выразная сацыяльная арыентацыя, якая адпавядала інтарэсам усіх сацыяльных груп сучаснага беларускага грамадства, стала важнейшым складальнікам ўсіх прынятых за гэты час указаў і пастаноў. Зыходнымі складнікамі, якія ўлічаны ў беларускай мадэлі, былі, перш за ўсё, асцярожны, прагматычны падыход да рэфармавання эканомікі. Сутнасцю дадзенага падыходу з'ўлялася стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць высокі ўзровень сацыяльнай абароненасці, высокая якасць і перадавыя сацыяльныя стандарты жыцця ўсіх слаёў насельніцтва з дапамогай захавання назапашанай папярэднімі пакаленнямі багатай спадчыны: матэрыяльнай базы, высокаразвітай інфраструктуры і высокакваліфікаванага складу рабочых.

У краіне ажыццяўляўся свядомы падыход да перадачы дзяржмаёмасці ў прыватную ўласнасць, што дазволіла захаваць значную частку адзіных маёмасных комплексаў у дзяржаўнай уласнасці і выкарыстоўваць іх у інтарэсах усяго беларускага народа, а не ў інтарэсах асобных суб'ектаў. Прыватызацыя стала праводзіцца пры непасрэдным удзеле і пад кантролем Прэзідэнта краіны А. Лукашэнкі. Вызначальным стала рашэнне будаваць айчынную мадэль на сінтэзе лепшага, што было назапашана грамадствам розных цывілізацый. Пастаўлена задача: фарміраваць беларускае грамадства як грамадства сацыяльнай

Рэпазіторый ВДУ

справядлівасці, праводзіць эканамічныя пераўтварэнні паступова, пакінуць абарону насельніцтва, якая склалася ў савецкі час па ўсім спектры паслуг. Прыпынены дэмантаж буйнай калгасна-саўгаснай вытворчасці, вядучыя прамысловыя прадпрыемствы засталіся ў дзяржаўнай уласнасці. Стаўка ў развіцці прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці зроблена на ўласныя сілы.

З 1995 года эканоміка Рэспублікі Беларусь увайшла ў стабільны перыяд з наступным штогадовым ростам [3, с. 99]. Захаваў тэмпы росту савецкага часу і нафтаперапрацоўчы комплекс. З 1996 года быў спынены працэс сацыяльнага расслаення насельніцтва. У рэспубліцы захоўвалася сістэма сацыяльнай абароны, намечаны меры па недапушчэнні рэзкай палярызацыі ў даходах людзей. У планах сацыяльна-эканамічнага развіцця закладзены досыць высокія выдаткі на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і працаўладкаванне насельніцтва, вялася сістэмная дзяржаўная палітыка па стварэнні працоўных месцаў. Рэгістрацыйнае беспрацоўе ў Рэспубліцы Беларусь у 2011 годзе знаходзілася ў межах менш за 1% – пры сацыяльна прымальным сусветным узроўні ў 3% эканамічна актыўнага насельніцтва.

Кіраўніцтва краіны ўлічвала гістарычны вопыт функцыянавання заходніх мадэляў грамадскага развіцця. Гэты вопыт падказваў, што на першым этапе пераходу да адкрытай і свабоднай рыначнай эканомікі трэба адмовіцца ад планава-размеркавальнай эканомікі з яе дырэктыўным і ўсеабдымным планаваннем, пакінуўшы пры гэтым індыкатыўное, кропкавае планаванне, якое дазваляе праводзіць трансфармацыю грамадскай уласнасці сістэмна (пры высокай долі дзяржаўнасці), падтрымліваць прыбытковыя прадпрыемствы і нізкі ўзровень беспрацоўя. Ад капіталістычнага грамадства на гэтым этапе быў прыняты феномен прыватнай ініцыятывы, дзейнічаючыя ў ім рынкавыя механізмы прапановы і попыту.

Беларусы прынялі гэтую мадэль як найбольш аптымальную і блізкую іх гістарычнаму досведу, і менталітэту. Яна была прывабная на дадзеным этапе тым, што да гэтага часу ў свядомасці людзей глыбока ўмацавалася думка пра пераважную роль дзяржавы ў іх жыцці. Калі сыходзіць з таго, што прыватызацыя агульнанароднай уласнасці на сродкі вытворчасці – асноўны элемент пераходу ад адной сацыяльна-эканамічнай фармацыі да іншай, а яе ажыццяўленне – складаны і працяглы працэс, то сёння варта прызнаць: такі падыход на той час быў верным. Навукоўцы і палітыкі прызнаюць, што права дзяржаўнай уласнасці ў адрозненне ад права прыватнай уласнасці пераважна ўлічвае грамадскія, а не прыватныя інтарэсы. Такі падыход сугучны вопыту некаторых постсацыялістычных краін. Напрыклад, эканамісты знаходзяць дастаткова прадуманым рашэнне, згодна якога праводзілася прыватызацыя ў Кітаі, і да гэтага яшчэ ў сацыялістычнай Польшчы. Як падкрэсліваў былы прэм'ер-міністр фінансаў Польшчы, прафесар Г. Калодка, у Польшчы прыватызацыя пачалася значна раней, чым у Расіі і Беларусі. Пры гэтым паспешнасці пры прыватызацыі дзяржпрадпрыемстваў тут не было і няма. Прыватызацыі папярэднічала **камерцыяналізацыя** (вылучана аўтарам. – *І.М.*), а раздзяржаўленне ўласнасці пачыналі з дробных прадпрыемстваў пасля стабілізацыі цэн. Прыватызацыя сярэдніх па памеры прадпрыемстваў была праведзена значна пазней (толькі праз 5–6 гадоў пасля Расіі), а продаж у

прыватныя рукі буйных прадпрыемстваў праводзіўся абдумана і з карысцю для грамадства, “многія буйныя горадаўтваральныя прадпрыемствы і сёння знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы. І не таму, што яны і так працавалі рэнтабельна, а таму, што па меркаваннях геэканамічнай бяспекі яны не павінны знаходзіцца ў прыватных руках” [4, с. 199]. Па сведчанні таго ж прафесара Г. Калодка, да гэтага часу 20% ВУП Польшчы прыпадае на дзяржаўны сектар, у якім занята 28% працуючых [5, с. 73].

У Рэспубліцы Беларусь праз рэалізуемую з 1995 года эканамічную і сацыяльную палітыку дзяржава імкнулася стымуляваць эканамічны рост, абараніць людзей ад галечы і беднасці, гарантаваць кожнаму чалавеку мінімальнае існаванне, забяспечыць людзям большую роўнасць з дапамогай сцірання адрозненняў ва ўзроўнях дабрабыту, забяспечыць абарону перад непрадбачанымі жыццёвымі сітуацыямі (рызыкамі). Адносна наяўнага становішча такі падыход дэманстраваў на гэтым этапе сваю жывучасць. Ён актывізаваў вытворчую дзейнасць. Да 2000 года крызісны стан у сацыяльнай сферы быў пераадолены, сацыяльнае становішча насельніцтва рэспублікі нармалізавалася, у працоўных адноўлена вера ў дзяржаву, у яе магчымасці стварыць умовы, якія забяспечваюць годнае жыццё, ахову працы і здароўя людзей.

Беларуская дзяржава імкнулася забяспечваць усталяваны гарантаваны мінімальны памер аплаты працы, ажыццяўляла падтрымку сям’і, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, інвалідаў і пажылых грамадзян, развіццё сістэмы сацыяльных службаў. У інтарэсах захавання сацыяльнай стабільнасці паміж дзяржавай, працадаўцамі (наймальнікамі) і прафсаюзамі склалася супрацоўніцтва, вядомае як сістэма сацыяльнага партнёрства. Тут пастаянна індэксаваліся дзяржаўныя пенсіі, дапамогі і іншыя гарантыі сацыяльнай абароны. Але паколькі жыццёвыя стандарты, памеры выдаткаў на сацыяльныя мэты наўпрост залежаць ад эканамічных вынікаў, сацыяльныя патрэбы грамадзян рэспублікі забяспечваліся не ў поўнай меры.

Сусветная практыка падсказвала, што ажыццяўленне ідэі дасягнення стандартаў свабоды і дабрабыту насельніцтва, наяўных у перадавых краінах са свабоднай эканомікай, – складаны і працяглы працэс. На падставе аналізу фарміравання і развіцця дзяржаў з рознымі грамадскімі сістэмамі магчыма зрабіць выснову, што фарміраванне сацыяльнай дзяржавы ў рыначных умовах – гэта не аднамомантавае ператварэнне аднаго тыпу ў іншы і гэта не застылы тып дзяржавы. Сацыяльная дзяржава пастаянна развіваецца і трансфармуецца ў той жа меры, у якой развіваюцца і трансфармуюцца супольнасці і эканоміка. Станаўленне і развіццё сацыяльных дзяржаў у такіх краінах, як Швецыя, Швейцарыя, Германія, Фінляндыя, Ізраіль і інш., якія дабіліся значных вынікаў на шляху будаўніцтва прававой дэмакратычнай сацыяльнай дзяржавы, заснаванай на сацыяльна арыентаванай рыначнай гаспадарцы, якія сёння аднесены да сацыяльных па факце, адбывалася на працягу доўгага часу, як правіла, праз тры этапы. На першым (пачатковым) этапе на працягу 50–60 гадоў ішло стварэнне канцэпцыі і прававой асновы, выпрацоўваліся вядучыя напрамкі эканамічнай і сацыяльнай палітыкі, ішла падрыхтоўка кадравага складу, фарміраліся інстытуты рыначнай структуры на ўсіх узроўнях улады.



Репозиторий ВГУ

Другі этап (пераходны) займаў у сярэднім ад 15 да 20 гадоў. У гэты час адбывалася ўдасканаленне ўсіх складнікаў рыначнага механізму ў дзяржаве. І толькі пасля гэтага наступаў трэці этап, калі ажыццяўляліся прагрэсіўныя сацыяльныя рэформы ў інтарэсах шырокіх слаёў насельніцтва, паступова надыходзіла стабільнае функцыянаванне эканамічнай і палітычнай сістэмы, якая магла забяспечыць высокія стандарты ў жыццядзейнасці чалавека.

Працягласць перыядаў у розных краінах была неаднолькавай, яна залежыла ад прычын як унутранага, так і міжнароднага характару, ад умення кіраўнікоў краіны правесці сістэмную эканамічную трансфармацыю. Так, у КНР, як прызнана экспертамі, выпрацоўка і ўкараненне сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі ад 1979 да 2008 года пазначана чатырмя этапамі. На першым этапе сацыяльна-эканамічнага абнаўлення краіны (1979–1984 гг.) улады забяспечылі нармалізацыю становішча ва ўсіх галінах грамадскага жыцця пасля разбуральнай "культурнай рэвалюцыі". Пачатак рэформам паклаў трэці Пленум ЦК КПК у снежні 1979 года. Па афіцыйных дадзеных у канцы 1970-х гадоў у Кітаі галадала 250 млн сялян (амаль чвэрць насельніцтва), не меншы іх лік вымушаны быў весці напаўгалоднае існаванне. У краіне пачынаўся стыхійны сялянскі рух. Выступоўцы патрабавалі адказу ад ураўняльнага размеркавання працы ў межах "камун" і пераходу да ўраўняльнага размеркавання зямельных угоддзяў. Улады не адразу пагадзіліся на задавальненне сялянскіх дамаганняў. І толькі пераканаўшыся ў станоўчых выніках сялянскай ініцыятывы, у 1984 годзе КПК абвясціла аб роспуску камун, сялянам прадастаўлена права гаспадарання на падрадных зямельных участках. Зямля па-за гарадамі аб'яўлена ўласнасцю "калектыву сельскіх жыхароў", а падворны падрад – часткай сацыялістычнай эканомікі.

Другі этап эканамічнай рэформы ў Кітаі прыходзіўся на 1984–1992 гг. у адрозненне ад Расіі і краін Усходняй Еўропы рэцэпты неакласікаў у Кітаі ўспрымаліся дастаткова крытычна. Быў выбран шлях, вызначаемы максімай "пераходзячы раку, нашчупвай дно". На партыйным форуме ў 1984 годзе абвешчана аб стварэнні ў краіне планава-рыначнай сістэмы гаспадаркі пад дэвізам "План – галоўнае, рынак – дапаможны". Сталі шырока выкарыстоўвацца падрадныя формы гаспадарчых сувязей паміж прадпрыемствамі і іншымі структурамі рэальнага сектара эканомікі. Дробныя і сярэднія прадпрыемствы дазволена здаваць у арэнду, перадаваць ва ўласнасць працоўнага калектыву, на ўмовах падраду прыватным асобам. Пашыраны правы дзяржаўных прадпрыемстваў. Яны маюць права пасля выканання плана выпускаць звышпланавую прадукцыю і самастойна рэалізоўваць яе на рынку. Вядома, увядзенне новых адносін у эканамічнае жыццё не абышлося без негатыўных з'яў. Адначасова з уздымам сельскагаспадарчай вытворчасці, стварэннем новых галін прамысловасці ў краіне распаўсюджваліся спекулятыўныя і незаконныя аперацыі, што адбілася на хуткім росце цэн. У выніку ў 1989 годзе тут мелі месца ўспышкі хваляванняў насельніцтва.

Трэці этап кітайскай эканамічнай рэформы ахоплівае 1992–2002 гг. На гэтым этапе пачалося вывучэнне перакладзеных на кітайскую мову прац лаўрэата Нобелеўскай прэміі па эканоміцы Д. Норта аб інстытуцыянальнай эвалюцыі грамадства. Амерыканскі вучоны Дуглас Норт ў пачатку 1990 года



Рэпазіторый ВДУ

надрукаваў серыю прац па пытаннях тэорыі арганізацыі. Ён лічыць, што рынак – гэта складаная і неаднародная з'ява, ахопліваючая розныя інстытуты. Фундаментальнае пытанне яго працы: чаму асобныя краіны багатыя, а іншыя – бедныя. На гэты конт аўтар робіць наступную выснову: у багатых краінах "інстытуты ствараюць базавыя структуры, з дапамогай якіх людзі на працягу ўсёй гісторыі дабіліся парадку і такім чынам знізілі ступень сваёй няўпэўненасці. Выкарыстоўваючы тэхніку, яны вызначаюць кошт аперацый і пераўтварэнняў і, такім чынам, рэнтабельнасць і абаснаванасць эканамічнай актыўнасці" [6, с. 49 ]. Натуральна, што бедныя краіны такіх кіраўніцкіх інстытутаў, якія ўлічваюць нацыянальныя асаблівасці, стварыць не змаглі.

Думкі навукоўца прывялі кіраўнікоў Кітая да высновы аб недапушчальнасці механічнага пераносу на сваю глебу замежных эканамічных мадэлей, і аб неабходнасці выбару "асобага шляху". Асаблівую цікавасць у кітайцаў выклікалі думкі Норта наконт гістарычнага вопыту: "Выбар, зроблены людзьмі ў мінулым, вызначае той выбар, які яны могуць зрабіць зараз". У 1992 годзе ў Кітаі адмовіліся ад "планава-таварнай" эканомікі на карысць будаўніцтва "сацыялістычнай рыначнай эканомікі" і рэалізацыі стратэгіі яе экспартнай арыентацыі. На XIV з'ездзе КПК было сказана: "Мы ствараем сістэму сацыялістычнай рыначнай эканомікі менавіта для таго, каб рынак выконваў базісную роль у размяшчэнні рэсурсаў пры ажыццяўленні сацыялістычнай дзяржавай макрарэгулявання і макракантролю, каб магчыма было правесці гаспадарчую дзейнасць у дакладнасць з патрабаваннем закона кошту, прыстасаваць яго да змен суадносін запыту і прапаноў" [7, с. 2].

Пасля з'езда ў Кітаі былі створаны цэлыя раёны па вытворчасці прадукцыі на экспарт, дзе канцэнтруюцца прамыя замежныя інвестыцыі і пераважная частка нацыянальных капіталаўкладанняў. У краіне складвалася сістэма прадпрыемстваў, якія належаць дзяржаве і недзяржаўным уласнікам. Адбылося станаўленне прыватнага прадпрымальніцтва. Для павышэння эфектыўнасці вытворчасці дзяржаўныя прадпрыемствы вызваліліся ад залішняга персаналу. У сувязі з узмацняльным міграцыйным патокам прыйшлося скласці па-новаму сістэму сацыяльнага страхавання.

Чацвёрты этап кітайскіх рэформаў датуецца спецыялістамі 2002–2008 гадамі. На дадзеным этапе Кітай прыступіў да новай стадыі індустрыялізацыі. Праведзена вялікая праца па стварэнні "сістэмы сучасных прадпрыемстваў". Яе мэта і змест вызначаліся патрэбамі пераўтварэння дзяржаўных прадпрыемстваў як ячэяк адзінай дзяржаўнай планавай гаспадаркі ў самастойныя гаспадарчыя структуры, якія знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы. У кампаніях і на буйных прадпрыемствах, дзе дзяржава адзіны або асноўны ўласнік, засноўваюцца нарады дырэктараў і іншыя органы кіравання, закліканыя прымаць самастойныя рашэнні, арганізоўваць кіраванне гаспадарчай дзейнасцю і забяспечваць кантроль за выкананнем рашэнняў, павышаць эфектыўнасць вытворчасці. Арганізуюцца конкурсы на замяшчэнне кіруючых пастоў у кампаніях і прадпрыемствах айчыннымі і замежнымі спецыялістамі. Ад старой сістэмы ў КНР засталася манаполія ў фінансава-банкаўскай сістэме, энергетыцы, вытворчасці электраэнергіі, яе размеркаванні, водазабеспячэнні, забеспячэнні газам, на транспарце і ў паштовай гаспадарцы [8, с. 109–117].

Рэпазіторый ВДУ

З прыведзенага вышэй зместа, бачна: у ходзе рэформы кітайскай эканомікі прыходзілася часам мяняць многія погляды і ўстаноўкі, удакладняць уяўленні, якія склаліся, аб працэсах, што адбываюцца ў краіне і свеце. Навукова абгрунтаваны падыход да эканамічнай рэформы прывёў да ўмацавання рыначных адносін. Эфектыўнасць мадэлі эканамічнага развіцця тут у пэўнаай ступені з'яўляецца вынікам эфектыўнага рэфармавання дзяржаўнага сектара і змены рэгуліруючай ролі дзяржавы.

У Рэспубліцы Беларусь з сярэдзіны 90-х гг. выкарыстоўваліся агульнасусветныя заканамернасці будаўніцтва сацыяльных дзяржаў ва ўмовах рыначнай эканомікі тых краін, якія адносяцца да такіх па факце, а таксама і тых, што сталі на шлях будаўніцтва такога грамадства ў блізкіх часовых рамках. У той жа час тут прыкметна прасочвалася і зараз наглядаецца ўласная спецыфіка сацыяльна-эканамічнага развіцця. З сусветнага вопыту ўзяты толькі асобныя элементы.

Будаўніцтва сацыяльнай дзяржавы тут праводзілася з улікам сацыяльнай структуры грамадства, векавых традыцый і спецыфікі дамінуючых у грамадскай свядомасці ўяўленняў аб узаемаадносінах дзяржавы і яе грамадзян.

**Літаратура**


1. Конституция Республики Беларусь от 15 марта 1994 г. (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканском референдуме от 24.11.1996, в ред. решения республиканского референдума от 17.11.2004 № 1/0) // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 05.01.1999. – № 1. – 1/0; 02.12.2004. – № 188. – 1/6032.
2. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь от 30.09.1994 № 3249-XII «О программе неотложных мер по выходу экономики Республики Беларусь из кризиса» // Советская Белоруссия. – 1994. – 2 нояб.
3. Мандрик, И.В. Социальная политика в Республике Беларусь в контексте мирового опыта / И.В. Мандрик // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2014. – № 2. – С. 95–107.
4. Колодко, Г. Глобализация и наверстывание. От экономического спада к экономическому росту в странах с переходной экономикой / Г. Колодко // Постсоциалистические страны в условиях глобализации: сб. материалов междунар. науч. конф. – М., 2001. – С. 67–71.
5. Колодко, Г. От шока к терапии / Г. Колодко // Политическая экономия постсоциалистических преобразований. – М., 2000.
6. Норт, Д. Институты, институциональные изменения и функционирование экономики / Д. Норт. – М., 1997. – 112 с.
7. Жэньминь жибао. – 1992. – 21 кастр.
8. Гельбрас, В.Г. 30 лет реформ открытости Китая / В.Г. Гельбрас // Общественные науки и современность. – 2009. – № 2.


Репозиторий ВГУ

# Г Л А В А 6
# Сацыяльная палітыка, яе сутнасць і асаблівасці

Аналізуючы публікацыі вядомых замежных і айчынных эканамістаў, гісторыкаў, сацыёлагаў і палітолагаў, якія разглядалі нацыянальныя праекты сацыяльнай палітыкі і іх асноўныя напрамкі ў даіндустрыяльным перыядзе (іх прозвішчы агучаны ў папярэдніх главах), а таксама тых, чыя ўвага засяроджана на гэтай праблематыцы сёння (F. Fukuyma, П. Бурда, Е. Гонтмахер, Н. Рамашэўская, В. Чычканаў, В.Ф. Ушакоў, Б.В. Ракіцкі, Н.А. Волгін, Т.С. Сулімава, Л. Якабсон, В.М. Шымаў, А.А. Быкаў, Л.М. Гакаў, А.У. Ванкевіч і інш.), можна адзначыць, што, нягледзячы на асобныя разыходжанні, іх аб'ядноўвае агульны падыход. Сацыяльную палітыку яны характарызуюць як дзейнасць дзяржавы, палітычных і сацыяльных інстытутаў па кіраванню сацыяльнай сферай грамадства, забеспячэнню матэрыяльных і культурных патрэб яго членаў, рэгуляванні працэсаў сацыяльнай дыферэнцыяцыі грамадства, у тым ліку даходаў эканамічна актыўнага насельніцтва і непрацаздольных грамадзян [1].

Навукоўцы даюць фармулёўку сацыяльнай палітыкі ў шырокім і вузкім разуменні. У шырокім сэнсе сацыяльная палітыка разглядаецца як сукупнасць тэарытычных палажэнняў і практычных мер, якія выпрацоўваюцца і рэалізуюцца дзяржаўнымі і недзяржаўнымі ўстановамі, арганізацыямі, накіраваных на стварэнне неабходных умоў жыццядзейнасці, задавальненне ўзрастаючых сацыяльных і духоўных патрэб насельніцтва, стварэнне ў грамадстве спрыяльнага сацыяльнага клімату.

У вузкім разуменні сацыяльная палітыка – гэта дзейнасць дзяржаўных органаў і іх службовых асоб, звязаная з вызначэннем інтарэсаў, зместу і форм дзейнасці і рэалізацыяй функцый і задач дзяржавы па стварэнню ўмоў жыццядзейнасці, фарміраванню аптымальнай сацыяльнай інфраструктуры і сацыяльнай структуры грамадства.

Сацыяльная палітыка – адзін з галоўных складнікаў унутранай палітыкі дзяржавы, яго ўладных структур, палітычных сіл, якія знаходзяцца за імі, і грамадскіх рухаў. У яе стварэнні прымаюць непасрэдны ўдзел прэзідэнт краіны, старшыня ўрада, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, рэгіёнаў, а таксама канкрэтных сацыяльных сістэм заканадаўчых і выканаўчых органаў, грамадскіх рухаў, у першую чаргу прадстаўнікі працоўных – прафсаюзы. Сацыяльная палітыка прызвана ўдасканальваць стан жыцця людзей, развіваць іх пазітыўныя якасці: працавітасць, грамадскую актыўнасць, адказнасць і мараль. І калі намечаныя меры па дасягненню сацыяльна значымых мэт у дзяржаве ўзгадняюцца з эканамічным, культурным, экалагічным і дэмаграфічным фактарамі грамадскага развіцця, тады сацыяльная палітыка прызнаецца эфектыўнай.

Спектр існуючых мадэляў сацыяльнай палітыкі ў пералічэнні аўтараў таксама не мае асаблівых разыходжанняў. У навуковым вызначэнні – гэта ліберальная, сацыял-дэмакратычная і патэрналісцкая. Меркаванне аўтараў

Репозиторий ВГУ

супадае і ў тым, што ў дзяржаве найбольш дзейсная тая мадэль сацыяльнай палітыкі, якая дазваляе кожнаму члену грамадства рэалізаваць яго найважнейшыя сацыяльна-эканамічныя правы. І перш за ўсё, права на ўзровень якасці жыцця, неабходны для нармальнага ўзнаўлення і развіцця асобы.

Статыстыка сведчыць, што сацыяльная палітыка ў краінах са свабоднай рыначнай эканомікай рэалізуецца ў адпаведнасці з нацыянальнымі праектамі пераважна праз ліберальную мадэль. Зыходзячы з дадзенай мадэлі дзяржава павінна забяспечваць правы асобы і прававую абарону гаспадарчай дзейнасці пры мінімальнай сацыяльнай падтрымцы. У гэтым варыянце аказанне сацыяльнай дапамогі і падтрымка прадугледжваюцца тым пластам насельніцтва, якія жывуць у нястачы, але асноўную масу працоўных лібэральная мадэль ставіць ва ўмовы дачынення і адказнасці за вынікі працы, што дазваляе ім самім вызначаць свой сацыяльны статус праз удзел на ўсіх узроўнях улады і кіравання ў выпрацоўцы і экспертызе сацыяльнай палітыкі. Такі кірунак робіць чалавека суб’ектам у вызначэнні свайго сацыяльнага статусу, ён пры вырашэнні прыярытэтных для сябе жыццёвых праблем і забеспячэнні свайго дабрабыту нясе асабістую адказнасць.

Галоўнай асаблівасцю сацыял-дэмакратычнай мадэлі сацыяльнай палітыкі з’яўляецца ўсеагульнасць (універсалізацыя) сацыяльнай абароны насельніцтва, як гарантаванае права ўсіх грамадзян, забяспечваемага дзяржавай. Дзяржава пры такой мадэлі забяспечвае высокі ўзровень якасці і агульнадаступнасць сацыяльных паслуг, яна рэгулюе пэўныя сектары эканомікі і абараняе слаі насельніцтва, якія маюць у гэтым найбольшую неабходнасць. Эканамічная аснова гэтай мадэлі – эфектыўная вытворчасць, поўная занятасць, моцныя аб’яднанні працадаўцаў і прафсаюзаў і дагаварныя адносіны паміж імі, якія кантралююцца дзяржавай, высокі ўзровень пераразмеркавання грамадскага прадукта.

Патэрналісцкі кірунак у сацыяльнай палітыцы характэрны больш для краін з дырэктыўна-каманднай эканомікай. У адпаведнасці з патэрналісцкай мадэллю дзяржава рэгулюе большую частку эканомікі і аказвае падтрымку ўсім пластам насельніцтва: працуючым, пенсіянерам, інвалідам, часова непрацаздольным і іншым катэгорыям, якім цяжка ці немагчыма ўпісацца ў механізм рыначных адносін. Пры патэрналісцкай мадэлі ўлады вызначаюць усе існуючыя праблемы насельніцтва, у тым ліку і прыярытэты. Сацыяльная палітыка, калі дзяржава нясе поўную адказнасць сваіх структур за ўсё, што адбываецца ў галінах сацыяльнай сферы, зніжае пачуццё адказнасці саміх грамадзян за канчатковыя вынікі, у тым ліку за стан эканомікі краіны, якое і з’яўляецца асноўным звяном пры выбары кірунку сацыяльнай палітыкі [2, с. 51].

Вывучэнне паказвае, што чыста патэрналісцкай, сацыял-дэмакратычнай або ліберальнай мадэлі, на практыцы не існуе. Кожная краіна мае ўласную мадыфікацыю сацыяльнага развіцця, якая адрозніваецца сваімі механізмамі і ўзроўнем эфектыўнасці. У Нямеччыне, Швецыі, Японіі, ЗША поспехі ў рэалізацыі сацыяльнай палітыкі, якіх яны дамагліся ў канцы ХХ стагоддзя, звязваюць больш з ліберальнай мадэллю. Правадзімая ў гэтых краінах сацыяльная палітыка мае не толькі ўласную назву (“нямецкая мадэль”, “шведская мадэль”, “японская мадэль”, “амерыканская мадэль”), але і сваю мадыфікацыю, што абумоўлена станаўленнем пэўных сістэм сацыяльна-



Рэпазіторый ВДУ

эканамічных адносін у рамках фарміравання рыначных адносін. Натуральна, што да сфарміраванай нацыянальна-ліберальнай і сацыял-дэмакратычнай мадэлі сацыяльнай палітыкі гэтыя дзяржавы ішлі паступова, па-рознаму, улічваючы свае гістарычныя і прыродна-эканамічныя асаблівасці.

Дзяржавы, пабудаваныя на ліберальнай ідэалогіі, атрымалі сваё развіццё ў рамках "адкрытага грамадства". У сярэдзіне 70-х гадоў ва ўмовах эканамічнага спаду ў краінах Захада разгарнулася шырокая крытыка дзяржаўнай сістэмы сацыяльных гарантый. На думку многіх апанентаў, экстэнсіўнае забеспячэнне насельніцтва сацыяльнымі паслугамі станавілася непасільным цяжарам для эканомікі. Менавіта таму большасць краін прыступілі да ўдасканальвання сістэмы сацыяльнай палітыкі. Адбыліся змены ў прынцыпах фінансавання і адказнасці дзяржаўных структур за сацыяльныя праблемы. У цяперашні час вышэйназваныя і падобныя ім краіны з высокаразвітай эканомікай арыентуюцца ў большай ступені на самастойнае рашэнне большасцю грамадзян сваіх сацыяльных праблем, аказваючы сацыяльную дапамогу і падтрымку неабароненым пластам насельніцтва. Сацыяльная кампанента тут першапачаткова забяспечвае рэальнае адчуванне насельніцтвам сувязі павышэння свайго дабрабыту з вынікамі эканамічных пераўтварэнняў. Для працаздольнага насельніцтва ствараюцца эканамічныя і юрыдычныя ўмовы, якія дазваляюць грамадзянам за кошт даходаў ад уласнай прадукцыйнай працы мець больш высокі ўзровень сацыяльнага спажывання, уключаючы камфортнае жыллё, лепшую якасць паслуг у сферы адукацыі і аховы здароўя, дастойны ўзровень жыцця ў сталым узросце.

У сучасную эпоху ў краінах з рыначнай эканомікай назіраецца актыўнае ўмяшальніцтва дзяржавы ў сацыяльныя адносіны. Рэгулюючы ўзаемаадносіны паміж працай і капіталам, буржуазныя (як і сацыялістычныя) дзяржавы пастаянна пашыраюць свае сацыяльныя функцыі. Гэта адбываецца пад уплывам Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), якая з 1946 год з'яўляецца спецыялізаванай установай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. МАП займае ўнікальнае месца ў правядзенні ў жыццё асноўных прынцыпаў станаўлення і развіцця дзяржаў з моцнай сацыяльнай палітыкай. У дадзенай арганізацыі задзейнічаны прадстаўнікі працадаўцаў, працоўных (іх інтарэсы тут адстойваюць прафсаюзы), а таксама ўрада. Штогод МАП праводзіць канферэнцыі з абмеркаваннем сацыяльна-працоўных праблем. Кожная краіна – член гэтай арганізацыі мае права пасляць на канферэнцыю чатырох дэлегатаў: два ад урада і па адным ад працаўнікоў і ад працадаўцаў. Прадстаўнікі працоўных маюць роўны голас з прадстаўнікамі ўрада і працадаўцаў у працэсе выпрацоўкі і прыняцця агульнай палітыкі па прафесійным навучанні персаналу, працоўным адносінах, удасканаленню метадаў кіравання, гендэрных праблемах, адукацыі рабочых і інш. Такім чынам МАП заахвочвае развіццё сацыяльнага партнёрства ўнутры дзяржаў, садзейнічае сацыяльнаму дыялогу бакоў. Асноўныя прынцыпы пабудовы і дзейнасці МАП замацаваны ў яе асноўных дакументах. Прыярытэтам тут з'яўляецца распрацоўка міжнароднай палітыкі і праграм, накіраваных на паляпшэнне ўмоў працы і жыцця працоўных, павышэнне магчымасці занятасці і падтрымку асноўных правоў чалавека. Галоўнымі мэтамі арганізацыі з'яўляюцца: абарона інтарэсаў і правоў працоўных шляхам рэгламентацыі працоўнага часу; барацьба з беспрацоўем;

Репозиторий ВГУ

устанаўленне гарантый заработнай платы і прызнанне прынцыпаў роўнай аплаты за роўную працу; абарона працоўных ад прафесійных захворванняў і няшчасных выпадкаў на вытворчасці; абарона працоўных правоў і ўмоў працы дзяцей, падлеткаў і жанчын; рэгламентацыя пытанняў сацыяльнага страхавання і сацыяльнага забеспячэння: арганізацыя прафесійнага навучання працоўных. Дзейнасць Адміністрацыйнага савета і Міжнароднага бюро МАП, прынятыя імі канвенцыі і рэкамендацыі спрыяюць кансалідацыі дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў у працэсе станаўлення сацыяльных дзяржаў.

Правядзенне дзяржаўнай сацыяльна арыентаванай палітыкі ўяўляе сабой цяжкі працэс, свайго роду палітычную эквілібрыстыку, абумоўленую неабходнасцю ўлічваць супярэчлівыя фактары, якія часам амаль выключаюць адзін аднаго. Сацыяльная дзяржава павінна пастаянна наладжваць цяжкадасягальны баланс паміж свабодай рыначнай эканомікі і неабходнасцю ўздзейнічаць на размеркавальныя працэсы з мэтай дасягнення сацыяльнай справядлівасці, згладжвання сацыяльнай няроўнасці. Краіны Захаду і ЗША знаходзілі выхад з узнікаючых цяжкасцей праз развіццё навукова-тэхнічнага прагрэсу, стварэнне спрыяльных умоў малому і сярэдняму бізнесу, заснаванаму на прынцыпах спаборніцтва, што спрыяла назапашванню сродкаў і давала магчымасць падтрымліваць сацыяльную стабільнасць у краіне [3, с. 117]. У большасці развітых краін сацыяльна арыентаваная змешаная эканоміка дазволіла забяспечыць даволі высокі ўзровень сацыяльнай абароненасці насельніцтва.

Аднак не лішнім стане напамін, што каталізатарам працэсу развіцця ідэі сацыяльнай дзяржавы і ўвасаблення яе ў жыццё на Захадзе, несумненна, было ўзнікненне і развіццё Савецкай дзяржавы, дзе ва ўсіх прынятых за гэты час канстытуцыях і іншых заканадаўчых актах, дэкларавалася сацыяльная арыентаванасць унутранай палітыкі. У пяцігадовых планах пастаянна ставілася задача забеспячэння значнага ўздыму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа. На працягу ўсіх гадоў (акрамя экстрымальнага часу 30–40-х гг., гады Вялікай Айчыннай вайны і ў першыя пасля яе аднаўленчыя) мелася структурная цэласнасць сацыяльнай палітыкі, якая ажыццяўлялася ва ўсіх асноўных сферах сацыяльных адносін. У аплаце працы і працоўных адносінах, забяспячэнні поўнай занятасці насельніцтва, пенсійным забеспячэнні, прадстаўленні адраснай дапамогі, абавязковага сацыяльнага страхавання, забеспячэння жыллём, адукацыяй і прафесійнай падрыхтоўкі, аховай здароўя і г.д.

Варта таксама адзначыць, што станаўленне сацыяльнай дзяржавы ў СССР у “чалавечым” вымярэнні было працэсам не толькі эканамічным і палітычным, але і працэсам маральным. У жыцці рэспублік Савецкага Саюза істотнае значэнне і свае спецыфічныя рысы мела духоўная сфера. У пачатак праграмы развіцця савецкага грамадства ставілася задача фарміравання ўсебаковай і гарманічна развітай асобы. Для гэтага грамадзянам, і перш за ўсё моладзі, быў адчынены шырокі доступ да сапраўдных узораў сусветнай і айчыннай культуры, мастацтва і літаратуры. Тут беражліва ставіліся да народных традыцый, каштоўнасных прынцыпаў гуманізму і маральнасці, да найвышэйшых дасягненняў сусветнай і айчыннай культуры. І хоць палітычная тэорыя і дэкларацыі сацыялізму часам знаходзіліся ў супярэчнасці з рэальнасцю, нельга адмаўляць важкіх дасягненняў у сацыяльнай палітыцы сацыялістычных дзяржаў.

Репозиторий ВГУ

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, знаходзячыся ў складзе СССР, несумненна, з'яўлялася сацыяльнай дзяржавай. Беларуская дзяржава забяспечыла даступнасць сацыяльнай падтрымкі ўсім яго членам, стварыла дзяржаўную сістэму сацыяльнай абароны, увяла бюджэтнае фінансаванне сацыяльных праграм і новыя механізмы сацыяльнай палітыкі ў выглядзе дзяржаўнага сацыяльнага страхавання насельніцтва. Па дадзеных статыстыкі, паважна выглядаў пад'ём дабрабыту насельніцтва. На працягу 50–70-х гадоў нацыянальны даход у разліку на душу насельніцтва вырас у краіне ў 5–7 разоў. Высокага ўзроўню дасягнулі ў гэтыя гады ўрбанізацыйныя працэсы. Доля гараджан мела тэндэнцыю пастаяннага росту. З адной трэці насельніцтва перад вайной і двух пятых – у пачатку 50-х гадоў – да паловы ў 1965 годзе і 63% – у 1980 годзе. Людзі, якія мелі няпоўную сярэднюю і больш высокую адукацыю, складалі большасць савецкага народа. На завяршэнні 70-х гадоў сярод асоб старэй 10-гадовага ўзросту гэта лічба знаходзілася на ўзроўні 64%, а сярод працуючых – 81% [4, с. 23 ].

Важнае месца ў развіцці эканомікі і ўсталяванні гарантый сацыяльнай абароны працоўных у савецкай грамадскай сістэме займаў прафсаюзны рух. У вырашэнні гэтых задач мэты прафсаюзаў супадалі з мэтамі савецкай дзяржавы. Прафсаюзы прынялі на сябе функцыі сацыяльнага патэрналізму, у іх абавязкі ўваходзіла прававая і тэхнічная інспекцыя працы, накладанне штрафных санкцый за парушэнне заканадаўства аб працы і ахове працы. Прафсаюзы мелі права на спыненне вытворчай дзейнасці і нават закрыццё прадпрыемстваў, якія не выконвалі нарматыўных патрабаванняў па ахове працы. У кампетэнцыі прафсаюзаў знаходзілася шырокая сетка санаторыяў, дамоў адпачынку, палацаў культуры, спартыўных і турыстычных баз, дзе мільёны працоўных маглі адпачыць і паправіць сваё здароўе [4, с. 100].

Аднак у сілу розных прычын (як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных) палітычнае кіраўніцтва рэспублікі, не змагло пазбегнуць дыктату саюзнага цэнтра, прымала захады для хуткага росту прамысловасці, пастаянна пашырала капіталаўкладанні ў галіны вытворчасці сродкаў вытворчасці, што негатыўна ўплывала на забеспячэнне насельніцтва спажывецкімі таварамі і паслугамі. У выніку не атрымоўвалася дасягнуць мэт дэклараваных у фундаментальных дакументах кіруючай партыі і дзяржаўных устаноў па развіццю сацыяльнай сферы. На жаль, па меры ўзрастання (пачынаючы з 1930-х гг.) Савецкі Саюз і іншыя краіны, якія папоўнілі пасля Другой сусветнай вайны сістэму сацыялізму, сталі адставаць у забеспячэнні дабрабыту насельніцтва ад узроўню, які прадастаўляўся ў гэты час грамадзянам у развітых краінах са свабоднай рыначнай эканомікай. Безумоўна, сацыяльная палітыка савецкай дзяржавы мела патэрналісцкі характар.

Калі гаварыць аб вызначэнні сацыяльнай палітыкі беларускай дзяржавы на этапе 1991–2015 гадоў, то з названых вышэй трох мадэлей, яе нельга ахарактарызаваць адназначна як ліберальную, сацыял-дэмакратычную ці патэрналісцкую. Але, зыходзячы з таго, што пры ліберальнай мадэлі асноўным суб'ектам з'яўляецца грамадства, прадстаўленае эканамічна актыўным насельніцтвам, а дзяржава ажыццяўляе адміністраванне рэалізацыі грамадскіх інтарэсаў, можна з упэўненасцю гаварыць аб слабым праяўленні самых важных элементаў гэтай мадэлі ў Рэспубліцы Беларусь [5, с. 63]. У гэты перыяд рэалізуемая ў Беларусі сацыяльная палітыка была блізкая да мадэлей, якія

Репозиторий ВГУ

прынята называць сацыял-дэмакратычнай і патэрналісцкай. Рэальны выбар заўсёды ішоў паміж сацыял-дэмакратычнай і патэрналісцкай мадэлямі і ўвогуле вырашаўся на карысць апошняй [6, с. 62]. Уладныя структуры прынялі ў гэты час на сябе адказнасць за ўсё, што адбывалася ў эканоміцы і галінах сацыяльнай сферы. Сацыяльная палітыка, правадзімая ў рэспубліцы, складалася з мноства накірункаў. Яна ўключала палітыку даходаў насельніцтва; палітыку ў сферы працы і працоўных адносін; палітыку сацыяльнай падтрымкі і абароны непрацаздольных і малазабяспечаных сям’яў і грамадзян; палітыку развіцця галін сацыяльнай сферы і інфраструктуры, сацыяльнай абароны асобных груп насельніцтва; палітыку ў галіне экалагіі, дэмаграфіі і міграцыйных працэсаў, а таксама сацыяльнае страхаванне, сацыяльную абарону працуючых, палітыку ў галіне заработнай платы, сацыяльныя меры на рынку працы, жыллёвую палітыку.

Распрацоўваючы і ўвасабляючы сярэднетэрміновыя і доўгатэрміновыя планы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, беларуская дзяржава не магла не ўлічваць таго, што лібэральная мадэль не карысталася падтрымкай нават у самым пачатку рэформаў, калі прысутнічалі ілюзіі аб здольнасці дзяржавы новага тыпу забяспечыць насельніцтву ўзровень даходаў развітых краін. Большасць насельніцтва па-ранейшаму разглядала дзяржаву ў якасці ўсемагутнага суб’екта і цвёрда арыентавалася на выкарыстанне яго як ключавога інстытута ў вырашэнні асноўных сацыяльна-эканамічных праблем. Улічваючы настроі ў грамадстве, дзяржава не адмовілася ад прынятай у савецкі час абароны насельніцтва па ўсім спектры паслуг, не дапускала рэзкага разрыву ў даходах насельніцтва. Па меры ўмацавання эканомікі рэспублікі складваліся ўмовы і перадумовы для мэтанакіраванай дзейнасці па рэалізацыі мэт і задач сацыяльнай дзяржавы. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускага грамадства пайшло па шляху праграмна-мэтавага рэгулявання. Дзяржава выступала асноўным суб’ектам стварэння неабходных умоў жыццядзейнасці чалавека, задавальнення сацыяльных і духоўных патрэб насельніцтва, стварэння ў грамадстве спрыяльнага сацыяльнага клімату.

У 1996–2015 гг. у сярэднетэрміновых і доўгатэрміновых праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны быў намечаны і ў працэсе развіцця ажыццёўлены цэлы шэраг важных прыярытэтных нацыянальных праектаў у сферы аховы здароўя, адукацыі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аграпрамысловым комплексе, дэмаграфічнай палітыцы. Атрымалася пераадолець крызісныя праявы; у краіне забяспечылі харчовую бяспеку, спынілі працэс сацыяльнага расслаення насельніцтва. За гэты кароткі па гістарычных мерках перыяд рэспубліка дасягнула двухразовага росту рэальнага ВУП, што дало магчымасць больш мэтанакіравана вырашаць праблемы па сацыяльнай абароне працоўных. Сацыяльная палітыка беларускай дзяржавы ў гэты час набыла ўсе асноўныя рысы патэрналісцкай мадэлі. Мадэль эканамічнага развіцця, якая арыентуецца на павышэнне ўзроўню жыцця, зніжэнне ступені сацыяльнага расслаення насельніцтва толькі за кошт дзяржаўнага рэгулявання (у большай ступені патэрналісцкага характару), не можа быць ідэальнай. Пакуль Рэспубліка Беларусь не стала тыповай рыначнай ліберальна-дэмакратычнай еўрапейскай краінай. Станаўленне рыначнай эканомікі і сацыяльна арыентаванай дзяржавы ў вывучаемы час у рэспубліцы знаходзілася яшчэ на раннім этапе. Перад палітыкамі і эканамістамі пастаянна паўставалі ўсё новыя і

Репозиторий ВГУ

новыя пытанні, на якія не заўсёды знаходзіліся адэкватныя адказы. Найбольш складанай аказалася задача захавання балансу паміж рыначнай эканомікай і ліквідацыяй яўнай сацыяльнай няроўнасці, што склалася на пачатковым этапе свайго станаўлення. У канцы 2015 года эканоміка Беларусі апынулася ў складаных умовах. На гэты час быў практычна вычарпаны запас савецкай эканомікі “ручнога” кіравання. Пакуль застаецца нявырашаным цэлы шэраг сацыяльных праблем у сацыяльна-працоўнай сферы, пенсійным забеспячэнні, адукацыі, культуры, ахове працы і экалогіі. Занадта высокая інфляцыя, якая была пасля 2009 года – паказчык не толькі знешняга ўплыву, але таксама і таго, што рашэнне сацыяльных праблем у краіне не заўсёды знаходзілася, як гэтага патрабуюць эканамічныя законы, у прамой сувязі з эфектыўнасцю вытворчасці. Рэспубліка хоць і запазычыла ў працэсе постсавецкай трансфармацыі асобныя атрыбуты прыватна-ўласніцкай эканомікі і дэмакратычнай арганізацыі грамадства, але ўладныя адносіны адміністратыўна-каманднай эканомікі з уласцівай ім наменклатурнай іерархіяй захавалі сваё дамінаванне над адносінамі ўласнасці.

Імкненне кіраўніцтва рэспублікі забяспечыць сацыяльную абарону насельніцтва (што само па сабе ўспрымалася карысным) за кошт захавання працоўных месцаў, якія не прыносілі даходу, росту зарплаты, часам без уліку магчымасцей рэальнай эканомікі, стала адной з найважнейшых і канкрэтных прычын высокай інфляцыі. У пачатку 2016 года ў краіне назіралася складаная і непрадказальна дынамічная сітуацыя, што ўказвала на непазбежнасць рэформ і ўдасканалення беларускай мадэлі эканамічнага развіцця.

Безумоўна, што ў развіцці беларускага грамадства не можа быць шаблону. Аднак выверaны перадавы айчынны і замежны гістарычны вопыт дазваляе сцвярджаць, што сацыяльная палітыка фарміруецца і рэалізуецца ў працэсе дзейнасці суб’ектаў не толькі ў асобе дзяржаўных структур, але і органаў мясцовага самакіравання, грамадскіх арганізацый, а таксама вытворчых калектываў і саміх грамадзян.

Патэнцыйныя магчымасці Рэспублікі Беларусь як сацыяльнай дзяржавы, магчыма спалучаць з традыцыйным народаўладдзем і калектывізмам, масавым энтузіязмам, у рыначнай эканоміцы – з акцыянаваннем прадпрыемстваў. Больш хуткі пераход да спелага этапу сацыяльнай дзяржавы ў Беларусі магчыма ажыццявіць праз актыўнае ўключэнне ў яго будаўніцтва як мага большай колькасці людзей. Практычнае рашэнне гэтай унікальнай задачы можа кратна павысіць здольнасць беларускай мадэлі эканамічнага развіцця да самарэгуляцыі, гнуткага і хуткага яе абнаўлення.

Каб справіцца з унутранымі прычынамі і знешнімі пагрозамі, што негатыўна ўплываюць на развіццё беларускага прамысловага і сельскагаспадарчага комплексу, сацыяльнай сферы, структуры, якім даверана кіраўніцтва дзяржавай, закліканы знайсці рычагі ўзмацнення магчымасцей абранай мадэлі да саманастройкі з улікам выклікаў сусветнай эканомікі. Патрэбна своечасовая карэкціроўка ідэалогіі існуючай мадэлі эканамічнага развіцця ў правільным кірунку, своечасовае вырашэнне супярэчнасцей, улік урокаў з недалёкага мінулага і ўсведамленне выклікаў будучага. Пытанне заключаецца ў тым, што найбольш аптымальная мадэль эканамічнага развіцця – гэта інтэнсіўная і інавацыйная эканоміка. Стварэнне эканомікі такога тыпу непарыўна звязана з

Репозиторий ВГУ

фарміраваннем у краіне становішча пошуку, бесперапынных навацый, свабоднага абмеркавання, без чаго масавая творчасць немагчыма. Маецца неабходнасць пераходу ад хуткасці да якасці развіцця. Фарміраванне сталай сацыяльнай дзяржавы, здольнай рэальна забяспечыць годны ўзровень жыцця кожнаму чалавеку, магчыма толькі праз уключэнне ў гэты працэс шматмільённых мас працоўных, фарміраванні ў іх высокай адказнасці і асабістага актыўнага і творчага ўдзелу ў вытворчай, грамадскай і палітычнай дзейнасці. Пры ўдасканаленні айчыннай мадэлі акцыянавання неабходна ўлічваць новыя гістарычныя ўмовы, а таксама традыцыі і менталітэт карэннага этнасу і нацыянальных меншасцей.

Іншымі словамі, выбар стратэгічнага курсу, пошук рацыянальнага інструментарыя для вырашэння галоўнай мэты – пабудовы сацыяльнай дэмакратычнай прававой дзяржавы – вызначаецца не адным кіраўніцтвам, а ўсенародна. Толькі такі падыход здольны цесна з'яднаць беларускае грамадства, аб'яднаць усе сілы на развіццё эканомікі рэспублікі, якая і з'яўляецца сродкам вырашэння сацыяльных праграм і гарантыяй фарміравання ў краіне больш прадукцыйнага і эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага ўкладу. Задача складаная, але пасільная. Для гэтага існуюць створаныя ўсімі папярэднімі пакаленнямі матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, неабыякавае стаўленне да лёсу Айчыны мільёнаў беларусаў і палітычная воля дзяржаўнага кіраўніцтва краіны.

**Літаратура**


1. Fukuyma, F. Trust: The Social Vitues and the Creation of Prosner / F. Fukuyma. – Penguin Books, 1995; Бурдье, П. Социология политики // П. Бурдье. – М.: Социо Логос, 1993; Социальная политика государства / под ред. В.Ф. Ушакова. – М., 1997; Ракитский, Б.В. Социальная политика, социальная защита, самозащита трудящихся в обществе. Ч. 1: Социальная политика / Б.В. Ракитский // Трудовая демократия. – М., 1997; Социальная политика в регионах России. – М., 1998; Социальная политика: энциклопедия / под ред. Н.А. Волгина и Т.С. Сулимовой. – М.: «Альфа-Пресс», 2006; Шимов, В.Н. Национальная экономика: теоретико-методологические вопросы формирования и развития / В.Н. Шимов, А.А. Быков, Л.М. Крюков // Белорусский экономический журнал. – 2012. – № 1; Обзор социальной политики в России. Начало 2000-х. – М.: НИСП, 2007 и др.
2. Социальная политика: энциклопедия / под ред. Н.А. Волгина и Т.С. Сулимовой. – М.: «Альфа-Пресс», 2006.
3. Основы социального государства: учебник для вузов / под общ. ред. д-ра эконом. наук, проф. Н.Н. Гриценко, д-ра эконом. наук, проф. А.А. Шулуса. – М.: Изд. дом АТиСО, 2009. – 440 с.
4. Численность и состав населения СССР. По данным Всесаюзнай переписи населения 1979 г.
5. Возмитель, И.К. Очерки истории профсоюзов Витебщины / И.К. Возмитель, И.В. Мандрик; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2015. – 504 с.: ил.
6. Мандрик, И.В. Патернализм или партнерство? Социальная политика в Республике Беларусь в период 1991–2010 годов: модель, проблемы, пути их решения / И.В. Мандрик // Беларус. думка. – 2013. – № 9. – С. 60–65.


Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 7
# Крызіс сацыяльнай сферы ў постсавецкай Беларусі

Рысамі сацыяльнай дзяржавы, як адзначалася вышэй, з'яўляецца зацікаўленая пастаянная ўвага дзяржавы да стану сацыяльнай рыначнай гаспадаркі і сацыяльнага жыцця, умяшанне ў эканоміку і сацыяльныя працэсы галоўным чынам шляхам стварэння і змянення ўмоў, накіраваных у патрэбнае рэчышча паводзіны суб'ектаў гаспадарчай дзейнасці, недапускаючы разгулу рыначнай стыхіі і адміністравання.

Сацыяльнай дзяржаве павінна быць уласціва максімальна магчымая гарманізацыя інтарэсаў і ўзаемадзеянне розных сацыяльных супольнасцей, у першую чаргу прадпрымальнікаў і наёмных рабочых і іх аб'яднанняў, забеспячэнне пры пасрэдніцтве дзяржавы і грамадскіх інстытутаў іх цеснага ўзаемадзеяння на пачатках сацыяльнага партнёрства і ўзаемапрыемных кампрамісаў. Важна каб сацыяльнае партнёрства садзейнічала выключэнню з грамадскага жыцця гвалтоўных экстрымісцкіх форм і спосабаў барацьбы за інтарэсы тых ці іншых груп і супольнасцей, вырашаючы іх мірнымі спосабамі, але невыключаючы пры неабходнасці дазволу на забастоўкі ці выкарыстанне сілы прымушэння.

На этапе 1991–1995 гг. незалежнага развіцця рэспублікі ў яе кіраўнікоў было імкненне наблізіць сацыяльную палітыку да сацыял-дэмакратычнай і нават – да ліберальнай мадэлі. Ужо ў самым пачатковым перыядзе пасля абвяшчэння Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі (27 ліпеня 1990 г.) ва ўрадзе В. Кебіча пераважала арыентацыя на хуткі пераход да ліберальнага рынку. У падрыхтаванай урадам і прынятай у кастрычніку таго ж года праграме пераходу да рыначнай эканомікі, перавага аддавалася заходняй мадэлі, гаспадарання [1, с. 535, 538]. Задача на бліжэйшую перспектыву складалася ў скасаванні адміністратыўна планавай эканомікі і ўраўняльнай аплаты за працу. У той жа час, усвядоміўшы, што краіне трэба будзе зрабіць пераход у якасна новы стан, а такія працэсы не праходзяць у кароткі момант, бачачы небяспеку ўзрастання сацыяльнага напружання ў грамадстве, кіраўніцтва рэспублікі не змагло рэзка адмовіцца ад рэгулявання эканомікі і ад дататаванай сацыяльна накіраванай палітыкі савецкага перыяду, калі дзяржава гарантавала абавязковыя сацыяльныя параметры для насельніцтва (што асабліва ярка выяўлялася і, як вядома, не без поспеху ў сферы адукацыі, аховы здароўя, культуры).

Меркавалася, што поўны адыход ад савецкіх механізмаў у вырашэнні сацыяльных праблем грамадства можна будзе зрабіць не раней, чым праз два-тры гады, калі сфарміруецца новая сацыяльна-эканамічная сістэма, якая можа забяспечыць дынамічнае развіццё гаспадарчага комплексу рэспублікі. Разлікі будаваліся на тым, што рыначная эканоміка, у якой усе вытворцы стануць прымаць непасрэдны і зацікаўлены ўдзел у сацыяльна-эканамічных пераўтварэннях, сама па сабе адрэгулюе вытворчасць і спажыванне і на гэтай

Рэпазіторый ВГУ

аснове працаздольнае насельніцтва без дзяржаўных сацыяльных датацый дасягне больш высокага, чым на папярэднім, савецкім этапе, узроўню жыцця.

Вялікія надзеі былі ўскладзены на прыватызацыю дзяржаўнай уласнасці. Меркавалася, што праз імянныя чэкі грамадзяне краіны стануць ўласнікамі пэўнай долі дзяржаўнай маёмасці, якое забяспечыць ім, як акцыянерам і работнікам, годнае жыццё. Вярхоўны Савет і ўрад рэспублікі вырашылі правесці прыватызацыю дзяржаўнай уласнасці праз імянныя чэкі "Маёмасць". Чэк "Маёмасць" – гэта дакумент, частка права на прыватызуемую ўласнасць коштам 2,5 тыс. рублёў. Жыхарам Беларусі методыку разліку кошту чэкаў не растлумачылі. Айчыннымі масмедыя прыватызацыя ў такой форме падавалася як кампенсацыя працоўным за іх працу ў папярэднія гады, як справядлівае дзеянне ўладаў па размеркаванні багатай уласнасці, створанай многімі пакаленнямі жыхароў Беларусі. Прыкладна мільён жыхароў краіны чэкі атрымалі, аднак ўласнікамі прадпрыемстваў не сталі.

Да сярэдзіны 90-х гадоў стала зразумела: чэкі "Маёмасць", акрамя сацыяльна-псіхалагічнага, іншага значэння не маюць. Так, на пачатак ліпеня 1996 года з 1 млн. уладальнікаў чэкаў 42% прадалі свае чэкі па вельмі нізкай цане – 2,5 тыс. рублёў за 1 чэк, толькі 28% выкарыстоўвалі іх для аплаты за прыватызаваную ўласнасць, 13% абмянялі на акцыі спецыялізаваных інвестыцыйных фондаў, 17% пераафармілі сваякам [3, с. 409]. Дывідэнды ад укладзеных у Дзяржкаммаёмасць Рэспублікі Беларусь чэкаў былі настолькі нізкімі, што ніякага энтузіязму і станоўчых эмоцый у іх уладальнікаў не выклікалі.

І ў пачатку XXI стагоддзя большасць насельніцтва краіны не разабралася ў прыватызацыі ўласнасці праз імянныя чэкі. Хоць першапачаткова чаканне і надзеі пры прыватызацыі былі светлымі. Калектыў экспертаў, сфарміраваны знакамітым мікрахірургам С.Н. Фёдаравым у 1996 годзе, вызначыў, што пры прыватызацыі на кожнага грамадзяніна Расіі прыпадала ад 150 да 200 тысяч долараў [4, с. 2]. Беларусы ў савецкі час працавалі не менш прадукцыйна, чым працоўныя Расійскай Федэрацыі. БССР не без падставаў лічылася адным з найбольш развітых рэгіёнаў вялікай адзінай краіны. У рэспубліцы была створана матэрыяльна-тэхнічная база, якая пры правільным падыходзе да прыватызацыі зрабіла б больш паспяховым пераход да цывілізаванага рынку. Але па розных прычынах (распад адзінай эканамічнай прасторы, канверсія прамысловасці, недавер да капіталістычнага спосабу вытворчасці ў кіраўнікоў і работнікаў прадпрыемстваў, адсутнасць трывалай прававой базы і прадуманай канцэпцыі і методыкі раздзяржаўлення) першапачатковыя разлікі на станоўчы вынік не апраўдаліся. Насельніцтва рэспублікі несла адчувальныя сацыяльныя страты. У Беларусі, якая ўваходзіла да гэтага ў склад СССР і трывала стаяла на сацыялістычных прынцыпах развіцця вытворчасці, з станоўчай тэндэнцыяй стану інтэгральных паказчыкаў сацыяльнай бяспекі (нараджальнасць, чаканая працягласць жыцця, сацыяльнае расслаенне, узровень спажывання духоўных дабротаў, міграцыя і іншыя складнікі), з 1991 года наступіў перыяд рэзкага спаду вытворчасці, за ім – стан глыбокага крызісу сацыяльнай сферы. Прыйшлося наладзіць масавы імпарт тавараў шырокага спажывання і харчавання, што вызначыла іх невымерна высокі, у параўнанні з заробкам, кошт.

Галапуючы рост цэн на харчовыя і прамысловыя тавары (на старце рэформаў яны былі вызваленыя), на аплату камунальна-бытавых паслуг прывёў да рэзкага падзення ўзроўню жыцця. Так, у 1995 годзе намінальная заработная плата павялічылася ў 6,3 разы, а кошты на тавары і паслугі – у 8,1 разы. У многіх катэгорый насельніцтва заработная плата не дасягала пражытачнага мінімуму. Да таго ж на шмат якіх прадпрыемствах заработная плата выдавалася з вялікай затрымкай. Урад у гэты час прыняў некалькі рашэнняў аб падтрыманні стабільнага росту зарплаты для ўсіх катэгорый занятага насельніцтва, але ва ўмовах неэфектыўнай эканомікі выканаць намечаную праграму было немагчыма. Паколькі даходы насельніцтва залежаць ад рэальнага сектара эканомікі, рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ў 1995 годзе па адносінах да 1990 года (па афіцыйных дадзеных) складалі 64% [5, с. 12]. Матэрыяльны дабрабыт народа ў 1991–1995 гадах знаходзіўся на мяжы беднасці.

Беларусь закранула даўно забытая (з 1931 г.) з'ява – беспрацоўе. На працягу 1991 года ў службу занятасці звярнуліся 67 тыс. чалавек. У 1991 годзе каля 80% ад агульнай колькасці беспрацоўных складалі жанчыны [6, с. 111, 115]. Выдзяляемыя грашовыя сродкі на падтрыманне беспрацоўных былі даволі невялікімі. Каля 50% беспрацоўных рэспублікі ў 1995 годзе грашовую дапамогу не атрымлівалі. Сур'ёзнай праблемай незалежнай беларускай дзяржавы стала забеспячэнне жыллём сем'яў, якія мелі ў гэтым патрэбу. У рэспубліцы адбылося рэзкае скарачэнне будаўніцтва і ўводу жылля. У 1995 годзе па адносінах да 1990 года пабудавана толькі 37% жылой плошчы. Калі ў 1990 годзе атрымалі новыя кватэры або палепшылі свае жыллёвыя ўмовы 89 тыс., то ў 1995 годзе – толькі 32 тыс. сем'яў [7, с. 532].

Падзенне вытворчасці, рост інфляцыі, зніжэнне прыбытку і, адпаведна, падатковых паступленняў негатыўна адбіліся на ўзроўні жыцця людзей. Пацярпела эканамічна актыўнае насельніцтва, занятае ў вытворчым працэсе. У 1995 годзе за рысай мінімальнага спажывецкага бюджэту апынулася больш за 60% насельніцтва. Павялічыўся разрыў у даходах 10% найменш забяспечанага насельніцтва і 10% найбольш багатых. Дыферэнцыяцыя тут даходзіла, па розных ацэнках, ад 1:15 да 1:17 (у развітых краінах, дзе сярэдні клас вельмі шырокі, максімум 1: 5). У грамадстве раслі дэградацыя і маральнае збядненне. Такое становішча парушала сацыяльную стабільнасць.

Значнымі сацыяльнымі праблемамі заставаліся рэзкае скарачэнне нараджальнасці і сярэдняй працягласці жыцця, пагаршэнне здароўя людзей. Унікальнасць сітуацыі складалася ў тым, што на працягу доўгага перыяду скарачалася колькасць насельніцтва працаздольнага ўзросту. У 1993 годзе смяротнасць упершыню перавысіла нараджальнасць. Калі ў 1990 годзе смяротнасць у разліку на 1 тыс. насельніцтва складала 10,7 чалавек, то ў 1995 годзе яна вырасла да 13,0 чалавек [7, с. 73]. Надалей працэс дэпапуляцыі, а разам з ім падрыў працоўных рэсурсаў, як асновы развіцця вытворчасці ў рэспубліцы, працягваўся.

Смяротнасць, якая перавышала нараджальнасьць, у гэтыя гады звязана не толькі з чыста эканамічнымі або медыцынскімі фактарамі (узровень матэрыяльнага дабрабыту і медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, вядома, знізіўся), але і з ірацыянальнымі паводзінамі насельніцтва: масавым п'янствам

Рэпазіторый ВДУ

(у большай меры мужчынскай часткі), безадказным стаўленнем да ўласнага здароўя, высокім траўматызмам на вытворчасці і іншымі прычынамі [8, с. 119].

Абагульняючы становішча, якое склалася ў рэспубліцы на этапе 1991–1995 гадоў, варта адзначыць, што дэмантаж савецкай сістэмы тут праходзіў далёка не па аптымальным варыянце, як гэта было ў КНР. Кіраўнікі ўрада, эканамісты і гаспадарчыя суб’екты ў гэты час не былі падрыхтаваныя да ўкаранення нетрадыцыйнай для сябе эканамічнай палітыкі і сістэмы кіравання гаспадарчым комплексам. Пераход да рынку адбываўся непаслядоўна і недастаткова прадумана. Сацыяльная частка праграмы пераходу да рынку пры негатыўным стане эканомікі заставалася не больш чым дэкларацыяй. У кожным прынятым дакуменце, выступленнях кіраўнікоў верхняга эшалона ўлады гаварылася аб стабілізацыі і аб хуткім і істотным павышэнні жыццёвага ўзроўню людзей, а ў рэальным жыцці назіралася паглыбленне іх цяжкага становішча. Дасягнуць планаваных і зацверджаных у праграме, нават па рэшткавым прынцыпе, паказчыкаў сацыяльнага развіцця не ўдавалася. 1994 год характарызаваўся далейшым паглыбленнем крызісных працэсаў. Паскорылася падзенне вытворчасці, узрос дэфіцыт бюджэту, захоўваўся высокі ўзровень інфляцыі, працягвалася падзенне курсу беларускага рубля. Урад Кебіча спадзяваўся з цягам часу знайсці больш эфектыўную мадэль рыначнай эканомікі, а разам з ёй і аптымальную мадэль сацыяльнай палітыкі (адмаўляць гэтага нельга, у рэспубліцы з першых дзён ішоў пошук пераадолення негатыўных наступстваў распаду Савецкага Саюза). Аднак даволі глыбокі крызіс у эканоміцы, непадрыхтаванасць кіраўнікоў да вырашэння маштабных задач пераходу эканомікі ў новыя гістарычныя ўмовы (што таксама нельга ставіць ім у віну!) спараджалі ў грамадстве сіндром недаверу як да рэспубліканскіх, так і да рэгіянальных структур улады.

Рэспубліка Беларусь як сацыяльная дзяржава ў перыяд 1991–1995 гадоў рэальна знаходзілася на раннім этапе свайго развіцця. Трэба было прайсці шлях пераўтварэння канцэптуальнай (тэарэтычнай) мадэлі ў практычную (рэальную) мадэль сацыяльнай дзяржавы з сацыяльнай рыначнай эканомікай. Дэкларацыі, што ўжывалі ў звароце да насельніцтва кіраўнічыя структуры, і жыццёвые рэаліі зусім не супадалі. Перыяд такой сітуацыі, як вядома з гістарычнага вопыту, не ўмацоўвае імідж улады. Працоўныя і большасць насельніцтва, якія мелі шматгадовы вопыт свайго функцыянавання ў сацыялістычнай сістэме, не разумелі той мадэлі, якая не забяспечыла паварот дзяржавы да лепшага.

Да лета 1994 года ў насельніцтва склаўся недавер да ўладных структур дзяржавы. Для перамен у настроі народа былі падставы – крытычная сітуацыя ў эканоміцы і сацыяльнай сферы. Мандат на кіраўніцтва дзяржавай у гэты склада-ны час быў перададзены іншым палітыкам.

Пасля прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (15 сакавіка 1994 г.), якая прадугледжвала ўвядзенне ў рэспубліцы прэзідэнцкай формы кіравання, 10 ліпеня 1994 г. насельніцтва зрабіла выбар, першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь абраны А.Р. Лукашэнка. У перадвыбарнай платформе А.Р. Лукашэнка заявіў аб неабходнасці ўсталявання ў рэспубліцы эканамічнай і палітычнай стабільнасці, паляпшэння матэрыяльнага становішча насельніцтва, забеспячэння сувернітэту пры цесным саюзе з Расійскай Федэрацыяй і аб бескампраміснай



Рэпазіторый ВДУ

барацьбе з карупцыяй і злачыннасцю. З гэтага часу на Беларусі пачаўся новы этап у правядзенні рэформаў. Пастаўлена задача фарміраваць беларускае грамадства як грамадства сацыяльнай справядлівасці, праводзіць эканамічныя пераўтварэнні паступова, узнавіць сітуацыю, якая за савецкім часам забяспечвала абарону насельніцтва па ўсім спектры паслуг. Грамадзяне не маглі не падтрымаць прапанаваны курс.

## Літаратура


1. Сборник законов БССР. – 1990. – № 29.
2. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапаможнік: у 2 ч. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.М. Забродскі [і інш.] / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – Ч. 2: Люты 1917–2000 г.
3. Комсомольская правда. – 2002. – 26 нояб. – С. 2.
4. Статистический ежегодник Республики Беларусь. – Минск, 2000.
5. Статистический ежегодник Республики Беларусь. – Минск, 2000. Статистический ежегодник Республики Беларусь. – Минск, 2001.
6. Статистический ежегодник Республики Беларусь. – Минск, 2001.
7. Население Республики Беларусь. Статистический ежегодник. – Минск, 2009.


Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 8
# Сацыяльная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь у 1996–2015 гады

Пасля прэзідэнцкіх выбараў перад абноўленым кіраўніцтвам рэспублікі на чале з першым Прэзідэнтам краіны А.Р. Лукашэнкам, востра паўстала пытанне аб вывадзе краіны з глыбокага крызісу і выбары далейшага шляху развіцця. Было прынята рашэнне будаваць айчынную мадэль эканамічнага развіцця на сінтэзе лепшага, што назапашана грамадствам розных цывілізацый. Выступаючы ў якасці кандыдата на пасаду Прэзідэнта падчас выбарчай кампаніі, а затым і пасля абрання, А.Р. Лукашэнка назваў галоўным кірункам у сваёй дзейнасці дасягненне кансалідацыі грамадства і ўмацаванне дзяржавы, барацьбу з беднасцю і забеспячэнне ўстойлівага росту дабрабыту насельніцтва. Прааналізаваўшы стан эканомікі і вызначыўшы прычыны расчаравання людзей, Прэзідэнт улічыў іх матывы аб неабходнасці ўзвысіць дзяржаўную ўладу над прыватнымі інтарэсамі, навесці ў краіне парадак. У кастрычніку 1994 года, з улікам новага бачання ўнутрыпалітычнага развіцця краіны, праведзена карэкціроўка ранейшага курсу. Канцэпцыя і методыка аздараўлення абстаноўкі ў краіне былі вызначаны ў праграме неадкладных мер па выхаду эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу [1, с. 2]. У праграме неадкладных мер па выхаду рэспублікі з крызісу (зацверджана 1994/09/30 г.) па-новаму пастаўлены цэлы шэраг пытанняў. У ёй вызначана галоўная мэта – будаўніцтва сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі, прадугледжаны комплекс ўзаемазвязаных неадкладных мер, накіраваных на спыненне вытворчасці, тармажэнне інфляцыі, недапушчэнне далейшага падзення жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Дзяржава мела намер стымуляваць эканамічны рост праз жорстка цэнтралізаваныя метады кіравання эканомікай, адначасова змякчаючы сацыяльныя наступствы той грамадскай няроўнасці, якая непазбежна для пачатковага этапу рыначнах адносін. Унутраная палітыка краіны арыентавана на захаванне пераемнасці з палітыкай савецкага перыяду, прапанавана пры ўкараненні рыначных падыходаў не адкідваць апраўданых сацыялістычных прыёмаў і метадаў гаспадарча-кіраўніцкай сістэмы. Было ўсвядомлена простае правіла “Рынак сам па сабе не можа вырашыць усіх праблем. Рынку ўласцівая (асабліва ў пераходным перыядзе) маса сур’ёзных праблем. Для паспяховага росту ў эканоміцы і стабільнасці грамадства неабходна забяспечыць баланс паміж рынкам і дзяржавай”, вызначыць меры рэгулявання дзяржавай эканомікі і аб’ёму сацыяльнай падтрымкі насельніцтва. Улічвалася і тое, што за 1991–1994 гады ў рэспубліцы адбылася змена формаў уласнасці на сродкі вытворчасці ў шэрагу галін прамысловасці, транспарту, у сферы паслуг, аграпрамысловым комплексе. Дэмантаваны механізм цэнтралізаваннага планавання і кіравання адзіным народнагаспадарчым комплексам, перабудаваны фінансавы механізм, сістэма цэнаўтварэння, банкаўская сістэма. Па гэтых прычынах вяртанне да ранейшага сацыялістычнага ўладкавання стала таксама немагчымым. Улічваючы гэтыя і іншыя фактары, кіраўніцтва павяло краіну па сімбіёзнаму шляху развіцця:



Репозиторий ВГУ

захаванне камандных вышынь за адміністраваннем і ўключэнне некаторых элементаў канкурэнцыі ў якасці дадатковых кампанентаў эканамічнага механізму.

У праграме неадкладных мер па выхаду рэспублікі з крызісу (у гэтым, як сёння бачыцца, гістарычным дакуменце) ўлічвалася, у прыватнасці, што пераход да новай сацыяльна-эканамічнай сістэмы з'яўляецца крутым гістарычным паваротам і праводзіць паскорана рынечныя адносіны без неабходнай для гэтага перабудовы ніжэйшых, базісных звёнаў эканамічнай мадэлі небяспечна. Дзейнасць Прэзідэнта насіла наступальны характар. Аб'ектыўная ацэнка абстаноўкі, разуменне таго, што пераўтварэнне варта праводзіць у адпаведнасці з інтарэсамі працоўных і рэальнымі магчымасцямі краіны і што для змены свядомасці людзей спатрэбіцца час, стала асновай прынятага рашэння: праводзіць рэфармаванне старой сістэмы паступова, укараняючы новыя рыначныя падыходы, не адкідваючы сацыялістычныя прыёмы і метады эфектыўнага кіравання і гаспадарання. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця прыняла з гэтага часу жорстка цэнтралізаваныя метады кіравання эканомікай з моцнай рэгулюючай роляй дзяржавы ў сацыяльнай сферы. Дзяржава ў гэты час імкнулася стымуляваць эканамічны рост, адначасова змякчаючы сацыяльныя наступствы той грамадскай няроўнасці, якая непазбежна для пачатковага этапу рыначныя эканомікі. Цэны і тарыфы на паслугі насельніцтву прапаноўвалася набліжаць да рэальных выдаткаў паэтапна [1, с. 2, 3]. Такія падыходы варта прызнаць правільнымі. У савецкі час у БССР было шмат таго, ад чаго вынікала адмовіцца дзеля паспяховага развіцця, але было і тое, што і сёння можна выкарыстоўваць для паскоранага руху наперад. Аналіз архіўных дакументаў, якія раскрываюць дзейнасць партыйных і савецкіх органаў рэспублікі ў 1970–1980 гадах, паказвае, што кіраўніцтва рэспублікі разумела неабходнасць правядзення ў краіне карэнных пераўтварэнняў задоўга да красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС. У 1973 годдзе П.М. Машэраў арыентаваў партыйна-гаспадарчы актыў на інтэнсіўныя метады гаспадарання. У заключным слове на Пленуме ЦК КПБ ён сказаў: "Для павышэння эфектыўнасці прамысловай вытворчасці нам усім трэба значна лепш працаваць. А гэта магчыма зрабіць толькі пры **ўмове глыбокай перабудовы ўсёй нашай дзейнасці** ў галіне эканомікі, ва ўсіх звёнах арганізацыі вытворчасці і кіравання, **абавязковай перабудовы** (вылучана намі. – *І.М.)* на пачатках інтэнсіўных, і толькі інтэнсіўных, метадаў арганізацыі справы..." [2, с. 149]. Канструктыўныя сілы ў партыйным і савецкім апараце, якія сфарміраваліся ў савецкі час, магутная прамысловасць (зборачны цэх СССР), навуковы і адукацыйны патэнцыял сусветнага ўзроўню, сярэднееўрапейскі ўзровень развіцця аграпрамысловага сектара дазвалялі рэспубліцы развівацца адносна высокімі і ўстойлівымі тэмпамі ў самыя, як іх цяпер называюць, "застойныя" гады.

Сцэнар, па якім Беларусь з 1994 года рухалася да рынку, упершыню сістэмна выкладзены Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на Другім эканамічным форуме ў Санкт-Пецярбургу ў 1998 г. Гаворачы пра шлях развіцця рэспублікі ў постсавецкі час, больш канкрэтна аб пошуку айчыннай эканамічнай мадэлі, А.Р. Лукашэнка падкрэсліў: "Рэформа – гэта ўдасканаленне таго, што створана, таму што зламаць і стварыць новае ў нас няма часу, ні сродкаў. Ды і ці трэба гэта рабіць наогул?". Далей ён нагадаў, што ў Беларусі ажыццяўляецца

Репозиторий ВГУ

“фарміраванне сацыяльна арыентаванай, шматукладнай рыначнай эканомікі з раўнапраўным функцыянаваннем дзяржаўнай і прыватнай уласнасці з рознымі формамі гаспадарання – акцыянернай, калектыўнай, арэнднай і іншымі” [3, с. 2].

Пазней (у 1999 г.) у сваім выступленні ў Маскве ў Дзяржаўнай Думе А.Р. Лукашэнка ў чарговы раз пацвердзіў, што ў Беларусі пасля абрання першага Прэзідэнта ў развіцці дзяржавы былі ўлічаны гістарычныя ўрокі мінулых радыкальных падыходаў да грамадскіх пераменаў: “Мы з самага пачатку адмовіліся ад рэвалюцыйнай ломкі, аддаючы перавагу паступоваму рэфармаванне эканомікі, пераймаючы ўсё лепшае, што можа прапанаваць сусветны вопыт” [4, с. 1]. Пры ўкараненні рыначных падыходаў ужываліся і тыя, з дапамогай якіх дасягала поспехаў савецкая Беларусь. Адносна абстаноўкі, якая склалася раней ў краіне, падобны падыход дэманстраваў на тым этапе сваю жывучасць. Ён актывізаваў вытворчую дзейнасць. 1995 год стаў паваротным у станаўленні беларускай мадэлі сацыяльнай палітыкі. Адбылося ўзмацненне дзяржаўнага рэгулявання. Рыначныя адносіны прынялі рэжым паступовых сацыяльных рэформаў. Гэты год стаў апошнім, калі ў Рэспубліцы Беларусь назіралася падзенне асноўных вытворчых паказчыкаў. Пасля катастрафічнага абвалу вытворчасці пачаўся яго ўздым. Правільнасць такога падыходу ў кіраванні эканомікай і сацыяльнай сферай з боку беларускага кіраўніцтва ў крызісныя гады пацвярджае і сусветны вопыт. У 1933 годзе прэзідэнт ЗША. Ф. Рузвельт прапанаваў праграму выхаду з крызісу “Новы курс”, якая прадугледжвала шырокае ўмяшанне дзяржавы ў эканоміку. Рэалізацыя прапанаванай праграмы з адладжаным дзяржаўным кіраваннем ажывіла амерыканскую эканоміку ў даволі кароткія тэрміны. Адпраўным момантам пераходу да сацыяльна арыентаванай мадэлі рыначнай эканомікі, у якой толькі часткова выкарыстоўваўся вопыт станаўлення рыначных адносін заходняга тыпу, сталі “Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гады”. У праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі на перыяд 1996–2000 гадоў (прынята ў кастрычніку 1996 г., з гэтага часу пакладзены пачатак постсавецкім пяцігодкам) былі прапанаваны больш эфектыўныя механізмы правядзення прыватызацыі, новыя тэрміны дэцэнтралізацыі і раздзяржаўлення. Тады ж распрацавана і зацверджана “Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2010 года”. У гэтых дакументах пазначаны курс на правядзенне ў краіне моцнай і эфектыўнай сацыяльнай палітыкі, павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва і скарачэнне малазабяспечанасці. Гаворка ў гэтых дакументах ішла аб разумных суадносінах забеспячэння насельніцтва сацыяльнымі выгадамі з эканамічнымі магчымасцямі краіны. Унутраная палітыка дзяржавы стала асэнсавана накіраванай на захаванне пераемнасці з палітыкай савецкага перыяду. З прыняццем праграмных дакументаў сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускага грамадства пайшло па шляху праграмна-мэтавага рэгулявання. Сацыяльная палітыка ў рэспубліцы набыла рысы патэрналісцкай мадэлі. Дзяржаўная ўлада не даверялася на стыхію рынку, не сыходзіла з эканамічнага і сацыяльнага жыцця ў краіне. Мадэрнізацыя эканомікі і дзяржаўна-праававой сістэмы ў Беларусі ажыццяўлялася больш прадумана і ў зберагальным рэжыме. У людзей з’явілася ўпэўненасць у будучыні, узмацнілася імкненне да

Рэпазіторый ВГУ

прадукцыйнай працы. Большасць вядучых галін наладзілі стабільнасць у рабоце. Прамысловая і сельскагаспадарчая вытворчасць ў 2000 годзе перасягнула паказчыкі 1991 года. З 1997 па 2000 год рост аб'ёмаў вытворчасці складаў штогод ад 10 да 18% [5, с. 283]. Рост ВУП ў 1997 годзе склаў больш за 11%, у 1998 – 8,4%. У 2000 годзе эканамічны рост паскорыўся: прырост ВУП склаў 8%, перавысіўшы ўзровень апошняга для савецкай Беларусі 1990 года. У цэлым па большасці паказчыкаў першы пяцігадовы план быў выкананы [5, с. 8].

Па меры ўмацавання эканомікі складваліся ўмовы і перадумовы для мэтанакіраванай дзейнасці па рэалізацыі мэт і задач сацыяльнай дзяржавы. Сацыяльная палітыка беларускай дзяржавы ў гэты час была накіравана на стварэнне неабходных умоў жыццядзейнасці чалавека, задавальненне ўзрастаючых сацыяльных і духоўных патрэб насельніцтва, стварэнне ў грамадстве спрыяльнага сацыяльнага клімату. Рэальная зарплата занятых у сферы вытворчасці павялічылася на 10% [5, с. 9]. Да 2000 года крызісныя праявы атрымалася пераадолець. У краіне была забяспечана харчовая бяспека, спыніўся працэс сацыяльнага расслойвання насельніцтва. Аб фарміраванні беларускай эканамічнай мадэлі з выразна выяўленай сацыяльнай скіраванасцю адзначана ў прынятай на Другім Усебеларускім сходзе (18 мая 2001 г.) Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2001–2005 гады. Тут указвалася на неабходнасць павелічэння ВУП краіны на 40%, а ўзроўню дабрабыту народа – у 1,8 разы. Пры гэтым сацыяльны складнік арыентаваўся на эканамічнае мысленне працоўных, дасягненне іх высокай забяспечанасці за кошт уласных намаганняў. Прагрэсіўнае развіццё меркавалася ажыццявіць толькі за кошт росту прадукцыйнасці працы і ўкаранення новых тэхналогій і новых метадаў ўдасканалення вытворчасці і кіравання.

Вызначаўся выхад на эфектыўную працу вядучых экспартнаарыентаваных прадпрыемстваў краіны (Мінскага трактарнага і аўтамабільнага заводаў, Салігорскага калійнага камбіната, Наваполацкага і Мазырскага нафтаперапрацоўчых заводаў і інш.). Канчатковыя вынікі гэтага перыяду сведчылі пра тое, што праграмныя ўстаноўкі на эфектыўную сацыяльную палітыку ў Рэспубліцы Беларусь, якая абвясціла сябе сацыяльнай дзяржавай, пры шырокамаштабным дзяржаўным умяшанні ў эканоміку і сацыяльную палітыку паспяхова рэалізоўваліся.

На дадзеным этапе стабільна нарошчваўся патэнцыял нацыянальнай эканомікі, адпаведна, і база для правядзення эфектыўнай дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. Устойлівы прырост прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі даваў падставу разлічваць на спрыяльнае развіццё эканомікі Беларусі ў бліжэйшай і далёкай перспектыве.

У дакладзе А.Р. Лукашэнка на Трэцім Усебеларускім сходзе "Аб выніках выканання Праграмы развіцця краіны на 2001–2005 гг. і аб новай праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на перыяд 2006–2010 гг." было сказана, што выпрацаваны курс развіцця краіны аказаўся правільным. Прамысловая і сельскагаспадарчая вытворчасць у 2000 годзе перасягнулі паказчыкі 1991 года. Выпуск прамысловай прадукцыі за пяць гадоў павялічыўся на 52%, сельскагаспадарчай – на 26%. ВУП за перыяд 1996–2000 гадоў вырас на 36%. Штогадовы прырост ВУП склаў больш за 7,5% супраць 3,5% за сярэднесусветны

Рэпазіторый ВДУ

[6, с. 15]. Вынікі такога ўзроўню могуць быць параўнальныя толькі з лепшымі перыядамі савецкай эпохі. У ліку перадавых прадпрыемстваў у гэтыя гады знаходзіліся калектывы вытворчага аб'яднання "Мінскі трактарны завод", "БелАЗ", "МАЗ", беларускае ўнітарнае прадпрыемства" Беларускі металургічны завод», большасць прадпрыемстваў нафтаперапрацоўчай прамысловасці. Тут змаглі ў кароткія тэрміны наладзіць выпуск новай прадукцыі, якая мела попыт на знешніх рынках.

Спрыяльныя фінансава-эканамічныя ўмовы і адносная адаптацыя да спецыфікі рыначнай эканомікі дазволілі дзяржаве, яго кіруючым структурам адысці ад ўжываемай раней патэрналісцкай мадэлі сацыяльнай палітыкі, наблізіўшы яе да ліберальнай мадэлі. Фактар эфектыўнасці вытворчасці стаў найважнейшым фактарам сацыяльнай палітыкі. Працаўнікам рэспублікі былі прадастаўлены магчымасці ў большай меры самім вызначаць свае статус і дабрабыт. Урад выкарыстоўваў падыходы, якія стымулявалі ў людзях творчасць, развівалі ў найбольш масавай групы насельніцтва, занятай наёмнай працай, моцную працоўную матывацыю. Асноўную ролю ва ўздыме дабрабыту насельніцтва стала займаць заработная плата. Яна вызначалася ў адпаведнасці з прадукцыйнасцю і эфектыўнасцю працы, мела тэндэнцыю да пастаяннага росту. За пяць гадоў сярэднямесячная заработная плата ў сярэднегадавым вылічэнні вырасла (у пераліку на амерыканскую валюту) да 260 дол. Найбольш значнае павелічэнне яе ў параўнанні з папярэднім годам адбылося ў 2001 г. – на 30%. Сярэдні памер пенсій за гэты час (з улікам кампенсацыйных выплат) склаў 104 дол. У канцы 2005 года аплата працы работнікаў сацыяльнай сферы (аховы здароўя, адукацыі, культуры) была набліжаная да сярэднерэспубліканскага ўзроўню. Вышэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень мелі зарплату работнікі навукі і навуковага абслугоўвання, прамысловасці, транспарту, сувязі і будаўніцтва.

У 2005 годзе ў краіне зафіксаваны самы нізкі ўзровень інфляцыі – 8% за ўвесь год. Пры нізкіх беларускіх цэнах Рэспубліка Беларусь яшчэ больш апярэджвала краіны, якія ўваходзілі ў СНД, па пакупніцкай здольнасці насельніцтва. Удзельная вага малазабяспечанага насельніцтва ў агульнай колькасці жыхароў рэспублікі знізіўся з 41,9% да 12,7%. Рэльефна сацыяльная накіраванасць беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця вызначалася і ў наступныя пяць гадоў. У праграме развіцця краіны на 2006–2010 гады рэальныя грашовыя даходы, у тым ліку і зарплату, планавалася падняць на 50–55%, а ўзровень жыцця насельніцтва Беларусі наблізіць да сярэднееўрапейскага. Першы год трэцяй пяцігодкі аказаўся паспяховым: амаль па ўсіх паказчыках сацыяльна-эканамічнага развіцця план года быў перавыкананы. ВУП павялічыўся на 9,9%. Пры гэтым аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі павялічыўся на 11,3%, у сельскай гаспадарцы прырост склаў 6,1%. Інвеставанне сродкаў у прамысловую групу «Б» дазволіла задаволіць попыт насельніцтва на дэфіцытныя тавары і прадукты харчавання. Узраслі магчымасці насельніцтва ў набыцці кватэр за кошт назапашаных сямейных зберажэнняў . Упершыню за ўсе постсавецкія гады на працягу аднаго года ў рэспубліцы пабудавана больш за 4 млн кв. м жылля. Вытворчасць спажывецкіх тавараў, без уліку прамысловых тавараў, павялічылася амаль на 10%. У разліку на душу насельніцтва спажывецкіх тавараў (халадзільнікі, тэлевізары, тканіны і абутак) у Беларусі выраблялася

Рэпазіторый ВГУ

больш, чым у іншых краінах СНД. Рэальная зарплата ў бюджэтнай сферы ўзрасла больш чым на 20% (планавалася 6–7%). Раздробны тавараварот павялічыўся за 2006 год на 17% [5, с. 21]. Рост даходаў прывёў да зніжэння долі насельніцтва з даходамі ніжэй бюджэту пражытачнага мінімума. Так, калі ў 2002 годзе доля насельніцтва з даходамі ніжэй за бюджэт пражытачнага мінімуму складала амаль 30%, то ў 2006 годзе яна не перавышала 12%. Дачыненне даходаў самых багатых жыхароў да даходаў самых малазабяспечаных у рэспубліцы ў канцы 2006 года не перавышала 5:1, што характарызавала даволі высокі ўзровень сацыяльнай справядлівасці. У далейшым таксама назіралася даволі ўстойлівае павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. Пацвярджаецца гэта, перш за ўсё, ростам рэальнай заработнай платы, узросшымі магчымасцямі насельніцтва ў набыцці значных бытавых, прамысловых тавараў і высокакаларыйных прадуктаў. Так, у 2010 годзе доля зарплаты і трансфертаў насельніцтву складала 34,3% выдаткаў бюджэту (у 2009 г. 31,5%). Насельніцтва набыло за гэты час значную колькасць аўтамабіляў. У 2008 годзе ў рэспубліцы знаходзілася ў асабістым карыстанні амаль 3 млн транспартных сродкаў.

Прыярытэтным напрамкам сацыяльнай палітыкі на гэтую пяцігодку стала развіццё сацыяльнай структуры вёскі. Для выканання Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі (прынята ў сакавіку 2005 г.) на базе цэнтральных сядзіб гаспадарак або цэнтраў сельскіх Саветаў створаны аграгарадкі. Толькі ў адным Віцебскім раёне за 4 гады рэалізацыі гэтай праграмы пабудавана 438 дамоў і кватэр, добраўпарадкавана 14 з запланаваных 17 аграгарадкоў [6, с. 228, 234]. У рэспубліцы за 2005–2007 гады ў 253 аграгарадках былі завершаны работы па стварэнні найважнейшых аб'ектаў інфраструктуры. Забяспечанасць насельніцтва ўстановамі камунальна-бытавога і сацыяльна-культурнага прызначэння тут мала чым адрознівалася ад тых, што меліся ў буйных гарадах [7, с. 228, 234].

На працягу ўсіх гадоў дзяржава прыкладала вялікія намаганні па далучэнню насельніцтва да здаровага ладу жыцця. З дзяржаўнага бюджэту штогод вылучаліся значныя сродкі на будаўніцтва і рэканструкцыю спартыўных і культурна-асветных аб'ектаў. У 2010 годзе ў рэспубліцы функцыянавала больш за 25,8 тыс. аб'ектаў фізкультурна-спартыўнага прызначэння, у тым ліку 12 тыс. плоскасных спартыўных збудаванняў, 24 спартыўныя збудаванні са штучным лёдам. За апошнія гады ўведзены ў строй лядовыя палацы ў гарадах Жлобін, Пружаны, Мазыр, Баранавічы, Бабруйск, Пінск, Ліда, Лунінец. Дзякуючы гэтаму, паводле афіцыйных звестак Белстата, каля 16% насельніцтва рэспублікі былі далучаныя да рэгулярных заняткаў фізічнай культурай і спортам [8, с. 6].

Дэмаграфічная сітуацыя на гэты час пакуль мела вынік са знакам мінус. Рэжым дэпапуляцыі, у якім краіна знаходзілася з 1994 года, прывёў да даволі значнага скарачэння насельніцтва рэспублікі. Асаблівую трывогу выклікалі сацыядэмаграфічныя паказчыкі нараджальнасці і смяротнасці. Калі ў 1999 годзе дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў у агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі было 21,2%, то ў 2005 г. – толькі 17,7% [9, с. 50]. За шэсць гадоў з 2001 па 2006 год насельніцтва Віцебскай вобласці скарацілася за кошт уласнага змяншэння (перавышэнне смяротнасці над нараджальнасцю) на 64 508 чалавек [10, с. 8]. Але і тут атрымалася пераламаць негатыўную тэндэнцыю. У 2005 годзе

Рэпазіторый ВДУ

каэфіцыент дзіцячай смяротнасці ў краіне (на 1000 нараджэнняў) зменшыўся ў параўнанні з 2000 годам з 11,3 да 6,4% [11, с. 63]. У 2007 годзе назіралася самая высокая нараджальнасць за ўсе папярэднія 25 гадоў. Колькасць народжаных за гэты год вырасла на 7%, дзіцячая смяротнасць знізілася на 15%, мацярынская – на 2,7%, пасляаперацыйная смяротнасць пры экстраннай хірургічнай паталогіі – на 16% [12, с. 2]. У дзяржаўнай палітыцы асаблівая ўвага надавалася развіццю і выкарыстанню чалавечага патэнцыялу краіны і яго пашыранаму ўзнаўленню. За кошт забеспячэння росту ўзроўню годнага жыцця агульны кафіцыент нараджальнаці, які вызначаецца адносінамі народжаных да сярэднегадовага ліку насельніцтва, плануецца давесці не менш чым у 10–15%.

У 2010 годзе ў рэспубліцы меўся высокі ўзровень занятасці: колькасць занятага насельніцтва з 2006 па 2010 год узрасла з 4 млн 403 тыс. да 4 млн 649 тыс. чалавек. Узровень беспрацоўя на 1 снежня 2010 года склаў толькі 0,7% (у 2002 г. беспрацоўных у краіне налічвалася 3%). Важным вынікам ажыццяўлення ў гэтым кірунку мер стала рашэнне праблем сельскага і рэгіянальнага беспрацоўя. У параўнанні з 2005 годам колькасць беспрацоўных на вёсцы да 2010 года знізілася больш чым у 15 разоў і практычна зраўнялася з колькасцю наяўных там вакансій.

Як бачна, беларуская мадэль з прамымі метадамі рэгулявання рыначнай эканомікі прывяла да пазітыўных змен у вырашэнні сацыяльных задач для насельніцтва рэспублікі. Нават у складаным 2007 годзе, калі адбылося значнае павышэнне сусветных цэн на нафту і газ, сацыяльныя праграмы разглядаліся ў рэспубліцы ў якасці прыярытэтных. У дзяржаўнай палітыцы вызначалася нават узмацненне сацыяльнага складніку. Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва за гэты год ўзраслі на 14,9%, а рэальная заработная плата – на 9,5%. З 2000 па 2008 год назіраўся паступальны рост пакупніцкай здольнасці за кошт павышэння заработнай платы. У 2008 годзе сярэднямесячная заработная плата работнікаў, занятых у гаспадарчым комплексе, вырасла да 500 амерыканскіх долараў. На прыстойным узроўні знаходзілася пенсійнае забеспячэнне. Пенсіі за два гады гэтай пяцігодкі павялічыліся на 40%. Сярэднямесячная пенсія ў канцы 2008 г. у пераліку на амерыканскую валюту складала 177 дол. (у Расіі – 154 дол.). Паколькі рыначныя адносіны ў сацыяльнай палітыцы сталі больш адчувальныя, ўзраслі выдаткі саміх грамадзян на важнейшыя віды паслуг, дзе раней меліся значныя датацыі дзяржавы. Так, аплата камунальных паслуг без датацый дзяржавы дасягала 50 і нават 70%. У дзяржавы з'явілася магчымасць вылучаць і выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі на іншых накірунках [13, с. 3].

У 2008 годзе ў эксплуатацыю ўведзена 5,15 млн кв м. жылля [5, с. 16], у 2010 – больш за 6,5 млн кв. м. Рэалізавана шырокая праграма па паляпшэнні сацыяльных умоў для жыхароў вёскі. У выніку сельскагаспадарчая вытворчасць рэспублікі па эфектыўным выкарыстанні вытворчых сіл перамясцілася ў лік перадавых краін.

Істотныя змены ў станоўчую тэндэнцыю паспяховага вырашэння сацыяльных пытанняў насельніцтва рэспублікі, якая выразна абазначылася з 1995–1996 гадоў, прынёс 2009 год. Глабальны фінансавы крызіс 2008 года унёс карэктывы ў планы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. 2009 год паказаў, што сацыяльная палітыка ёсць вытворны прадукт не толькі ўнутранай палітыкі

дзяржавы. Рэалізацыя дзяржаўных планаў па стварэнні годных умоў жыцця і творчага развіцця чалавека, стабільнае павышэнне дабрабыту насельніцтва краіны залежаць таксама ад знешняга ўплыву, ад стану эканомік і паводзін суседніх краін. Рэспубліка Беларусь – невялікая па тэрыторыі і бедная прыроднымі рэсурсамі краіна – не можа быць эканамічна самадастатковай. Яна тысячамі нітак звязана са знешнім светам, яе прамысловы комплекс цесна пераплецены інтэграцыйнымі сувязямі з Расіяй. Ужо ў 2008 годзе, з-за падзення пакупніцкай здольнасці многіх імпарцёраў, у тым ліку расійскіх, рэспубліка сутыкнулася з праблемай экспарту. Многія прадпрыемствы па выніках года панеслі значныя страты.

Трывожныя наступствы 2008 года сталі адчувальныя ўжо на самым старце наступнага 2009 года: у пачатку студзеня адбылася дэвальвацыя беларускага рубля. Памяншэнне попыту на экспартныя пастаўкі асноўных відаў прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў прывяло да росту складскіх запасаў. Нягледзячы на прыкладзеныя намаганні па збыце вырабленай прадукцыі, затаваранасць заставалася вельмі высокай (на пачатак 2010 года – 6 трлн руб. [14, с. 2]. Уплыў знешніх фактараў на эканоміку рэспублікі ў 2007–2015 гг. негатыўна адбіўся на выкананні прагназуемых паказчыкаў сацыяльнай сферы. Дэвальвацыя беларускага рубля, рост цэн прывялі да зніжэння пакупніцкай здольнасці насельніцтва. Рэальная заработная плата (у сярэднім 500 долараў) пасля 2008 года стала ніжэй ранейшай, мела тэндэнцыю да зніжэння (у 2015 г. менш за 400 долараў). Працоўныя пенсіі адставалі ад узроўню заробкаў. Пры гэтым цэны на харчовыя прадукты, сацыяльна значныя тавары сталі плаваючымі. Назіралася высокая інфляцыя і зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. Разумеючы, што сацыяльная абарона – адна з найважнейшых функцый дзяржавы, кіраўніцтву краіны прыйшлося зноў звярнуцца да ўзмацнення адміністратыўнага ўплыву на развіццё сацыяльнай сферы. За кошт субсідый дзяржава стала падтрымліваць прымальныя для насельніцтва цэны на спажывецкія тавары, на паслугі ЖКГ, на грамадскі транспарт. Дзяржаўныя датацыі толькі на аплату камунальных паслуг насельніцтву выраслі ў 2010 годзе да 66%, у грашовым адлюстраванні гэта больш за 1 млрд долараў ЗША [14, с. 6]. У верасні 2010 года Прэзідэнт рэспублікі А.Р. Лукашэнка, называючы гэтыя лічбы, адначасова зрабіў выснову, што такі падыход быў вымушанай і часовай мерай. Выснова Прэзідэнта з’яўляецца вельмі актуальнай. Уяўленне аб захаванні дасягнутага жыццёвага ўзроўню насельніцтва ў крызісны перыяд за кошт росту заработнай платы без уліку паказчыкаў, якія характарызуюць эфектыўнасць працы, – гэта «простае рашэнне», якое вядзе да негатыўных наступстваў. Падыход, калі налічваемая і выплачваемая на прадпрыемствах рэспублікі заработная плата апярэджвае рост прадукцыйнасці працы, – гэта не што іншае, як парушэнне аб’ектыўна дзеючых эканамічных законаў. Урад краіны ў такім выпадку становіцца заложнікам сваёй жа палітыкі. Крызіс у шэрагу еўрапейскіх краін (Грэцыя, Італія і інш.) наглядна гэта прадэманстраваў. Жыццё не па сродках, страта кантролю за агульным станам эканомікі, структурныя перакосы прыводзяць да тых наступстваў, з якімі сутыкнулася сёння багатая Еўропа. Да таго ж у асобных еўрапейскіх краінах назіраецца ўтрыманства, дзе часта не працаваць значна больш выгадна, чым працаваць. Гэта пагражае не толькі эканоміцы, але і маральным асновам грамадства.

Рэпазіторый ВГУ

Для Беларусі такі (еўрапейскі) падыход непрымальны. Правядзенне дзяржавай мэтанакіраваных мерапрыемстваў па павышэнні жыццёвага ўзроўню насельніцтва павінна цалкам узгадняцца з эфектыўнасцю функцыянавання эканомікі краіны, а заработная плата работнікаў галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі – служыць стымулам узняцця іх цікавасці да павышэння эфектыўнасці працы. Як адзначана ў выступленнях кіраўніка дзяржавы, у перспектыве ў Рэспубліцы Беларусь будзе і ў далейшым рэалізоўвацца ўласная беларуская мадэль сацыяльнай палітыкі (з перавагай элементаў сацыял-дэмакратычнай мадэлі). Мэтай сацыяльнай палітыкі дадзенай мадыфікацыі застаецца далейшы рост узроўню жыцця насельніцтва краіны за кошт устойлівага развіцця эканомікі. Унутраная палітыка дзяржавы ў галіне лібералізацыі аплаты працы будзе знаходзіцца ў поўнай адпаведнасці з эфектыўнасцю гаспадарання.

Падыход зусім слушны: у сацыяльнай дзяржаве можа быць жыццёвай адна формула: "Максімум выгод за максімальна высокапрадукцыйную працу". Галоўным фактарам павышэння ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва, фарміравання ў рэспубліцы грамадства сацыяльнай справядлівасці пры такой сацыяльнай палітыцы павінна стаць заработная плата. Падобны падыход вядзе да павышэння адказнасці саміх грамадзян за свой дабрабыт. Менавіта заработнай плаце належыць роля стымулятара прагрэсіўнага эканамічнага развіцця і павышэння эфектыўнасці нацыянальнай эканомікі.

Такім чынам, разглядаючы эфектыўнасць сацыяльнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь на этапе 1995–2015 гадоў, важна адзначыць значныя дасягненні ў гэтым кароткім па гістарычных мерках перыядзе: памер ВУП на душу насельніцтва па парытэту пакупніцкай здольнасці на душу насельніцтва ВУП з 2000 па 2010 год павялічыўся ў 2,6 разы – з 5083 дол. да 13864 дол. [15, с. 18]. Доля насельніцтва з даходамі ніжэй бюджэту пражытачнага мінімуму за шэсць гадоў (2002–2008) знізілася больш чым у пяць разоў. Нават у самых складаных для краіны 2008–2009 гадах айчынная эканоміка хоць і не дасягнула запланаванага ўзроўню росту, але змагла, у адрозненне ад большасці іншых краін, не дапусціць яго спаду [16, с. 17]. Такі стан з'яўляецца сведчаннем таго, што дзяржаўныя кіраўнічыя структуры мелі ў гэты час у сваім арсенале антыкрызісныя механізмы, здольныя ўтрымаць канкурэнтаздольнасць нацыянальнай эканомікі і яе сацыяльную накіраванасць. Таму, як нам уяўляецца, дзяржаўную сацыяльную палітыку ў Рэспубліцы Беларусь, што праводзілася з сярэдзіны 1990-х гадоў па 2015 год, можна ў цэлым прызнаць рацыянальнай. На дадзеным этапе развіцця дзяржавы прынятыя рашэнні аб правядзенні сацыяльнай палітыкі па такім варыянце былі досыць узважанымі. Арыентацыя на сацыяльную абароненасць людзей тут была пастаяннай.

У той жа час вырашэнне задачы выхаду на сярэднееўрапейскі ўзровень дабрабыту насельніцтва ў краі пакуль застаецца мэтай будучага.

Фарміраванне сацыяльна арыентаванай дзяржавы ў нашай рэспубліцы (як рэалізацыя сур'ёзнай гістарычнай задачы) можа быць больш паспяховай справай пры выкананні шэрагу фактараў. Для гэтага, па-першае, на наш погляд, у перыяд будаўніцтва сацыяльнай дзяржавы на рыначных механізмах, патрабуюцца паўнавартасныя сістэмныя рэформы, накіраваныя на вырашэнне існуючых

Рэпазіторый ВДУ

супярэчнасцей і забеспячэнне балансу паміж рынкам і дзяржавай. Па-другое, трэба ўлічваць агульнае імкненне ўсіх трох пакаленняў беларусаў (савецкага, постсавецкага, сучаснага) да вяршэнства ў іх індывідуальных і грамадскіх чалавечых каштоўнасцей. Па-трэцяе, важнейшыя заканамернасці сацыяльнай рыначнай эканомікі сведчаць, што якаснае павялічэнне дастатку, хуткі рост рэальных даходаў, забяспячэнне найвышэйшых сацыяльных стандартаў жыцця насельніцтва можа адбывацца за кошт высокай прадукцыйнасці працы ў галінах гаспадарчага комплексу. Таму дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі павінны скіраваць асаблівую ўвагу на фарміраванне ў працоўных асноў добрасумленнай працы, што ў вывучаемым перыядзе праяўлялася недастаткова.

**Літаратура**


1. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь от 30.09.1994 № 3249-XII «О программе неотложных мер по выходу экономики Республики Беларусь из кризиса» // Советская Белоруссия. – 1994. – 2 нояб.
2. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф 4. Оп. 20. Д. 510.
3. Совет. Россия. – 1998. – 25 июня.
4. Выступление А.Г. Лукашенко в Госдуме Российской Федерации // Советская Россия. – 1999. – 31 окт.
5. Медведев, Р.Н. Белорусская крепость / Р.Н. Медведев // Беларус. думка. – 2009. – № 12.
6. Республика Беларусь: энциклопедия. – Минск: Беларуская энцыклапедыя. – 2005. – Т. 1.
7. Сакович, В.С. Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.: тенденции развития / В.С. Сакович. – Минск, 2008.
8. Первый год новой пятилетки: основные ориентиры социально-экономического развития страны в 2011 г. – Минск, 2011.
9. Республика Беларусь: энциклопедия. – Минск: Беларуская энцыклапедыя, 2005.
10. Мандрик, И.В. Социальная безопасность и роль профсоюзов в ее обеспечении // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2008. – № 2(20).
11. Республика Беларусь в цифрах. – Минск, 2006.
12. Мед. вестн. – 2008. – 7 февр.
13. Лукашенко, А.Г. Наша цель – создать обновленный облик Беларуси. Выступление Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко на VI съезде Федерации профсоюзов Беларуси // СБ. Беларусь сегодня. – 2010. – 18 сент.
14. СБ. Беларусь сегодня. – 2010. – 23 янв.
15. Дачковский, А.А. Экономический рост в Республике Беларусь: состояние, проблемы, перспективы / А.А. Дачковский // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2011. – № 1.
16. Таранова, А.В. Матэрыяльны дабрабыт і сацыяльна-эканамічная няроўнасць насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь: сацыялагічны аспект / А.В. Таранова // Вес. Нац. Акад. навук Беларусі. – 2010. – № 1.


Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 9
# Праблемы структурнага характару беларускай эканамічнай мадэлі

## РАЗДЗЕЛ А. Акцыянаванне, дэмаграфія, падрыхтоўка рабочых: аналіз рэчаіснасці
## РАЗДЗЕЛ Б. Адукацыя: стан, праблемы і шляхі іх вырашэння

**Раздзел А. Акцыянаванне, дэмаграфія, падрыхтоўка рабочых: узровень эфектыўнасці.** Рэальная ацэнка дасягненняў і памылак, якія меліся ў развіцці Рэспублікі Беларусь у перыяд 1991–2016 гг., прыводзіць да наступнай высновы: працэс рэарганізацыі эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця ў краіне на гэтым этапе быў надзвычай цяжкім і супярэчлівым. У пачатку 1990-х гадоў першыя крокі да рынку прыйшлося рабіць на фоне рэзкага скарачэння ВУП, высокай інфляцыі, дэградацыі сацыяльнай сферы, падзення ўзроўню жыцця і значнага разрыву ў даходах насельніцтва. Перад палітыкамі і эканамістамі пастаянна паўставалі ўсё новыя і новыя пытанні, на якія не заўсёды знаходзіліся адэкватныя адказы. Трансфармацыя кіравання прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці ў гэты час была арыентавана ў кірунку да заходняй мадэлі грамадскага развіцця. Удзел дзяржавы ў кіраванні эканомікай і сацыяльнай сферай быў мінімізаваны. Разбалансаваная палітычная эліта рэспублікі не змагла ўлічыць усяго комплексу бягучых гістарычных, палітычных, эканамічных, культурных і ідэалагічных фактараў. Цэнтральная ўлада рэспублікі не здолела выпрацаваць выразнай і паслядоўнай унутранай палітыкі. Імкліва руйнавалася эканоміка, адбывалася амярцвенне каласальных прадукцыйных сіл, што суправаджалася значнымі выдаткамі ў сацыяльнай сферы. Усё гэта выклікала глыбокае расчараванне і апатыю ў беларускім грамадстве. Давялося шукаць новыя падыходы, ствараць, як у гістарычнай літаратуры адзначаецца, чыста беларускую мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Перыяд з 1995 па 2015 год адрозніваўся ад папярэдняга 1991–1994 гадоў тым, што ў гэты час краіна выходзіла з крызісу, сацыяльная эканоміка фарміравалася з улікам існуючых новых гістарычных умоў і ўспрымання беларускім грамадствам рыначных механізмаў. На прыярытэтнае месца ў дзяржаве вылучаўся клопат пра чалавека. Аднак страта ўстойлівасці працэсу дынамічнага развіцця эканомікі, істотны спад паказчыкаў, якія характарызуюць сацыяльнае становішча насельніцтва, у канцы першага дзесяцігоддзя новага стагоддзя, сведчаць, што беларускую эканамічную мадэль развіцця не варта абсалютызаваць. На працягу ўсіх вывучаемых гадоў дадзеная мадэль заставалася ў зоне праблем. Прычым разам са знешнімі ў рэспубліцы меліся і ўнутраныя фактары, якія адмоўна ўплывалі на яе стабільнае развіццё. Да аб'ектыўных прычын зніжэння эфектыўнасці гаспадарчага комплексу краіны можна аднесці агульны стан сусветнай эканомікі, якая час ад часу трапляе ў глыбокі крызіс. Як

Рэпазіторый ВГУ

ужо адзначалася вышэй, Рэспубліка Беларусь – невялікая па тэрыторыі і бедная прыроднымі рэсурсамі краіна – не можа быць эканамічна самадастатковай. Яна цесна звязана са знешнім светам. Ад знешняга ўплыву, ад стану эканомік і паводзін суседніх краін шмат у чым залежыць рэалізацыя дзяржаўных планаў рэспублікі. У 2008 годзе з-за падзення пакупніцкай здольнасці многіх імпарцёраў, у тым ліку расійскіх, рэспубліка сутыкнулася з праблемай экспарту сваёй прадукцыі. Шмат якія прадпрыемствы краіны па выніках года панеслі значныя страты, паменшыўшы, тым самым, крыніцы павышэння дабрабыту насельніцтва.

У той жа час крытычны падыход да падзей, што адбываліся ў краіне дазваляе выявіць унутраныя фактары, якія разам са знешнімі аказвалі адмоўны ўплыў на стабільнае развіццё рэспублікі.

Заміналі паступоваму без збояў развіццю рэспублікі, складзеныя падчас фарміравання рыначных механізмаў, вытворчыя адносіны (яны ж захаваліся і пасля 2016 г.). Вытворчыя адносіны не набліжалі работніка да ўласнасці (у параўнанні з савецкім часам), а яшчэ больш яго аддалялі. Работнік з цягам часу, як гэта прадугледжвалася, не стаў суб’ектам узаемадзеяння. Партнёрскія адносіны ў працэсе вытворчасці, клопат і ўвага пра чалавека працы, якія мелі месца ў савецкі перыяд, выцясняліся. Прыватызацыя і развіццё бізнесу, імкненне ў атрыманні высокіх даходаў часта суправаджаліся ігнараваннем працоўнымі і чалавечымі адносінамі паміж наёмным работнікам і наймальнікам. На многіх прыватных прадпрыемствах не было прафсаюзных арганізацый (на асобных яны не сфарміраваліся і пазней), што выключала тут цывілізаванае сацыяльнае партнёрства. Разам з прыватызацыяй і развіццём бізнесу адбывалася адчужанасць наёмнага работніка ад удзелу ў кіраванні вытворчасцю. Эгаізм працадаўцы, асабліва ў перыяд першапачатковага назапашвання капіталу, адсутнасць інструментаў рэгулявання сацыяльна-працоўных узаемаадносін на дагаворнай аснове спараджалі ў наёмнага персаналу прадпрыемстваў незадаволенасць сваім статусам. Анкетныя апытанні, праведзеныя ў 2007–2009 гадах супрацоўнікамі кафедры сацыяльна-гуманітарных навук Віцебскага філіяла “МІПСА”, паказалі, што больш за палову інжынерна-тэхнічных работнікаў Віцебскай вобласці былі занепакоеныя недастатковай увагай да чалавека працы ў калектыве, адсутнасцю рэальных умоў уласнай запатрабаванасці ў вытворчым і грамадскім жыцці. 12% апытаных адзначылі, што ім настолькі дрэнна, што з-за гэтага яны збіраюцца змяняць месца жыхарства [1, с. 10]. На іх думку, простыя людзі і ў рыначнай эканоміцы здольныя адыграваць больш прыкметную ролю ва ўздзеянні на эканамічныя і сацыяльныя працэсы ў працоўных калектывах, прымаць удзел у кіраванні справамі дзяржавы і грамадства ў розных і даступных формах. Гэтаму пакуль перашкаджаюць вельмі высокая цэнтралізацыя ў кіраванні, кантрактная форма найму на працу, іншыя бюракратычныя элементы сістэмы. У персаналу прыватных прадпрыемстваў незадаволеных сваім статусам аказалася яшчэ больш [1, с. 10]. Тут грамадскія формы ўдзелу працоўных у кіраванні прадпрыемствамі і ўстановамі наогул не дэкларыраваліся і не прымяняліся.

Працоўныя адносіны такога парадку паміж наёмнымі работнікамі і наймальнікамі абмяжоўвалі ініцыятыву і прадпрымальнасць, з’яўляліся

Рэпазіторый ВДУ

тормазам пры фарміраванні ў рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых асноў добрасумленнай працы, актыўнага і свядомага іх удзелу ў ажыццяўленні планаў, умацавання сацыяльнай справядлівасці і сацыяльнай салідарнасці грамадства.

Адказы рэспандэнтаў на пытанні анкеты паказваюць: поспеху ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем (пра гэта сведчыць далёкае і не зусім далёкае гістарычнае мінулае) можна дабіцца толькі пры правільнай пастаноўцы задач і адшуканні найбольш аптымальных шляхоў і сродкаў іх рэалізацыі, пры актыўным, свядомым і зацікаўленым удзеле ў гэтым саміх работнікаў. Па-сапраўднаму працоўныя ўключаюцца ў сацыяльную творчасць толькі тады, калі самі разумеюць і ўсведамляюць грамадскія ідэалы, спалучаючы іх са сваімі асабістай зацікаўленасцю. У кантэксце сказанага ў краіне ў першую чаргу трэба ставіць і вырашаць праблему працоўнай матывацыі і сацыяльнай адказнасці работнікаў наёмнай працы. Без развітай здольнасці да самакіравання і кантролю над "вярхамі" з боку "нізоў" грамадства аказваецца безабаронным перад усеўладдзем дзяржаўных органаў і ўладальнікаў эканамічнага бізнесу. Адказнасць працоўных калектываў за лёсы сваіх прадпрыемстваў, ініцыятыва ў вырашэнні вытворча-тэхнічных праблем могуць мнагакратна ўзрасці пры змене існуючай сістэмы акцыянавання, праз масавае ўключэнне працоўных у сферу працы і грамадскае самакіраванне. Недастаткова глыбокая прапрацоўка на папярэдніх этапах складанай, але, як сведчыць сусветны вопыт, вырашаемай з карысцю для ўсеагульнага дабра праблемы развіцця ў краіне эфектыўна функцыяніруючай акцыянернай уласнасці работнікаў знаходзіцца ў ліку фундаментальных унутраных прычын, якія насілі структурны характар і не дазвалялі ў поўнай меры раскрыцца беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі.

Рэальнае ўключэнне мас у працэсы пераўтварэння ўласнасці наспявала з самага пачатку пераходу рэспублікі да рынку, але ўвесь гэты час заставалася ў цені. У шырокіх пластах беларускага грамадства адчувалася (засталася і зараз) нездаволенасць зыходам прыватызацыі праз імянныя чэкі "Маёмасць". Маючы значную колькасць акцый, працаўнікі (зараз ужо больш за ўсё пенсіянеры) не з'яўляюцца саўладальнікамі прадпрыемстваў. Яны так і не сталі суб'ектамі ўзаемадзеяння. Такое становішча абмяжоўвае ініцыятыву і прадпрымальнасць рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых, з'яўляецца тормазам фарміравання асноў добрасумленнай працы, актыўнага і свядомага ўдзелу ў ажыццяўленні планаў па павышэнню прадукцыйнасці працы.

У лістападзе 2013 года падчас сустрэчы з прэм'ерам краіны Міхаілам Мясніковічам кіраўнік дзяржавы А.Р. Лукашэнка ўнёс гэтае пытанне ў лік першачарговых, якія, на яго погляд, патрабуюць сур'ёзнага, прадуманага вырашэння. Бо дзяржава, як ён думае, абавязана абараняць інтарэсы мінарэтарных акцыянераў. Прэзідэнт даў даручэнне і чакае прапаноў ад урада аб вырашэнні гэтай актуальнай ў рыначных умовах праблемы. Пакуль урадавых прапаноў і практычных дзеянняў не наглядалася. Іх неабходна зрабіць неадкладна ў хуткім часе.

Не лішнім, як лічыць аўтар, пры вырашэнні дадзенай праблемы можа быць выкарыстанне вопыту тых краінаў, якія асвоілі ў гэтай справе эфектыўныя падыходы.

У Швецыі, шэрагу іншых краін, каб не дапускаць канфліктаў паміж працай і капіталам, на прадпрыемствах ствараюцца асацыяваныя сацыяльныя аб'яднанні, у якія ўваходзяць удзельнікі вытворчасці, яны ж саўладальнікі прадпрыемстваў.

Органы працоўнага прадстаўніцтва асацыяваных аб'яднанняў дамагаюцца ад уладальнікаў кантрольных пакетаў акцый абавязковай квоты па колькасці акцый, якое кіраўніцтва кампаній абавязана прадаць па намінальным курсе радавым працаўнікам. Уладальнік акцый, ён жа работнік гэтага прадпрыемства, зацікаўлены ў высокіх яго дасягненнях, так як гэта прыводзіць да павелічэння яго даходу. У такім выпадку ўласнасць тут носіць як бы калектыўна-кааператыўную форму, мяняецца сацыяльная роля наёмнага работніка: з аб'екта ўздзеяння ён становіцца суб'ектам узаемадзеяння.

У былых савецкіх рэспубліках Балтыі, як адзначаюць навукоўцы, немалую выгаду працаўнікам прынесла чэкавая прыватызацыя. Так, у Літве пачатковы этап прыватызацыі даваў магчымасць персаналу купляць адносна дарагія сярэднія і буйныя па памерах прадпрыемствы за персанальныя (імянныя) прыватызацыйныя чэкі – ваўчары. Таму тут амаль 75% работнікаў прамысловых прадпрыемстваў сталіся іх мінарэтарнымі акцыянерамі. І толькі ў 1996 годзе ў Літве прыступілі да адкрытага (на тэндэрах) продажу буйных прадпрыемстваў за грошы. Але да гэтага часу ў краіне ўтварыўся шырокі пласт уласнікаў, частка з якіх стала, натуральна, паступова і цывілізавана канцэнтраваць у сваіх руках значны капітал. Эканамісты прызналі гэтую мадэль прыватызацыі сацыяльна арыентаванай і найбольш салідарызуючай таварыства [2, с. 19].

З гэтага вынікае, што адраджаць філасофію прыватнай уласнасці лепш за ўсё праз асацыяцыі ўласнікаў, дзе ўласнікамі выступаюць самі работнікі. Найбольш простай даступнай і зразумелай формай для гэтага з'яўляюцца акцыянаваныя прадпрыемствы, дзе прысутнічае ўдалае спалучэнне асабісных і грамадскіх інтарэсаў, дзе даходы ад працоўнай дзейнасці паміж працай і капіталам набліжаюцца да справядлівага размеркавання. Дадзеная праблема з'яўляецца на сёння надзённай і для іншых краін, але ў нашай рэспубліцы, як паказвае даследаванне, яна патрабуе асаблівага навуковага аналізу і практычнага вырашэння з улікам нацыянальнага менталітэту, які склаўся гістарычна, і стэрэатыпу насельніцтва. Народаўладдзе і калектывізм традыцыйна ўласцівыя беларусам пры пабудове сацыяльнай дзяржавы могуць быць адным з галоўных фактараў прагрэсу.

Свядомасць сваёй грамадскай значнасці ў асяроддзі працоўных – гэта досыць глыбока запушчаныя карані не толькі савецкага часу. Шырокае прыцягненне працоўных да кіравання на вытворчасці істотна павышае іх адказнасць за прыняцце рашэнняў, зніжае імкненне многіх з іх вінаваціць ва ўсіх цяжкасцях адміністрацыю. Упарадкаванне акцыянернай уласнасці ў Беларусі можа даць рэальную адчувальную матэрыяльную аддачу. Гэта несумненна падыме прэстыж добрасумленнай працы, зменіць гаспадарчы механізм, зробіць яго больш эфектыўным, надасць людзям упэўненасць у заўтрашнім дні. Карэнныя эканамічныя пераўтварэнні, пераход да спелага этапу сацыяльнай дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь можа ажыццявіцца ў больш кароткія тэрміны і з меншымі выдаткамі толькі праз актыўнае ўключэнне ў яго будаўніцтва максімальна большай колькасці людзей.

Рэпазіторый ВДУ

Назапашваліся супярэчнасці ў вывучаемы перыяд і ў іншых сегментах сацыяльнай сферы. У ранейшым раздзеле ўказвалася на працяглую дэпапуляцыю насельніцтва. З 1994 г. краіна знаходзілася ў рэжыме дэпапуляцыі: ад 1993 да 2015 года насельніцтва Беларусі скарацілася з 10 млн 227 тыс. да 9 млн 481 тыс. Кожны год краіна траціла насельніцтва параўнальнае з цэлымі раёнамі. Напрыклад, у 2002 годзе адбылося найбольш значнае зніжэнне колькасці насельніцтва за ўсе ўказаныя гады – на 57 922 жыхары.

На гэта меліся важкія прычыны, у тым ліку і аб'ектыўныя. Адной з іх была нізкая ступень матэрыяльнай забяспечанасці шматдзетных сем'яў. Сярод сем'яў, якія мелі траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, доля малазабяспечаных у 2009 годзе па афіцыйных дадзеных складала 32,8% [3, с. 129].

Важна адзначыць, што ў незалежнай Беларусі дадзеная праблема не засталася па-за ўвагай. Кіраўніцтва рэспублікі, заклапочанае гэтай праблемай, шукала шляхі для яе нармалізацыі. У 2011–2012 гадах былі знойдзены механізмы да яе частковага вырашэння: распрацавана стратэгія дэмаграфічнага развіцця краіны, якая мела практычную рэалізацыю. Меры падтрымкі шматдзетных сем'яў у Беларусі насілі дыферэнцыраваны і доўгатэрміновы характар. У 2012 годзе такі падыход да вырашэння гэтай праблемы меў станоўчыя вынікі: сярэднемесячны памер дапамог на дзяцей да трох гадоў вырас у два, а старэйшых за тры – у 3,3 разы. Бацькі, якія гадавалі дваіх дзяцей і больш, атрымалі права на павышаны памер стандартнага падатковага выліку, на дзяцей да трох гадоў пры наяўнасці рэцэпту ўрача – забеспячэнне бясплатным лекамі. Да таго ж на далейшае станоўчае вырашэнне пытання аб павышэнні жыццёвага ўзроўню шматдзетных сем'яў накіраваны і закон “Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей”. Закон прадугледжваў адраснасць дзяржаўнай дапамогі і ўзмацненне абароны сем'яў [4, с. 3]. Магчыма, што гэтыя і іншыя захады дзяржавы мелі станоўчыя наступствы: у 2016 годзе ў рэспубліцы меўся ўжо прырост насельніцтва больш чым на 500 чалаек.

Аднак сучасная дэмаграфічная сітуацыя (зусім нязначны прырост насельніцтва, павелічэнне ў ім долі людзей ва ўзросце больш за 65 гадоў) патрабуе комплексу дадатковых дзяржаўных мер, здольных аказаць істотны ўплыў на натуральны прырост насельніцтва краіны. Найважнейшымі фактарамі тут могуць быць вылучэнне шматдзетным сем'ям з дзяржаўнага фонду камфортнага жылля, аказанне больш значных дапамог і прадугледжванне льгот.

Мабыць неабходныя і іншыя рашэнні. Асэнсоўваючы склаўшуюся дэмаграфічную сітуацыю, варта ўлічваць сусветную тэндэнцыю: змена ў паводзінах людзей з пакалення ў пакаленне, пераход бацькоў высокаразвітых краін да нешматдзетных сем'яў. Навуковая гіпотэза, прапанаваная і абгрунтаваная эканамістамі і сацыёлагамі, заключаецца ў тым, што ў наш час бацькі сталі вышэй шанаваць сваіх дзяцей і робяць усвядомлены выбар не толькі ў сваіх, але і ў іх інтарэсах. Аддаюць перавагу нараджэнню ў свет аднаго-двух дзяцей, укладваючы ў іх чалавечы капітал істотна вышэй існуючага, чым пецярых з чалавечым капіталам нашмат ніжэй за норму [5, с. 136]. Як бачна, вопыт развітых краін сведчыць, што меры матэрыяльнага забеспячэння не заўсёды прыносяць станоўчыя вынікі. Дэмаграфічная палітыкі на

Рэпазіторый ВДУ

сярэднетэрміновую перспектыву ў Беларусі павінна ўлічваць дадзеныя абставіны. Беларускай дзяржаве неабходны мерапрыемствы па стварэнню перадумоў для стабілізацыі паказчыкаў нараджальнасці, але ў той жа час патрабуюцца практычныя захады па павялічэнню сярэдняй працягласці жыцця чалавека, зніжэнню ўзроўню смяротнасці насельніцтва.

Да ліку сур'ёзных сацыяльных праблем, якія меліся ў рэспубліцы, варта аднесці праблему падрыхтоўкі і замацавання на вытворчасці высокакваліфікаваных творчых рабочых, здольных падняць прадукцыйнасць працы на ўзровень высокаразвітых краін, вырабляць высакаякасную, тэхнічна складаную прадукцыю, якая знаходзіць попыт і ў краіне, і за мяжой. На многіх прадпрыемствах (асабліва ў металаапрацоўчай, станкабудаўнічай, у апошнія гады ў будаўнічай галіне) востра паўстала пытанне неўкамплектаванасці штатнага раскладу кваліфікаванымі спецыялістамі і рабочымі вядучых спецыяльнасцей. Гэта ж адносіцца і да працоўных з сярэдняй кваліфікацыяй і звычайнай узброеннасцю працы. У канцы 2009 года востраdэфіцытнымі на рынку працы былі вадзіцелі аўтобусаў і тралейбусаў, токары-універсалы, зваршчыкі, фрэзероўшчыкі, муляры. Не хапала слесараў шырокага профілю, маляроў, цесляроў, сталяроў, слесараў-сантэхнікаў, электрыкаў, тынкоўшчыкаў, трактарыстаў і г.д. Сфарміраваная ў ранейшыя гады сістэма прафтэхадукацыі ў рэспубліцы захавалася, але, як паказвае вывучэнне, прэстыж рабочых прафесій у краіне адчувальна знізіўся. Скараціўся прыём у прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, адпаведна, і выпуск рабочых масавых прафесій. У 2007 годзе прафесійна-тэхнічныя вучылішчы рэспублікі падрыхтавалі 48,7 тысячы рабочых сярэдняй кваліфікацыі. Такая колькасць не пакрывала нават іх натуральнага змяншэння [6, с. 2]. Зусім мала ўвагі надавалі падрыхтоўцы рабочых прадпрыемствы прыватнай уласнасці, недастаткова вылучалі на гэтыя мэты фінансавых сродкаў. Нездавальняюча вялася індывідуальная і курсавая падрыхтоўка рабочых на прадпрыемствах.

Нельга не заўважыць і такі фактар: у 2009–2015 гадах пасля дэвальвацыі нацыянальных грошай узмацніўся адток кваліфікаваных работнікаў з айчынных прадпрыемстваў і арганізацый, звязаны з выездам на працу ў іншыя краіны. Нездавальняючае кадравае забеспячэнне ўласных прадпрыемстваў адбіваецца на эфектыўнасці іх працы. На прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемствах, у будаўнічых арганізацыях адчуваецца востры дэфіцыт кваліфікаваных рабочых. На пошук працаўніка патрэбнай кваліфікацыі прадпрыемствы і арганізацыі марнуюць дарагі час. У асобных галінах працоўныя месцы запаўняліся гастарбайтэрамі, якія не мелі адпаведнай падрыхтоўкі ў высокатэхналагічнай для Беларусі вытворчасці. На асобных вытворчасцях не было належнага парадку і дысцыпліны, не выконваўся тэхналагічны стандарт. У выніку ва ўсе вывучаемыя гады (такое становішча захавалася і ў 2017 годзе) у рэспубліцы не падышлі блізка да той прадукцыйнасці працы і якасці прадукцыі, якая маецца на амерыканскіх і нямецкіх прадпрыемствах. Нашы тавары з цяжкасцю збываюцца на знешніх рынках [7, с. 2]. Вопыт мінулых (савецкіх) гадоў пацвярджае, што сёння для эфектыўнай работы прадпрыемстваў неабходна, як гэта было раней, заняцца фарміраваннем стабільных працоўных калектываў, замацаваннем на вытворчасці рабочых з высокім агульнаадукацыйным і прафесійным узроўнем.

Репозиторий ВГУ

У кадравай палітыцы дзяржавы патрабуюцца сістэмны падыход і ўзмацненне яе рэгулюючай і стымулюючай ролі ў падрыхтоўцы спецыялістаў для гаспадарчага комплексу краіны ў сярэднеспецыяльных навучальных установах і тэхнічных вучылішчах. Тут не лішнім будзе зноў напамін аб існуючай практыцы савецкага часу, калі кожнае прадпрыемства мела план прафесійнай арыентацыі, прыёму і замацавання моладзі на вытворчасці. У 1970–1980-х гадах, што прадметна даследавалася намі ў выдадзенай раней навуковай рабоце, на Беларускай чыгунцы падрыхтоўка рабочых ажыццяўлялася па 50 асноўных і 33 сумежных спецыяльнасцях. Будавалася яна на распрацаванай канцэпцыі, у якой выкладаліся патрабаванні паслядоўнага ўдасканалення прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, росту майстэрства паводле наяўнай у работніка прафесіі на працягу ўсёй яго працоўнай дзейнасці. Пры гэтым ставілася мэта – даць работніку комплекс арганічна звязаных тэарэтычных і практычных ведаў, закліканых дапамагчы яму авалодаць прафесіяй ад пачатковага да высокага ўзроўню кваліфікацыі. Для засваення новай тэхнікі і прагрэсіўных тэхналогій адкрываліся мэтавыя курсы, вялося навучанне другім спецыяльнасцям, была арганізавана работа школ па вывучэнні перадавых метадаў працы. Павышэннем кваліфікацыі кадраў масавых прафесій займаліся тысячы інструктараў вытворчага і выкладчыкаў тэарэтычнага навучання. Часцей за ўсё навучанне вялося ў падраздзяленнях, дзе навуковыя распрацоўкі і практычная дзейнасць знаходзіліся ва ўзаемасувязі, дзе была наладжана высокаэфектыўная арганізацыя вытворчасці. Як заўважыў яшчэ тады дактарант, нават пры наяўнасці дастатковай колькасці працоўнай сілы на чыгуначным транспарце Беларусі ставілася задача папаўнення працоўных калектываў кадрамі пэўнай (высокай) якасці. Менавіта такі падыход дазваляў шматтысячнаму калектыву Беларускай чыгункі быць зладжаным ва ўсіх звёнах транспартным канвеерам у сетцы чыгунак СССР [8, с. 177–178].

Досыць стройная сістэма падрыхтоўкі рабочых склалася ў гэты час ва ўсіх абласцях рэспублікі. У Віцебскай вобласці за 1966–1968 гады вучылішчы сістэмы прафтэхадукацыі падрыхтавалі і выпусцілі больш за 22 тысяч кваліфікаваных рабочых. Непасрэдна на вытворчасці на працягу 1968 года падрыхтавалі 21,5 тысячы рабочых, 45 тысяч працоўных за гэты ж час павысілі сваю кваліфікацыю [9, с. 14].

Паспяховая рэалізацыя сацыяльна-эканамічнай палітыкі на наступных этапах у Беларусі, як нам уяўляецца, будзе шмат у чым залежыць ад здольнасці дзяржавы аптымальна збалансаваць падрыхтоўку працоўнай сілы з улікам яе патрэб і попыту на сярэдне- і доўгатэрміновую перспектыву як у агульнадзяржаўным, так і ў тэрытарыяльным, і ў галіновым **маштабах**. Даследчыкі лічаць, што разам з матывацыяй працоўнай дзейнасці людзей з і адпаведным узнагароджаннем за працу, патрабуецца карэкціроўка існуючай сістэмы прафесійнай арыентацыі моладзі на працоўныя прафесіі.

**Раздзел Б. Адукацыя: стан, праблемы, шляхі іх вырашэння.** У краінах, якія ўступілі ў постіндустрыяльнае і інфармацыйнае грамадства, вялікая доля прадукцыі носіць неадчувальны характар і грунтуецца на эксплуатацыі ідэй, а не матэрыяльных прадметаў (развіваецца “бязважкая эканоміка”). Як бачна,

Рэпазіторый ВДУ

эканоміка любой краіны становіцца ўсё больш залежнай ад ведаў. Імклівы прагрэс у развіцці ўсіх галін навукі і тэхнікі забяспечваюць спецыялісты з высокім узроўнем ведаў, уменняў і навыкаў. Для краін, якія імкнуцца ўвайсці ў лік сусветных лідараў за кошт павелічэння свайго нацыянальнага капіталу, развіццё сістэмы адукацыі з'яўляецца адным з прыярытэтных пытанняў. У сувязі з гэтым у рэспубліцы мэтазгодна было б звярнуць увагу на комплекс пытанняў, звязаных з функцыянаваннем вышэйшай школы. У XXI стагоддзі Рэспубліка Беларусь увайшла ў лік дзяржаў з высокім узроўнем пісьменнасці насельніцтва (узровень пісьменнасці дарослага насельніцтва ў рэспубліцы – 99,6%). Па гэтым паказчыку Беларусь апярэджвае многія развітыя краіны. У рэспубліцы функцыянуе шырокая сетка вышэйшых навучальных устаноў (на 1 студзеня 2015 г. функцыянавала 53 ВНУ, навучалася больш за 400 тысяч студэнтаў) [1, с. 204–205]. З фармальнага пункту гледжання гэта абсалютны сусветны рэкорд.

Сёння цалкам відавочна, што разам з ростам масавасці ў вышэйшай школе з'яўляліся слабыя месцы. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы А.Р. Лукашэнка, адукацыя, стаўшы масавай і лёгкадаступнай, у чымсьці разгубіла былы аўтарытэт [2, с. 2]. Пры перагружанасці студэнцкай аўдыторыі, невысокай забяспечанасці ВНУ прафесарскім складам, нізкай зацікаўленасцю студэнтаў у развіцці сваіх пазнавальных здольнасцей дамагчыся патрабаванай на дадзеным этапе высокай якасці адукацыі немагчыма. Значная частка студэнтаў, выкарыстоўваючы легкаважнасць выпрабавальнай сістэмы на ўступных іспытах, зарыентавана на атрыманне дыплома, не выяўляючы пры гэтым стараннасці ў засваенні дысцыплін і набыцці практычных навыкаў і ўменняў у выбранай прафесіі. Цяперашняя сітуацыя адлюстроўвае неапраўдана нарастаючы з кожным годам (пачынаючы з 1994 года) колькасны рост студэнтаў вышэйшай школы, што парушыла прапарцыянальнасць у падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай кваліфікацыі, ускладніла працу па сацыяльнай арыентацыі і набору моладзі ў навучальныя ўстановы, якія рыхтуюць рабочых масавых прафесій і спецыялістаў сярэдняга звяна. Так, медыцынскія ўстановы краіны адчуваюць востры дэфіцыт у сярэднім медыцынскім персанале. Попыт на медыцынскіх сясцёр у гарадах рэспублікі ў 2013 годзе амаль у 50 разоў перавышаў прапанову. Не цалкам укамплектаваныя гэтымі пасадамі паліклінікі і бальніцы ў сельскай мясцовасці [3, с. 3].

Асвятляючы дадзеную праблему, аўтар задаецца пытаннем "Хто прыйдзе праз пару гадоў на змену ў бальніцы і паліклінікі?" (Гаворка ідзе пра медсясцёр). У артыкуле, у асноўным, зроблена правільная і прафесійная выснова па гэтай праблеме, раскрыты прычыны недабору вучняў у медыцынскія каледжы на бюджэтныя месцы па дадзенай спецыяльнасці. Гэта – наступствы дэмаграфічнай сітуацыі, высокі кошт жылля ў сталіцы для наймальнікаў, невысокая зарплата медсясцёр пры высокай нагрузцы і іншыя фактары. Аўтару, на наш погляд, варта было б абавязкова адзначыць відавочнае: урад, міністэрствы і ведамствы краіны, функцыяй якіх з'яўляецца прагназаванне і своечасовае вырашэнне гэтых задач, не змаглі ацаніць стан з падрыхтоўкай работнікаў дэфіцытных у рэспубліцы спецыяльнасцей. У адукацыйнай палітыцы дзяржавы не быў забяспечаны сістэмны падыход і ўзмацненне яго рэгулюючай і стымулюючай ролі ў

Рэпазіторый ВДУ

падрыхтоўцы спецыялістаў для гаспадарчага комплексу краіны ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах і тэхнічных вучылішчах.

Калі ў самы бліжэйшы час не адрэгуляваць сітуацыю, то падобная дыспрапорцыя, як адзначалася на працоўнай сустрэчы Прэзідэнта А.Р. Лукашэнкі са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу (у той час акадэмікам А. Рубінавым), можа ў канчатковым выніку нанесці шкоду эканоміцы краіны [4, с. 2]. Такая выснова кіраўніка дзяржавы заснавана на рэальным становішчы. Сапраўды, за масавасцю вышэйшай школы хаваюцца сур'ёзныя праблемы. Неапраўдана завышаны колькасны рост студэнтаў вышэйшай школы, што адлюстроўваецца цяперашняй сітуацыяй, парушае прапарцыянальнасць у падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай кваліфікацыі, ускладняе працу па сацыяльнай арыентацыі і набору моладзі ў навучальныя ўстановы, якія рыхтуюць рабочых масавых прафесій. Адначасова ствараецца сітуацыя перагружанасці студэнцкай аўдыторыі, ідзе зніжэнне такога важнага крытэрыю адукацыйнага працэсу, як забяспечанасць ВНУ прафесарскім складам адносна студэнцкага кантынгенту. Выкарыстоўваючы легкаважнасць выпрабавальнай сістэмы, значная частка людзей уліваецца ў студэнцкую аўдыторыю абсалютна не гатовымі і, што больш важна, з адсутнасцю зацікаўленасці ў развіцці сваіх пазнавальных здольнасцей. З першага да апошняга курса яны зарыентаваныя на атрыманне дыплома, не выяўляючы пры гэтым стараннасці ў засваенні дысцыплін і набыцці практычных навыкаў і ўменняў у выбранай прафесіі. У такім варыянце адсутнічае сацыяльны заказ на адукаванасць. Абсалютызацыя фінансавага складніку, павелічэнне долі студэнтаў, якія навучаюцца на платнай аснове, што назіраецца ў апошнія гады ў адукацыйнай сістэме, ставяць у складанае становішча не толькі кіраўніцтва ВНУ, але і выкладчыкаў. Прафесар, непрымаючы прафанацыі ў адукацыі, выстаўляючы на экзамене студэнту, які атрымлівае адукацыю за кошт уласных сродкаў, нездавальняючую ацэнку (што ён робіць цяпер вельмі рэдка), бачыць сябе ў ролі чалавека, які падрывае фінансавы стан сваёй установы і свайго асабістага бюджэту.

Маюцца сур'ёзныя цяжкасці ў працаўладкаванні выпускнікоў ВНУ. У бягучым перыядзе вялікая колькасць выпускнікоў не была запатрабаванай на рынку працы, з шмат тых, хто не змог рэалізаваць сябе з карысцю для сям'і і грамадства. Перанасычаным апынуўся рынак працы эканамістамі, менеджарамі, юрыстамі. Значная частка выпускнікоў вышэйшай школы займаліся пошукам працы самастойна і знаходзіліся па-за полем зроку службы занятасці. У рабоце вышэйшай школы паўстаў парадокс: людзей з вышэйшай адукацыяй у краіне шмат, але не хапае сапраўдных спецыялістаў з наборам сучасных ведаў. Такое становішча зніжае прэстыж вышэйшай школы, дэфармуе сістэму стымулаў навучальнага працэсу ў ёй, аслабляе прафесійна-кваліфікацыйны ўзровень выпускаемых спецыялістаў, якія з'яўляюцца асноўным фактарам сацыяльна-эканамічнага і культурна-тэхнічнага росту грамадства ў сучаснасці і будучыні.

Шляхі вырашэння штодзённых праблем вышэйшай школы знаходзяцца, як уяўляецца даследчыкам, ва ўдасканаленні сістэмы адбору моладзі для вучобы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны.

Як вядома, шлях да ведаў цяжкі, навучальны працэс у ВНУ патрабуе ад чалавека высокай канцэнтрацыі і грунтоўнай падрыхтоўкі па прадметах

школьнай праграмы. У краінах Еўрапейскага саюза і ў Японіі прызнана, што не больш за 40% выпускнікоў агульнаадукацыйных школ здольныя фундаментальна асвойваць праграму вышэйшай школы [5, с. 4]. У нашай краіне гэтыя дадзеныя, хутчэй за ўсё, аналагічныя. Такая ж частка выпускнікоў агульнаадукацыйнай школы (а хутчэй за крыху больш, чым у Японіі) не гатовыя да канцэнтраваных дзеянняў і пераадолення цяжкасцей у статусе студэнта.

Цяперашняя дэмаграфічная сітуацыя ў краіне, узважаны падыход да ацэнкі выпускнікоў агульнаадукацыйнай школы прыводзяць да высновы: менеджмент адукацыі вышэйшай школы рэспублікі можа стаць больш суразмерным сучасным патрабаванням, калі змяніць крытэрыі адбору студэнцкага кантынгенту. Сёння, як і раней, актуальным пытаннем вышэйшай школы з'яўляецца адбор ва ўстановы такога тыпу таленавітай моладзі.

Ва ўсе часы галоўным клопатам дзяржавы была і застанецца якасць адукацыі. Адзнакай якасці з'яўляецца паўната атрыманых ведаў, навыкаў і ўменняў, адпавядаючых сучасным патрабаванням навукі, эканомікі, тэхнікі і сацыяльнай сферы. Задача дзяржавы – забяспечыць у рэчаіснасці атрымання ўсімі грамадзянамі Беларусі якаснай адукацыі, пастаяннага абнаўлення ведаў з мэтай іх эфектыўнага прымянення ў навуковай і практычнай дзейнасці. Неабходна падняць на некалькі парадкаў вышэй паказчыкі ўзроўню ведаў, набытых навучэнцамі ў сярэдняй школе і абітурыентамі на ўступных іспытах, чым тыя, якія існавалі на працягу апошніх 10–15 гадоў. Толькі такі падыход (гэта пацвярджаецца сусветнай практыкай, гэты ж пункт гледжання падзяляюць рэктары вышэйшых навучальных устаноў) з'яўляецца паказчыкам гатоўнасці маладога чалавека да пастаяннай высокай нагрузкі, самаўдасканалення праз усвядомленае стаўленне да навучальнага працэсу [4, с. 4].

Развіццё вышэйшай школы не можа не ўлічваць сусветных працэсаў і тэндэнцый. На першым месцы пры камплектаванні студэнцкай аўдыторыі павінен быць прагноз запатрабаванасці спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў гаспадарчым і сацыяльна-культурным комплексе як на цяперашнім этапе, так і на вядомую перспектыву. Змена тэхналагічнага ўкладу ў краіне на больш высокі патрабуе аператыўнай распрацоўкі і штогадовага абнаўлення Міністэрствам адукацыі нацыянальнай сістэмы спецыяльнасцей і спецыялізацый з улікам адаптаванасці прафесійных кваліфікацый ў бізнес-асяроддзе.

Існуючы на сёння ўзровень навукова-тэхнічнага прагрэсу ў прамысловасці, як лічаць спецыялісты, вырашаўся ў рэспубліцы ва ўмовах яе суверэнітэту, шмат у чым, за кошт выкарыстання даволі магутнага запасу савецкага часу (савецкага рэсурсу). У 1990 годзе расходы на развіццё навуковай сферы ў БССР складалі прыкладна 2,6% нацыянальнага даходу. На працягу апошніх 20 гадоў выдзяляемыя сродкі на навуку ў рэспубліцы знаходзіліся ў межах 1% ВУП [6, с. 6]. Сусветная практыка прызнае такую датацыю навуковай сферы крытычнай велічынёй для нармальнага ўзнаўлення навукова-тэхнічнага патэнцыялу любой краіны. Так, вядомы дзяржаўны дзеяч і палітык, акадэмік Яўген Прымакоў, падвяргаючы крытыцы ўрад Расійскай Федэрацыі, назваў становішча з фінансаваннем навукі ў сваёй краіне вельмі трывожным. У 2013 годзе дзяржаўныя і прыватныя выдаткі на навуку ў Расіі на аднаго даследчыка складалі 39 тысяч, у той час як у Кітаі – 74 тысячы, у ЗША –

Рэпазіторый ВДУ

293 тысячы долараў. Такі стан акадэмік патлумачыў не толькі адставаннем, але і сур'ёзным разрывам. Без фінансавага ўлівання ў адукацыю і навуку, падкрэсліў ён, не будзе інавацыйнага развіцця краіны і мадэрнізацыі. Не будзе вырашацца і дэмаграфічная сітуацыя.

Становішча, калі з 6 тысяч вызначальных тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца ў цяперашні час у эканоміцы Рэспублікі Беларусь, 79% ставяцца да традыцыйных, 15,8% – да новых і толькі 5,2% – да высокіх, хутчэй за ўсё, крыецца ў тых жа прычынах, што і ў Расіі [7, с. 67].

Сур'ёзнае адставанне ад вядучых краін у найважнейшым паказчыку, які найбольш поўна характарызуе эфектыўнасць вытворчасці, – прадукцыйнасць працы пацвярджае, што сёння эканоміка Беларусі мае вострую патрэбу ў высокай кваліфікацыі спецыялістаў тэхнічных спецыяльнасцей, здольных распрацоўваць і ўкараняць у вытворчасць новыя высокія тэхналогіі. Так, прадукцыйнасць працы ў 2012 годзе (тыс. дол. на чалавека) у Беларусі ў сярэднім па эканоміцы была толькі каля 14 тыс., у той час як у ЗША яна раўнялася 105,7 дол., у Германіі – 81,2, у Нарвегіі – 192,8 дол. [8, с 3] Кампетэнтных спецыялістаў сусветнага ўзроўню могуць і павінны рыхтаваць ВНУ рэспублікі, уся сістэма адукацыі і выхавання. Адукацыйныя ўстановы павінны быць прасякнуты культам вучобы і культам ведаў.

Згодна з фундаментальнымі дакументамі, Рэспубліка Беларусь трымае арыенцір на перадавыя краіны, дзе маецца пастаянная накіраванасць на паскоранае развіццё эканомікі за кошт доўгатэрміновых фактараў, да якіх ставяцца новыя высокія тэхналогіі. Тады ў дадзеным кантэксце больш правільным падыходам да дзейнасці вышэйшай школы можа быць арыентацыя не на колькасныя, а на якасныя паказчыкі, на высокі канчатковы вынік, на фарміраванне глыбокіх і трывалых ведаў, высокай кампетэнтнасці ў сваіх выпускнікоў. Пры такім падыходзе штогод у ВНУ рэспублікі, як паказвае аналіз, магчыма было б аптымальна адбіраць і залічваць прыкладна 35–45 тысяч студэнтаў. 170–200 тысяч навучэнцаў у вышэйшай школе для краіны з насельніцтвам менш 10-ці мільёнаў – разумнае размеркаванне наяўнага кадравага патэнцыялу. Зніжэнне агульнай колькасці студэнтаў ВНУ ліквідуе існуючыя непрапарцыянальныя суадносіны ў падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай і сярэднеспецыяльнай адукацыяй, а таксама рабочых масавых прафесій для высокатэхналагічнай вытворчасці.

Праблемным застаецца пакуль не даведзенае да лагічнага завяршэння пытанне аб стаўленні дзяржавы да таго сацыяльнага пласта людзей, якія займаюцца інтэлектуальнай працай. Тэмпы росту заработнай платы педагога агульнаадукацыйнай школы, тэхнікума, ВНУ на этапе 1991–2015 гадоў адставалі ад заробку работнікаў галін прамысловасці [9, с. 2]. У выніку праца настаўніка, педагога сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школы, без якога і гаворкі быць не можа ні пра якую культуру, абясцэньваецца, губляе свой прэстыж. Нягледзячы на росквіт інфармацыйных тэхналогій навучання, педагогіка ВНУ, іншых навучальных установ ніколі не абыдзецца без настаўніка, дацэнта, прафесара, якія ўвасабляюць сутнасць адукацыі, з'яўляюцца цэментуючым ядром адукацыйнай сістэмы, здольнай забяспечыць неабходнае высокую якасць



Репозиторий ВГУ

адукацыі, захаваць і прымножыць у сваіх выпускнікоў традыцыйна ўласцівыя беларускаму народу духоўныя і маральныя ідэалы.

Адсюль выцякае неабходнасць па-новаму падысці да фарміравання аптымальнай дзяржаўнай кадравай палітыкі ў сферы адукацыі. Бліжэйшая задача дня – паставіць народнага настаўніка (у шырокім плане гэта – чалавек, які ажыццяўляе адукацыйны і выхаваўчы працэс) на тую вышыню, якая яму прызначалася яшчэ ў Расійскай імперыі, дэкларавалася пад час станаўлення савецкай улады, адводзілася, з невялікімі збоямі, у СССР. Дзяржаве ва ўсіх адносінах карысна замацоўваць у сістэме адукацыі людзей з высокім узроўнем педагагічнай і навуковай кваліфікацыі. У вышэйшай школе асабліва беражліва варта ставіцца да людзей са статусам прафесара, якія з'яўляюцца цэментаваным ядром кафедральных аб'яднанняў і надзейнай апорай дзяржавы. Таму нават у складаных фінансава-эканамічных умовах дзяржаўная палітыка ў галіне аплаты працы навукоўцаў, педагагічных работнікаў павінна гарантаваць ім сацыяльную абароненасць і годнае матэрыяльнае ўзнагароджанне, што з'яўляецца найважнейшым фактарам павышэння прэстыжу і якасці іх працы, замацавання самых адораных, кампетэнтных і крэатыўных людзей у творчым працэсе развіцця высокатэхналагічнага сектара эканомікі, а таксама ў адукацыйных і выхаваўчых установах.

Аплата працы школьнага педагога не адзіная праблема, якая патрабуе неадкладнага рашэння. Планамерная падрыхтоўка высокапрафесійных настаўнікаў, вяртанне ў школу тых, хто яе пакінуў (сышоў гандляваць на рэчавы рынак, у іншыя сферы), адбудзецца пры дэбюракратызацыі сістэмы адукацыі, стварэнні настаўніку ўмоў для якаснага выканання яго чыста прафесійных абавязкаў. Забеспячэнне якаснай адукацыі ў агульнаадукацыйнай школе несумяшчальна з тэндэнцыяй павелічэння нагрузкі (што адбываецца ў апошнія гады ў рэальным жыцці з мэтай павелічэння зарплаты).

Вывучэнне і аналіз дзейнасці ўсіх структур, якія складаюць адукацыю, улік меркавання людзей, занятых у кіруючым звяне сістэмы адукацыі і ў самым адукацыйным працэсе, прыводзяць да высновы: у адукацыі насельніцтва неабходна выкараніць існуючыя супярэчнасці. Дзяржава павінна прызнаць, што найбольш надзейныя і выгадныя інвестыцыі ў чалавечы капітал – гэта тыя, што яна вылучае на адукацыю. Наяўнасць якаснай адукацыі – неабходная ўмова падрыхтоўкі чалавека да жыцця і працы. У краіне наспела сітуацыя для тэрміновага прыняцця комплекснай дзяржаўнай праграмы па сцвярджэнні сапраўднага аўтарытэту адукацыі ў грамадстве, а таксама закона аб сацыяльным статусе настаўніка. Самае галоўнае, каб у дадзеных дакументах былі прапісаны механізмы перакладу дэклараваных палажэнняў аб сацыяльнай справядлівасці ў адносінах да людзей, якім адводзіцца вядучая роля ў рэалізацыі прыярытэтнага напрамку ўнутранай палітыкі Рэспублікі Беларусь, у плоскасць практычных дзеянняў усіх галін дзяржаўнай улады ў супрацоўніцтве з грамадскімі інстытутамі. З надзяленнем педагога, народнага настаўніка належным для яго статусам узрасце эфектыўнасць нацыянальнай сістэмы адукацыі і выхавання маладога пакалення, што і стане асновай стварэння ў краіне інавацыйнай эканомікі.

Рэпазіторый ВГУ

## Літаратура

### Раздзел А. Акцыянаванне, дэмаграфія, падрыхтоўка рабочы: аналіз якасці


1. Мандрик, И.В. Профсоюзы как субъект социальной сплоченности общества / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2010. – № 2.
2. Симонян, Р. Россия и страны Балтии / Р. Симонян. – М., 2003.
3. Сечко, Н.Н. Малообеспеченность белорусского населения как социальная проблема / Н.Н. Сечко // Социальное знание и белорусское общество. – Минск: Право и экономика, 2009.
4. Дранюк, В. Обыкновенное и великое чудо / В. Дранюк // СБ. Беларусь сегодня. – 2013. –11 янв.
5. Демографическая модернизация России в XX веке // Общественные науки и современность. – 2007. – № 3. – С. 128–140.
6. Клюйко, А. Сістэма адукацыі выканала ўсе сацыяльна-эканамічныя паказчыкі / А. Клюйко // Настаўніцкая газета. – 2008. – 29 студз.
7. Лукашенко, А.Г. Независимость – это звучит гордо. Выступление Президента на торжественном собрании, посвященном Дню Независимости Республики Беларусь, 1 июля 2013 г. / А.Г. Лукашенко // СБ. Беларусь сегодня. – 2013. – 2 июля.
8. Мандрик, И.В. Развитие железнодорожного транспорта республики в 1970–1991 гг.: состояние, проблемы, уроки : монография для науч. и практ. работников по специальности 07.00.02 / И.В. Мандрик // Витебск: УО «ВГТУ», 2003. – 218 с.
9. Государственный архив Витебской области. – Ф. 1. Оп. 121. Д. 55.


### Раздзел Б. Адукацыя: стан, праблемы і шляхі іх вырашэння


1. Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2009.
2. Лукашенко, А.Г. Завтра твоей страны / А.Г. Лукашенко // Советская Белоруссия. – 2013. – 30 окт.
3. Юлія Васіліцына. Медсястра на вагу золата / Юлія Васіліцына // Савецкая Беларусь. – 2013. – 9 ліст. – С. 3.
4. По сообщениям пресс-службы Президента Респ. Беларусь // СБ. Беларусь сегодня. – 2013. – 10 сент. – С. 2.
5. Маскевич, С. Проходные баллы строят по ранжиру / С. Маскевич // СБ. Беларусь сегодня. – 2013. – 27 февр.
6. Сюльжина, А. Плоды невиданных идей / А. Сюльжина, А. Кириленко // СБ. Беларусь сегодня. – 2013. – 10 окт.
7. Оргиш, В. Беларусь: постиндустриальный шок неизбежен?! Народная Воля / В. Оргиш. – 2016. – 29 сак.
8. Бертош, Е.В. Воздействие международного трансфера технологий на национальную экономику: теоретический и практический аспект / Е.В. Бертош // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. – 2012. – № 1.
9. Будкевич, В. Интервью с зам. министра образования Респ. Беларусь / В. Будкевич // Беларускі час. – 2013. – 1–7 сак.


Репозиторий ВГТУ

# Г Л А В А 10
# Прафсаюзы ў грамадска-палітычнай сістэме дзяржавы, пераход ад канфрантацыі да партнёрскіх адносін

Дадзеная і наступныя главы даследавання – частка пазначанай у даследаванні праблемы. У гэтай частцы манаграфіі сістэматызуецца дзейнасць прафсаюзнага руху Беларусі, на якое гістарычна ўскладзены ахоўныя, прадстаўнічыя, кіраўніцкія і кантрольныя функцыі. Тут упершыню разглядаюцца (у гістарычным аспекце) спецыфічныя асаблівасці паводзін прафсаюзаў у калектыўна-дагаворным працэсе ў планава-дырэктыўнай эканоміцы і сацыяльна-палітычнай, эканамічнай і прававой прасторы, якая пастаянна змяняецца. Вызначаецца месца прафсаюзаў у структуры грамадства і іх роля ў працэсе станаўлення сацыяльна арыентаванай дзяржавы.

Актуальнасць выдзялення дадзенай праблемы абумоўлена неабходнасцю пошуку эфектыўных падыходаў для дасягнення кампрамісаў, кансенсусу пры вырашэнні ўзнікаючых супярэчнасцей у сацыяльна-працоўнай сферы паміж работнікамі (іх інтарэсы прадстаўляюць прафсаюзы), наймальнікамі і ўладнымі структурамі падчас станаўлення сацыяльнай дзяржавы. Значэнне разглядаемай у гэтай частцы даследавання праблемы заключаецца таксама і ў тым, што раскрыццё формаў і метадаў цывілізаванага супрацоўніцтва прафсаюзаў з дзяржаўнымі структурамі і наймальнікамі ўносіць яснасць у стварэнне эфектыўнай сістэмы сацыяльнай абароны грамадзян, садзейнічае фарміраванню згуртаванасці беларускага грамадства.

Мэта даследавання – выяўленне стану ўзаемадзеяння самай масавай і мэтавай арганізацыяй краіны з дзяржаўнымі структурамі і наймальнікамі ў сістэме сацыяльнага партнёрства пры забяспячэнні працоўных і сацыяльна-эканамічных інтарэсаў наёмных работнікаў і пошук шляхоў аптымізацыі іх узаемаадносін.

Пастаўленая мэта даследавання патрабавала вырашэння наступных задач:

– выявіць супярэчнасці паміж суб’ектамі, якія вызначаюць сацыяльна-эканамічную палітыку ў Рэспубліцы Беларусь (дзяржаўнымі структурамі, наймальнікамі і прафсаюзамі) у пачатковым этапе пераходу да рынačных адносін (1991–2002 гг.);

– даследаваць аб’ектыўныя перадумовы і карыснасць цывілізаваных формаў ажыццяўлення сацыяльнага партнёрства паміж дзяржавай, працадаўцамі і прадстаўнікамі наёмных работнікаў – прафсаюзамі ў сацыяльна-працоўнай сферы;

– разгледзіць генезіс ідэй аб рэгуляванні працоўных адносін і сацыяльнай абароны ў кантэксце грамадска-гістарычнага развіцця ў краінах, якія сталі на шлях індустрыяльнага развіцця;

– паказаць месца і ролю прафсаюзнага руху ў сістэме сацыяльна-



Рэпазіторый ВГУ

працоўных адносін у планава-дырэктыўнай эканоміцы і спецыфічныя асаблівасці ўдзелу прафсаюзаў Беларусі ў калектыўна-дагаворным працэсе пры пераходзе да рыначнай эканомікі;

– раскрыць формы і метады ўзгодненага ўзаемадзеяння дзяржавы, наймальнікаў і прафсаюзаў у сістэме сацыяльнага партнёрства ва ўмовах мадэрнізацыі беларускай эканомікі ў вывучаемы перыяд;

– зрабіць высновы і прапановы па ўдасканаленні формаў і метадаў у дзейнасці дзяржаўных структур, калегіяльных органаў наймальнікаў і грамадскіх арганізацый у час станаўлення сацыяльнай дзяржавы.

Матэрыялам для даследавання дадзенага раздзела паслужылі палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, канвенцый і рэкамендацый Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Указы Прэзідэнта краіны, якія прадугледжваюць рэгуляванне дзяржавай адносін у сацыяльна-працоўнай сферы паміж органамі дзяржаўнага кіравання, аб’яднаннямі наймальнікаў і прафесійнымі саюзамі на прынцыпах сацыяльнага партнёрства і ўзаемадзеяння бакоў. Выкарыстоўваліся таксама фундаментальныя працы навукоўцаў індустрыяльна развітых краін, у якіх аналізуецца дзейнасць сацыяльных партнёраў па фарміраванню і станаўленню сацыяльнай дзяржавы, здольнай забяспечыць рэальнае раўнапраўе як асобных індывідаў, так і ўсіх груп і пластоў грамадства.

Палажэнні і высновы ў даследаванні сфармуляваны на аснове працэсаў, якія адбываюцца ў беларускім грамадстве, дзе прафсаюзы на працягу ўсёй сваёй гісторыі з’яўляюцца важным сацыяльным інстытутам.

Гістарычны экскурс дазваляе адзначыць, што прафсаюзы ва ўсіх краінах з часу іх утварэння аказваюць пазітыўнае ўздзеянне на развіццё і захаванне працоўнага патэнцыялу грамадства. Яны выконваюць важную ролю ў выпрацоўцы і ажыццяўленні сацыяльнай палітыкі. Прафсаюзы, як самая масавая і шматмэтавая з усіх грамадскіх арганізацый працоўных, паўсталі і існуюць у сувязі з аб’ектыўнай патрэбай. З пачаткам і развіццём буйной прамысловай вытворчасці хутка расла і набірала сілу гандлёва-прамысловая буржуазія, з’явіўся і рос сучасны рабочы клас. Станаўленне буйной машыннай індустрыі, фарміраванне буржуазіі і прамысловага пралетарыяту было прагрэсіўнай з’явай. У той жа час у краінах, якія сталі на шлях індустрыяльнага развіцця, адразу ж выразна праявіліся складанасці ва ўзаемаадносінах паміж гэтымі класамі. Імкненне ўласнікаў да атрымання высокага прыбытку і мінімізацыі выдаткаў на працоўную сілу і на зарплату прыводзіла да высокай ступені эксплуатацыі наёмных работнікаў. Неверагодна цяжкія ўмовы працы, нізкая заработная плата, да таго ж і адсутнасць дэмакратычных свабодаў, спараджалі незадаволенасць і пратэсты працоўных. У 1861 годзе кіраўнік каталіцкай царквы Леў XIII у сваёй энцыкліцы “Эверум новарум” (Новых рэчаў дакранаюся я), адзначаючы сур’ёзную пагрозу рабочага пытання для стабільнасці грамадства, апісаў нечалавечыя ўмовы працы і побыту еўрапейскіх рабочых, іх поўнае бяспраўе. Энцыкліка гучала як суровае абвінавачванне сацыяльнай безадказнасці ўлады і капіталізму, як сур’ёзнае папярэджанне аб магчымых катастрафічных сацыяльных наступствах гэтага становішча. Натуральна, што асэнсаванне тых працэсаў грамадскага развіцця прывяло новае пакаленне працоўнага класа да



Рэпазіторый ВДУ

неабходнасці сумеснай абароны сваіх законных правоў і інтарэсаў. Гістарычна склалася так, што ў развітых краінах самымі структураванымі масавымі грамадскімі арганізацыямі, якія аб'ядналі намаганні наёмных работнікаў у патрабаванні за годныя ўмовы працы, адпавядаючыя намаганням у працы, своечасовасць яе выплаты, з'яўляліся прафсаюзы.

У Англіі, якая ў ліку першых правяла прамысловы пераварот і дзе працоўны клас падвяргаўся высокай ступені эксплуатацыі, аб'яднанне рабочых у прафесійныя арганізацыі пачалося ўжо ў другой палове XVIII стагоддзя. Масавым рухам трэд-юніянізм тут стаў пасля адмены антырабочага заканадаўства. У ЗША, Францыі, Расіі, іншых краінах станаўленне і развіццё прафсаюзнага руху адбывалася пазней, але ў цэлым па англійскім ўзоры [1]. Першапачаткова пад уплывам рэчаіснасці наёмныя работнікі ў большасці краін свету стварылі арганізацыі для аб'яднання намаганняў у адстойванні сваіх патрабаванняў да ўласнікаў, якія не выходзілі за рамкі свайго прадпрыемства, іх дзеянні насілі спарадычны характар.

У Беларусі прафсаюзы ўтварыліся больш за 110 гадоў таму, гісторыя іх стварэння мела як агульныя рысы, характэрныя для еўрапейскага і сусветнага прафсаюзнага руху ўвогуле, так і адметныя, абумоўленыя наяўнасцю нацыянальнага фактару і спецыфікай развіцця рэгіёну. Да 1917 году стварэнне і развіццё прафесійных аб'яднанняў тут было непарыўна звязана з агульнарасійскім прафсаюзным рухам, мала адрознівалася ад працэсаў станаўлення, якія былі ўласцівы іншым краінам. Першыя прафесійныя арганізацыі рабочых у гарадах Беларусі ўзніклі ў канцы 80-х гадоў XIX стагоддзя. Іх з'яўленне было звязана з рэвалюцыйнымі сацыял-дэмакратычнымі гурткамі і групамі.

Як правіла, прафесийныя арганізацыі існавалі ў мэтах падтрымкі сваіх членаў у форме рабочых гурткоў, цэхавых сходак, стачачных кас, кас узаемадапамогі, бальнічных і пахавальных кас і інш. На Віцебшчыне адна з першых стачачных кас зафіксавана ў Бешанковічах Лепельскага павета ў 1899 г. На думку вядомага беларускага гісторыка М. Біча ў гэты перыяд на тэрыторыі Беларусі найбольшай актыўнасцю адрозніваліся працоўныя Віцебска [2, с. 132–133]. Адным з першых калектыўных выступленняў была стачка рабочых на Віцебскай шчаціннай фабрыцы, у выніку якой працоўныя дамагліся скарачэння рабочага часу з 16 да 12 гадзін. У 1897–1900 гг. у гарадах Віцебскай губерні ў забастовачным і страйкавым руху прынялі ўдзел да 3600 чалавек. У 1900 годзе двойчы страйкавалі рабочыя тытунёва-махорачнай фабрыкі.

Якасна новую старонку ў рабочым руху Беларусі, якая характарызавалася стварэннем прафсаюзаў па вытворчым прыкметам, адкрыў 1904 год. У ліку першых стварылі прафсаюзную арганізацыю віцебскія гарбары (1904 г.). Разгортванне страйкавай барацьбы патрабавала далейшага згуртавання рабочых. У гэтым годзе адбываецца масавае стварэнне прафсаюзаў па вытворчаму прынцыпу практычна ва ўсіх буйных гарадах Беларусі: Гомелі, Віцебску, Оршы, Магілёве і інш. Ствараліся прафсаюзы, як і ў іншых краінах, для абароны працоўных і, як сёння прынята казаць, сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў работнікаў розных прафесій [3, с. 4–11].



Рэпазіторый ВДУ

На этапе ўзнікнення дзейнасць прафсаюзаў у асноўным абмяжоўвалася патрабаваннем скарачэння працоўнага часу, стварэння больш бяспечных умоў працы і павелічэння аплаты за працу. З боку дзяржавы і гаспадароў прадпрыемстваў нават такая дзейнасць прафсаюзаў падвяргалася жорсткім ганенням. Нездаровая тэндэнцыя прымушала бакі шукаць шляхі пераходу ад супрацьстаяння да супрацоўніцтва. Для таго каб мець рэальную прававую аснову для ўдзелу ў адстойванні правоў і інтарэсаў работнікаў і іх сем'яў, створаныя асацыяцыі прафсаюзаў, сталі грунтоўна абапірацца на навуковы патэнцыял.

Першапачаткова абмеркаванне праблем эканамічных адносін паміж прафсаюзамі, як прадстаўнікамі наёмных рабочых і працадаўцамі, вялося на аснове распрацаваных раней тэорый аб справядлівым ўладкаванні грамадства, сацыяльнай роўнасці людзей з адсутнасцю эксплуатацыі чалавека чалавекам. Прафсаюзныя асацыяцыі патрабавалі справядлівага размеркавання даходаў паміж працай і капіталам забеспячэння ўсеагульнай даступнасці людзей да асноўных сацыяльных выгад.

З цягам часу навукоўцы і кіраўнікі прафсаюзнага руху пераходзяць да тэматыкі, прысвечанай стварэнню і дзейнасці саміх прафсаюзных асацыяцый, ролі ў арганізацыі калектыўнай абароны ад эксплуатацыі і ажыццяўленні эканамічнага і грамадскага прагрэсу.

Першую грунтоўную тэарэтычную распрацоўку пытання аб прафсаюзах магчыма знайсці ў матэрыялах Кангрэса Грамадства рабочых, які праходзіў у Жэневе ў верасні 1886 года. Рэзалюцыя, прынятая ўдзельнікамі Кангрэса, адзначыла прыроду прафсаюзаў такімі словамі: капітал з'яўляецца канцэнтрыраванай грамадскай сілай, тады як працоўныя валодаюць толькі сваёй рабочай сілай. Сацыяльная сіла рабочых мае сэнс і вес толькі ў іх колькасці. Аднак моц колькасці рабочых ануліруецца іх размежаванасцю. Таму прафсаюзы становяцца арганізацыйнымі цэнтрамі працоўных, і іх дзейнасць у пытаннях заработнай платы і працоўнага часу законная, неабходная, і без яе немагчыма абысціся пры існуючым спосабе вытворчасці [4, с. 200–201].

Гэтую ж тэзу пазней падцвердзіў і заснавальнік рускай сацыял-дэмакратыі Г.В. Пляханаў. У 1905 г. ён пісаў: “Калі імкненне рабочых да палітычнай свабоды разлілося шырокай хваляй па зямлі рускай, то яшчэ больш шырокай хваляй разліваецца імкненне іх да дзейнасці і сяброўскай абароне сваіх эканамічных інтарэсаў. Здаецца, не было такой галіны працы, куды не пранікала б думка аб прафсаюзных арганізацыях...” І далей ён удакладняе: “Нам неабходна паскорыць гэты немінучы працэс планамернай агітацыі за стварэнне прафесіянальных саюзаў” [5, с. 7].

На наступных этапах падрыхтаван вялікі стос прац аб месце і сацыяльнай ролі прафсаюзных арганізацый. Склалася досыць шырокая і разнастайная тэматыка навуковых прац аб стварэнні сістэмы, здольнай рэгуляваць сацыяльна-працоўныя адносіны з удзелам прафсаюзаў. Аўтары ўсё больш надавалі ўвагу пытанням удзелу прафсаюзаў у вырашэнні агульнадзяржаўных, агульнанацыянальных задач, зместу нацыянальных мадэляў, якія рэгулююць адносіны ў сацыяльна-працоўнай сферы паміж органамі дзяржаўнага кіравання, аб'яднаннямі наймальнікаў і прафесійнымі саюзамі. Агульнымі намаганнямі

Репозиторий ВГУ

гісторыкаў падрыхтаваны фундаментальныя дакументальна-гістарычныя працы па асобных праблемах прафсаюзнага руху, напісаны і абаронены дысертацыі, выданы манаграфіі і артыкулы па асвятленню шматграннай працы прафсаюзных камітэтаў і арганізацый.

На сёння ў навуковых працах склалася агульнае меркаванне, што ў краінах са свабоднай рыначнай эканомікай у асноўным сфарміравалася сістэма сацыяльнага партнёрства, пабудаваная на цесным узаемадзеянні трох бакоў – дзяржава, прафсаюзы, наймальнікі, што дазваляе найбольш разумным і эфектыўным спосабам праводзіць карэнныя перамены ў вытворчай і сацыяльнай сферы ў мэтах стварэння аптымальных умоў і магчымасцей для найбольш поўнай рэалізацыі неад'емных правоў і свабод чалавека, уключаючы права кожнага чалавека на годнае жыццё. Разам з тым у працах адзначаецца патрэба ў пастаяннай пільнай увазе да гэтай жыццёва важнай праблемы. Неабходнасць выклікана тым, што, як ужо адзначалася вышэй, нягледзячы на даволі значны перыяд станаўлення сацыяльнага партнёрства ў краінах з рыначнай эканомікай, маецца яшчэ нямала прыкладаў, калі сацыяльныя партнёры знаходзяцца ў складаным становішчы. Як правіла, гэта адбываецца ў перыяд зацяжных эканамічных крызісаў. Абвостраная сітуацыя паміж сацыяльнымі партнёрамі, як гэта было ў нашай краіне і іншых постсавецкіх рэспубліках ў 1990-я гады, часцей за ўсё ўзнікае на першапачатковым этапе станаўлення рыначных адносін. Адсутнасць прававой асновы і практычнага вопыту ў правядзенні калектыўных перамоваў, невысокі ўзровень грамадзянскай і прававой адказнасці службовых асоб, якія прадстаўляюць бакі, іншыя прычыны ўскладняюць ажыццяўленне сацыяльнага партнёрства ў аптымальных, цывілізаваных формах трохбаковай згоды [6].

У постсавецкіх дзяржавах механізм устанаўлення адносін сацыяльнага партнёрства і сацыяльнага дыялогу стаў аб'ектам грамадскай значнасці і навуковага кірунку падчас пераходу да рынку. Стымулам гэтага працэсу з'явіліся нестабільнасць у грамадстве, агульнанацыянальны крызіс 1989–1994 гадоў. Органы дзяржаўнай улады і грамадскія фарміраванні заняліся пошукам механізмаў і працэдур, закліканых падтрымліваць баланс інтарэсаў бакоў, якія ўдзельнічаюць у перамовах аб занятасці, аплаце і ўмовах працы, аб рашэнні іншых праблем, якія ўзнікаюць у новых умовах.

З сярэдзіны 2000-х гг. з'явіліся фундаментальныя распрацоўкі расійскіх вучоных па дадзенай тэматыцы [4]. Для нас у сілу гістарычных традыцый і фарміруючай паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь Саюзнай дзяржавы разумнае выкарыстанне іх пазначаных тэарэтычных распрацовак можа мець важнае значэнне.

Навукоўцы і практыкі Беларусі таксама актыўна ўключыліся ў вывучэнне праблем, звязаных з сацыяльна-працоўнымі, эканамічнымі і палітычнымі адносінамі. Зацікаўлена паставіліся да вывучэння праблемы дзейнасці інстытутаў сацыяльнага дыялогу навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вышэйшых навучальных устаноў. Значная колькасць работ, якія раскрываюць сістэму сацыяльнага партнёрства ў рэспубліцы, належыць ініцыятарам яго фарміравання – прафсаюзам, іх навучальнай установе – Міжнароднаму ўніверсітэту "МІПСА" і яго філіялам у Віцебску і Гомелі. Тут



Рэпазіторый ВДУ

праведзены дзясяткі міжнародных навукова-практычных канферэнцый, на якіх разглядаліся праблемы, якія маюць базавае значэнне для прафсаюзнага руху рэспублікі ў забеспячэнні ўстойлівага эвалюцыйнага развіцця грамадства з непасрэдным удзелам прафсаюзаў як прадстаўнікоў працоўных [6; 7].

Спалучаючы тэарытычныя канцэпцыі з практычным вопытам, кіруючыя калегіі прафсаюзаў на працягу доўгага часу на розных гістарычных этапах імкнуліся на практыцы даказаць сваю здольнасць забяспечыць эфектыўную абарону работнікаў наёмнай працы. У тых галінах прамысловасці, дзе наёмным работнікам ўдавалася стварыць і захаваць моцны арганізаваны прафсаюзны рух, яны змаглі рэалізаваць сваё галоўнае прызначэнне – забяспечыць дынамічную раўнавагу і рухомы баланс інтарэсаў з дзяржавай, выстаяць у супрацьстаянні з працадаўцамі і дамагчыся годнага ўзроўню аплаты працы і сацыяльных гарантый. Іх настойлівыя патрабаванні змушалі кіраўніцтва індустрыяльных краін прымаць і ўдасканальваць заканадаўчыя акты, якія ўзгадняюць інтарэсы дзяржаўных структур, арганізацый працаўнікоў і працадаўцаў.

Станаўленне арганізаванага прафсаюзнага руху ў большасці краін свету ўмацавала статус прафсаюзаў як законных прадстаўнікоў і абаронцаў працоўных. Не пасягаючы на прэрагатывы працадаўцаў, абавязкі і правы дзяржавы, прафсаюзы развітых краін набіраліся вопыту і станавіліся паўнапраўным бокам станаўлення грамадзянскай супольнасці і захавання яе стабільнасці. Інтарэсы захавання сацыяльнай стабільнасці ў грамадстве прывялі да таго, што працадаўцы (наймальнікі) і прафсаюзы пры пасярэдніцтве дзяржавы перайшлі да супрацоўніцтва, вядомаму сёння як сістэма сацыяльнага партнёрства. Актыўна развівацца сістэма сацыяльнага партнёрства ў краінах свету стала пасля завяршэння Другой сусветнай вайны, калі ў прамыслова развітых капіталістычных краінах рабочы і прафсаюзны рух стаў рэальнай сілай. Пры актыўнай ролі дзяржавы ў большасці еўрапейскіх краін пачалі ствараца нацыянальныя сацыяльна-эканамічныя саветы з прадстаўнікоў аб’яднанняў прадпрымальнікаў, прафсаюзаў і дзяржавы. Моцны стымул развіццю ідэалогіі сацыяльнага партнёрства дала навукова тэхнічная рэвалюцыя.

У рамках сацыяльнага дыялогу прафсаюзы выступалі супраць спроб стварэння зон “таннай працоўнай сілы”, змагаліся супраць зверхэксплуатацыі работнікаў з боку транснацыянальных кампаній. У такіх умовах сацыяльнае партнёрства атрымала юрыдычнае замацаванне праз нормы працоўнага права. З аднаго боку сацыяльнае партнёрства разглядаецца як сістэма ўзаемаадносін паміж наёмнымі работнікамі і працадаўцам, а з другога – як адзін са спосабаў прадстаўлення інтарэсаў якіх-небудзь сацыяльных груп у грамадстве. Эфектыўна сацыяльнае партнёрства можа будавацца толькі пры зацікаўленых і адказных адносінах такога яго суб’екта як дзяржава. Такім чынам, сацыяльнае партнёрства ператвараецца ў адзін з важных прынцыпаў дзяржавы. У сацыяльнай дзяржаве гэты прынцып з’яўляецца асновай умацавання сваёй “сацыяльнасці”.

Мадэлі сацыяльнага партнёрства, іх змест у кожнай краіне ў працэсе свайго развіцця вызначаюцца іх нацыянальнымі і культурнымі асаблівасцямі і ўяўляюць сабой спалучэнне канкрэтных формаў сацыяльных адносін. У аснову класіфікацыі мадэляў сацыяльнага партнёрства пакладзен парадак удзелу



Репозиторий ВГУ

работнікаў у калектыўна-дагаворных адносінах і ў кіраванні вытворчасцю. Паводле гэтага прынцыпу ў цяперашні час па сваёй спецыфіцы вылучаюцца тры мадэлі сацыяльнага партнёрства: прадстаўніцкая, прадстаўнічай дэмакратыі і плюралістычная [8]. Пры прадстаўнічай мадэлі (яна характэрная для Францыі, Іспаніі, Грэцыі, Люксембурга і Ірландыі) работнікі ўдзельнічаюць у кіраванні на прынцыпах прадстаўніцтва. Прадстаўнікі работнікаў выбіраюцца ў саветы дырэктараў прадпрыемстваў і назіральныя саветы, дзе яны маюць тыя ж правы і абавязкі, што і прадстаўнікі акцыянераў, гэта значыць удзельнічаюць непасрэдна ў прыняцці рашэнняў на парытэтных пачатках з менеджарамі. Любая істотная інвестыцыйная дзейнасць, меры па змене магутнасці або прадукцыйнасці, якія могуць прывесці да змены занятасці на прадпрыемстве, павінны прымацца на сумесным сходзе. Мадыфікацыя гэтага віду партнёрскіх адносін заснавана на тым, што прыняцце сумесных эканамічных рашэнняў прадпрымальнікамі і прадстаўнікамі работнікаў сфакусіравана на сацыяльных наступствах, звязаных са зменамі ў заработнай плаце, арганізацыяй працы і занятасці. Мадэль прамой прадстаўнічай дэмакратыі характарызуецца тым, што прадстаўнічыя функцыі работнікаў адводзяцца прафсаюзным арганізацыям. Яна зводзіцца да заключэння калектыўных дагавораў на прадпрыемствах. У дадзенай мадэлі прысутнічаюць прымусовы працоўны арбітраж і пасярэдніцтва. Дзяржава кампенсуе сваё адхіленне ад умяшальніцтва ў адносіны сацыяльных партнёраў на стадыі калектыўных дагавораў тым, што актыўна ўздзейнічае на адносіны пры праяве працоўнага канфлікту бакоў. Без праходжання абавязковай працэдуры прымірэння бакі не маюць права звярнуцца да страйку або лакаўту. Дадзеная мадэль сацыяльнага партнёрства характэрная для такіх краін, як Канада, Японія, а таксама большасці краін, якія развіваюцца ў Азіі, Лацінскай Амерыцы і англамоўных краін Афрыкі.

Плюралістычная мадэль у большай меры характэрная для ЗША. У гэтай краіне калектыўныя перамовы вядуцца толькі на ўзроўні прадпрыемстваў. Прымірыцельна-арбітражныя працэдуры калектыўных працоўных канфліктаў функцыянуюць на аснове канкуруючай юрысдыкцыі. У ролі пасярэдніка ў вырашэнні канфліктаў выступае Федэральная служба пасярэдніцтва і прымірэння альбо прыватная арганізацыя Амерыканскай асацыяцыі арбітраў. Работнікі тут прымаюць удзел у кіраванні толькі апасродкавана. У Вялікабрытаніі не склаліся арганізацыйныя асновы для трыпартызму. Тут калектыўныя дагаворы і рашэнні залежаць ад суадносін сіл у кожнай галіне або рэгіёне, а то і на асобным прадпрыемстве [9, с. 18].

Важна адзначыць, што ні адна з названых мадэляў не прадстаўлена ў развітых краінах у чыстым выглядзе. Хутчэй можна казаць аб разнастайнасці формаў узаемадзеяння суб’ектаў сацыяльна-эканамічнай палітыкі дагаворных бакоў з вызначэннем агульнай мэты і абавязкаў кожнага ўдзельніка ў захаванні патрабаванняў міжнародных прававых стандартаў і прынцыпаў.

Мадэлі сацыяльнага партнёрства – вынік працяглага сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця, іх сутнасць вызначаецца нацыянальнымі і культурнымі асаблівасцямі развіцця кожнай краіны і ўяўляе сабой спалучэнне канкрэтных форм сацыяльных адносін. Асноўнымі прынцыпамі сацыяльнага партнёрства незалежна ад іх спецыфікі з’яўляюцца: раўнапраўе бакоў, павага і



Рэпазітарый ВДУ

ўлік зацікаўленасці бакоў, захаванне прадстаўнікамі бакоў працоўнага заканадаўства і іншых нарматыўна прававых актаў, якія ўтрымліваюць нормы працоўнага права, добраахвотнасць прыняцця на сябе абавязкаў, іх рэальнасць, абавязковасць выканання калектыўных дамоў і пагадненняў, а таксама адказнасць удзельнікаў сацыяльнага партнёрства за невыкананне па іх віне прынятых пагадненняў.

У Расійскай імперыі нацыянальная мадэль сацыяльнага партнёрства (тып якой цяжка вызначыць) знаходзілася толькі ў зародкавым стане.

Пры савецкай уладзе мадэль ўзгаднення інтарэсаў працоўных і дзяржавы мела свае асаблівасці. У сілу аб’ектыўных абставінаў, калі дзяржава брала на сябе забеспячэнне насельніцтву асноўных сацыяльных гарантый, прафсаюзы выконвалі прынцыпова адрозныя функцыі ад тых, што былі характэрныя для прафсаюзаў краін з рыначнай эканомікай. Згодна з савецкай мадэллю, якая дэкларавала роўнасць інтарэсаў дзяржавы і насельніцтва ў працэсе працы і грамадскіх адносін, прафсаюзы як самая масавая арганізацыя працоўных былі надзелены шэрагам значных паўнамоцтваў, якіх ніколі не было, ды і не магло быць у прафсаюзаў капіталістычных краін. Сваю працу яны максімальна набліжалі да вытворчасці, ажыццяўлялі нагляд за выкананнем заканадаўства аб працы і ахове працы, кіравалі справай сацыяльнага страхавання, аздараўлення і культурнага развіцця працоўных. Намаганні прафсаюзаў у асноўным былі накіраваны на падтрыманне дысцыпліны працы, арганізацыю працоўнага саперніцтва, эканамічную вучобу працоўных, і толькі ў асобных выпадках, пры сур’ёзных канфліктах кіраўніка прадпрыемства або ўстановы і работнікаў, яны ўключаліся ў іх вырашэнне.

Не без поспеху прафсаюзныя арганізацыі выконвалі работу па ўключэнню рабочых, калгаснікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых у кіраванне вытворчасцю, развіццё іх працоўнай і вытворчай актыўнасці ў сферы эканомікі, перш за ўсё праз сацыялістычнае спаборніцтва. Арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, установах займала ў прафсаюзнай працы адну з найважнейшых функцый і несла нямала рацыянальнага. Спаборніцтва адзін з адным заўсёды ўласціва людзям па самой прыродзе калектыўнай працы. Таму працоўныя ў масе сваёй паверылі ў ідэалы спаборніцтва, у тым ліку і ў рух за камуністычнае стаўленне да працы. На стадыі прыняцця сацыялістычных абавязкаў і на працягу іх рэалізацыі многія працаўнікі адклікаліся на заклік прафсаюзаў добрасумленна працаваць, выходзіць на суботнікі, павышаць сваю кваліфікацыю. Дзякуючы спаборніцтву памнажаўся лік передавікоў і наватараў вытворчасці, пашыралася вучоба рабочых і служачых на вячэрняй і завочнай формах адукацыі ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах.

Пахвальна і тое, што ў савецкі час прафсаюзныя арганізацыі мелі пастаяннае імкненне да пашырэння ўдзелу працоўных у кіраванні вытворчасцю праз пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады (ПДВН) і працоўныя сходы, да ўдзелу рабочых у тэхнічным удасканаленні абсталявання праз бюро па рацыяналізацыі і вынаходніцтву (БРІЗ), навукова-тэхнічныя аб’яднанні (НТА), іншыя формы.



Репозиторий ВГУ

Для павышэння працаздольнасці і прадукцыйнасці працы, фарміравання здаровага ладу жыцця і росту культурнага ўзроўню працоўных прафсаюзныя арганізацыі выкарыстоўвалі культурна-асветныя і фізкультурна-спартыўныя аб'екты, якія знаходзіліся ў іх веданні. Цэнтрамі гэтай працы былі бібліятэкі, дамы і палацы культуры, шматлікія спартыўныя збудаванні. Такі быў вынік рэалізацыі савецкай канцэпцыі прафсаюзнага руху, як школы ўключэння шырокіх мас у справу кіравання вытворчымі і грамадскімі справамі [10, с. 172–174].

У сувязі з гэтым правільным будзе прызнаць, што ў БССР адносіны паміж уладнымі структурамі, дырэктарскім корпусам, рэалізуючымі функцыі працадаўцы і работнікамі (іх інтарэсы абаранялі прафсаюзы) знаходзіліся ў стане дзяржаўнага сацыяльнага патэрналізма.

БССР з 1954 года з'яўлялася членам Міжнароднай арганізацыі працы, тут былі прызнанымі і не парушаліся асноўныя ідэі і прынцыпы Канвенцый гэтай арганізацыі "Аб свабодзе асацыяцый і абароне права на арганізацыю" і "Аб прымяненні прынцыпаў права на арганізацыю і на вядзенне калектыўных перамоваў", у якіх закладзена базавая прававая канструкцыя сацыяльнага партнёрства [11].

Вядома, мадэль паводзінаў сацыяльных партнёраў савецкага перыяду мела сваю спецыфіку, істотна адрознівалася ад мадэлі, характэрнай для краін з рыначнай эканомікай. Прафсаюзы на працягу ўсяго савецкага перыяду займалі пэўнае месца ў палітычнай сістэме савецкага грамадства. Суб'екты партнёрскіх адносін – прафсаюзы, адміністрацыя прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, дзяржаўныя органы – з'яўляліся ў савецкія гады элементамі адзінай сістэмы, цалкам падпарадкоўваліся партыйна-дзяржаўным дырэктывам. Працоўных адносін, заснаваных на ўзаемадзеянні розных, адносна незалежных адзін ад аднаго сіл, у такіх суадносінах проста не магло быць. У галоўным дзеянні ўсіх гэтых суб'ектаў былі ўніфікаваны, накіраваны на выкананне планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Сваю ахоўную функцыю ў адносінах да працаўнікоў, пачынаючы з 1920-х гадоў, савецкія прафсаюзы ажыццяўлялі праз калектыўныя дагаворы. Практыка па распрацоўцы і заключэнні калектыўных дагавораў на вытворчых прадпрыемствах і ў арганізацыях пастаянна ўдасканальвалася. З сярэдзіны 1950-х гадоў практыка работы прафсаюзных камітэтаў і саветаў па ажыццяўленню кантролю за выкананнем калектыўных дагавораў насіла сістэмны характар. Члены прафсаюза праз свае першасныя звёны, функцыяніруючыя ў працоўных калектывах, прымалі непасрэдны ўдзел у вывучэнні і складанні калектыўных дагавораў. Актыўна вялі сябе прафсаюзы на стадыі іх папярэдняга абмеркавання і абароны, падвядзення папярэдніх і канчатковых вынікаў. Працоўны калектыў не толькі меў права ацэньваць працу адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта па змесце і рэалізацыі ўключаных у дагавор абавязкаў, але і прымаць рашэнне аб адказнасці асоб, якія не спрыялі іх выкананню. Прафсаюзныя арганізацыі знаходзіліся ў карэктных адносінах з наймальнікамі, удзельнічалі ў працэсе найму рабочых, падборы і расстаноўцы сярэдняга кіруючага персаналу. Нароўні з афіцыйнымі (з боку адміністрацыі) на прадпрыемствах і ўстановах функцыянавалі грамадскія аддзелы кадраў.



Рэпазіторый ВГУ

У прафсаюзным руху савецкага перыяду можна знайсці цэлы шэраг асаблівасцей, якія ўказваюць на іх нерацыянальныя дзеянні. Негатыўныя моманты ў іх дзейнасці, вядома ж, звязаны з устаноўленай ў краіне сістэмай кіравання, заснаванай на цвёрдым цэнтралізме і дэталёвым рэгламентаванні. На асобных этапах прафсаюзныя камітэты рэспубліканскага і саюзнага ўзроўню не праяўлялі належнай настойлівасці ў карэкціроўцы прымаемых дзяржаўнымі органамі рашэнняў, якія на дадзены перыяд уступалі ў супярэчнасці з грамадскім меркаваннем, насілі ненатуральны характар. Слаба праглядаюцца патрабаванні прафсаюзаў да адмовы ад ўраўняльнай тэндэнцыі ў размеркаванні вынікаў працы, якія спараджалі адчужанасць і абыякавасць работнікаў да дзяржаўнай маёмасці. Як у цэнтры, так і на месцах прафсаюзы мала займаліся аналізам макраэканамічнай сітуацыі, выяўленнем думкі працоўных пра змест дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі па задавальненні духоўных і культурных патрэб насельніцтва (адсюль у асобныя перыяды – рэшткавы прынцып пры выдзяленні бюджэтных сродкаў на развіццё сацыяльнай сферы, матэрыяльнай базы культуры і спорту). Накіраванасць прафарганізацый да празмернай маштабнасці сацыялістычнага спаборніцтва, сталага пошуку яго новых арганізацыйных формаў спараджала фармалізм і бюракратызм, рапартаманію і паператворчасць. Не заўсёды спрацоўваў механізм прафсаюзнага (грамадскага) кантролю за выкананнем калектыўных дагавораў і пагадненняў. Пытанні, якія выносіліся на разгляд рабочых сходаў, ПДВН, саветаў працоўных калектываў, на асобных прадпрыемствах, глыбока не прапрацоўваліся, прапановы і рэкамендацыі, унесеныя ў рэзалюцыі, не ўказвалі канкрэтных метадаў і сродкаў выпраўлення прапаноў і крытычных заўваг радавых членаў прафсаюза.

У сучаснай Беларусі сацыяльнае партнёрства ўлічвае агульнасусветныя заканамернасці, міжнародныя нормы і правілы, а таксама багаты, хаця і складаны, супярэчлівы шлях прафсаюзнага руху перыяду 1917–1990-х гадоў. Метадалогія даследавання гісторыі прафсаюзаў не можа не ўлічваць той акалічнасці, што ў гэтым грамадскім аб'яднанні знаходзіліся мільёны людзей, з іхняй працы створаны велізарныя багацці, плёнам якіх карыстаецца цяперашняе пакаленне. Тая ўвага, якая выяўлялася да чалавека працы з боку прафсаюзаў, іх намаганні па фарміраванні ў працоўных калектывізму, працавітасці і патрыятызму, іншых станоўчых каштоўнасных якасцей, павінны стаць аб'ектам пільнага вывучэння, а таксама і прымянення. Такі падыход паспрыяе ўсталяванню непарыўнай сацыяльнай сувязі пакаленняў (адначасова ён будзе тормазам у пераадоленні распаду гістарычнай свядомасці беларусаў), удасканаленні дзейнасці прафсаюзаў па абароне інтарэсаў працоўных у бягучым часе. Не выпадкова, што многае з арсенала савецкага мінулага (конкурсы на лепшага па прафесіі, канкурэнцыя – гэта значыць спаборніцтва пры дасягненні высокіх вытворчых вынікаў, занясенне перадавых калектываў на Дошку гонару, арганізацыя суботнікаў і г.д.) з поспехам выкарыстоўваецца і сёння.

На дадзеным этапе сацыяльнае партнёрства ў рэспубліцы лічыцца асноўным тыпам адносін дзяржавы, працадаўцаў і прафсаюзаў (якія з'яўляюцца паўнамоцнымі прадстаўнікамі наёмных работнікаў). На яго аснове вядзецца ўзгадненне інтарэсаў бакоў метадамі сацыяльнага дыялогу з мэтай канструктыўнага супрацоўніцтва ў сацыяльна-працоўнай сферы рыначнай

эканомікі. Прафсаюзы, як адзін з бакоў сацыяльнага партнёрства, імкнуцца развіваюць праз яго вытворчую дэмакратыю, дапамагаюць станаўленню тут грамадзянскай супольнасці. Яны садзейнічаюць інтэграцыі грамадства, дасягненню сацыяльнага міру. Найбольш значны іх уклад у інстытуцыяналізацыю сацыяльных канфліктаў. Пры ўзнікненні канфліктаў у сферы сацыяльна-працоўных адносін яны ўводзяць іх у арганізаванае рэчышча. Нават такія вострыя формы індустрыяльных канфліктаў, як забастоўкі, якія часам ініцыіруюцца прафсаюзамі, у канчатковым рахунку спрыяюць інтэграцыі грамадства, бо дазваляюць лепш разумець становішча і інтарэсы супрацьборнічаючых груп і знаходзіць узаемапрымальныя рашэнні. Увогуле ж, выступаючы ў ролі сацыяльнага амартызатара паміж супрацьборнічаючымі бакамі, прафсаюзы спрыяюць аб'яднанню людзей.

У XXI стагоддзі перад сусветнай цывілізацыяй і рабочым рухам паўсталі новыя выклікі і новыя пагрозы. Спроба арганізаваць жыццё чалавецтва на адзіных асновах у маштабе ўсёй планеты мае шэраг пазітыўных вынікаў, а таксама сур'ёзныя супярэчнасці. Ва ўмовах глабалізацыі распаўсюджваецца практыка актыўнага ўмяшання буйнога капіталу транснацыянальных карпарацый (ТНК) ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў з спробай унесці змены ў нацыянальнае заканадаўства ў бок абмежавання сацыяльна-працоўных правоў. Больш за тое кіраўніцтва асобных ТНК спрабуе абыйсціся без прафсаюзных арганізацый на сваіх прадпрыемствах, перашкаджае аб'яднанню працоўных у прафсаюз. У гэтых умовах перад прафсаюзным рухам стаіць задача супрацьстаяць наступу міжнароднага капіталу на правы работнікаў, правы грамадзян сваёй суверэннай краіны.

Важнае месца ў рэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін у транснацыянальных кампаніях (ТНК), якія дзейнічаюць на тэрыторыі краін-удзельніц Садружнасці, займае Савет старшыняў прафсаюзных камітэтаў прадпрыемстваў ТНК (створаны ў кастрычніку 1997 г). Прафсаюзныя арганізацыі разбурылі манаполію эканамічнай улады праз такую апраўданую сябе ва ўсім свеце форму, як калектыўныя дагаворы і пагадненні. Праз калектыўныя дагаворы прафсаюзы аказваюць у большай ці меншай ступені уплыў на такія аспекты сацыяльна-працоўных стасункаў, як аплата працы; умовы, арганізацыя і нармаванне працы; ахова працы і яго бяспека (уключаючы экалагічную); занятасць і беспрацоўе, усталяванне сацыяльных гарантый работнікам пры скарачэнні працоўных месцаў з прычыны ліквідацыі або рэарганізацыі прадпрыемстваў; прыватызацыя; падаткі і бюджэты ў той частцы, якая тычыцца грамадскай працы. Закон аб прафсаюзах дае ім права ўзгадняць з працадаўцамі і іх аб'яднаннямі сістэму аплаты працы, формы матэрыяльнага стымулявання, размеры тарыфных ставак (акладаў), а таксама нормы працы, зацверджаемыя на прадпрыемствах. Заканадаўства дае прафсаюзам права выступаць з прапановамі пры прыняцці дзяржаўнай уладай законаў і іншых нарматыўных актаў, што датычаць сацыяльна-працоўнай сферы. Акрамя таго, прафсаюзы могуць патрабаваць, каб праекты законаў, пастаноў, загадаў, якія рэгламентуюць сацыяльна-працоўныя правы працоўных, не прымаліся органамі дзяржаўнай улады, ці мясцовым самакіраваннем без уліку думкі прафсаюза.

Рэпазіторый ВДУ

Важнай сферай сацыяльнай палітыкі, дзе прафсаюзы могуць з карысцю для працоўных выкарыстоўваць свае правы, з'яўляецца забеспячэнне занятасці. Прафсаюзныя камітэты прымаюць удзел у распрацоўцы праграм занятасці, прапаноўваюць меры сацыяльнай абароны членаў прафсаюза, вызваленых у выніку рэарганізацыі ці ліквідацыі прадпрыемстваў і арганізацый. Практычна прафсаюзы маюць магчымасці для ўплыву на іншыя сферы дзейнасці і паўсядзённага жыцця чалавека, працы і яго сям'ю. Яны ўдзельнічаюць у вырашэнні праблем у галіне аховы працы і навакольнага прыроднага асяроддзя. Згодна з дамоўленасцямі бакоў у рамках сацыяльнага партнёрства частка паўнамоцтваў па рэгуляванні сацыяльна-эканамічных працэсаў дэлегуецца працоўным калектывам, якія разам з працадаўцамі і адміністратарамі пачынаюць раздзяляць адказнасць за характар іх ходу і вынік [12, с. 88]. Гэта цалкам ўпісваецца ў сучасныя менеджарскія канцэпцыі парцісіпацыйнага кіравання (гэта кіраванне, калі работнік прымае ўдзел у справах фірмы, уцягнуты ў кіраванне праз грамадскія арганізацыі і атрымлівае ад гэтага задавальненне). Прафсаюзныя арганізацыі аказваюць моцны ўплыў на працэс фарміравання сацыяльных дзяржаў тым, што яны выступаюць настойлівымі лабістамі ў парламентах і ўрадах па правядзенню разнастайных сацыяльных праграм, па наданню эканомікам сацыяльна арыентаванага характару. Праца прафсаюзаў сумесна з заканадаўчымі і выканаўчымі органамі ўлады, з працадаўцамі (наймальнікамі) у працэсе разгляду праектаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, нарматыўных прававых актаў, якія закранаюць сацыяльна-працоўныя адносіны, – гэта ніва, дзе прафсаюзы на практыцы могуць паказаць сваю карыснасць у фарміраванні і станаўленні сацыяльнай дзяржавы праз рыначныя ўмовы.

Такім чынам, экскурс у праблему стварэння, станаўлення і развіццё прафсаюзаў, уся іх дзейнасць паказвае, што яны былі і засталіся адзінай грамадскай арганізацыяй, якая пранізлівае ўсе ўзроўні і сферы сістэмы органаў, дзе выпрацоўваюцца і прымаюцца сацыяльна-эканамічныя рашэнні, дзе вызначаецца і праводзіцца ў жыццё сацыяльная палітыка дзяржавы. Стан, калі ўласнікі імкнуцца да атрымання звышвысокага для сябе прыбытку за кошт мінімізацыі выдаткаў на працоўную сілу, спараджае адкрытае супрацьстаянне і напружанасць у сацыяльна-працоўнай сферы. Такое становішча было характэрна яшчэ для сярэднявечча, ускладнілася яно ў Новы час і да сённяшняга дня застаецца перадумовай для аб'яднання працоўных пры абароне сваіх законных правоў і інтарэсаў. Асэнсаванне працэсаў, якія адбываліся ў грамадскім развіцці прывяло перадавых рабочых у большасці краін свету да думкі аб неабходнасці сумеснай абароны сваіх законных правоў і інтарэсаў, да стварэння сваіх прафесійных арганізацый. На пачатковым этапе для аб'яднання намаганняў у адстойванні сваіх патрабаванняў да ўласнікаў наёмныя работнікі ў большасці краін свету стваралі арганізацыі, якія не выходзілі за рамкі матэрыяльнай падтрымкі работнікаў свайго прадпрыемства. Пасля разрозненыя арганізацыі аб'ядналіся ў сістэмна-арганізаваны структураваны прафсаюзны рух. З часам прафсаюзы, набіраючыся вопыту і з'яўляючыся законнымі прадстаўнікамі працоўных, станавіліся паўнапраўным бокам станаўлення грамадзянскай супольнасці. Асноўная задача прафсаюзных арганізацый на ўсіх узроўнях заключалася (такой яна і засталася) у аб'яднанні работнікаў для калектыўнай



Репозиторий ВГУ

абароны ад жорсткай эксплуатацыі, патрабаванняў права на працу, бяспечных ўмоў працы і годную яе аплату. У становішчы ўціску правоў працоўных з боку працадаўцаў і дзяржавы прафсаюзы часцей ўжывалі формы і метады, што вялі да мірнага вырашэння канфліктаў, з'яўляліся, такім чынам, адным з важных сацыяльных амартызатараў. Для таго каб у новых грамадска-эканамічных умовах мець рэальную прававую аснову для ўдзелу ў адстойванні правоў і інтарэсаў работнікаў і іх сем'яў, прафсаюзы, як і раней, абапіраюцца на навуковы патэнцыял Акадэміі навук Беларусі, прафесарскі склад вышэйшых навучальных устаноў.

**Літаратура**


1. Профсоюзный университет. – 2006. – № 3.
2. Бич, М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. / М.О. Бич // Минск: Наука и техника. – 1973. – 280 с.
3. Мандрик, И.В. Профсоюзное движение Беларуси: история и современность / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2004. – № 1. – С. 4–11.
4. Маркс, К. Творі / К. Маркс, Ф. Енгельс. – Київ, 1960. – Т. 16.
5. Плеханов, Г.В. Сочіненія / Г.В. Плеханов. – М.; Л., 1929. – Т. XV.
6. Социальное государство: мировой опыт и реалии России. – М.: АТиСО, 2002; Ваисов, М.С. Наемный труд в современной Англии / М.С. Ваисов. – М.: Наука, 1980. – С. 61–285; Доморацкая, Э.И. Социальное законодательство Франции / Э.И. Доморацкая. – М.: Наука, 1975. – С. 144–170; Киселев, В.Н. Социальное партнерство / В.Н. Киселев // Социальное партнерство: словарь-справочник. – М., 2002; Кубицкий, С.И. Роль социального партнерства рынков образования и труда в современной России: монография / С.И. Кубицкий. – Челябинск: ООО «Фотохудожник», 2006; Ветров, А.В. Соперничество или партнерство / А.В. Ветров. – М., 1990. – 268 с.; Гайнуллина, Ф.И. Становление системы социального партнерства / Ф.И. Гайнуллина. – М., 1998. – 202 с.; Иванов, О.И. Социальное партнерство: некоторые вопросы истории / О.И. Иванов. – СПб.: РАН, Ин-т социал.-экон. проблем, 1994. – 145 с.; Семенков, В.И. В поисках новой модели социальной защиты / В.И. Семенков // Труд и социальные отношения. Приложение. – 2000. – № 3. – С. 92; Буданова, М.А. Социальное партнерство в системе социально-трудовых отношений / М.А. Буданова, В.И. Гостенина. – М.: Прометей, 2003. – С. 31–57.
7. Очерки истории профсоюзов Витебщины / сост.: И.К. Возмитель, И.В. Мандрик; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. – Витебск: Витебская областная типография, 2015. – 504 с.; Мандрик, И.В. Зрелость социально-экономических и политических условий для осуществления социального партнерства в Республике Беларусь / И.В. Мандрик // Социальное партнерство: концепция, опыт, проблемы: материалы Второй междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 22–23 апр. 1999 г. / Витебск, 1999. – С. 19–29; Айзенштадт, А.Л. Профсоюзная деятельность и проблемы социального партнерства / А.Л. Айзенштадт // Социальное партнерство: концепция, опыт, проблемы: материалы Третьей Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 22–23 июня 2000 г. – Витебск: ВФ УО ФПБ «МИТСО», 2001. – С. 13–15.


Репозиторий ВГУ

8. Мандрик, И.В. Генезис и развитие профсоюзного движения. От конфронтации к социальному партнерству / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2015. – № 4. – С. 4–11.
9. Аврамова, Е.М. О пространстве возможностей реформирования социальной сферы / Е.М. Аврамова // Общественные науки и современность. – 2006. – № 3. – С. 18–21.
10. Возмитель, И.К. Очерки истории профсоюзов Витебщины / И.К. Возмитель, И.В. Мандрик; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2015. – 504 с.: ил.
11. О консультациях и сотрудничестве между предпринимателями и трудящимися на уровне предприятия: рекомендация Междунар. организации труда № 94: принята 26 июня 1952 г. // Конвенции и рекомендации, принятые МОТ, 1919–1956. – Т. 1. – Женева: Междунар. бюро труда, 1991. – С. 1087; О политике в области труда и занятости: рекомендация Междунар. организации труда № 169: принята 26 июня 1984 г. // Конвенции и рекомендации, принятые МОТ, 1957–1990. – Т. 2. – Женева: Междунар. бюро труда, 1991. – С. 2047–2060.
12. Профессиональные союзы Беларуси: история и современность / под ред. Л.П. Козика. – Минск: Федерация профсоюзов Беларуси, 2007. – 672 с.

Репозиторий ВГУ

# Г Л А В А 11
# Адаптацыя прафсаюзнага руху рэспублікі да новых умоў: складанасці першага перыяду

З распадам СССР, палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі пераўтварэннямі, якія пачаліся ў 90-я гг. ХХ ст., пераходам да рыначнай эканомікі прафсаюзы Беларусі апынуліся ў складанай сітуацыі. Зацвярджэнне шматукладнай эканомікі, што прывяло да змены сацыяльна-эканамічнай фармацыі, запатрабавала істотнай карэкціроўкі ў іх дзейнасці. Пераход ад планава-дырэктыўнай мадэлі кіравання эканомікай да механізмаў, якія дзейнічаюць у рыначных умовах, стаў абгрунтаваннем для перагляду раней сфарміраванай прафсаюзнай парадыгмы. Паўстала пытанне аб пераходзе ад савецкай мадэлі прафсаюзнага будаўніцтва, якая зацвердзілася і функцыянавала працяглы перыяд у вытворчай сферы, да іншай, да той, у якой павінна была пераважаць ахоўная функцыя. Задача па сутнасці зводзілася да неабходнасці выкарыстання беларускімі прафсаюзамі вопыту заходніх трэд-юніёнаў па фарміраванню сістэмы гнуткіх калектыўных працоўных адносін, якія грунтуюцца на дыялогавай сістэме ўзгаднення інтарэсаў, у прынятым найменні – сацыяльнае партнёрства. Для Беларусі, як і для іншых рэспублік, якія абвясцілі аб сваім суверэнітэце, паняцце “сацыяльнае партнёрства” не з’яўлялася, як паказвае змест папярэдняга раздзела, цалкам новай з’явай. Новая тут толькі тэрміналогія, яна ў савецкі час не ўжывалася.

Перамены ў канстытуцыйна-прававым уладкаванні і сацыяльна-эканамічным развіцці Рэспублікі Беларусь абумовілі змяненне стратэгіі і тактыкі ў дзейнасці прафсаюзаў. З’яўленне прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў з прыватнай формай уласнасці паставіла перад імі на першы план задачу абароны працоўных, сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў сваіх членаў і ўстанаўлення раўнапраўных адносін з сацыяльнымі партнёрамі.

У адпаведнасці са стандартамі, уласцівымі плюралістычнай, грамадзянскай супольнасці, прафсаюзы імкнуліся заняць сваю нішу для ўзаемадзеяння з іншымі суб’ектамі сацыяльнага партнёрства. Органы заканадаўчай і выканаўчай улады рэспублікі былі таксама зацікаўленыя ў тым, каб прафсаюзы аказаліся ўключанымі ў аздараўленне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне. 22 красавіка 1992 г. быў прыняты Закон РБ “Аб прафесійных саюзах», а праз сем месяцаў (24.11.1992) Закон РБ “Аб калектыўных дагаварах і пагадненнях”, у студзені 1994 г. – Закон РБ “Аб парадку вырашэння калектыўных працоўных спрэчак (канфліктаў)” [1, с. 49]. Дадзеныя законы склалі юрыдычную аснову партнёрскіх адносін паміж работнікамі і наймальнікамі, а таксама паміж дзяржаўнымі органамі, аб’яднаннямі прафсаюзаў і наймальнікаў. З гэтага часу ў афіцыйных дакументах Рэспублікі Беларусь з’явілася і стала шырока прымяняцца паняцце “сацыяльнае партнёрства”. Аднак ва ўмовах эканамічнага крызісу і палітычнай

Рэпазіторый ВДУ

нестабільнасці, што назіралася ў рэспубліцы ў пачатку 1990 гадоў, механізм сацыяльнага партнёрства даваў збоі як на рэгіянальным, так і на рэспубліканскім узроўні. З'яўляючыся бокам сацыяльнага партнёрства, працадаўцы і дзяржаўныя структуры не выконвалі прынятыя на сябе перад працаўнікамі абавязкі.

Адсутнасць рэальных зрухаў да лепшага ў штодзённым жыцці і належнай сацыяльнай абароны, у параўнанні з савецкім часам, выклікала ў насельніцтва неспакой і трывогу. У беларускім грамадстве нарастала сацыяльная напружанасць. У сувязі з рэзкім зніжэннем ўзроўню жыцця, няўпэўненасцю свайго становішча ў сферы працы, рабочыя, ІТР і служачыя прад'яўлялі прэтэнзіі не толькі наймальнікам але і прафсаюзным арганізацыям. Як уяўлялася наёмным работнікам, іх цяжкае становішча, нізкая аплата працы, адсутнасць магчымасці забяспечыць годны ўзровень жыцця для сваёй сям'і звязаны з тым, што прафсаюзы ўсіх узроўняў недастаткова надаюць увагі іх становішчу і не абараняюць іх правы і інтарэсы. Адбывалася паслабленне цікавасці да прафсаюзнай працы ў радавых членаў, назіралася агульнае падзенне ролі прафсаюзаў у вытворчым і грамадскім жыцці. У такіх няпростых умовах у траўні 1990 г. VIII пленум Белсаўпрофу прааналізаваў становішча спраў у прафсаюзным руху рэспублікі, прыняў курс на развіццё самастойнасці ў працы прафсаюзных арганізацый па абароне правоў і інтарэсаў працоўных. У жніўні-верасні 1990 г. ва ўсіх абласцях прайшлі міжсаюзныя прафсаюзныя канферэнцыі, былі ўтвораны абласныя аб'яднанні прафсаюзаў.

4–6 кастрычніка 1990 года на XVII з'ездзе прафсаюзаў Беларусі, які канстытуяваўся ў Першы з'езд Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, утворана Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі (ФПБ), прыняты Статут і праграма дзеянняў. З'яўляючыся правапераемнікам Белсаўпрофу, ФПБ з гэтага часу прыняла на сябе ролю аб'ядноўчага і арганізацыйнага цэнтра. На 1 лістапада 1990 г. у ФПБ ўваходзіла 6 абласных аб'яднанняў, 24 самастойных галіновых і 1 рэспубліканскі камітэт прафсаюза (саюзнага значэння). У ФПБ налічвалася ў гэты час 5080762 члены прафсаюза [1, с. 45].

Свае адносіны з ўваходзячымі ў яе склад прафсаюзнымі арганізацыямі ФПБ мела намер будаваць на прынцыпах рэальнай дэмакратыі і раўнапраўя. Як у самой Федэрацыі, так і ў абласных аб'яднаннях, галіновых прафсаюзах, прафсаюзных арганізацыях назіралася рашучая настроенасць на якаснае выкананне ўласцівай прафсаюзнаму руху ў рыначнай эканоміцы функцыі – абароны інтарэсаў працоўных незалежна ад іх палітычнай, нацыянальнай, рэлігійнай арыентацыі. Было заяўлена аб намеры будаваць узаемаадносіны з дзяржавай і наймальнікамі на прынцыпах раўнапраўя і пры неабходнасці канструктыўнай апазіцыі ўраду рэспублікі, выканаўчым і гаспадарчым органам на месцах. У першасных арганізацыях былі створаны ўмовы для свабодных выбараў. Старшыні і члены прафкамаў абіраліся на альтэрнатыўнай аснове. З 1992 да 2000 года склад прафсаюзнага актыву ў першасных арганізацыях практычна змяніўся цалкам. Аднак з-за існуючых крызісных умоў у эканоміцы, асабліва трываласці карпаратыўна-патэрналісцкіх адносін, набытых прафсаюзамі ў савецкім грамадстве, працэс гэты ажыццяўляўся нялёгка. Павольна мяняліся арганізацыйная структура, характар унутраных узаемаадносін і, галоўнае, менталітэт значнай часткі прафсаюзных работнікаў,



Рэпазіторый ВГУ

ды і асноўнай масы радавых членаў прафсаюза. Зрэшты, інакш і не магло быць, прафсаюзы – значная частка грамадства, а любое грамадства валодае вялікім запасам інерцыі. Для змен патрэбны час. Да таго ж магчымасці прафсаюзаў ўплываць на працэсы, якія адбываліся ў грамадстве, былі мінімізаваныя і па той прычыне, што ў 1993–1994 гг. яны не мелі права заканадаўчай ініцыятывы, страцілі права нагляду і кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы, ад іх адабралі фонд сацыяльнага страхавання, функцыю аздараўлення і санаторна-курортнага лячэння насельніцтва.

Сур'ёзнае ўздзеянне на сітуацыю ў прафсаюзах аказалі разбуральныя працэсы, якія ахапілі эканоміку краіны, іншыя сферы жыцця грамадства. Крызіс, які закрануў практычна ўсе галіны эканомікі, прывёў да абвалу прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Гаспадарчы комплекс рэспублікі не выходзіў на прагнозныя паказчыкі ў забеспячэнні сацыяльных выгод для насельніцтва. Яны ў рэальнасці да 1995 г. аказваліся ніжэй планавых. Высокая інфляцыя, няпоўная занятасць працаздольнага насельніцтва, узрастаючыя знешнія даўгі прымушалі ўрад скарачаць падтрымліваючыя праграмы ўжо пасля падпісання пагадненняў з прафсаюзамі. У выніку матэрыяльны ўзровень жыцця знізіўся ў соцень тысяч людзей.

Не назіралася яднання і салідарных дзеянняў і ў самім прафсаюзным руху. Частка прафсаюзных структур, асабліва кіруючае ядро ў цэнтры – у адміністрацыі ФПБ, рэспубліканскага і абласнога ўзроўню (тут такога абнаўлення кадраў як у пярвічных арганізацыях не адбылося), спрабуючы вызначыцца ў прыярытэтах сваёй працы, схіляліся да палітычнай дзейнасці, прымалі ўдзел у грамадска-палітычных акцыях, накіраваных супраць існуючых органаў улады. Занятая на гэтым этапе кіруючым складам прафсаюзаў пазіцыя, прывяла да абвастрэння іх адносін з Прэзідэнтам краіны, дзяржаўнымі органамі і наймальнікамі.

З-за induratoku рабочай сілы ў недзяржаўны сектар, з'яўленне беспрацоўных, умяшання дзяржаўных структур ва ўнутрапрафсаюзнае жыццё, пазбаўлення прафсаюзаў раней выконваемых імі ў дзяржаве істотных для насельніцтва функцый і іншых прычын, давер да прафсаюзаў у работнікаў усіх сфер вытворчасці рэзка знізіўся. У гэтых умовах прафсаюзы аказаліся ў фінансавым крызісе, нязначным стаў уплыў прафсаюзных арганізацый працоўных калектываў на гаспадарчую дзейнасць, былі страчаны магчымасці бараніць працоўныя правы грамадзян. Наёмны работнік застаўся безабароненым перад дзяржаўнымі структурамі і працадаўцамі. Гэта аслабіла прафсаюзы, абумовіла вельмі значнае скарачэнне прафсаюзных радоў. Частка членаў прафсаюза страціла веру ў гэта грамадскае фарміраванне. За перыяд з 1990 па 2002 год прафсаюзнае сяброўства ў рэспубліцы скарацілася на 1,8 млн чалавек, асобныя прафсаюзныя арганізацыі зусім спынілі сваю дзейнасць. На ролю прадстаўнікоў працоўных паралельна з прафсаюзнымі арганізацыямі сталі прэтэндаваць страйкамы, разнастайныя працоўныя саюзы, нарады і камісіі. На прадпрыемствах ішло стварэнне альтэрнатыўных прафсаюзаў [1, с. 53–54].

Па меры нарастання крызіснага стану ў эканоміцы абараняць правы працоўных станавілася ўсё цяжэй, эфектыўнасць прымянення сістэмы сацыяльнага партнёрства была нізкай і, як вынік, у асобных вытворчых

калектывах і галінах назіраўся канфліктны стан сацыяльна-працоўных адносін. Адбываўся зрыў дамоўленасцей, што ў нормах паводзінаў бакоў называецца неабавязковасцю. Гэта ствaрала вялікія цяжкасці ў дасягненні агульнай мэты, сфармуляванай у пагадненнях партнёраў усіх узроўняў. Не выконваліся асобныя пункты Генеральнага і галіновых тарыфных пагадненняў, калектыўных дагавораў, што тычылася, перш за ўсё, мер аздараўлення фінансавага стану прадпрыемстваў, забеспячэння годнага ўзроўню аплаты працы. Напрыклад, пагадненне, падпісанае ў 1998 годзе паміж Віцебскім аблвыканкамам, абласным аб’яднаннем прафсаюзаў і саюзам наймальнікаў, не выконвалася па самому значнаму элементу сацыяльнай абароны насельніцтва – зарплаце. Не дасягнута, як гэта прадугледжвалася пагадненнем, апераджальнага росту зарплаты перад ростам спажывецкіх цэнаў; не выканан пункт, у якім дэкларавалася дасягнуць 130% узроўню зарплаты ад мінімальнага спажывецкага бюджэту ў галінах гаспадарчага комплексу; на многіх прадпрыемствах не сталі своечасовымі выплаты зарплаты. Назіраўся зрыў дамоўленасцей і ў больш маштабных межах: у радыёэлектроннай прамысловасці рэспублікі замест ўмоўленага росту рэальнай зарплаты адбылося яе падзенне [2, с. 82].

Федэрацыя прафсаюзаў Беларуская (так яна стала называцца з 1995 г.) кваліфікавала такую неўрэгуляванасць адносін бакоў нізкім узроўнем грамадзянскай і прававой адказнасці сваіх сацыяльных партнёраў. Невысокі каэфіцыент карыснага дзеяння і невыкананне балансу інтарэсаў і раўнапраўя бакоў тлумачыліся недахопам заканадаўчай базы. Кіраўніцтва Федэрацыі ўнесла прапанову аб прыняцці заканадаўчага акта, які б вызначаў адказнасць службовых асоб і ўдзельнікаў сацыяльнага партнёрства за выкананне прынятых на сябе абавязацельстваў, і заканадаўчым замацаванні за прафсаюзамі права адзіных прадстаўнікоў наёмных работнікаў.

Ініцыятыва ФПБ была адобрана кіраўніком дзяржавы. Гэтаму былі падпарадкаваны Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. 15 ліпеня 1995 года выйшаў Указ Прэзідэнта № 278 “Аб развіцці сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь”, а 16 снежня 1997 года Указ № 639 “Аб мерах па ўдасканаленні ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання і прафсаюзаў”. Аднак у гэты перыяд беларускія прафсаюзы, органы дзяржаўнага кіравання і наймальнікі так і не змаглі наладзіць свае ўзаемадзеянні на прынцыпах раўнапраўя бакоў. Былі згублены магчымасці прафсаюзаў на важнейшыя для іх правы: заканадаўчай ініцыятывы, нагляду і кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы, аздараўлення працоўных, – якімі яны валодалі ў савецкі перыяд. Непрыдатнымі для эксплуатацыі сталі многія прафсаюзныя аб’екты санаторна-курортнага і турысцка-экскурсійнага прызначэння, установы культуры.

У прафсаюзным руху Беларусі да 2002 года складвалася небяспечная сітуацыя, якая вяла да распаду гэтай масавай са стогадовай гісторыяй арганізацыі. Асобныя прафсаюзныя арганізацыі, назіраючы за хаатычнасцю паводзінаў у “вярхах”, не адчуваючы цвёрдасці ў паводзінах кіруючых органаў, выходзілі са складу ФПБ. Але і ў такі складаны час большасць прафсаюзных арганізацый не паддаліся ліквідатарскім тэндэнцыям, захавалі сваю структуру,

Репозиторий ВГУ

не знізілі істотна колькасны склад членаў, пакінулі на сваім балансе функцыянуючыя спортзбудаванні, бібліятэкі, клубы, санаторыі-прафілакторыі.

На Віцебшчыне падобнае стаўленне да сваіх прафарганізацый заставалася ў працоўным калектыве найбуйнейшага ў рэспубліцы Наваполацкага ВА “Нафтан”, у саўгасе “Рудакова”, ўнітарным прадпрыемстве “Віцебскаблгаз”, аддзяленні Беларускай чыгункі. Станоўчыя прыклады былі і ў іншых рэгіёнах рэспублікі [3, с. 192]. Прафсаюзныя арганізацыі і ў такіх складаных умовах пазітыўна ўплывалі на развіццё рыначных адносін, супрацiўляліся звышэксплуатацыі работнікаў. Найважнейшым мэтавым арыенцірам у сваёй дзейнасці лічылі зацвярджэнне гуманістычных нормаў і нормаў працоўнай маралі, сумленнай і добрасумленнай працы, калектывізму, узаемадапамогі, ствараючы тым самым умовы для эканамічнага росту і паляпшэння жыцця людзей. Прафсаюзы настойліва дабіваліся ад дзяржаўных органаў і наймальнікаў права і гарантый, прызнаючых і рэалізуючых сістэму сацыяльнага партнёрства ў якасці асноўнага механізму дасягнення грамадскай згоды, баланса інтарэсаў работніка, працадаўцы, дзяржавы пры рэгуляванні сацыяльна эканамічных і працоўных адносін.

**Літаратура**

1. Профессиональные союзы Беларуси: история и современность / под ред. Л.П. Козика. – Минск: Федерация профсоюзов Беларуси, 2007. – 627 с.
2. Мандрик, И.В. Профсоюзные организации Витебской области в политической системе советского общества (середина 1960-х – 1990 гг.) / И.В. Мандрик // Профсоюзное движение на Витебщине: история, опыт, уроки: пособие. – Витебск, 2000. – 102 с.: ил.
3. Возмитель, И.К. Очерки истории профсоюзов Витебщины / И.К. Возмитель, И.В. Мандрик; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2015. – 504 с.: ил.

Репозиторий ВГУ

# Г Л А В А 12
# Сацыяльнае партнёрства ва ўмовах стабілізацыі эканомікі рэспублікі

Сфарміраваная ў сусветнай практыцы палажэнне аб тым, што эфектыўнасць прымянення сістэмы сацыяльнага партнёрства залежыць непасрэдна ад стану эканомікі, будзе з часам пацверджана і ў Беларусі. Стабілізацыя ў эканоміцы, паспяховае функцыянаванне ў гэты час айчыннага гаспадарчага комплексу адкрылі магчымасці для правядзення цывілізаванага і выніковага сацыяльнага партнёрства. У адпаведнасці з тагачаснымі ўмовамі ў рэспубліцы паступова стваралася больш дасканалае заканадаўства, у якім прафсаюзам надавалася больш правоў у галіне працоўных і сацыяльных адносін. У маі 1998 г. выдадзены Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 252 "Аб Нацыянальным савеце па працоўных і сацыяльных пытаннях", якім вырашалася пытанне аб павышэнні статусу Нацыянальнага савета, надзяленні прынятых у рамках кампетэнцыі бакоў рашэнняў сілы нарматыўнага дакумента, абавязковага для выканання адпаведнымі структурамі. Нацыянальны савет быў надзелены таксама функцыяй правядзення экспертызы праектаў заканадаўчых актаў, звязаных з рэгуляваннем працоўных адносін і сацыяльнай абаронай работнікаў, шэрагам іншых паўнамоцтваў [1, с. 16].

Пазітыўныя змены ў галінах эканомікі рэспублікі, што мела месца пасля 1995 года, і прынятыя дакументы ўнеслі свае карэктывы ў паводзіны суб'ектаў, здольных аказваць уплыў на вытворчыя адносіны. Прафсаюзы, паступова вызваляючыся ад раней выконваемых імі функцый, канчаткова вызначыліся: дамінуючай у іх дзейнасці стала паслядоўная абарона працоўных, сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў членаў прафсаюзаў. На прадпрыемствах рэспублікі ішло пашырэнне супрацоўніцтва прафсаюзаў з уладай і наймальнікамі на аснове калектыўных дамоваў. Па стане на 1 студзеня 1999 года з 27825 прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый калектыўныя дагаворы заключаны на 19.572 (70,3%). Заключана таксама каля 600 галіновых і тэрытарыяльных пагадненняў [1, с. 11]. Калектыўныя дагаворы і пагадненні спрыялі вырашэнню сацыяльных пытанняў і стабілізацыі сітуацыі ў працоўных калектывах. На пытанне анкеты, сфармуляваным інфармацыйна-аналітычным цэнтрам ФПБ у 1998 г., "Ці спрыяюць калектыўныя дагаворы, прынятыя на прадпрыемствах, паляпшэнню ўмоў працы, вырашэнню сацыяльных праблем", каля 50% работнікаў прадпрыемстваў з недзяржаўнай формай уласнасці і 42% работнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў далі станоўчы адказ. Самую высокую ацэнку калектыўным дагаворах далі кіраўнікі прадпрыемстваў (66,9%), меншае задавальненне ад іх рэалізацыі атрымліваў рабочы клас (39,6%). Больш высокая доля работнікаў, станоўча ацэньваючых значэнне калектыўных дагавораў, была ў дадзеным перыядзе ў дабрабытных галінах – хімічнай (68%) і нафтахімічнай (65%) [1, с. 12–13], дзе фінансава-эканамічны стан, у асноўным, супадаў з сацыяльнымі чаканнямі работнікаў. Такое становішча аказала ўздзеянне на трансфармацыю поглядаў у грамадстве на прафсаюзы. У 1999 г. на пытанне

Рэпазіторый ВДУ

анкеты “Як Вы ацэньваеце дзейнасць прафсаюзаў на Вашым прадпрыемстве?”, 30% адзначылі, што іх прафсаюзныя арганізацыі паспяхова выконваюць свае функцыі, пры гэтым важна, што старэйшыя ўзроставыя групы рэспандэнтаў (больш за 55 гадоў), якія мелі магчымасць параўнаць іх працу ў мінулым, значна вышэй ацанілі дзейнасць прафсаюзаў на гэтым этапе. У адказе на гэта пытанне прасочваецца тая ж заканамернасць, якая назіралася пры адказе на пытанне аб калектыўных дамовах: больш за 90% рэспандэнтаў прадпрыемстваў адзначылі адчувальны ўплыў прафсаюзных арганізацый на станоўчыя зрухі, якія адбываліся ў іх калектывах [1, с. 13].

Да 2002 году адносіны паміж дзяржаўнымі структурамі і прафсаюзамі нармалізаваліся, партнёры прыйшлі да больш цеснага ўзаемадзеяння. IV Пазачарговы з’езд Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай (адбыўся 18–19 верасня 2002 г.) прыняў рашэнні, у якіх абгрунтоўваўся новы курс на арганізацыйнае ўмацаванне і салідарнасць прафсаюзнага руху, супрацоўніцтва з дзяржаўнымі структурамі на аснове сацыяльнага партнёрства. З улікам заяўленага Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі (такую назву прафсаюзам прадаставіў Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 584 ад 25 лістапада 2002 г.) курса аб спыненні непатрэбнага проціборства з уладай ствараліся перадумовы для павышэння эфектыўнасці ў працы прафсаюзных арганізацый, умовы для росту радоў прафсаюзаў, умацавання іх фінансавага становішча. Пасля з’езда праца ФПБ і складаючых яе суполак стала весціся ў цеснай сувязі з дзяржаўнымі структурамі і наймальнікамі, што дазволіла зняць сацыяльнае напружанне ў працоўных калектывах, пакласці канец ярка выяўленым крызісным з’явам прафсаюзнага руху. Прафсаюзы Беларусі правялі працу па абнаўленні, арганізацыйнаму ўмацаванню і ўпарадкаванню сваіх структур, пашырэнню сацыяльнай базы. Адбывалася ўступленне ў прафсаюзах новых сяброў, аднаўленне прафсаюзнага сяброўства рабочых, ІТР, служачых і навучэнцаў, якія раней пакінулі іх. З гэтага часу ў рэспубліцы адзначаўся пастаянны рост прафсаюзнага членства. На прадпрыемствах, ва ўстановах дзяржаўнай формы ўласнасці (амаль на ўсіх, нават там, дзе налічвалася не больш за дзясятак супрацоўнікаў) пачалі зноў функцыянаваць прафсаюзныя арганізацыі.

Вялікая колькасць прафсаюзных арганізацый ў гэтыя гады было створана на прадпрыемствах з прыватнай формай уласнасці. У канцы 2010 года ў прафсаюзах знаходзілася большасць эканамічна актыўнага насельніцтва краіны. Ахоп прафсаюзным членствам у рэспубліцы ў гэты час наблізіўся да савецкага перыяду (больш за 4 млн чалавек) і знаходзіўся на ўзроўні 94,8% [3, с. 2].

ФПБ пашырыла сферу ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва з іншымі інстытутамі грамадства і, перш за ўсё, упарадкавала калектыўна-дагаворную практыку з дзяржаўнымі інстытутамі і аб’яднаннямі працадаўцаў у вырашэнні найбольш важных сацыяльна-эканамічных праблем. У мэтах пашырэння ўзаемадзеяння і наладжвання сацыяльнага партнёрства прадстаўнікі сяброўскіх арганізацый ФПБ былі ўключаны ў склад калегій міністэрстваў і ведамстваў, заканадаўчых і выканаўчых органаў на ўсіх узроўнях. Сацыяльнае партнёрства стала ажыццяўляцца на рэспубліканскім, рэгіянальным, галіновым і лакальным узроўнях.

Умацаваліся ў гэты час і формы ажыццяўлення сацыяльнага партнёрства. Своечасова праводзіліся перамовы і кансультацыі па падрыхтоўцы праектаў

Рэпазітарый БГУ

калектыўных дагавораў, пагадненняў, заключэнні калектыўных дагавораў. Надавалася ўвага ўдзелу працоўных і іх прадстаўнікоў у кіраванні прадпрыемствамі і арганізацыямі, у вырашэнні працоўных спрэчак.

Супрацоўніцтва і больш цеснае ўзаемадзеянне сацыяльных партнёраў станоўча адбілася на развіцці прамысловасці, сферы паслуг і прадпрымальніцтва, павышэнні жыццёвага ўзроўню насельніцтва рэспублікі. Так, у рамках Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях ФПБ змагла дамовіцца з дзяржаўнымі органамі аб прыпыненні росту цэн на жыллёва-камунальныя паслугі. Па прапанове ФПБ у Генеральнае пагадненне былі ўключаны нормы, згодна з якімі павышэнне аплаты за жыллё, камунальныя паслугі і тарыфы на праезд у гарадскім транспарце агульнага карыстання і на перавозкі ў прыгарадным транспарце маглі ажыццяўляцца толькі пасля апераджальнага павелічэння даходаў грамадзян.

У сферы аплаты працы ўдалося вырашыць адну з самых надзённых праблем гэтага часу – ліквідаваць запазычанасць па выплаце наймальнікамі заработнай платы. Па ініцыятыве ФПБ у Генеральнае пагадненне пастаянна ўключаўся пункт аб забеспячэнні дзяржаўнага і грамадскага кантролю за своечасовай выплатай налічанай заработнай платы ў арганізацыях усіх форм уласнасці. У 2005 годзе па патрабаванні Федэрацыі прафсаюзаў прынята прапанова аб зацвярджэнні памеру мінімальнай заработнай платы на ўзроўні бюджэту пражытачнага мінімуму.

Карэктныя адносіны паміж суб’ектамі сацыяльнага партнёрства, рост дабрабыту насельніцтва ўмацавалі аўтарытэт прафсаюзаў. Як паказалі анкетныя апытанні, праведзеныя ў 2007 і 2009 гадах на Віцебшчыне, прафсаюзы Беларусі ўвайшлі ў лік асноўных вядучых сацыяльных сіл грамадства. Рэспандэнты – радавыя сябры прафсаюза і кіраўнікі абласных і раённых структур – аднеслі сваю арганізацыю па зацікаўленасці ў вырашэнні праблем, якія стаяць перад грамадствам, на трэцяе месца, аддаўшы ёй крыху менш за 20% галасоў (пасля Прэзідэнта і урада, якія атрымалі адпаведна – 71% і 21,2%) [4, с. 4]. Пасля прафсаюзаў засталіся палітычныя партыі, міліцыя, суд і пракуратура, усе іншыя дзяржаўныя ўстановы і грамадскія аб’яднанні.

Тое, што прафсаюзы апынуліся ў дадзеным апытанні адразу за Прэзідэнтам і ўрадам, не было выпадковасцю. Дадзенае анкетаванне пацвердзіла першапачаткова вылучаны даследчыкамі пасыл: члены прафсаюза павінны адводзіць сваёй арганізацыі ключавую ролю ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем, але ў перыяд станаўлення рынечных адносін яны наўрад ці змогуць аддаць ёй перавагу перад дзяржаўнымі структурамі. Гэта першапачаткова прапаваны змест звязваўся навукоўцамі з асноватворным становішчам, вызначаючым сацыяльна арыентаваную дзяржаву: падтрыманне якасці жыцця, якое забяспечвае нармальнае ўзнаўленне грамадства, – найважнейшая функцыя сацыяльнай дзяржавы. Заканамерна, што надзеі грамадзян рэспублікі на паляпшэнне сваіх жыццёвых умоў рэспандэнты звязалі, перш за ўсё, з прэзідэнцкай вертыкаллю і дзяржаўнымі ўстановамі.

Не выпадковым стала і тое, што ўдзельнікі апытання, а гэта ў асноўным людзі, якія былі членамі прафсаюзаў, менавіта яны вызначалі і адчувалі пазіцыю і ўплыў сваёй арганізацыі, паставілі прафсаюзы вышэй іншых арганізацый і

ўстаноў, адзначыўшы тым самым сілу прафсаюзаў, іх здольнасць ажыццяўляць ахоўную дзейнасць работнікаў наёмнай працы. Адзначым, што ў той момант прафсаюзы Беларусі атрымалі ў параўнанні з расійскімі даволі высокую адзнаку. Па дадзеных сацыялагічнага апытання, праведзенага расійскім сацыялагічным цэнтрам, пра стаўленне насельніцтва краіны да розных грамадскіх інстытутаў, з 11 фіксаваных пазіцый, прафсаюзы тут занялі толькі 10-е месца. Вышэй па аўтарытэтнасці ў рэспандэнтаў Расіі апынуліся Прэзідэнт, царква, армія, друк, радыё, тэлебачанне, урад, суд, пракуратура, Савет Федэрацыі і Дзярждума. Горш, чым да прафсаюзаў, расіяне паставіліся толькі да міліцыі [4, с. 2].

Аднак дваццаціпрацэнтны рэйтынг грамадскага аб'яднання сярод сваіх членаў і сімпатызантаў ў Беларусі сігналізаваў аб тым, што, застаючыся сацыяльным партнёрам дзяржавы, прафсаюзам з улікам працэсаў, якія праходзілі у беларускім грамадстве, трэба было прыкласці дадатковыя намаганні па абароне правоў і інтарэсаў працоўных. На такі падыход прафсаюзы арыентаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка. Ён увесь час акцэнтаваў увагу на тым становішчы, што прафсаюзам у нашай краіне адводзіцца значная роля ў вырашэнні ўнутраных праблем і актывізацыі сацыяльна-пазітыўных працэсаў у фарміраванні грамадзянскай супольнасці. У спецыфічных умовах, пакуль у краіне не сфарміравалася партыйна-палітычная сістэма, прафсаюзы, як ён лічыць, з'яўляюцца партыяй працоўных. Выступаючы на VII з'ездзе ФПБ ён адзначыў: "Вы – партыя працоўных. Вы з'яўляецеся асноўным правадніком дзяржаўных ідэй. І вам павінна быць да ўсяго справа! Замацавана гэта дзяржавай у законах ці не". Прэзідэнт заклікаў прафсаюзы да значнага пашырэння поля сваёй дзейнасці, быць на перадавой у вырашэнні ўсіх надзённых праблем грамадства. У выступленні кіраўніка дзяржавы было ўказана на неабходнасць узмацнення пазіцый прафсаюзаў у працоўных калектывах, павышэння сваёй ролі па стварэнні на прадпрыемствах нармальных умоў працы і побыту [5, с. 2–3].

Як паказвае рэальнае жыццё, задача, вылучаная кіраўніком дзяржавы, па ўдасканаленні прафсаюзнай працы асноўнага і самага масавага структурнага звяна ФПБ – пярвічных прафсаюзных арганізацый – вельмі актуальная. Іх рэакцыя на парушэнні, якія дапускаліся наймальнікамі ў галіне аплаты працы, аховы працы і здароўя работнікаў у працоўных калектывах, пакуль была слаба выніковай. З-за невыканання правілаў аховы працы і тэхнікі бяспекі ў галінах вытворчасці рэспублікі па-ранейшаму наглядаўся высокі працэнт няшчасных выпадкаў, прычым у 2015 годзе кожны чацвёрты загінуўшы на вытворчасці быў у нецвярозым стане. Што да такога важнага напрамку ў дзейнасці прафсаюзных арганізацый у рынкавых умовах, як сістэма аплаты працы, тут, на жаль, таксама назіралася нізкая выніковасць. Шматлікія парушэнні ў налічэнні і выплатах заработнай платы назіраліся ў Гомельскай вобласці. Тут у 2007 годзе праверка прававой інспекцыяй абкама прафсаюза работнікаў будаўніцтва і прамбудматэрыялаў 57 прадпрыемстваў у 47 з іх выявіла недаплаты работнікам на суму 26 млн рублёў. У аграпрамысловым комплексе Мінскай вобласці ў 2012 годзе спецыялісты абкама і райкамаў прафсаюза выявілі 700 парушэнняў па аплаце працы працаўнікам вёскі. Пасля праверак адміністрацыя гаспадарак (у гэтым прыкладзе парушэнні выяўлены ў 372 арганізацыях) вымушана была

вярнуць працаўнікам больш за 2 млрд 122 млн рублёў, якія былі ім недаплачаны або незаконна ўтрыманы [6, с. 13].

У Віцебскай вобласці вынікі праверак з боку абласнога аб'яднання прафсаюзаў паказалі, што і тут ў 2014 годзе мелася звыш 3 тысяч парушэнняў пры налічэнні або незаконным утрыманні сум заработнай платы [7, с. 13].

Самі па сабе прыклады выяўлення парушэнняў і ўстанаўлення справядлівасці кажуць аб змястоўнай дзейнасці прафсаюзаў па абароне сацыяльна-працоўных правоў працоўных. Абласныя і раённыя камітэты прафсаюза, валодаючы прадстаўніцкімі, пасрэдніцкімі і кансультатыўнымі функцыямі, маюць права аказваць падтрымку работнікам-сябрам прафсаюза прадпрыемстваў і арганізацый. У той жа час гэтыя ж прыклады наглядна паказваюць: многія пярвічныя прафсаюзныя арганізацыі, у большай меры тыя, што прадстаўляюць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, у няпростай эканамічнай сітуацыі аказваюцца папросту не здольнымі вытрымаць ціск працадаўцаў у пытаннях сацыяльнай абароны працоўных, справядлівай і своечасовай аплаты за працу. Гэтыя сур'ёзныя парушэнні з боку адміністрацыі ў налічэнні зарплаты і аплаце працы работнікам гаспадарак сведчаць аб нізкім каэфіцыенце карыснага дзеяння ў рабоце прафсаюзных арганізацый першаснага звяна – на прадпрыемствах, ва ўстановах, – дзе, згодна з нарматыўнымі дакументамі, павінен ажыццяўляцца асноўны аб'ём сацыяльнай работы, звязанай з выразам і адстойваннем інтарэсаў і гарантый работнікаў працоўнага калектыву. Менавіта тут праз канкрэтныя вынікі найбольш ярка выяўляюцца ўсе асноўныя функцыі прафсаюзаў, вядзецца асноўная праца па складанні калектыўных дагавораў і пагадненняў, кантроль за іх рэалізацыяй.

Прафсаюзныя арганізацыі прадпрыемстваў будаўнічай сферы і аграпрамысловага комплексу Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абласцей не здолелі абараніць сваіх сябраў, на практыцы аказаліся слабымі і няздольнымі вырашыць канфлікты, якія ўзнікалі ў працоўных калектывах. Наймальнікі такіх прадпрыемстваў або арганізацый (а іх у нясталых рынкавых умовах нямала), ігнаруючы заканадаўства і адначасова прафсаюзны камітэт, разумелі і дапускалі сацыяльнае партнёрства ў той меры, у якой гэта было выгадна ім. Такі тып адносін з'яўляецца прамым невыкананнем абавязкаў, прынятых на сябе сацыяльнымі партнёрамі.

У адпаведнасці з сацыялагічным апытаннем 63,3% рэспандэнтаў перакананыя, што асноўнай прычынай праблем і канфліктаў на ўзроўні прадпрыемства з'яўляецца нездавальняючая праца адміністрацыі ў вырашэнні пытанняў, якія тычацца ўмоў, арганізацыі і аплаты працы. Даследаванне праблемы развіцця сацыяльнай актыўнасці работнікаў і стварэння станоўчай маральна-псіхалагічнай абстаноўкі на прадпрыемствах Магілёўскай вобласці (праведзена ў 1999 г. сацыялагічным цэнтрам пры абласным выканкаме, апытана 600 чалавек) пацвердзіла, што ў кіраўнікоў шмат якіх калектываў не стае ўменняў аднаўляць узаемаадносіны з падначаленымі (13,1%), здольнасцей правільна ўспрымаць крытыку (11,3%), умення прыслухоўвацца да меркавання падпарадкаваных (13,2%) і арганізаваць работу калектыву (11,4%). На асобных прадпрыемствах (фабрыка мастацкіх вырабаў, "Фандок", абутковай фабрыцы) на пытанне "Хто або што з'яўляецца вінаватым ў складаным гаспадарча-



Рэпазіторый ВДУ

эканамічным становішчы прадпрыемства?” больш за 40% апытаных галоўнымі вінаватымі нездавальняючага стану прадпрыемстваў назвалі першых кіраўнікоў [8, с. 15–16].

Змена такіх умоў на пазітыўныя пасля даследавання стала адной з найважнейшых задач прафсаюзных камітэтаў Магілёўшчыны. Было заяўлена, што застаючыся на пазіцыях сацыяльнага партнёрства і супрацоўніцтва, яны будуць актыўна абараняць інтарэсы працаўнікоў, якія не баяцца праяўляць ініцыятыву і адстойваць пазіцыю калектыву.

Слабым месцам у працы прафсаюзных арганізацый было і пакуль застаецца недастатковая ўвага з іх боку да прыцягнення шырокага кола працаўнікоў да падрыхтоўкі, абмеркавання і прыняцця пагадненняў і калектыўных дагавораў, а таксама перыядычнай інфармаванасці калектыву працуючых аб іх выкананні. Даследаванне эфектыўнасці прынятых калектыўных дагавораў на прадпрыемствах Віцебшчыны (2005–2007 гг.) паказала, што калектыўныя дагаворы паміж бакамі сацыяльнага партнёрства атрымалі ў грамадскай думцы даволі высокую адзнаку. Было заўважана, што сфарміраваная сістэма іх заключэння і прыняцця ў асобных галінах гаспадарчага комплексу мела дастаткова адладжаны змест. Прафсаюзныя камітэты сталі больш патрабавальна ставіцца да дасягнення ўзгодненых у дагаворах прагнозных абавязацельстваў, звязаных з інтарэсамі работнікаў.

Пры абагульненні адказаў анкеты пра інфармаванасць членаў працоўных калектываў аб наяўнасці і змесце калектыўных дагавораў на прадпрыемствах (у арганізацыях), а таксама аб ступені ўдзелу апытваемых у падрыхтоўцы прапаноў у праекты пагадненняў і калектыўныя дагаворы, атрыманы наступныя адказы: 62,5% рэспандэнтаў ведалі аб наяўных на іх прадпрыемствах калектыўных дагаворах, 32,7% – мелі цяжкасці з адказам на гэта пытанне, 4,8% былі перакананыя ў іх адсутнасці. Пры гэтым 31% анкетаваных адзначылі, што калектыўны дагавор – гэта асноўны інструмент абароны інтарэсаў працоўных, 41% – перакананыя ў тым, што гэта важны інструмент уплыву на наймальніка, хоць і не лічаць калектыўны дагавор абсалютнай формай абароны сваіх інтарэсаў на вытворчасці. Толькі ў 12,2% рэспандэнтаў склалася меркаванне, што гэты дакумент, нягледзячы на закладзеныя ў яго пэўныя льготы і гарантыі, бескарысны, так як яго нормы, як правіла, не выконваюцца.

Вынікі анкетавання сведчаць: у цэлым апытаныя досыць высока ацэньваюць ролю калектыўных дагавораў у стварэнні ўмоў для высокапрадукцыйнай працы і годнай аплаты. У іх ацэнцы бачацца моцныя бакі калектыўных дагавораў і неабходнасці прыняцця апошніх ва ўсіх без выключэння працоўных калектывах. У той жа час анкетнае апытанне паказала слабыя месцы ў практыцы калектыўна-дагаворнай працы. Нізкай аказалася дасведчанасць рэспандэнтаў пра змест Генеральнага, абласных, гарадскіх (раённых) і галіновых пагадненняў. Ведаюць аб наяўнасці, але не знаёмыя з іх утрыманнем 24,5% рэспандэнтаў, 10,2% – знаёмыя з утрыманнем у агульных рысах, а 24,5% – не ведалі пра тое, што яны прымаюцца, 61,2% анкетаваных не мелі ўяўленні аб тым, у якой сувязі могуць і павінны знаходзіцца калектыўны дагавор прадпрыемства (арганізацыі) з рэгіянальнымі і галіновымі пагадненнямі.

Рэпазіторый ВГУ

Невысокім заставаўся на гэты час узровень інфармаванасці работнікаў аб тым, як поўна рэалізуюцца калектыўныя дамовы на прадпрыемствах. На пытанне “У якой ступені Вы валодаеце інфармацыяй аб рэалізацыі пунктаў калектыўнай дамовы на вашым прадпрыемстве?”, ні адзін з рэспандэнтаў не даў адказу, што ён цалкам валодае гэтай праблемай, ведалі аб рэалізацыі пагадненняў у агульных рысах – 6% апытаных, дрэнна ўяўлялі сабе іх змест – 14,2%, не ведалі аб паўнаце рэалізацыі прынятых бакамі абавязацельстваў – 28%, выпрабавалі цяжкасці з адказам на гэтае пытанне – 51,7% [9, с. 3–6]. Несуцяшальныя паказчыкі, атрыманыя ў ходзе даследавання, відавочна, можна растлумачыць тым фактам, што да падрыхтоўкі калектыўных дагавораў прыцягвалася вельмі мала радавых членаў прафсаюза. Толькі 10% апытаных уносілі прапановы ў праекты пагадненняў, яшчэ менш рэспандэнтаў прысутнічала на сходах (канферэнцыях) пры прыняцці калектыўных дагавораў.

Меліся праблемы з выкананнем наймальнікамі ў поўным аб’ёме прынятых на сябе абавязацельстваў і ў іншыя гады. Прафсаюзы адносілі прычыны падобнага становішча, як правіла, да аб’ектыўных (што часам не разыходзілася з рэчаіснасцю), з дапамогай прымірэнчых працэдур яны ішлі на кампраміс, уступкі. У многіх выпадках – гэта добра: атрымоўвалася выключыць радыкальныя сродкі ў вырашэнні працоўных спрэчак. Аднак такі спосаб вырашэння сацыяльна-эканамічных складанасцей у працоўным калектыве ставіў прафсаюзны камітэт у няёмкую пазіцыю. З’яўляліся (часам не без падстаў) публікацыі пра бюракратызацыю прафсаюзаў і іх адзяржаўленне, пра сумненне кампрамісаў, аб поўнай залежнасці прафсаюзных кіраўнікоў ад адміністрацый прадпрыемстваў. Для прафсаюзнага руху гэта аказалася стратай прэстыжу, зніжэннем матывацыі прафсаюзнага членства.

Вядома, зводзіць невыкананне пагадненняў і дамоўленасцей да нежадання ўрада, мясцовых дзяржаўных органаў або наймальнікаў было б няправільна, як, зрэшты, і абвінавачваць кіраўнікоў прафсаюзаў у няўстойлівасці іх поглядаў і нежаданні супрацьстаяць да канца. Пры наяўнасці пралікаў суб’ектыўнага плана ў рэспубліцы існавалі і аб’ектыўныя прычыны, якія не дазвалялі ажыццяўляць у поўным аб’ёме дэкляраваныя ў калектыўных дагаворах абавязацельствы.

У той жа час можна з высокай доляй упэўненасці сцвярджаць: эфектыўнасць калектыўна-дагаворнай практыкі ў сістэме сацыяльнага партнёрства можа кратна ўзрасці, калі будзе наладжана сістэма прыцягнення радавых членаў прафсаюза да ўдзелу ў распрацоўцы пагадненняў і калектыўных дагавораў і поўная інфармаванасць працоўных аб правадзімай прафсаюзамі працы па іх рэалізацыі.

Такім чынам бачна, што з пачатку 1990-х гадоў прафсаюзы як пасрэднікі ў працоўных адносінах паміж дзяржавай, працадаўцамі і працаўнікамі вымушаныя былі (з пераходам да рынку) зрабіць сур’ёзную карэкціроўку ў найважнейшых кірунках сваёй дзейнасці, унесці змены ў стратэгію і тактыку, усталяваную ў савецкі час. Заявіўшы аб правядзенні ўласнай палітыкі, незалежнай ад партыйных і дзяржаўных структур, прафсаюзы далёка не адразу змаглі адаптавацца да новых умоў. Невысокі каэфіцыент карыснага дзеяння пры выкананні прафсаюзамі ахоўнай функцыі апасродкаваны крызісам унутрыпрафсаюзнага руху, складанымі эканамічнымі і палітычнымі ўмовамі,



Репозиторий ВГУ

патэрналісцкім стаўленнем да іх з боку дзяржаўных структур. Да 2002 года прафсаюзныя арганізацыі гублялі колькасць сваіх радоў, пазіцыі ў перамоўных працэсах і палітычны ўплыў. З 2002 года адносіны паміж дзяржаўнымі структурамі і прафсаюзамі нармалізаваліся. Не без цяжкасцей, паступова ў працоўнай сферы складвалася мадэль сацыяльнага партнёрства, якая адказвала спецыфіцы нацыянальнай эканомікі рэспублікі. Зараз беларуская мадэль сацыяльнага партнёрства знаходзіцца ў стадыі станаўлення, фарміруецца з выкарыстаннем сусветнага пазітыўнага вопыту. Ключавую ролю ў рэалізацыі прафсаюзамі ахоўнай функцыі займае інстытут калектыўных дагавораў і пагадненняў, які ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі выступаў найважнейшым элементам сістэмы сацыяльнага партнёрства, а такім чынам, асновай сацыяльнай стабільнасці. Карэктныя адносіны паміж суб’ектамі сацыяльнага партнёрства падняла імідж прафсаюзаў у беларускім грамадстве. Больш цеснае ўзаемадзеянне сацыяльных партнёраў спрыяла ўстойліваму развіццю прамысловасці, сферы паслуг і прадпрымальніцтва, павышэнню жыццёвага ўзроўню насельніцтва рэспублікі.

**Літаратура**


1. Витко, Ф.П. Профсоюзы и социальное партнерство / Ф.П. Витко // Социальное партнерство: концепция, опыт, проблемы: материалы Второй Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 22–23 апр. 1999 г. / Витебск, 1999. – С. 1–18.
2. Доклад председателя Федерации профсоюзов Беларуси Л.П. Козика VI съезду ФПБ // Беларускі час. – 2010. – 17–23 сент.
3. Мандрик, И.В. Социальная безопасность: место и роль профсоюзов в ее обеспечении / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2008. – № 2. – С. 7–11.
4. Головачев, В. Доверие только крепнет / В. Головачев // Труд. – 2004. – 29 сент. – С. 2.
5. Лукашенко, А.Г. Вы – партия наших трудящихся / А.Г. Лукашенко // Беларускі час. – 2015. – 5 июня. – С. 3.
6. Азаренко, К.В. Одни экономят на зарплатах, другие возвращают недоплаченные деньги работникам / К. Азаренко, В. Симанович // Беларускі час. – 2013. – 22–28 февр. – С. 13.
7. Возмитель, И.К. За нами – люди труда / И.К. Возмитель // Витьбичи. – 2015. – 30 мая. – С. 3.
8. Александренок, М.С. Руководитель в системе производственных отношений / М.С. Александренок // Социальное партнерство: концепция, опыт, проблемы: материалы Третьей Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 22–23 июня 2000 г. – Витебск: ВФ УО ФПБ «МИТСО», 2001. – С. 15–17.
9. Мандрик, И.В. Степень информированности членов профсоюза о содержании соглашений и коллективных договоров. Имеющиеся проблемы требуют особого внимания / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2007. – № 1.


Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 13
# Месца і роля прафсаюзаў у забяспячэнні сацыяльнай бяспекі і згуртаванасці грамадскай супольнасці

## Раздзел А. Сацыяльная справядлівасць – аснова грамадскага пагаднення
## Раздзел Б. Прафсаюзы – суб’ект сацыяльнай згуртаванасці грамадства

**Раздзел А. Сацыяльная справядлівасць – аснова грамадскага пагаднення.** У навуковай грамадскасці склалася досыць абгрунтаванае разуменне тэрміна “сацыяльная бяспека”. Паняцце “сацыяльная бяспека” разглядаецца як стан, пры якім эканамічныя грамадскія працэсы ў дзяржаве развіваюцца па ўзыходзячай, чалавеку гарантуюцца сацыяльная справядлівасць і сацыяльная абароненасць, у грамадстве адсутнічаюць ці мінімізаваныя прычыны сацыяльных канфліктаў. Сацыяльная бяспека ўяўляецца як ўзровень развіцця эканамічных, сацыяльных і духоўных параметраў дзяржавы, пры якім яна ў супрацоўніцтве з грамадскімі інстытутамі мае магчымасць забяспечыць абарону жыццёва важных інтарэсаў асобы, сям’і і прафесійных супольнасцей у адпаведнасці з патрэбамі прагрэсу цяперашніх і будучых пакаленняў.

У Рэспубліцы Беларусь замацоўваецца мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця, прыярытэтамі якой выступаюць кардынальнае павышэнне якасці жыцця грамадзян, узнаўленне насельніцтва і фарміраванне чалавека-грамадзяніна, працаўніка, патрыёта. Канцэнтрацыя намаганняў зроблена на развіццё эканомікі, устойлівы рост макраэканамічных паказчыкаў. На думку навукоўцаў, галоўная пагроза сацыяльнай бяспекі краіны захоўваецца ў нізкім жыццёвым стандарце значнай часткі яе грамадзян. Гэта адбіваецца не толькі на сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў грамадстве, але і на яго псіхалагічным стане. Парогавым значэннем, фіксуючым магчымасць з’яўлення сацыяльных канфліктаў, як паказвае сусветны вопыт, з’яўляецца незадавальненне сваім жыццёвым узроўнем 30% насельніцтва (сюды ўваходзяць прыкладна 10% тых, хто мае даход ніжэй пражытачнага мінімума, і 20% тых, у каго даход перавышае на 40–50% мінімум. Разам яны складаюць групу так званага сацыяльнага незадавальнення.

Кіраўнік дзяржавы А.Р. Лукашэнка яшчэ ў 2007 годзе паставіў маштабную і складаную задачу: давесці праз пяць гадоў якасць жыцця нашых грамадзян да ўзроўню, параўнальнага са сярэднееўрапейскім [1, с. 6]. Паколькі падтрыманне якасці жыцця, якое забяспечвае нармальнае ўзнаўленне грамадства (галоўны крытэрый сацыяльнай бяспекі), – гэта найважнейшая функцыя дзяржавы, у Беларусі вызначаны нацыянальныя праекты, рэалізацыя якіх павінна вывесці краіну на запланаваны ўзровень. Такі падыход, як адзначалася ў папярэднім

Репозиторий ВГУ

раздзеле, падзяляецца насельніцтвам рэспублікі, іх надзеі на паляпшэнне сваіх жыццёвых умоў звязваюцца з дзяржаўнай падтрымкай і дзейнасцю мясцовай улады.

При гэтым вывучэнне грамадскай думкі ў працоўных калектывах паказала, што паспяховае выкананне кіраўніцтвам дзяржавы пэўных задач і адначасова рашэнне праблем сацыяльнай бяспекі, звязваецца, што зусім слушна, з трываласцю партнёрскіх адносінаў дзяржавы з грамадскімі інстытутамі і перш за ўсё з прафесійнымі саюзамі краіны. Прафсаюзным арганізацыям у вырашэнні праблем сацыяльнай бяспекі адводзіцца роля партнёраў дзяржавы з тым, каб накіроўваць намаганні шматлікага грамадскага руху на абарону сацыяльна-эканамічных і палітычных правоў і інтарэсаў працоўных.

У прынятых дакументах і дзеяннях ФПБ у вывучаемым перыядзе прасочвалася лінія актыўнага ўздзеяння на паступальнае развіццё беларускага грамадства ў рамках грамадзянскага міру, справядлівасці, роўнасці правоў і адносна дыферэнцыраванага размеркавання выгод ў адпаведнасці з выдаткаванай цяжкасцю, яе колькасцю, якасцю і кваліфікацыяй работнікаў [2].

Станоўчы ўплыў на сацыяльную бяспеку аказваў наладжаны дыялог кіраўніцтва ФПБ з урадам па розных, у тым ліку па самых вострых сацыяльных праблемах. На пасяджэннях Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях з удзелам прадстаўнікоў прафсаюзаў рэгулярна абмяркоўваліся пытанні развіцця эканамічных, сацыяльных і духоўных параметраў дзяржавы, якія пры апоры на грамадскія інстытуты забяспечваюць абарону жыццёва важных інтарэсаў асобы, сям'і і прафесійных супольнасцей.

Пачынаючы з 2002 года бакі часцей за ўсё дасягалі кампрамісу і, як правіла, знаходзілі станоўчыя для насельніцтва рашэнні па самых вострых пытаннях: гарантыі заработнай платы, пенсійнага забеспячэння, абароны працоўных ад прафесійных захворванняў, няшчасных выпадкаў на вытворчасці і шэрагу іншых праблем, з якімі сутыкаецца чалавек працы. Такі падыход аказваў пазітыўны ўплыў на становішча мільёнаў людзей. Сацыяльныя адносіны, пабудаваныя на аснове сацыяльнай справядлівасці, выгадны і наймальнікам, і рабочым. Тым самым здымаюцца незадаволенасць грамадзян і напружанне, назапашанае ў асобных сацыяльных групах.

Прафсаюзы спрыялі стабільнаму развіццю дзяржавы не толькі тым, што яны аказвалі ўплыў на дзяржаўныя і гаспадарчыя інстытуты. ФПБ у рыначных умовах прыняла непасрэдна на сябе частку дзяржаўнай адказнасці за прадастаўленне насельніцтву розных сацыяльных паслуг – адукацыйных (функцыяніруе свая ВНУ), аздараўлення і адпачынку, развіцця творчых здольнасцей чалавека (тут таксама маюцца вопыт і адпаведная база).

Як бачна, такімі адносінамі да грамадства прафсаюзы ўплываюць на стварэнне стабільнай абстаноўкі ў краіне. Падобны падыход толькі дадае аўтарытэту прафсаюзнаму руху рэспублікі. Аднак, на думку даследчыкаў, сацыяльная згода не азначае, што прафсаюзы не павінны змагацца за правы сваіх сяброў. У краіне яшчэ існуюць ўмовы працы, якія цягнуць за сабой несправядлівасць, патрэбу ў абароне правоў для пэўнай колькасці людзей. Прафсаюзам неабходна вызначыць свае паводзіны ў пытаннях павышэння дабрабыту насельніцтва і скарачэння беднасці за кошт заработнай платы. Для



Рэпазіторый ВДУ

барацьбы з беднасцю прафсаюзы настойваюць на шырокамаштабным развіцці адраснай сацыяльнай дапамогі, якая, як вядома, не дае росту дастатку грамадству, а толькі пераразмяркоўвае ўжо створанае.

Больш эфектыўным метадам барацьбы з беднасцю з'яўляецца павышэнне заработнай платы, якая забяспечвае годны ўзровень жыцця для работніка і яго сям’і. Прафсаюзам, на думку многіх навукоўцаў, неабходна заняць выразную палітыку ў галіне даходаў насельніцтва, галоўным арыенцірам павінна быць пашырэнне ў краіне сярэдняга класа. Як сведчыць сусветная практыка, сацыяльная бяспека грамадства грунтуецца на тых, хто сваёй працай зарабляе на жыццё і плаціць падаткі. Гэты пласт павінен складаць не менш за 50% насельніцтва краіны. Прафсаюзам у наладжванні сацыяльнага партнёрства з дзяржавай і наймальнікамі ў XXI ст. варта паставіць у разрад прыярытэтаў сацыяльнай палітыкі барацьбу з беднасцю. Адным з важных напрамкаў тут было б вылучэнне патрабаванняў па ўзроўні заработнай платы: дамагацца такога становішча, каб працуючы чалавек і яго сям’я не траплялі ў асяроддзе бедных. Пакуль па ВУП на душу насельніцтва Беларусь не знаходзіцца ў ліку развітых краін.

Як паказала даследаванне, сярод прыярытэтных задач, звязаных з забеспячэннем сацыяльнай бяспекі, на дадзеным этапе, на думку большасці рэспандэнтаў, вылучалася задача сумеснай дзейнасці прафсаюзаў з дзяржавай і наймальнікамі па задавальненні патрэбаў работніка і яго сям'і з пазіцыі пашыранага ўзнаўлення працоўнай сілы. Варта адзначыць правільнасць падобнага меркавання. Трагічныя падзеі 1986 г. на Чарнобыльскай АЭС, распад Савецкага Саюза, зніжэнне даходаў насельніцтва парушылі нармальнае ўзнаўленне грамадства як дэмаграфічнай папуляцыі, як нацыі. Згодна са статыстыкай натуральнае змяншэнне з-за смяротнасці ў краіне ў вывучаемым перыядзе перавышала нараджальнасць. За 6 гадоў (2001–2006), насельніцтва Віцебскай вобласці скарацілася за кошт натуральнага змяншэння (перавышэнне смяротнасці над нараджальнасцю) на 64508 чалавек [3]. Нагадаем, што ў савецкай Беларусі мелася тэндэнцыя паступовага прыросту насельніцтва, а ў 1950 гады назіраўся ўсплеск нараджальнасці. Штогод натуральны прырост насельніцтва складаў амаль 150 тыс. чалавек.

У вывучаемы час у Беларусі замацавалася тэндэнцыя нешматдзетнай сям’і, ці адкладвання нараджэння дзяцей маладымі людзьмі на больш позні час. Штогадовае скарачэнне нараджальнасці прывяло да таго, што ў 2005 годзе дзеці ва ўзросце 15 гадоў складалі 17,7% ад агульнай колькасці жыхароў рэспублікі, хоць у 1999 г. іх было 21,2% [4, с. 50].

Дэпапуляцыя – бяда для сацыяльнай бяспекі любой краіны. Наступствам дэпапуляцыі становіцца не толькі колькаснае скарачэнне працоўнага патэнцыялу краіны, але і яго старэнне, што непазбежна прыводзіць да павелічэння так званай “дэмаграфічнай нагрузкі” на кожнага працаздольнага. З гэтай праблемай сёння сутыкаецца ўся Еўропа. Па прагнозах Міжнароднай асацыяцыі сацыяльнага забеспячэння (МАСЗ) да 2050 г. на аднаго пенсіянера ў сярэднім у свеце будзе прыходзіцца ўсяго два працуючых (у 1950 г. на аднаго пенсіянера прыходзілася 10 работнікаў). Пры такой дэмаграфічнай сітуацыі, як яна складвалася ў краіне на папярэднім дваццацігадовым этапе, прафсаюзныя арганізацыі абавязаны

Репозиторий ВГУ

стымуляваць працадаўцаў на першачарговае правядзенне імі арганізацыйна-тэхнічных мер па ахове працы, якія ўключаюць комплекс тэхналагічных, сацыяльных, медыцынскіх, санітарна-гігіенічных мер, на стварэнне сістэмы кіравання рызыкамі на прадпрыемствах. Павышаная ўвага да праблемы бяспекі працы тлумачыцца ў першую чаргу тым, што з кожным годам, нягледзячы на прымаемыя ў розных краінах меры, вытворчы траўматызм, у тым ліку са смяротным зыходам, і прафзахворванні не зніжаюцца. Прычым гэта тычыцца і тых краін (перш за ўсё развітых рыначных), дзе ім надаецца, здавалася б, павышаная ўвага. Паводле дадзеных МАП, у 2002 годзе (пазнейшых такіх жа падрабязных звестак у нашым распараджэнні пакуль няма. – *І.М.*), у свеце зарэгістравана звыш за 270 млн няшчасных выпадкаў, звязаных з працоўнай дзейнасцю, і 160 млн выпадкаў прафесійных захворванняў. Загінулі на вытворчасці амаль 354 тыс. работнікаў, з іх у краінах з рыначнай эканомікай – 16,2 тыс., у былых сацыялістычных краінах – 21,4 тыс., у Кітаі – 73,6 тыс., у Індыі – 48,1 тыс. Вялікія страты ад вытворчай недасканаласці і паводзінаў работнікаў у працэсе працы нясуць краіны Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна. Калі ж да ліку загінуўшых на вытворчасці дадаць тых, хто атрымаў у выніку няшчаснага выпадку прафзахворванне і выбыў з вытворчага працэсу, то гэты паказчык узрасце да 2 млн чалавек (у 2004 г. такіх было ўжо за 2,2 млн) [5, с. 25].

У сферы бяспекі працы ва ўсіх дзяржавах свету ўсё ў большай меры становяцца актуальнымі пытанні, звязаныя з маральным самаадчуваннем работнікаў, і фактары, якія ўскосна ўплываюць на працу, – спажыванне алкаголю, наркотыкаў і нават «інтэрнэт-залежнасць». У Рэспубліцы Беларусь назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння вытворчага траўматызму: за дзесяць гадоў з 1998 па 2008 год колькасць траўміраваных на вытворчасці знізілася амаль у чатыры разы. У 2008 годзе на вытворчасці траўмы атрымалі 3000 работнікаў, у 2009 – 2792. Аднак і гэтыя статыстычныя паказчыкі вытворчага траўматызму выклікаюць сур'ёзны клопат. Па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь з-за траўміравання работнікаў на вытворчасці грамадства нясе велізарныя страты. У 2009 годзе з-за траўматызму на вытворчасці страчана 101,8 тыс. чалавека-дзён. Сума выплачаных пацярпелым страхавых за кошт сродкаў абавязковага страхавання ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў склала 148,2 млрд рублёў (2008 г. – 140,4 млрд рублёў). У сярэдзіне 2000-х гадоў у рэспубліцы больш за 13% смерцяў прыходзілася на вытворчы траўматызм. Гэта прыкладна столькі ж, колькі ад пагаршэння экалагічнага становішча. У канцы 2015 года ўзровень вытворчага траўматызму са смяротным зыходам на беларускіх прадпрыемствах быў у 5-6 разоў вышэй, чым у эканамічна развітых краінах. Паводле аператыўных дадзеных Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы ў 2015 годзе – за няпоўны год (студзень-лістапад) – у выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці загінуў 131 чалавек, што на семнаццаць работнікаў менш, чым за аналагічны перыяд 2014 года. Трыццаць два загінуўшых у момант траўміравання знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

Аналіз сітуацыі спецыялістамі ў гэтай галіне паказвае на тое, што ў большасці выпадкаў прафесійныя захворванні ўзнікаюць з-за недасканаласці

Рэпазіторый ВГУ

тэхналагічных працэсаў, канструктыўных недахопаў машын і абсталявання, загазаванасці працоўных памяшканняў. Каля 15% рэспандэнтаў Віцебскай і Магілёўскай абласцей адзначылі, што на сацыяльную бяспеку негатыўна ўплываюць нездавальняючыя ўмовы працы. Пакуль ўдзельная вага работнікаў, занятых ва ўмовах, якія не адпавядаюць санітарна-гігіенічным нормам, дастаткова высокая.

З-за высокай ступені зносу асноўнага абсталявання ўзрастаюць прафесійныя рызыкі, адбываецца большасць выпадкаў вытворчага траўматызму, часта са смяротным зыходам. Статыстычныя дадзеныя па Віцебскай вобласці ў рамках перыяду даследавання пацвярджаюць гэтую выснову: траўматызм на вытворчасці зніжаўся павольна, а ў асобных раёнах станавіўся яшчэ вышэй. Такое ж становішча ў Магілёўскай вобласці, хоць тут, як і на Віцебшчыне, колькасць праверак умоў працы на вытворчасці з боку прафсаюзных арганізацый ўзрастала з кожным месяцам, а ўзровень вытворчага траўматызму заставаўся высокім. Адбываюцца і зусім казусныя выпадкі: у Гомельскай вобласці наймальнікі паспрабавалі ў 2006 годзе аформіць 26 смяротных выпадкаў у працэсе працы як не звязаных з вытворчасцю [6, с. 15].

Праверкі, як кантроль над бяспечнымі ўмовамі працы, – важны бок прафсаюзнай дзейнасці. Але паколькі эфектыўная і бяспечная праца непасрэдна на працоўным месцы павінна адпавядаць навукова абгрунтаваным умовам, важна, каб за праверкай вынікалі сур’ёзныя меры, у тым ліку фінансавыя, матэрыяльныя ўкладанні ў мадэрнізацыю вытворчасці, змены ступені шкоднасці і небяспекі, якія вядуць да адчувальнага паляпшэння жыцця і ўмоў працы. Кампенсацыі ў выглядзе грашовых выплат, прадастаўленне лячэбна-прафілактычнага харчавання, чаму так шмат увагі надаюць прафсаюзныя камітэты, – гэта меры карысныя, але яны носяць паліятыўны характар, ад іх мала карысці ў захаванні здароўя, зніжэнні смяротных зыходаў на вытворчасці. Атрымліваючы малако або аплату ў павышаным памеры, тыя ж работнікі з-за ўстарэлага абсталявання могуць стаць калекамі, з вытворчага працэсу выводзяцца кадры (ім прызначаюцца дапамогі па непрацаздольнасці), што негатыўна адбіваецца на эканоміцы краіны.

Спецыялісты, якія вывучаюць дасканала дадзеную праблему, лічаць неабходным бачыць галоўныя перашкоды, што вядуць да вытворчага траўматызму і прафесійных захворванняў. Дрэнны стан прадукцыйных сіл, адсталы парк абсталявання – гэта тыя фактары, якія спрыяюць траўматызму і дэградацыі працоўнага патэнцыялу чалавека.

Кампенсацыі, у якіх часта зацікаўлены прафсаюзныя камітэты і самі работнікі, перашкаджаюць фундаментальнаму падыходу да паляпшэння ўмоў працы. У краінах Еўрапейскага Саюза падобная сістэма адменена. Прафсаюзы гэтых краін настойваюць на маштабных, дадатковых укладаннях сродкаў у мадэрнізацыю вытворчых працэсаў. У асаблівых выпадках (пры павышанай рызыцы для работніка) у прафсаюзаў тут ёсць магчымасць настойваць на спыненні ці закрыцця ўчасткаў, цэхаў і нават прадпрыемстваў. Беларускія прафсаюзы могуць выкарыстоўваць вопыт савецкага часу. Савецкія прафсаюзы валодалі такім правам.

Рэпазіторый ВГУ

У сучасных умовах у прафсаюзаў рэспублікі маецца неабмежаваны патэнцыял магчымасцей для ўзмацнення інфармацыйна-растлумачальнай працы сярод працоўных па выкананні на вытворчасці правілаў тэхнікі бяспекі і здаровага ладу жыцця. У тэме бяспечнай працы і аховы здароўя на працоўным месцы ў цяперашніх умовах востра паўстае пытанне аб стрэсавых з'явах, якія таксама вядуць да страты здароўя работнікаў. Стрэс як негатыўна афарбаваная эмацыянальная рэакцыя на працоўны працэс узнікае па прычыне псіхічных перагрузак работнікаў, у тым ліку з-за неразмерных патрабаванняў да працы, аўтарытарнага кіраўніцтва, канфліктаў на працоўным месцы, гвалту і мобінгу (трэціраваннем з боку калег. – *І.М.*). Да ліку класічных фактараў стрэсу адносяцца таксама шумы, вібрацыя і манатоннасць працы.

На час публікацыі манаграфіі мы не валодалі пэўнымі дадзенымі аб захворваннях, звязаных са стрэсамі ў нашай рэспубліцы. Вылучыць у асобную радок стрэсавыя захворванні працоўных, прапушчаныя ў сувязі з імі працоўныя дні, эканамічныя страты дзяржавы і бізнесу з-за хвароб складана. Еўрапейскі фонд паляпшэння ўмоў жыцця і працы (офіс размешчаны ў горадзе Дублін) вылучае праблему стрэсаў на працоўным месцы ў асобную праграму. Па дадзеных гэтага фонду ад стрэсавых з'яў пакутуюць прыкладна 28% працоўных у краінах Еўрапейскага Саюза, у 23% выяўлены сімптомы хранічнай стомленасці.

У Францыі прафсаюзы патрабуюць прызнання стрэсу прафесійным захворваннем, паколькі яго ахвярамі называюць сябе 72% апытаных працаўнікоў, перш за ўсё служачыя, і 11% работнікаў, якія атрымалі вызваленне ад працы па гэтай прычыне.

У Рэспубліцы Беларусь стрэсавы стан выклікае практыка кантрактнай сістэмы найму на працу, якая часта ставіць работніка ў нераўнапраўнае, зневажальнае становішча.

Вядома, дысцыпліна, парадак, арганізаванасць ў сферы сацыяльна-працоўных адносін – важныя фактары. Але, разам з тым, заключэнне кантрактаў на адзін год, магчымасць непрацяг кантракту без тлумачэння прычын, некаторыя іншыя палажэнні не суадносяцца з неабходнасцю фарміравання свядомай дысцыпліны на вытворчасці.

Прафсаюзныя камітэты рэспублікі павінны стаць ініцыятарамі ў арганізацыі і правядзенні канферэнцый, семінараў па пытаннях рацыянальнага выкарыстання працоўных рэсурсаў, стварэння камфортных умоў працы, выстаў на тых прадпрыемствах, дзе праводзіцца паспяховая работа па стварэнні спрыяльнага клімату на вытворчасці.

Патрабуе прафсаюзнай увагі праблема развіцця прафілактычнай медыцыны. Тут прафсаюзам варта глыбей разгледзець праграму, звязаную з захаваннем здароўя, развіццём прафілактычнай медыцыны, санаторна-курортнага лячэння, арыентаваную перш за ўсё на ўмацаванне здароўя людзей.

Як паказала вывучэнне дадзенага пытання, у здраўніцы рэспублікі, у тым ліку прафсаюзныя, у 2008 годзе лягчэй было трапіць жыхарам Санкт-Пецярбурга, Масквы, грамадзянам іншых краін, чым карэннаму насельніцтву. Больш таго, на асобных прадпрыемствах (недзяржаўных формаў уласнасці) меліся цяжкасці з набыццём не толькі пуцёўкі, але і не прадугледжвалася



Репозиторий ВГУ

прадастаўленне адпачынку работнікам (такая тэма неаднаразова абмяркоўвалася ў 2000-х гадах на пасяджэнні Віцебскага абласнога аб’яднання прафсаюзаў, актуальнай яна засталася і ў наступныя гады). Падобнае становішча не садзейнічала фарміраванню сацыяльнай актыўнасці працоўных, выклікала ў іх незадаволенасць дзейнасцю функцыянуючых дзяржаўных структур, наймальнікаў і прафсаюзаў.

Прафсаюзныя камітэты ставілі пытанні аб стварэнні сваіх арганізацый, якія змаглі б выступаць ад імя работнікаў, абараняць іх інтарэсы, у тым ліку і ў справе аховы працы, на прадпрыемствах недзяржаўных формаў уласнасці, але сур’ёзных змен тут не адбывалася.

На VII з’ездзе ФПБ (чэрвень 2014 г.) кіраўнік дзяржавы А.Р. Лукашэнка зноў засяродзіў увагу на пытанні стварэння прафсаюзных арганізацый на прадпрыемствах з прыватнай формай уласнасці [7, с. 3]. Пакуль жа асобныя кіраўнікі прыватных, у тым ліку буйных кампаній, не знаходзяць магчымым ствараць прафсаюзныя арганізацыі ў працоўных калектывах недзяржаўнай формы ўласнасці і нават перашкаджаюць гэтаму. Па ўсёй верагоднасці, для вырашэння гэтай праблемы ў Беларусі можна было б пераняць вопыт Кітая. Тут заканадаўча прынята рашэнне аб стварэнні прафсаюзных арганізацый на прадпрыемствах з прыватнай формай уласнасці.

Адна з самых вострых праблем сацыяльнай бяспекі на сёння, якая патрабуе ўвагі дзяржаўных структур і прафсаюзаў, – дэпрафесіяналізацыя персаналу. У рэспубліцы, як яе бачаць навукоўцы, у параўнанні з савецкім часам, да 2015 года мелася значнае зніжэнне аб’ёмаў прафесійнага навучання і перанавучання персаналу. Слаба дзейнічала сістэма прафесійнай арыентацыі. У галінах эканомікі, аб чым было сказана раней, адчуваўся дэфіцыт не толькі высокакваліфікаваных рабочых, але і спецыялістаў канструктарскага, інавацыйна-тэхналагічнага і кіраўніцкага персаналу. Гістарычны вопыт сучасных развітых краін (Японія, Нарвегія) падсказвае, што галоўнай умовай эканамічнага прарыву і стварэння дастойных умоў працы з’яўляецца не столькі наяўнасць сыравінных рэсурсаў, колькі працоўны патэнцыял грамадзян, працягласць жыцця насельніцтва. Лідарства ў эканамічнай і сацыяльнай сферах можна дасягнуць толькі за кошт умелай працоўнай матывацыі чалавека. Сёння можна ўзяць на ўзбраенне лепшы вопыт мінулага. У СССР прафсаюзы разам з дзяржаўнымі ўстановамі ў 60–80-х гг. мінулага стагоддзя займаліся паглыбленнем і пашырэннем прафесійнай сацыялізацыі працоўных праз эканамічныя школы, настаўніцтва, правядзенне конкурсаў па прафесіях і іншыя формы. Добрыя прыклады прафесійнай падрыхтоўкі і замацавання кадраў на вытворчасці меліся ў нашай рэспубліцы [8, с. 112].

Неразвітасць партый і грамадскіх рухаў робіць прафсаюзы цэнтральным і галоўным сацыяльным інстытутам фарміруючай грамадзянскай супольнасці. Важна адзначыць: прафсаюзы Беларусі, у адрозненне ад іншых грамадскіх фарміраванняў, маюць сфарміраваную доўгім часам арганізацыйную структуру, высокі сацыяльны статус, сваю членскую базу, сацыяльныя мэты і досвед працы ў розных умовах. У сувязі з гэтым прапануецца падняць цікавасць навукоўцаў да праблем прафсаюзнага будаўніцтва, вывучэнню пэўных крытэрыяў сацыяльнай бяспекі самога прафсаюзнага руху. Пакуль буйных даследаванняў па гэтым

Репозиторий ВГУ

пытанні ў рэспубліцы не праводзілася. Тэма аб спецыфічных для рэспублікі фактарах унутрыпрафсаюзнай бяспекі не атрымала належнага развіцця ў тэарэтычных распрацоўках і паўсядзённай практычнай дзейнасці. Паводле сацыялагічных даследаванняў, слабым месцам на дадзены час, што адмоўна адбіваецца на аўтарытэце прафсаюзаў, не ўзмацняе іх унутранай бяспекі, з'яўляецца фармалізм у працы прафсаюзных камітэтаў і арганізацый, які спараджае інертнасць у радавых членаў прафсаюза, вядзе да адрыву асноўнай масы людзей ад кіруючых прафсаюзных калегій.

Пры наяўнасці ў прафсаюзным руху рэспублікі салідрай членскай базы (больш за 4 млн чалавек) у ёй пераважае інерцыйна-страховачны і спажывецкі тып прафсаюзнага членства (знаходзяцца ў прафсаюзах людзі ў сілу інерцыі, па звычцы, на ўсялякі выпадак, для абароны ўласных правоў на выпадак цяжкіх жыццёвых сітуацый). Навукоўцы маскоўскай Акадэміі працы і сацыяльных адносін і даследаванні беларускіх навукоўцаў паказваюць: сёння для прафсаюзаў важна дамагацца салідарысцкага тыпу прафсаюзнага членства (такія члены прафсаюза ўспрымаюць прафсаюзны рух як калектыўнага, рэальнага абаронцу сваіх правоў і нават у зменлівых экстрымальных абставінах не стануць перарываць у прафсаюзах свайго сяброўства).

У прафсаюзным руху рэспублікі ёсць сябры прафсаюза гэтага тыпу. З кожным годам, у залежнасці ад успрымання працуючымі ступені ўплыву прафсаюзаў на рашэнне найбольш важных праблем у жыцці людзей, іх працэнтныя суадносіны па тыпах да агульнай колькасці змяняюцца. Пытанне гэта патрабуе пастаяннага (а не эпізадычнага) вывучэння. Чым больш будзе ў радах прафсаюзнага руху людзей з салідарным тыпам, тым вышэй будзе ўнутраная прафсаюзная бяспека. Як суб'екты сацыяльнай стабільнасці прафсаюзы могуць і павінны заняць вядучае месца ў краіне. А пакуль на пытанне, ці з'яўляюцца прафсаюзы суб'ектамі сацыяльнай бяспекі дзяржавы, станоўча адказалі толькі 30% рэспандэнтаў і каля 40% рэспандэнтаў адзначылі важную ролю прафсаюзаў у фарміраванні стабільнага працоўнага калектыву [9, с. 10].

Прафсаюзным арганізацыям неабходна належным чынам займацца ўмацаваннем сваёй сяброўскай базы на падставе сяброўства салідарнага тыпу (аб гэтым размова пойдзе ў спецыяльным раздзеле), лепш выкарыстоўваць магчымасці ўключаных у прафсаюзы людзей для пашырэння самадзейных форм работы, стварэннем у працоўных калектывах умоў, пры якіх жыццёвая энергія чалавека, накіраваная на індывідуальную асобасную самарэалізацыю, спалучалася б з уцягваннем яго ў грамадскае жыццё.

Прафсаюзным арганізацыям не варта адмаўляцца ад сістэмы працоўнага спаборніцтва (але толькі ў больш узважаных формах і маштабах, чым гэта наглядалася ў савецкі час). Суперніцтва – рэальны стымул паспяховай працы, свядомых адносін да працы. У рабочым асяроддзі лічыцца важным запазычанне вопыту мінулага ў дзейнасці прафсаюзных камітэтаў па развіцці сеткі бібліятэк, клубаў, стварэнню творчых калектываў і спартыўных таварыстваў.

Прафсаюзам сваімі паспяховымі дзеяннямі, а навукоўцам выступленне ў друку, у аўдыторыях неабходна разбураць стэрэатыпы асобных людзей і груп, дзе прафсаюзы бачацца як адсталая арганізацыя, і фарміраваць адпаведны для гэтай арганізацыі імідж. Як вынікае з вышэйсказанага, прафсаюзы з'яўляюцца

Рэпазіторый ВДУ

найбольш рэальнымі суб'ектамі кансалідацыі намаганняў па забеспячэнню ўстойлівай сацыяльнай бяспекі. Для гэтага ў прафсаюзах маецца два асноўныя спосабы ўзаемадзеяння з дзяржавай і працадаўцамі: супрацоўніцтва і суперніцтва. Пазіцыя прафсаюзаў у стварэнні сацыяльнай бяспекі павінна быць асэнсаванай, яснай, паслядоўнай, дынамічнай і народнай. Па меры руху наперад прафсаюзным камітэтам і арганізацыям для стварэння стабільнага становішча на прадпрыемствах, ва ўстановах варта ініцыяваць прыняцце дзяржаўных стандартаў, арыентаваных не на параметры фізіялагічнага выжывання чалавека (падобная тактыка прафсаюзаў яшчэ мае месца), а на такую якасць яго працы і жыцця, якая забяспечвае годнасць і свабоднае развіццё асобы. Далейшае ўмацаванне ўнутранай прафсаюзнай бяспекі можа адбывацца на аснове стварэння сваёй устойлівай арганізацыйнай структуры, правядзення палітыкі, арыентаванай на інтарэсы працоўных, фарміравання ўсвядомленасці прафсаюзнага членства, трывалай уласнай матэрыяльна-тэхнічнай базы, кадравага патэнцыялу, які валодае агульнай і спецыялізаванай кампетэнтнасцю, стылем, культурай рэалізацыі сваіх функцый, інавацыйнага мыслення, адказнасцю і паслядоўнасцю ў рэалізацыі прынятых рашэнняў.

Ва ўмовах глыбокіх тэхналагічных перамен прафсаюзы нашай краіны здольны мабілізаваць намаганні дзяржавы і бізнесу (і ўласныя) для бесперапыннай прафесійнай падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі работнікаў. Уздзейнічаючы на падрыхтоўку рабочых кадраў, выкарыстоўваючы матэрыяльныя і духоўна-ідэалагічныя механізмы, фарміраванне прафесійнай свядомасці і прафесійнай культуры суб'ектаў працы, прафсаюзы тым самым умацуюць кадравую бяспеку дзяржавы і грамадства.

**Раздзел Б. Прафсаюзы – суб'ект сацыяльнай згуртаванасці грамадства.** Гістарычны досвед (айчынны і замежны) сведчыць, што трываласць грамадскай сістэмы – неаддзельная ад згуртаванасці грамадства. Сацыяльная згуртаванасць грамадства – гэта стан, які характарызуецца ўстойлівымі сувязямі і цесным узаемадзеяннем ўсіх складнікаў яго сацыяльных супольнасцей. Такому грамадству ўласцівыя ўмовы для рэальнага ўдзелу чалавека ў эканамічным і грамадска-палітычным жыцці, захаванне яго правоў і свабод, магчымасцей рэалізацыі працоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялаў. Сацыяльны мір, згода – асноўныя рысы згуртаванасці грамадства, абумоўленыя сацыяльна-эканамічнай і палітычнай мадэллю дзяржаўнага ладу. Сацыяльным дзяржавам уласцівыя атрыбуты планавання і правядзення эканамічнай і сацыяльнай палітыкі, якія забяспечваюць годны ўзровень жыцця і ўсебаковае развіццё грамадзян сваёй краіны. Унутраная і знешняя функцыя сацыяльнай дзяржавы арыентуецца на свядомы выбар у накіраванасці і паслядоўнасці развіцця сацыяльна-эканамічнай і прававой сфер. Менавіта дзяржава валодае матэрыяльнымі сродкамі для правядзення дзяржаўнай палітыкі (уласнасць, бюджэт, валютныя запасы і інш.), прымяняе сістэму падаткаў і пазык. Такім чынам, функцыя актыўнага ўмяшання дзяржавы ў сацыяльныя адносіны для стварэння кансалідаванага грамадства выступае ў ліку важнейшых. Але пры ўсёй важкасці дзяржавы ў стварэнні спрыяльных умоў для сацыяльнага згоды ў грамадстве яго паўнамоцтвы будуць больш эфектыўна выкарыстоўвацца, калі



Рэпазіторый ВГУ

яно не будзе дапускаць у фарміраванні сацыяльнай згуртаванасці грамадзян сваёй выключнасці над іншымі суб'ектамі грамадзянскай супольнасці.

У цяперашніх спецыфічных умовах, калі ў нашай рэспубліцы не сфарміравалася стала грамадзянская супольнасць, адсутнічае развітая партыйна-палітычная сістэма, найбольш моцным суб'ектам станаўлення сацыяльнай згуртаванасці грамадства могуць быць прафсаюзы. Прафсаюзам Беларусі пад сілу гэтая роля. Яны маюць шырокую сацыяльную базу, арганізацыйную структуру, даволі высокі сацыяльны статус і сацыяльны вопыт дзейнасці. У прафсаюзным руху прымае ўдзел большасць эканамічна актыўнага насельніцтва краіны. На дзяржаўных прадпрыемствах, ва ўстановах, якія налічваюць нават дзясятак чалавек, функцыянуюць пярвічныя прафсаюзныя арганізацыі. Прафсаюзы маюць багаты вопыт савецкага часу, калі яны былі праваднікамі сцвярджэння гуманістычных каштоўнасцей і развітой працоўнай маралі.

Перыяд пераходу да рынку, ускладняючыся адносіны паміж працаўнікамі і наймальнікамі, паміж рознымі пластамі, групамі, якія ўзаемадзейнічаюць у грамадстве, запатрабавалі пераарыентацыі ў дзейнасці прафсаюзаў. Кансалідацыя грамадства стала іх прыярытэтнай задачай. Разам з раней прынятымі формамі і метадамі прафсаюзы сталі шукаць новыя падыходы прадстаўніцтва і абароны інтарэсаў членаў прафсаюза ў мэтах захавання грамадзянскага міру і згоды ў грамадстве. Для таго каб прафсаюзная дзейнасць ажыццяўлялася ў рэчышчы грамадскай думкі, спрыяла вырашэнню наяўных супярэчнасцей у вытворчай і сацыяльнай сферах, патрабавалася ўсебаковае і дбайнае вывучэнне працэсаў, якія праходзяць унутры прафсаюзнага руху і ў развіцці грамадства ў цэлым. Гэта актывізавала навуковую працу ў вывучэнні месца і ролі прафсаюзаў у кансалідацыі беларускага грамадства. У вырашэнні гэтай праблемы прымалі ўдзел навукоўцы ВНУ рэспублікі, у прыватнасці прафесарска-выкладчыцкі склад Віцебскага філіяла УА ФПБ "МІПСА". У 2007–2009 гг. на кафедры сацыяльна-гуманітарных навук праведзены шматлікія маніторынгавыя сацыялагічныя апытанні працоўных. Даследаванні былі накіраваны на комплекснае вывучэнне ўнутранага стану прафсаюзнага руху, агульнага стану грамадскага асяроддзя, асноўных тэндэнцый развіцця адносін на прадпрыемствах, ва ўстановах і навучальных установах як важнага фактару сацыяльнай стабільнасці грамадства. У 2007 годзе ў анкетным апытанні ўдзельнічалі 320 чалавек, у іх ліку 82,18% – радавыя сябры прафсаюза: інжынерна-тэхнічныя работнікі Віцебскай вобласці, студэнты Віцебскага філіяла УА ФПБ "МІПСА" і ВДТУ, 17,82% – прафсаюзныя кадры і актыў Віцебскай і Магілёўскай абласцей; у 2009 г. паўторна апытана – 227 рэспандэнтаў: 87% радавых членаў прафсаюза і 13% прафсаюзных работнікаў.

У сувязі з тым, што сацыяльная згуртаванасць прадугледжвае стварэнне аптымальных умоў для ўзаемаадносін асобы, сям'і і грамадства, першым у анкеце 2007 г. было пастаўлена пытанне "Наколькі камфортна, спакойна, упэўнена Вы адчуваеце сябе ў паўсядзённым жыцці?". Вынікі адказаў сведчаць, што з трох груп рэспандэнтаў найбольш камфортна ў штодзённым жыцці адчувалі сябе прафсаюзныя кадры. 60% рэспандэнтаў дадзенай катэгорыі адчувалі сябе ўпэўнена і спакойна. 30% хаця і адчувалі некаторы дыскамфорт,

Репозиторий ВГУ

але з ім, як яны лічылі, можна мірыцца. Прыкметнае незадаволенасць, раздражненне ад многага, што адбываецца ў жыцці, або моцны дыскамфорт у гэтай групе адчувалі не больш за 10% рэспандэнтаў. Інакш ацанілі сваё самаадчуванне інжынерна-тэхнічныя работнікі. Камфортныя пачуцці адчувалі толькі 8% анкетаваных гэтай сацыяльнай групы, 45% рэспандэнтаў не задавальнялі асобныя моманты, з якімі можна было мірыцца. У той жа час больш за 35% інжынерна-тэхнічных работнікаў адчувалі прыкметную незадаволенасць, моцны дыскамфорт, а 12% адзначылі, што ім настолькі дрэнна, што з-за гэтага яны збіраюцца мяняць месца жыхарства.

Студэнцкая моладзь больш аптымістычна вызначыла свой стан у жыцці. Каля 40% студэнтаў (дзённая форма навучання) адчувалі сябе ў жыцці спакойна і ўпэўнена, больш за 50% указалі на моманты, якія іх не задавальнялі, але лічылі, што з імі можна мірыцца і з-за гэтага няма неабходнасці мяняць месца жыхарства. У адказах студэнцкай моладзі меліся дадзеныя, якія патрабавалі больш дэталёвага вывучэння. У іх анкетах адзначалася, што па-за ўласным домам 65% ад агульнай колькасці апытаных адчувалі моцны дыскамфорт.

Натуральна, стварыць усяму грамадству камфортныя ўмовы – вельмі цяжкая, хутчэй, нерэальная задача любога часу. Аднак незадаволенасць сваім становішчам адной трацiны інжынерна-тэхнічных работнікаў і не зусім тыповы адказ студэнцкай моладзі пра адчуванне па-за домам звярнулі на сябе ўвагу даследчыкаў. Тады матывы гэтых адказаў не былі вывучаны да канца. Навукоўцы толькі выказалі здагадку, што такі адказ інжынерна-тэхнічных работнікаў звязаны з асаблівым, больш вострым успрыманнем імі ўзнікаючых бягучых праблем у паўсядзённым жыцці, студэнтаў – з цяжкасцямі навучальнага працэсу, выдаткамі адносін у студэнцкіх групах.

На другое пытанне “Ці з’яўляюцца, з Вашага пункту гледжання, прафсаюзы суб’ектамі забеспячэння сацыяльнай бяспекі працоўнага калектыву?”, меркаванні рэспандэнтаў былі розныя. Станоўча ацанілі ролю прафсаюзаў у забеспячэнні сацыяльнай бяспекі працоўнага калектыву (што адпавядае станаўленню ў ім стабільнасці і згуртаванасці) каля 40% студэнтаў, 25% інжынерна-тэхнічных работнікаў і 80% саміх прафсаюзных работнікаў і актывістаў. На тое, што чалавек рэальна не адчувае да сябе ўвагі ў працоўным калектыве з боку прафсаюзаў, паказалі 60% інжынерна-тэхнічных работнікаў, 25% студэнтаў і 20% саміх прафсаюзных работнікаў і актывістаў. Адзнака сваёй працы як суб’екта фарміравання сацыяльнай згуртаванасці ў прафсаюзных работнікаў была ў два разы вышэй, чым адзнака іх дзейнасці сярод студэнтаў, і ў тры разы больш, чым у інжынерна-тэхнічных работнікаў. Даследчыкі зноў звярнулі ўвагу на адказы інжынерна-тэхнічных работнікаў, а таксама пятай часткі (ад апытаных) прафсаюзных работнікаў і актывістаў. Палічылі, што адказы інжынерна-тэхнічных работнікаў, студэнтаў і часткі саміх крытычна настроеных прафсаюзных работнікаў і актывістаў можна аднесці да недахопаў і фармалізму ў працы функцыянуючага грамадскага інстытута працоўнага калектыву.

Аналіз адказаў на пытанне “Ці атрымалі Вы на працягу 3-х гадоў сацыяльную ці матэрыяльную дапамогу? Куды вы звярталіся ў такім выпадку?” дазволіў высветліць, што незадаволенасць, раздражненне, якія выпрабоўвалі інжынерна-тэхнічныя работнікі ў паўсядзённым жыцці, іх невысокую ацэнку

дзейнасці прафсаюзных арганізацый як суб'ектаў сацыяльнай бяспекі нельга аднесці толькі да недахопаў работы прафсаюзаў.

Вынікі даследавання паказалі, што пры складаным матэрыяльным становішчы рэспандэнтаў з групы інжынерна-тэхнічных работнікаў, якія звярталіся ў 2007 г. за дапамогай у прафсаюзныя арганізацыі, больш за 60% на свае заявы атрымалі станоўчы адказ (яны дапамогу атрымалі). У іншыя арганізацыі інжынерна-тэхнічныя работнікі звярталіся вельмі рэдка: у органы сацыяльнай абароны – 1–2%, да адміністрацыі прадпрыемстваў – каля 5%.

У гэтай сувязі ацэнку прафсаюзнай работы інжынерна-тэхнічным персаналам па фарміраванні сацыяльнай устойлівасці працоўных калектываў даследчыкі асацыявалі не толькі з тым, што матэрыяльная дапамога з боку прафсаюзаў была нязначнай у суадносінах з асабістымі патрэбамі. Галоўным фактарам такой ацэнкі, як выявілі наступныя адказы, з'яўлялася тое, што ў гэтай сацыяльнай групы работнікаў чаканні заключаліся не толькі ў атрыманні матэрыяльнай дапамогі. Іх турбавалі праблемы недастатковай увагі да чалавека працы ў калектыве, адсутнасць рэальных умоў уласнай запатрабаванасці ў вытворчым і грамадскім жыцці. На іх думку, яны здольныя адыграваць больш прыкметную ролю ва ўздзеянні на эканамічныя і сацыяльныя працэсы ў працоўных калектывах, прымаць удзел у кіраванні справамі дзяржавы і грамадства ў розных і даступных формах. Гэтаму пакуль перашкаджалі вельмі высокая цэнтралізацыя ў кіраванні, кантрактная форма найму на працу, іншыя бюракратычныя элементы сістэмы.

У аналітычнай запісцы па выніках вывучэння даследчыкі прапаноўвалі прафсаюзным арганізацыям паўней выкарыстоўваць магчымасці гэтай катэгорыі работнікаў у павышэнні эфектыўнасці грамадскіх пачаткаў у працы сваіх арганізацый і прадпрыемстваў. Рэкамендавалася дапамагчы інжынерна-тэхнічным работнікам пазбавіцца ад стрэсавых сітуацый, выкліканых аўтарытарным кіраўніцтвам, мобінгам, ад няўпэўненасці ў сваёй будучыні; прадумаць меры рэалізацыі наяўных у гэтай катэгорыі людзей здольнасцей з дапамогай прыцягнення іх да ўдзелу ў кіраванні вытворчасцю і справядлівым размеркаванні вынікаў грамадскай працы. Гэтым самым навукоўцы спадзяваліся аптымізаваць іх раўнавагу, зрабіць дзейнасць інжынерна-тэхнічных работнікаў больш эфектыўнай, надаць ім пачуццё ўпэўненасці і абароненасці.

На неабходнасць больш прадуманай працы прафсаюзаў па развіцці працоўных калектываў на дадзеным этапе паказвалі вынікі даследавання, якое праводзілася ў лістападзе-снежні 2009 года. За два гады прафсаюзныя арганізацыі не павялічылі колькасць прыхільнікаў, якія лічылі іх гарантамі сваіх сацыяльных чаканняў: у 2007 г. на павышэнне ўзроўню сваіх сацыяльных гарантый з удзелам прафсаюзаў спадзяваліся 32,6%, у 2009 г. – 28%. 78% рэспандэнтаў, якія ўдзельнічалі ў апытанні, былі перакананыя, што прафсаюзы ў існуючай сістэме выглядаюць малавынікoвымі ў рэалізацыі сваіх патрабаванняў да працадаўцаў па ліквідацыі парушэнняў працоўных правоў работнікаў. Прычыны зніжэння даверу прафсаюзам, пра якое можна меркаваць па адказах рэспандэнтаў анкетнага апытання, у канцы 2009 года, верагодна, трэба шукаць у эканамічнай сітуацыі: у перыяд эканамічнага і фінансавага крызісу, ва ўмовах вымушанай няпоўнай занятасці (у студзені-кастрычніку 2009 года ў рэспубліцы



Рэпазіторый ВДУ

налічвалася ў такім стане 327 тыс. чалавек) і невысокага спажывання прафсаюзы не маглі заняць наступальную пазіцыю ў адносінах да сваіх сацыяльных партнёраў [1, с. 8]. Важна было ў гэты перыяд прасачыць прычыны невысокай грамадскай ацэнкі прафсаюзаў, што знаходзіліся ўнутры прафсаюзнага руху. Адказы рэспандэнтаў выявілі прычыны такога стаўлення да прафсаюзных арганізацый на гэтым этапе. Яны былі абумоўлены тым, што частка прафсаюзных работнікаў (атрымліваючых заработную плату з прафсаюзнай касы і ў меншай меры працуючыя на грамадскіх пачатках) імкнуліся да кампрамісу, да згоды з адміністрацыяй нават тады, калі гэта было недапушчальна. Вядома, пры адсутнасці на прадпрыемствах у гэты час фінансавых сродкаў немагчыма было патрабаваць павелічэння зарплаты, але, як паказалі рэспандэнты, прафсаюзным арганізацыям варта было рэагаваць на адхіленні ад этычных нормаў у паводзінах адміністрацыі ў адносінах да працоўнага, ІТР, служачага, заўважаць і папярэджваць парушэнні гендэрнай роўнасці працуючых, забяспечваць кантроль за ўзроўнем бяспекі працы і г.д.

Важнае месца ў фарміраванні масавай свядомасці аб ролі прафсаюзных камітэтаў у працоўных калектывах адводзілася рэспандэнтамі кадраваму складу прафсаюзаў. Дадзеныя маніторынгавых даследаванняў паказалі, што ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу работнікі наёмнай працы прад’яўляюць больш высокія патрабаванні да кампетэнтнасных характарыстык прафсаюзных кадраў як абаронцаў працоўных. Калі ў 2007 годзе толькі 16,3% рэспандэнтаў адзначалі недастатковасць ведаў прафсаюзнымі работнікамі нарматыўнай базы ў працоўнай сферы, то двума гадамі пазней на гэта паказалі 24%. На прадпрыемствах, дзе праводзілася апытанне працуючых, павялічылася колькасць рэспандэнтаў, якія адзначылі адсутнасць у прафсаюзных кадраў навыкаў вядзення дыялогу з наймальнікамі: у 2007 г. – 10,2%, у 2009 г. – 14% [2, с. 8].

Абагульненыя адказы рэспандэнтаў падцвердзілі: сур’ёзным матывам у ацэнцы дзейнасці прафсаюзаў з’яўляюцца іх лідары. Там, дзе прафсаюзныя арганізацыі ўзначальваюць кампетэнтныя, патрабавальныя да сябе і да наймальнікаў работнікі, у такіх калектывах прафсаюз разам з адміністрацыяй разумна выбудоўвае сацыяльную палітыку. І, як правіла, у работнікаў наёмнай працы ў гэтых працоўных калектывах, нягледзячы на складанасці сацыяльна-эканамічнага характару, павышаецца пачуццё абароненасці, зніжаецца трывожны настрой і памяншаюцца сімптомы сацыяльнай напружанасці. З гэтага бачна, што эфектыўнасць дзеянняў прафсаюзаў у значнай ступені залежыць ад кампетэнтнасці прафсаюзных кадраў, іх гатоўнасці працаваць вынікова ў рамках прадстаўленых паўнамоцтваў, не дапускаючы зрошчвання з дзяржаўнымі органамі і наймальнікамі. Для гэтага ў складаных умовах гістарычнага развіцця прафсаюзным работнікам патрабуюцца высокая кваліфікацыя сацыяльнага менеджара, прававая кампетэнтнасць, веданне гуманітарных, эканамічных навук, валоданне сучаснымі сродкамі сувязі, інфармацыі і камунікацыі [3, с. 110].

Даследаванне паказала: з’яўляючыся буйным, самастойным інстытутам грамадства, у функцыянаванне якога ўцягнуты мільёны людзей, прафсаюзы валодаюць вялікімі рэсурсамі і магчымасцямі ўплыву на сацыяльныя працэсы. Моцным бокам прафсаюзаў выступае іх пабудова па вытворчаму прынцыпу.



Рэпазіторый ВДУ

Праз уключэнне большасці свах членаў у вытворчыя і грамадскія адносіны на прадпрыемствах і ўстановах, прафсаюзы могуць унесці значны ўклад у фарміраванне згуртаванасці грамадства. Іх супрацоўніцтва і суперніцтва з дзяржаўнымі структурамі і наймальнікам нават у крызісны час, здольна стварыць у працоўных калектывах надзейную сістэму сацыяльнай і маральнай абароны грамадзян, атмасферу паважлівага стаўлення да чалавека працы. Гэта прывядзе толькі да ўзмацнення кансалідацыі і згуртаванасці беларускага грамадства.

Рэгуляванне сацыяльна-працоўных адносін на аснове забеспячэння балансу інтарэсаў суб'ектаў, якія дзейнічаюць у эканоміцы з удзелам прафсаюзаў, здольна дабратворна адбівацца на фарміраванні здаровага маральна-псіхалагічнага клімату ў краіне. Усе гэтыя і іншыя складнікі прафсаюзныя камітэты і пярвічныя арганізацыі пакуль выкарыстоўвалі не ў поўнай меры.

У рыначных умовах прафсаюзам, іх сацыяльным партнёрам неабходна разам вырашаць задачу прынцыповага значэння: якператварыць у рэальнасць абвешчаны тэзіс аб тым, што працаўнікі ў нашай краіне з'яўляюцца гаспадарамі вытворчасці, гаспадарамі краіны, што яны самі сапраўды кіруюць і распараджаюцца ўласнасцю. Прафсаюзы павінны быць асабліва настойлівыя ў распрацоўцы і рэалізацыі аптымальнага варыянту акцыянавання, у якім неабходна прадугледзіць удалае спалучэнне асабістых і грамадскіх інтарэсаў, дзе даходы ад працоўнай дзейнасці набліжаюцца да справядлівага размеркавання. Застаючыся пасрэднікам паміж працадаўцам і працаўніком, паміж дзяржавай і грамадзянамі ў працоўных ўзаемаадносінах, прафсаюзны рух зможа выканаць сваю гістарычную ролю і грамадскае прызначэнне толькі пры актыўным уплыве на становішча спраў у краіне, калі будзе цвёрда і эфектыўна адстойваць інтарэсы чалавека наёмнай працы.

## Літаратура

### Раздзел А. Сацыяльная справядлівасць – аснова сацыяльнага пагаднення


1. Лукашенко, А.Г. Независимая Беларусь – наш достойный и надежный дом / А.Г. Лукашенко // СБ. Беларусь сегодня. – 2007. – 25 апр. – С. 6.
2. Козик, Л.П. Об итогах работы Федерации профсоюзов Беларуси в 2007 году и задачах профсоюзных организаций, исходящих из текущего момента с учетом социально-экономического развития страны в 2008 году: доклад на IV пленуме Совета ФПБ / Л.П. Козик // Беларускі час. – 2007. – 7 дек. – С. 1–6, 9–11.
3. Данные анкетирования респондентов, проведенного в сентябре-ноябре 2007 г. В выборку включены инженерно-технические работники Витебской области, профсоюзные кадры Витебской и Могилевской областей.
4. Рэспублика Беларусь. – Энциклапедия. – Минск, 2005. – Т. 1. –1037 с.
5. Некоторые данные о современном состоянии безопасности труда в мире // Профсоюзы. – 2007. – № 10. – С. 25–27.




Репозиторий ВГУ

6. Айзенштадт, А.Л. Профсоюзная деятельность и проблемы социального партнерства / А.Л. Айзенштадт // Социальное партнерство: концепция, опыт, проблемы: материалы Третьей Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 22–23 июня 2000 г. – Витебск: ВФ УО ФПБ «МИТСО», 2001. – С. 13–15.
7. Лукашенко, А.Г. Вы – партия наших трудящихся / А.Г. Лукашенко // Беларускі час. – 2015. – 5 июня. – С. 3.
8. Возмитель, И.К. Очерки истории профсоюзов Витебщины / И.К. Возмитель, И.В. Мандрик; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2015. – 504 с.: ил.
9. Мандрик, И.В. Социальная безопасность: место и роль профсоюзов / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2008. – № 2. – С. 7–11.

**Раздзел Б. Прафсаюзы – суб’ект сацыяльнай згуртаванасці грамадства**

1. Тезисы доклада председателя Федерации профсоюзов Беларуси на VI пленуме Совета ФПБ // Беларускі час. – 2009. – 11 дек.
2. Автор ссылается на данные анкетирования респондентов, проведенные в 2010 г. В выборку включены рабочие, инженерно-технические работники, студенты, в том числе и актив профсоюзных организаций предприятий и учреждений Витебской области. Мандрик, И.В. Профсоюзы как субъект социальной сплоченности общества / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2010. – № 2. – С. 9–13.
3. Мандрик, И.В. Профессиограмма профсоюзного лидера: теоретический и социологический аспект / И.В. Мандрик // Профсоюзы как школа социального образования: материалы междунар. конгресса, Минск, 24–25 мая 2001 г. / УО ФПБ «МИТСО». – Минск, 2001. – С. 109–113.

Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 14
## Членская база прафсаюзаў, тыпы матывацыі яе радоў

Змены, што адбыліся ў краіне з пераходам да рынычных адносін, сацыяльна-эканамічная і палітычная сітуацыя ў дзяржаве ў першай палове 1990-х гадоў запатрабавала ад прафсаюзаў адэкватных адказаў. У гэтай сувязі найбольш актуальным на выклікі часу паўстала пытанне аб арганізацыйным умацаванні саміх прафсаюзаў, без якога ім стала цяжка супрацьстаяць наймальнікам, весці раўнапраўны дыялог па пытаннях сацыяльна-працоўных правоў і інтарэсаў работнікаў са структурамі ўлады.

Узмацненне прафсаюзнага ўплыву на рашэнне найбольш важных для працоўных праблем шмат у чым вызначалася захаваннем і ўмацаваннем чалавечай базы прафсаюзаў. Пытанне аб членскай базе прафсаюзаў (ступень ахопу прафсаюзным членствам эканамічна актыўнага насельніцтва і матывацыя прафсаюзнага членства) – адно з асноўных пытанняў тэорыі і практыкі прафсаюзнага будаўніцтва. Па колькасці прафсаюзных радоў, ступені ахопу прафсаюзным членствам людзей працы можна першапачаткова меркаваць пра сілу і магчымасці гэтай арганізацыі. Але пры больш глыбокім разглядзе праблемы становіцца зразумела, што пры вызначэнні дзеяздольнасці прафсаюзнага руху не менш важным застаецца пытанне ўнутранай псіхалагічнай настроенасці, згуртаванасці, кансалідаванасць і актыўнасці членаў гэтай арганізацыі ў дасягненні пастаўленых мэтаў. Паводзіны чалавека, які ўваходзіць у прафсаюз, вызначаюцца па тым, як ён тут рэалізуе сваю сацыяльную ролю, другімі словамі да якога тыпу прафсаюзнага членства ён адносіцца.

Тып прафсаюзнага членства – гэта індывідуальная асобасная ўстаноўка чалавека адносна прафсаюзнай арганізацыі і свайго месца ў ёй. Членаў прафсаюза, якія добраахвотна, свядома ўступілі ў арганізацыю, валодаюць высокай сацыяльнай актыўнасцю і адказнасцю, здольнасцю на калектыўныя дзеянні ў адстойванні правоў і інтарэсаў працоўных, навукоўцы адносяць да салідарысцкаму тыпу прафсаюзнага членства. Таму вельмі важна валодаць інфармацыяй аб суадносінах членаў прафсаюза салідарнага тыпу да іншых тыпаў у агульным складзе прафсаюзнага руху.

У савецкі час у БССР была дасягнута вельмі высокая ступень прафсаюзнага членства. На завяршэнні 1980-х гадоў у прафсаюзныя арганізацыі ўваходзілі больш за 99% усіх працоўных, студэнтаў вышэйшых, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. У перыяд пераходу да рынычнай эканомікі (1990 – верасень 2002 г.) з-за уратоку рабочай сілы ў недзяржаўны сектар, з’яўлення беспрацоўных, умяшання дзяржаўных структур ва ўнутрыпрафсаюзнае жыццё, пазбаўлення прафсаюзаў раней уласцівых ім дзяржаўных функцый і іншых прычын, давер да прафсаюзаў у работнікаў усіх сфер вытворчасці рэзка знізіўся, адсюль вельмі значнае скарачэнне прафсаюзных радоў.

Рэпазіторый ВДУ

З 2002 года ва ўмовах стабілізацыі палітычнай і сацыяльна-эканамічнага становішча, з улікам заяўленага ФПБ курсу аб пераходзе прафсаюзаў да канструктыўнага супрацоўніцтва з дзяржаўнымі структурамі і наймальнікамі на аснове сацыяльнага партнёрства адбывалася ўступленне новых, а больш за ўсё, аднаўленне ў прафсаюзах рабочых, ІТР, служачых і навучэнцаў, якія раней пакінулі іх. З гэтага часу ў рэспубліцы адзначаўся пастаянны рост прафсаюзнага членства. На прадпрыемствах, ва ўстановах дзяржаўнай формы ўласнасці (амаль на ўсіх, нават там, дзе налічвалася не больш за дзясятак супрацоўнікаў) пачалі зноў функцыянаваць прафсаюзныя арганізацыі. Вялікая колькасць прафсаюзных арганізацый у апошнія гады створана на прадпрыемствах з прыватнай формай уласнасці. Напрыканцы 2010 года у прафсаюзных арганізацыях знаходзілася большасць эканамічна актыўнага насельніцтва краіны. Ахоп прафсаюзным членствам у рэспубліцы ў гэты час наблізіўся да савецкага перыяду (больш за 4 млн чалавек) і знаходзіўся на ўзроўні 94,8% [1, с. 7; 12].

Прафсаюзы Беларусі валодалі ўпарадкаванай арганізацыйнай структурай, шырокай сацыяльнай базай, даволі высокім сацыяльным статусам і сацыяльным вопытам у вырашэнні найбольш важных сацыяльна-эканамічных праблем у жыцці грамадства. Яны мелі шырокія знешнія сувязі, сферу ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва з іншымі структурамі грамадства і, перш за ўсё, вопыт калектыўна-дагаворнай практыкі з дзяржаўнымі інстытутамі і аб'яднаннямі працадаўцаў. Апытанні членаў прафсаюза, праведзеныя ў 2007 і 2009 гадах, пацвердзілі, што прафсаюзы знаходзяцца ў ліку асноўных сацыяльных сіл грамадства: рэспандэнты аднеслі сваю арганізацыю па зацікаўленасці ў вырашэнні праблем, якія стаяць перад грамадствам, на трэцяе месца пасля Прэзідэнта і урада [2, с. 7].

Аднак дваццаціпрацэнтны рэйтынг грамадскага аб'яднання сярод сваіх членаў паказваў, што, застаючыся сацыяльным партнёрам дзяржавы, прафсаюзы павінны былі прыкладаць дадатковыя намаганні па абароне правоў і інтарэсаў працоўных з улікам працэсаў, якія праходзілі у беларускім грамадстве.

У папярэдніх раздзелах даследавання ўжо гаварылася, што ў нашай рэспубліцы цеснае ўзаемадзеянне прафсаюзаў з дзяржаўнай уладай у вырашэнні ўнутраных праблем і актывізацыі сацыяльна-пазітыўных працэсаў у грамадстве ўзмацнялася яшчэ і па той прычыне, што ў краіне да гэтага часу яшчэ не сфарміравалася партыйна-палітычная сістэма. У дадзеных спецыфічных умовах прафсаюзы знаходзіліся ў ліку найбольш моцных суб'ектаў фарміруемай грамадзянскай супольнасці. Як найбуйнейшаму самастойнаму інстытуту грамадства, як партнёру дзяржавы, прафсаюзам (як і на папярэднім этапе) адводзілася роля максімальнага ўключэння сваіх сябраў ва ўдасканаленні дзяржаўнай палітыкі і фарміраванне сацыяльнай дзяржавы. На такі падыход прафсаюзы арыентаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. У сваіх выступленнях А.Р. Лукашэнка пастаянна акцэнтаваў увагу на тым становішчы, што прафсаюзам у нашай краіне адводзіцца роля галоўнага інстытута пры фарміраванні грамадзянскай супольнасці. Прафсаюзы, як лічыць кіраўнік дзяржавы, могуць і павінны выкарыстоўваць магчымасці людзей, якія знаходзяцца ў гэтай арганізацыі, для пашырэння самадзейных форм работы, стварэння ў працоўных калектывах умоў, пры якіх жыццёвая энергія чалавека,

накіраваная на індывідуальную асобасную самарэалізацыю, спалучалася б з уцягваннем яго ў змястоўнае вытворчае і грамадскае жыццё. На думку Прэзідэнта, “менавіта прафсаюзы могуць і павінны мабілізаваць працоўныя масы на прарыў” [3, с. 1]. На рабочай сустрэчы са старшынёй ФПБ Леанідам Козікам ў лютым 2013 года А.Р. Лукашэнка адзначыў, што да яго часам даходзяць супярэчлівыя ацэнкі аб рабоце прафсаюзаў, і пацікавіўся тым, што адбываецца ў прафсаюзным руху, ці не губляюць прафсаюзы свае пазіцыі ў працоўных калектывах? Прэзідэнт акцэнтаваў увагу прафсаюзнага лідара на неабходнасці ўзмацніць увагу прафсаюзаў на абарону правоў працоўных на прыватных прадпрыемствах і даручыў ФПБ працягнуць працу па стварэнню на прадпрыемствах нармальных умоў працы і побыту [4, с. 2]. Пытанне Прэзідэнта і яго прапановы па ўдасканаленні прафсаюзнай работы, звязанай з абаронай прафсаюзнымі камітэтамі інтарэсаў працоўных у пытаннях справядлівай і своечасовай аплаты за працу, як паказвае рэальнае жыццё, аказваліся своечасовымі і актуальнымі. Мелася дастаткова прыкладаў неадэкватнай рэакцыі прафсаюзных арганізацый працоўных калектываў на парушэнні, якія дапускаліся наймальнікамі ў галіне аплаты працы, аховы працы і здароўя работнікаў. Прыклады, якія прыводзіліся раней, з высокай ступенню аргументацыі наглядна паказваюць, што многія прафсаюзныя арганізацыі, што функцыянуюць на прадпрыемствах, аказваюцца нездольнымі (асабліва гэта праяўляецца тады, калі эканоміка краіны знаходзіцца ў складаных умовах) вытрымаць ціск працадаўцаў [5, с. 13]. Парушэнні з боку адміністрацыі ў налічэнні і аплаце працы работнікам, няўважлівае стаўленне да ўмоў працы і побыту, што адзначалася ў даследуемым перыядзе на прамысловых прадпрыемствах, але больш за ўсё ў сельскагаспадарчай вытворчасці, сведчаць пра невысокі каэфіцыент карыснага дзеяння ў рабоце прафсаюзных арганізацый першаснага звяна – на прадпрыемстве, ва ўстанове, сельскагаспадарчых калектывах – дзе, згодна з нарматыўным дакументам, павінен ажыццяўляцца асноўны аб’ём сацыяльнай работы, звязанай з вырашэннем і адстойваннем і інтарэсаў і гарантый работнікаў працоўнага калектыву. Тут жа, у першую чаргу, складваюцца ўсе найважнейшыя матывацыйныя фактары прафсаюзнага членства. Няўмелае або запозненае рашэнне надзённых праблем чалавека працы з боку пярвічных прафсаюзных арганізацый зніжала матывацыю ўсвядомленага прафсаюзнага сяброўства ў асяроддзі працоўнага калектыву і сведчыла: часам нават буйныя па колькасці (не кажучы пра малаколькасныя) і магутныя ў патэнцыяле прафсаюзныя арганізацыі аказваюцца не здольнымі на салідарныя дзеянні. Такое становішча даказвае, што колькасны склад яшчэ не можа цалкам вызначаць сілу прафсаюзаў. Не менш важным пры вызначэнні баяздольнасці прафсаюзнага руху застаецца пытанне якаснага складу тых, хто ў ім бярэ ўдзел. Эфектыўная работа прафсаюзаў па ўсіх напрамках вызначаецца матывавана ўсвядомленым прафсаюзным членствам.

Якія ж матывы пераважалі ў людзей у даследуемым перыядзе, непасрэдна уключаных у прафсаюзныя членскія арганізацыі, што знаходзіліся пад уплывам ФПБ? Навукова абгрунтаванага адказу на гэтае пытанне знайсці не ўдалося ў сілу адсутнасці ў рэспубліцы фундаментальных тэарэтычных распрацовак, якія б абапіраліся на эмпірычны матэрыял, які б раскрываў тып матывацыі



Рэпазіторый ВДУ

насельніцтва рэспублікі пры ўступленні ў прафсаюз і іх цяперашняе ўсведамленне неабходнасці захавання ў ім свайго сяброўства.

Практыкі (вызваленыя і невызваленыя прафсаюзныя работнікі) адчувалі гэты спектр, як ім казалася, "нутром", знаходзіліся ў пошуку фактараў, якія матывуюць сяброўства, разглядалі гэта пытанне на семінарах, але абагульненняў і высноў пакуль не зрабілі. Навукоўцы, што асвятлялі дзейнасць прафсаюзаў з розных бакоў, да такой пастаноўкі таксама не дайшлі. І тыя, і іншыя разумелі, што на тым узроўні, на якім гэтая тэма распрацавана, спыняцца нельга. Цікавасць, якая мелася на той час да гэтай праблемы, паклала пачатак збору інфармацыі. Па прапанове галіновых камітэтаў прафсаюза Віцебскай вобласці і з іх удзелам на кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Віцебскага філіяла УА ФПБ "МІПСА" (тут пакладзены пачатак), а ў далейшым на кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава праведзена даследаванне па тэме "Матывацыя прафсаюзнага членства ў арганізацыях, якія ўваходзяць у ФПБ". Пры вывучэнні тэмы навукоўцам прыйшлося звярнуцца да фундаментальных тэарэтычных распрацовак паняцця матывацыі псіхолагамі, а таксама да меркавання навукоўцаў Маскоўскай акадэміі працы і сацыяльных адносін (АПіСА), якія першымі зрабілі спробу тэарэтычнага вызначэння тыпаў матывацыі прафсаюзнага членства.

Вызначана, што ў псіхалогіі паняцце матывацыі раскрываецца як працэс, які адбываецца ўнутры чалавека, дзе ідэі і думкі ўзнікаюць ад адчуванняў, якія адбываюцца пад уплывам з'яў і падзей. Яны і вызначаюць яго паводзіны, яго выбар, гэта значыць прымушаюць паступаць менавіта так, а не інакш. У нашым выпадку матывацыя (гаворка пойдзе толькі пра матывацыю прафсаюзнага членства) з'яўляецца ўнутраным прымушэннем чалавека для ўступлення ў арганізацыю і ўключэння яго ў актыўную дзейнасць у ёй.

Навукоўцы АП і СА самым перспектыўным тыпам матывацыі сярод радавых членаў прафсаюза назвалі салідарны тып. Члены прафсаюза, якіх варта адносіць да гэтага тыпу, на іх думку, уступаюць у прафсаюз, лічачы гэта ўсвядомленым унутраным выбарам. Да дадзенага азначэння, якое зрабілі маскоўскія навукоўцы, дапоўнім, што, знаходзячыся ў прафсаюзах, члены прафсаюза салідарысцкай матывацыі, не галаслоўна, а рэальна ўплываюць на рэалізацыю ўласцівых для прафсаюзнага руху функцый, якія мяркуюць калектыўныя дзеянні ў абарону сваіх сацыяльна-працоўных інтарэсаў перад працадаўцам. Найбольш важным фактарам тут, на наш погляд, з'яўляецца тое, што такія члены прафсаюза лічаць сябе арганічнай часткай працоўнага калектыву, адчуваюць у сабе ўпэўненасць у адстойванні ўласных правоў і інтарэсаў і гатовыя падставіць плячо для салідарных дзеянняў іншым людзям, якія аказаліся ў складанай сітуацыі. Члены прафсаюза салідарысцкага тыпу маюць сур'ёзныя намеры сумесна з іншымі работнікамі працоўнага калектыву дамагацца сваіх мэт у сацыяльна-працоўнай сферы. Яны валодаюць высокай адказнасцю і нават у экстрымальных абставінах (што мы назіралі ў 1991–2002 гг.) не пакінуць арганізацыю, а будуць адстойваць першапачаткова закладзеныя ў падмурак арганізацыі мэты і задачы.

У навуковай літаратуры, акрамя салідарнага тыпу матывацыі прафсаюзнага членства, вылучаюць яшчэ два асноўныя – інерцыйна-



Репозиторий ВГУ

страховачны і спажывецкі. Да гэтага магчыма таксама дадаць яшчэ творчы і кар’ерны тыпы. Апошнія два тыпы матывацыі прафсаюзнага членства праяўляюцца ў асноўным у людзей, якія выбраныя на кіруючыя (вызваленыя і грамадскія) пасады ў прафсаюзных арганізацыях.

Прадстаўнікі інерцыйна-страховачнага тыпу матывацыі ўступаюць у прафсаюз у сілу інерцыі, па звычцы. Члены прафсаюза з такой матывацыяй слаба ўцягнутыя ў працу грамадскіх саветаў і камісій, створаных у арганізацыі. Дзейнасць выбарчых прафсаюзных органаў, ахоўныя магчымасці гэтай арганізацыі яны ацэньваюць даволі скептычна, але ў прафсаюзах застаюцца для страхоўкі, для абароны на выпадак неапраўданага звальнення ці цяжкіх жыццёвых абставінаў. Яны ў рэдкім выпадку знаёмыя з палажэннямі калектыўных дагавораў, а многія нават не ведаюць пра іх наяўнасць на прадпрыемствах.

Члены прафсаюза спажывецкага тыпу матывацыі ўспрымаюць прафсаюзы як размяркавальныя суб’екты матэрыяльных выгод і як свайго роду спажывецкія супольнасці. У дадзенага тыпу асабістае занадта пераважае над агульным. Яны з гатоўнасцю прымаюць ад прафсаюзных арганізацый сацыяльную дапамогу ў задавальненні шэрагу жыццёвых патрэб: асабістае і дзіцячае аздараўленне, спартыўны і культурны вольны час і да т.п., але актыўнасці ў працы прафсаюзаў, як правіла, не праяўляюць. У асобных прадстаўнікоў дадзенай матывацыі (а іх, як будзе паказана ніжэй, нямала) склалася ўяўленне, што прафсаюзы неэфектыўная, недзеяздольная арганізацыя, якая толькі і робіць, што бярэ ўнёскі.

Характарыстыка тыпаў матывацыі дае права на зацвярджэнне: для кожнай прафсаюзнай арганізацыі найлепшы варыянт, калі ў ёй пераважае колькасць членаў прафсаюза, якія адносяць сябе да салідарнага тыпу матывацыі. Для таго, каб прафсаюзная арганізацыя магла прыкладаць намаганні па прызначэнні, з большай эфектыўнасцю ўплываць на працэс фарміравання ў сваіх членаў матывацыі па дадзенаму тыпу, трэба мець эмпірычны матэрыял (меркаванне саміх членаў прафсаюза, а таксама і людзей, якія не з’яўляюцца такімі, але маглі б папоўніць гэтую арганізацыю). Гэтай мэце было падпарадкавана анкетаванне шырокага кола членаў прафсаюза ў прафсаюзных арганізацыях Віцебскай вобласці. У экспертным анкетным апытанні было ахоплена 920 рэспандэнтаў, з іх жанчын – 670, мужчын – 250. Узрост анкетаваных – ад 18 да 65 гадоў. Адукацыя – сярэдняя, сярэдняя спецыяльная, вышэйшая. Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанні, якія тычацца іх адносін да асноўных напрамкаў дзейнасці прафсаюзаў па ўключэнню працоўных у свае рады, уключэнню іх у працу прафсаюзных фарміраванняў, прымяненню найбольш эфектыўных форм і метадаў па выпрацоўцы ў членаў прафсаюзаў актыўнай пазіцыі, навыкаў кіравання, згуртаванасці і салідарнасці.

Усе пытанні (без выключэння) мелі навуковую і практычную накіраванасць, адпавядалі комплекснаму вывучэнню галоўнай праблемы – ступені ўстойлівасці прафсаюзнага руху ў рэспубліцы і пошуку шляхоў далейшага яго ўмацавання.

Прамое пытанне аб матывацыі прафсаюзнага членства ў анкеце было пастаўлена ў наступнай рэдакцыі “Пакажыце, калі ласка, як член прафсаюза, Вы сябе адносіце да якога тыпу прафсаюзнага членства:



Рэпазітарый ВДУ

– да салідарнага (маю магчымасць сумесна з іншымі дамагацца сваіх мэт у сацыяльна-працоўнай сферы, з’яўляюся часткай калектыву);

– да спажывецкага (хачу атрымліваць ад прафсаюза ці праз яго канкрэтныя матэрыяльныя даброты);

– да творчага (у рамках прафсаюзнай працы займаюся цікавай справай, дамагаюся грамадска важных мэт);

– да страховачнага (хачу мець абарону на выпадак непрадбачаных абставінаў, несправядлівых дзеянняў адміністрацыі, узнікнення цяжкіх жыццёвых сітуацый)?”.

Як бачна, складальнікі анкеты сфармулявалі пытанні такім чынам, каб радавыя члены прафсаюза змаглі разабрацца ў сутнасці кожнага тыпу матывацыі.

Рэспандэнты мелі магчымасць выбраць некалькі варыянтаў адказаў, таму сума размеркаванняў адказаў магла перавышаць 100%.

Адказы размеркаваліся наступным чынам: да салідарысцкага тыпу матывацыі прафсаюзнага членства з агульнага ліку анкетаваных аднеслі сябе 35% рэспандэнтаў, да спажывецкага – 21%, да творчага – 8,8%, да страховачнага – 38%. Да салідарысцкага тыпу аднеслі сябе 35,4% мужчын і 34,2% жанчын. З чатырох прадстаўленых сацыяльных груп (рабочыя, ІТР, студэнты, работнікі адукацыі) больш за ўсіх салідарысцкімі матывамі прафсаюзнага членства кіраваўся настаўніцкі склад (37%). За імі ішлі ІТР (33,3%) і працоўныя (32,6%).

Асаблівую цікавасць уяўлялі дадзеныя аб матывацыі прафсаюзнага членства ў адпаведнасці з працоўным стажам і стажам прафсаюзнага членства.

Аналіз вынікаў анкетавання падцвердзіў першапачаткова вылучаную гіпотэзу пра сувязь тыпаў матывацыі і прафсаюзнага стажу. Тут найбольш устойлівая па матывацыі салідарысцкая група знаходзілася сярод тых, хто ўступіў у прафсаюз 10 і больш гадоў таму. З такім прафсаюзным стажам да салідарысцкага тыпу аднеслі сябе 37,2%, у той час як да спажывецкага толькі 10% і да страховачнага – 34%. Заканамернасць пра большую адданасць прафсаюзнаму сяброўству ў адпаведнасці з працягласцю ўцягнутасці чалавека ў рады гэтай арганізацыі падцвярджаецца і ўзростам рэспандэнтаў. Так, 59% сяброў прафсаюза старэйшыя за 50 гадоў высока ацанілі дзейнасць прафкамаў і ўсвядомілі сваё сяброўства матывавана-салідарысцкім тыпам, 10% – спажывецкім і столькі ж – творчым. Да страховачнага тыпу сяброўства ў прафсаюзах, паводле апытання, аднеслі сябе 21% рэспандэнтаў гэтага ўзросту, што некалькі не ўкладваецца ў звыклую схему: людзі перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту, ім бы варта было б спадзявацца на захаванне свайго працоўнага статусу з дапамогай прафсаюзнага камітэта. 30% рэспандэнтаў ва ўзросце ад 30 да 50 гадоў і 26% ва ўзросце да 30 гадоў назвалі сваё сяброўства ў прафсаюзах усвядомленым (салідарысцкім).

Значная колькасць апытаных членаў прафсаюза (38%) паказалі, што яны адносяць сябе да прадстаўнікоў інерцыйна-страховачнага тыпу матывацыі. У гэты тып матывацыі вызначылі сябе 39% жанчын і 25% мужчын. Па стажу працы на прадпрыемстве, ва ўстанове, дзе праводзілася анкетаванне, да інерцыйна-страховачнага тыпу аднеслі сябе да 3-х гадоў працы – 47%, 3–5 гадоў – 44,4%, 5–7 гадоў – 44%, 7–10 гадоў – 36%, 10–15 гадоў – 44,1% і звыш 15 гадоў –

Рэпазіторый ВДУ

32%. Больш за іншых у гэтую групу ўвайшло рэспандэнтаў, якія знаходзяцца ў прафсаюзах ад 5 да 7 гадоў (62,5%), а вось членаў прафсаюза са стажам да 3-х гадоў – толькі 33%. У іншых стажавых прафсаюзных групах у блоку інерцыйна-страховачнага тыпу матывацыі налічвалася ад 35 да 44% сяброў прафсаюза.

Вышэй ужо паказвалася, што згодна з агульнай выбаркай, спажывецкі тып матывацыі прафсаюзнага членства, прадстаўнікі якога разглядаюць прафсаюзы як свайго роду спажывецкае таварыства і знаходзяцца ў іх у асноўным з-за прадастаўлення матэрыяльнай дапамогі, выдзялення пуцёвак у дамы адпачынку (са зніжкай) і да т.п., не з'яўляецца распаўсюджаным. Толькі 16% сяброў прафсаюза жанчын і 4% мужчын паказалі, што яны знаходзяцца ў прафсаюзах з улікам гэтага тыпу матывацыі. Больш за іншых да спажывецкага тыпу прафсаюзнай матывацыі аднеслі сябе людзі старэйшых узроставых груп (ад 40 гадоў і старэй), якія знаходзяцца ў прафсаюзах больш за 10 гадоў (18,4%), а таксама навучэнцы (29%). Распаўсюджанасць такога тыпу матывацыі прафсаюзнага членства сярод старэйшых узростаў, як уяўляецца даследчыкам, звязана з папярэднім савецкім перыядам, калі з удзелам прафсаюзных арганізацый працоўных калектываў вырашаліся практычна ўсе пытанні іх матэрыяльнага і культурнага дабрабыту. Што тычыцца зусім маладых членаў прафсаюза – тут, хутчэй, дамінуюць сучасны прагматычны разлік і няпоўнае ўсведамленне той ролі і значэння, якія нясе для працуючых дадзенае грамадскае аб'яднанне.

Дачыненне да моцнага грамадскана інстытута, пачуццё згуртаванасці і салідарнасці, абароненасці і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні сярод анкетаваных адчувалі 50% рэспандэнтаў, і ніякіх пры гэтым пачуццяў, знаходзячыся ў прафсаюзе, не адчувалі столькі ж. Больш за іншых сацыяльных груп, якія з'яўляюцца членамі прафсаюза, ніякіх пачуццяў не выказалі прадстаўнікі працоўнага класа (50%). На гэтым фоне яшчэ вялікім скептыцызмам вылучаюцца маладыя члены прафсаюза. Уступіўшы ў прафсаюз, многія не ўсвядомілі, што яны з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі, а не пасіўнымі пабочнымі назіральнікамі. Сярод тых, чый прафсаюзны стаж налічвае ад аднаго да трох гадоў, на пытанне "Якія пачуцці Вы выпрабоўваеце ад таго, што з'яўляецеся членам прафсаюзу?" 77% адказалі "Ніякіх".

Як паказала апытанне, сярод значнай часткі сяброў прафсаюза назіраецца абыякавасць і нават адчужэнне ад грамадскага самакіравання. На пытанне "Ці ўваходзіце Вы ў прафсаюзны актыў?" толькі 24% жанчын і 21% мужчын паказалі, што яны ўдзельнічаюць і задаволеныя грамадскай працай у сваёй арганізацыі. Астатнія рэспандэнты адзначылі, што яны не ўваходзяць у актыў і не прымаюць удзелу ні ў адной з камісій прафкама з-за таго, што ў іх няма арганізатарскіх здольнасцей (36% жанчын і 30% мужчын). Не ўваходзяць з-за таго, што не бачаць у гэтым сэнсу – 21% жанчын і 15% мужчын і каля 18% – не маюць жадання выбірацца ў прафсаюзны актыў па прычыне адсутнасці сапраўднай дэмакратычнасці выбараў тут кіруючых органаў. Найбольш актыўныя ў грамадскай рабоце прафсаюзаў інжынерна-тэхнічныя работнікі. Што гэта менавіта так, адзначылі 46% анкетаваных. У той жа час, згодна адказаў рэспандэнтаў, выяўляецца высокая інертнасць у грамадскім жыцці

прадстаўнікоў працоўнага класа: 88% рэспандэнтаў, якія прадстаўляюць рабочы клас, будучы членамі прафсаюза, не задзейнічаныя ў актыве сваіх арганізацый. 27% з іх адзначыліся ў адказах "Не ўваходжу, не бачу ў гэтым сэнсу", 49% – "Не ўваходжу, няма арганізатарскіх здольнасцей", 6% – "не ўваходжу па прычыне адсутнасці сапраўднай дэмакратычнасці выбараў у кіруючыя органы" і 6% апытаных рабочых абумовілі сваю пасіўнасць іншымі прычынамі (у асобных анкетах сустракаліся асабістыя заўвагі: у актыў не абраны, не прапаноўвалі).

Несумненна, што вызначаны лік радавых членаў прафсаюза, як відаць з апытання (у большай меры гэта ІТР і служачыя), у той ці іншай меры ўдзельнічалі ў выпрацоўцы і прыняцці рашэнняў на розных узроўнях у складзе выбарчых прафсаюзных фарміраванняў. Аднак, як вынікае з адказаў рэспандэнтаў, пры пераходзе да рынку партнёрскія адносіны, якія мелі месца ў савецкі перыяд у працэсе вытворчасці паміж адміністрацыяй і работнікамі, сёння так прыкметна не праяўляюцца. Яны выцясняюцца і замяняюцца патэрналісцкімі. У людзей падмяняюцца тыя каштоўнасці, якія ў іх былі раней сфарміраваны, у тым ліку і духоўныя, наўзамен настойліва навязваюцца спажывецкія інстынкты. Такая абстаноўка патрабуе ад прафсаюзных арганізацый павышанай увагі да ўкаранення ў работнікаў прадпрыемстваў грамадскіх пачаткаў у кіраванні вытворчасцю, да развіцця ў іх актыўнасці ў выпрацоўцы планаў сацыяльнага развіцця працоўных калектываў праз удзел у камісіях прафкамаў і творчых аб'яднаннях. Будзе, хутчэй за ўсё, дарэчным узяць з гістарычнага мінулага прафсаюзнай дзейнасці тое, што можа і сёння ўвайсці ў іх арсенал (як тут не ўспомніць практыку работы пастаянна дзеючых вытворчых нарад (ПДВН)), высокую цікавасць да грамадскага жыцця ў работнікаў праз удзел у шматлікіх прафсаюзных фарміраваннях, наладжаную прафкамамі эканамічную вучобу і іншыя карысныя справы) і будзе дапамагаць мадэрнізацыі, паскарэнню ў развіцці галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі краіны, грамадскаму ўздыму.

Немалую цікавасць у вывучэнні матывацыі прафсаюзнага членства прадстаўлялі адказы рэспандэнтаў на пытанні анкеты, звязаныя з крыніцамі інфармацыі аб унутрыпрафсаюзным жыцці і, канкрэтна, як часта ў прафсаюзных арганізацыях яны атрымліваюць інфармацыю на карысць прафсаюзнага членства, якая ўспрымаецца як пераканаўчая. Атрыманыя тут вынікі выглядаюць наступным чынам: 13,5% анкетаваных атрымлівалі інфармацыю аб унутрыпрафсаюзным жыцці на прафсаюзных сходах (здавалася б асноўная крыніца для радавога сябра прафсаюза), не больш за 18% – карысталіся для яе атрымання прафсаюзнымі стэндамі і яшчэ каля 12% – карысталіся часопісамі, газетамі, інфармацыйнымі матэрыяламі ФПБ.

Не менш 12–13% сяброў прафсаюза, якія ўдзельнічалі ў апытанні, паказалі, што інфармацыя аб прафсаюзнай працы да іх не даходзіць. Слаба інфармаванай групай аб дзейнасці прафсаюзаў па выкананні імі сваіх функцый больш за ўсяго аказалася сярод моладзі. Толькі 5,5% маладых людзей ва ўзросце да 30 гадоў атрымлівалі інфармацыю праз газеты, часопісы, матэрыялы, якія зыходзяць ад ФПБ, яшчэ менш – на прафсаюзных сходах (4,7%). Абмежаванасць інфармацыі пра дзейнасць прафсаюзнай арганізацыі ў працоўным калектыве, на што паказваюць рэспандэнты, хутчэй за ўсё, можа адбывацца з-за бессістэмнасці

Рэпазіторый ВГУ

правядзення прафсаюзных сходаў, а таксама і ад таго, што гаворка на прафсаюзных сходах вядзецца па пытаннях выканання вытворчых заданняў, пра перспектывы развіцця калектыву і да т.п., несумненна, пытаннях надзённых, але без сувязі з тым, як прафсаюз уплывае на падзеі, што адбываюцца, якія прафсаюзны камітэт прадпрымае акцыі, якія ён падымае праблемы, як яны вырашаюцца і што варта чакаць ад прафсаюзаў у будучыні. Слабая дасведчанасць членаў прафсаюза аб найважнейшых падзеях, мерапрыемствах і акцыях прафсаюзаў агульнарэспубліканскага ўзроўню – гэта недастатковая ўвага да распаўсюджвання сярод працоўных газеты "Беларускі час".

З гэтымі дадзенымі цесна звязаны адказ рэспандэнтаў на пытанне, як часта яны чуюць пераканаўчую інфармацыю пра карысць прафчленства. 25% рэспандэнтаў адзначылі добрую пастаноўку інфармацыі на карысць прафсаюзнага членства, якая імі ўспрымалася пераканаўча. 35% – паказалі, што такое здараецца часам, 32% – вельмі рэдка і 7,2% – такога не памятаюць наогул. Меркаванне рэспандэнтаў па дадзеным пытанні сведчыць: такое можа адбывацца толькі таму, што ў асобных прафсаюзных арганізацыях у працы з людзьмі дапускаецца шмат фармалізму. Гэтым недахопам асабліва пакутуе інфармацыйная праца ў малакалькасных арганізацыях. Па гэтай прычыне ў членаў прафсаюза прысутнічае сіндром няўпэўненасці ў сілу сваёй арганізацыі.

У той жа час абагульненне анкет з вылучэннем прафсаюзаў па галіновай прыкмеце раскрывае адрозненне ў падыходах да пастаноўкі тут інфармацыйнай працы, у тым ліку і ў той яе часткі, якая тычыцца матывацыі прафсаюзнага членства. Напрыклад, значна лепш ішлі на гэты час справы з матывацыяй прафсаюзнага членства на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці і камунальна-бытавога абслугоўвання Віцебскай вобласці. Тут пераканаўчую інфармацыю на карысць прафсаюзнага членства ў сваіх арганізацыях даволі часта чулі больш за 60% анкетаваных, тое, што такое тут здараецца часам, – 30,2%.

Пра тое, што ў арганізацыях гэтай галіны інфармацыя аб прафсаюзным членстве агучвалася вельмі рэдка, паказалі толькі 10% апытваемых, а што зусім не памятаюць – менш за 5%. У арганізацыях дадзенай галіны да салідарысцкага тыпу прафсаюзнага членства аднеслі сябе на 7% больш анкетаваных, чым у сярэднім па ўсёй выбарцы. Вынікі апытання ў гэтых прафсаюзных арганізацыях нельга не звязаць з той працай, якую праводзіў галіновы абласны камітэт прафсаюза.

Гэта і ёсць пераканаўчы доказ, што ў тых арганізацыях, дзе разумеюць значэнне добра наладжанай інфармацыі, паўсядзённай працы з людзьмі, там і матывацыйныя фактары ў членаў прафсаюза бліжэй да салідарысцкага тыпу.

Адказы анкетаваных "падкрэсліваюць" і такую праблему: радавым сябрам прафсаюза вызначана не хапае зносін з вызваленымі прафсаюзнымі работнікамі і актывам. Даклады і выступленні работнікаў і актывістаў у іх арганізацыях, як форму інфармацыі, рэспандэнты назвалі вельмі рэдкай. Яе наяўнасць адзначылі 12,5% інжынерна-тэхнічных работнікаў, 6% рэспандэнтаў з рабочых, 3% – настаўнікаў і 1,2% іншых сацыяльных груп.

Анкета прадугледжвала атрыманне адказа на пытанне "Якія асноўныя прычыны страты людзьмі сяброўства ў прафсаюзах?". Галоўнай прычынай, па



Репозиторий ВГУ

якой адбываецца выхад з прафсаюза, рэспандэнты назвалі абвастрэнне адносін з адміністрацыяй і нездаволенасць паводзінамі кіраўніцтва прафсаюзнай арганізацыі пры абароне правоў работнікаў. На гэта ўказалі 70,5% рэспандэнтаў. З-за нежадання плаціць узносы пакідаюць прафсаюз, як адзначылі рэспандэнты ў адказах, толькі 15%, людзей, якія знаходзіліся раней ў яго радах. Часам прафсаюзнае сяброўства работнікі губляюць пры пераходзе на іншае прадпрыемства (10%). Каля 4% рэспандэнтаў паказалі, што выхад з прафсаюзаў абумоўліваецца пасіўнымі паводзінамі іншых членаў прафсаюза.

На пытанне "Якія шляхі ўмацавання ролі прафарганізацыі ў працоўным калектыве Вы назвалі б у першую чаргу?" Адказы размеркаваліся наступным чынам: за тое, каб прафсаюзныя камітэты выкарыстоўвалі ў працы з адміністрацыяй меркаванне працоўных, дамагаліся рашэнняў, якія паляпшаюць становішча працуючых (навучэнцаў), выказаліся 62% рэспандэнтаў; за ўменне прафсаюзных арганізацый ставіць і вырашаць разам з адміністрацыяй праблемныя пытанні – 50%; за дакладнае выкананне ўласцівых прафсаюзам ахоўных функцый пададзена 25% галасоў; за дэмакратычны падбор прафсаюзных кадраў – 25%; перабудову арганізацыйнай структуры прапанавалі 5%; цяжкасць з адказам на дадзенае пытанне паўстала ў 15% рэспандэнтаў.

Сур'ёзныя цяжкасці з адказам на пытанне "Якія шляхі ўмацавання ролі прафарганізацый працоўных калектываў яны маглі б прапанаваць сёння?" паўсталі ў рэспандэнтаў з прафсаюзным стажам да 3-х гадоў: 55% з іх паставілі на варыянт "Цяжка адказаць". Падобная ацэнка галоўных напрамкаў у дзейнасці прафсаюзаў паказвае, што рэспандэнты жадалі б адчуць на сабе ўзмацненне такіх матывацыйных фактараў, як абарона прафсаюзнымі арганізацыямі сацыяльна-працоўных правоў ва ўсім іх аб'ёме. Што тычыцца адказаў на гэтае пытанне людзей толькі што ўступіўшых ў прафсаюз, то яны, хутчэй за ўсё, сведчаць аб недастатковым веданні імі не толькі гісторыі і тэорыі станаўлення і развіцця прафсаюзнага руху, але і цяпер дзеючых (хоць бы асноватворных) прафсаюзных дакументаў і напрамкаў у дзейнасці сваёй арганізацыі.

Такім чынам, паўстае заканамернае пытанне: якія патрабуюцца змены ў працы прафсаюзаў? Як зрабіць прывабным прафсаюзнае сяброўства і адначасова павысіць прэстыж прафсаюзаў? Што трэба рабіць, каб тыя члены прафсаюза, у якіх узровень даверу да сваёй арганізацыі пакуль не высокі, у якіх не хапае асабістай упэўненасці ў магчымасці знаходзіцца ў прафсаюзах, абараняць сумесна свае правы, памянялі б погляды і сталі б актыўна дзейнымі членамі прафсаюзнага руху?

Па-першае, у сувязі з тым, што ў пачатку даследавання ў яго выканаўцаў не было звестак пра стан матывацыі прафсаюзнага членства на папярэднім этапе (хаця б за 2–3 гады да гэтага), вызначыць, што было б вельмі важна, тэндэнцыю ў развіцці дадзенага пытання на этапе 2000-х гадоў не ўяўлялася магчымым. У гэтай сувязі даваць глыбока непрадуманыя рэкамендацыі па ўсёй сукупнасці працэсаў прафсаюзнага членства, не думаючы пра магутныя контртэндэнцыі, пабочныя і аддаленыя наступствы, было б заўчасна.

У той жа час атрыманыя ў ходзе даследавання сукупныя дадзеныя паказваюць, што праблемы ў матывацыі прафсаюзнага членства пакуль (і гэта варта прызнаць усім прафсаюзным фарміраванням, ад нізу да верху) існуюць.



Рэпазіторый ВДУ

Пацверджанне таму – цяперашні стан, які характарызуе матывацыю прафсаюзнага членства (праўда, толькі па выніках даследаванні ў рамках аднаго рэгіёна) у арганізацыях Віцебскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў.

Заўважым, што ўстойлівасць унутранай сістэмы прафсаюзаў забяспечваецца пераважным складам у іх членаў прафсаюза з усвядомленым салідарысцкім і творчым тыпам. Члены прафсаюза з такой матывацыяй вераць у здольнасць прафсаюзных структур адстаяць жыццёвыя інтарэсы сваіх членаў у любой, у тым ліку і ў складанай сацыяльна-эканамічнай абстаноўцы, праяўляюць зацікаўленасць у наяўнасці змястоўнага калектыўнага дагавора і сапраўднай калектыўнай абароне сацыяльна-працоўных інтарэсаў усіх работнікаў прадпрыемства перад наймальнікам.

Дадзеныя даследаванні паказваюць, што рады прадстаўнікоў, якія маюць матывацыю салідарысцкага тыпу, у прафсаюзных арганізацыях хоць і займаюць другое месца пасля страховога, але не так шматлікія, як патрабуецца для стабільна ўстойлівай і эфектыўна функцыянуючай арганізацыйнай сістэмы. Члены прафсаюза з інерцыйна-страхавачным і спажывецкім тыпамі матывацыі, якіх у суме аказалася большасць, не з'яўляюцца трывалым элементам, здольным супрацьстаяць негатыўнаму знешняму ўздзеянню на прафсаюзы. Яны ў складаных момантах – слабае звяно ва ўмацаванні ўнутранай устойлівасці прафсаюзных арганізацый.

Аднак варта ўлічыць, што матывацыя па прыкметах, апісаных вышэй, хоць і даволі ўстойлівая з'ява (змяніць свой погляд або тып матывацыі чалавек імгненна не можа, ён вельмі неахвотна расстаецца са сваімі старымі паводзінамі, стэрэатыпамі), але яе не варта разглядаць як застылы стан. Прафсаюзы, як і іншыя грамадскія фарміраванні, складаюцца з вялікай колькасці людзей, і ў кожны асобны момант часу чалавек імкнецца да задавальнення той патрэбы, якая для яго з'яўляецца больш важнай, або моцнай: розныя патрэбы фарміруюць розныя тыпы матывацыі і ўступлення ў прафсаюз, захавання прафсаюзнага членства. Абыйсціся без супярэчнасцей тут немагчыма. Але, як паказвае даследаванне, супярэчнасці гэтыя (не антаганістычныя) пераадольныя разам з развіццём і ўдасканаленнем дзейнасці прафсаюзаў у частцы матывацыі прафсаюзнага членства.

Пры пераходзе прафсаюзных арганізацый ад спрошчанага да прафесійнага падыходу ў вырашэнні пытання матывацыі прафсаюзнага членства сябры прафсаюза могуць змяняць асабістае меркаванне і пераходзіць у салідарысцкі тып матывацыі. Гэтаму ў большай меры спрыяюць рэальная адзнака прафсаюзным кіраўніцтвам становішча спраў у арганізацыі і працоўным калектыве, адэкватная рэакцыя на сітуацыю, прафсаюзны плюралізм, непасрэднае і рэальнае ўцягванне сябраў прафсаюза ў вытворчае і грамадскае жыццё, а таксама павышэнне інфармаванасці радавых членаў прафсаюза пра дзейнасць прафсаюзных арганізацый і іх аб'яднанняў.

Матывацыя членаў прафсаюза па салідарысцкаму тыпу на ўзроўні 50% і вышэй дазволіць прафсаюзам падняць свой імідж, паменшыць пасіўнасць у сваіх членаў, павялічыць лік сімпатызантаў. Таму пытанне аб матывацыі прафсаюзнага членства сярод зноў паступаючых і тых, хто доўгі час знаходзіцца у прафсаюзах, варта аднесці да асноўнага і важнейшага кірунку арганізацыйнай

Рэпазіторый ВГУ

працы на дадзеным этапе. Па-другое, для эфектыўнага ўздзеяння на дадзеную праблему прафсаюзным арганізацыям, пачынаючы ад пярвічкі і да рэспубліканскага ўзроўню, патрэбен эмпірычны матэрыял, які характарызуе распаўсюджанасць тыпаў матывацыі ў сучасных умовах. Атрыманне і абагульненне дадзеных, апора на іх у штодзённай дзейнасці растлумачаць дынаміку матывацыі прафсаюзнага членства, настрой людзей, іх стаўленне да прафсаюзнага руху будуць спрыяць навуковаму разуменню тых працэсаў, якія адбываюцца ў працоўных калектывах. На іх аснове прафсаюзныя арганізацыі змогуць праводзіць эфектыўныя, накіраваныя дзеянні па стварэнні заахвочвальных фактараў, якія будуць спрыяць паскарэнню трансфармацыі пераходу членаў прафсаюза ад спажывецкага і інерцыйна-страхавога да ўсвядомленага салідарысцкага і творчага тыпу.

Знаходжанне найбольш аптымальнага шляху прыцягнення ў прафсаюз новых людзей і захаванне стану задаволенасці сваім статусам раней уступіўшых – задача не з лёгкіх. Вырашаецца яна ўзгодненым і комплексным падыходам прафсаюзных структур да гэтай праблемы. Цэнтральным жа звяном работы па матывацыі прафсаюзнага членства (гэтая аксіёма пацверджана яшчэ раз адказамі рэспандэнтаў) застаецца пярвічная прафсаюзная арганізацыя. Тут фарміруецца матывацыйны механізм праз старанна прадуманую і добра спланаваную дзейнасць па прыёму новых членаў і фарміраванню такога асяродку, пры якім члены прафсаюза пастаянна адчуваюць сваю прыналежнасць да моцнага, эфектыўна функцыянуючага грамадскага інстытута.

Не варта даказваць, што матывацыя фарміруецца пад уздзеяннем умоў, у якіх чалавек знаходзіцца і вядзе ўласную дзейнасць. Галоўныя фактары, якія паскараюць трансфармацыю ад адной катэгорыі матывацыі да другой, – гэта рацыянальная дзейнасць прафсаюзаў пры дасягненні канкрэтных вынікаў у вырашэнні наспелых праблем. У тым выпадку, калі член прафсаюза бачыць не галаслоўны, а рэальны, штодзённай практыкай падмацаваны ўдзел сваёй прафсаюзнай арганізацыі ў вырашэнні спрэчных пытанняў на баку працоўных, ён абавязкова будзе імкнуцца да салідарысцкага тыпу. А гэта і ёсць станоўчае рашэнне той задачы, якая з‘яўляецца найважнейшай для сучаснага прафсаюзнага руху.

Як прапаноўваюць рэспандэнты, прафсаюзам варта выразна выконваць уласцівыя ім ахоўныя функцыі, выкарыстоўваць у працы з адміністрацыяй меркаванне працоўных, дамагацца выканання рашэнняў, якія паляпшаюць становішча працуючых і навучэнцаў. Такога пункту гледжання прытрымліваюцца каля 85% апытаных. Больш за ўсё на дадзены варыянт адказу зарыентаваныя члены прафсаюза, якія маюць вышэйшую адукацыю (больш за 90%), і людзі з дзесяцігадовым і вышэй прафсаюзным стажам.

Абагульненне адказаў рэспандэнтаў, якія былі разгледжаны вышэй, паказвае, што новы ўзровень развіцця беларускага грамадства, сутнасць ведаў людзей, павелічэнне долі прыватнага сектара патрабуюць шырокай і развітой дэмакратыі ў гэтай самай шматлікай і ўплывовай грамадскай арганізацыі. Каб змяніць суадносіны членаў прафсаюза, якія не маюць ніякіх пачуццяў ад сваёй прыналежнасці да прафсаюзу, на пераважную колькасць тых, хто, знаходзячыся ў прафсаюзах, адчувае дачыненне да моцнага грамадскага інстытута, кожнай



Рэпазіторый ВГУ

сяброўскай арганізацыі і ФПБ у цэлым трэба будзе ажыццявіць комплекс арганізацыйных і інфармацыйных мерапрыемстваў. Прафсаюзнаму руху рэспублікі неабходна ператварыцца з інстытута абарончага тыпу ў інтэлектуальнага лідара грамадзянскай супольнасці. Для гэтага варта неадкладна вырашаць задачу фарміравання больш дэмакратычнага ладу ўнутранага жыцця ў першасных прафсаюзных арганізацыях праз ўзняцце ролі прафсаюзных сходаў, актывізацыю працы грамадскіх фарміраванняў прафсаюзных органаў, праз пашырэнне разгалінаванай кадравай падсістэмы, якая ўключае прафсаюзны актыў, своечасовае інфармаванне сябраў прафсаюза аб прынятых рашэннях і іх выкананні, дамагацца балансу інтарэсаў пры рэалізацыі механізму сацыяльнага партнёрства і г.д.

У наладжванні кансалідацыі ў радах рафсаюзаў, выхаваўчых функцый іх пярвічных арганізацый важную ролю павінны заняць прафсаюзныя сходы. Праз гэтую форму прамой дэмакратыі выключна важна развіваць актыўнасць грамадскіх фарміраванняў прафсаюзаў па прыцягненню шырокага кола работнікаў, у першую чаргу сваіх членаў, да падрыхтоўкі, абмеркавання і прыняцця пагадненняў і калектыўных дагавораў, іншых формах у кіраванні прадпрыемствамі і ўстановамі. Прафсаюзным арганізацыям трэба сканцэнтравацца на вырашэнні першачарговай задачы – надаць прафсаюзным сходам такую сутнасць, дзе пануюць аўтэнтычныя формы дэмакратыі. У першую чаргу варта было б наладзіць рэгулярнасць у іх правядзенні (рэспандэнты адзначылі празмерна рэдкае правядзенне сходаў і іх нізкую якасць падрыхтоўкі, асабліва ў малакалькасных арганізацыях). Альтэрнатывы сходам членаў прафсаюза ў пярвічных арганізацыях не можа быць. Толькі яны з'яўляюцца формай прамой дэмакратыі, толькі тут кожны член прафсаюза можа рэалізаваць дадзенае яму статутам права свабодна адстойваць уласны пункт гледжання па ўсіх пытаннях жыцця і дзейнасці сваёй арганізацыі, удзельнічаць у распрацоўцы і прыняцці рашэнняў, ацэньваць дзейнасць выбарчых органаў.

Эфектыўнасць прафсаюзных дзеянняў, прыцягальнасць вобраза прафсаюзаў для іх членаў шмат у чым залежаць ад насычанасці інфармацыйнага поля. На думку навукоўцаў, сёння інфармацыйная праца ў прафсаюзных арганізацыях мае патрэбу ў карэнным паляпшэнні. Зыходзячы з атрыманых вынікаў даследавання, яна, на думку аўтараў, павінна ісці па шляху тэхналагічнага і якаснага ўдасканалення, праз адладжанасць форм узаемадзеяння ўнутрыпрафсаюзных структур: быць разнастайнай, аператыўнай, праўдзівай, а самае галоўнае – насіць дыферэнцыраваны характар.

Шырокае інфармаванне людзей як пра поспехі, напрыклад, удала праведзенай акцыі, так і пра цяжкасці, якія ўзнікаюць у выніку працы з адміністрацыяй, наймальнікам, пры вырашэнні канфліктных пытанняў, мае вельмі важнае значэнне. Адкрытасць і праўдзівасць інфармацыі аб існуючых цяжкасцях, іх прычынах не адштурхоўвае людзей ад прафсаюзаў, а вядзе да ўзмацнення іх іміджу, дэфармуе свядомасць людзей, спараджае апатыю сярод асобных пластоў насельніцтва, адарванасць інфармацыі ад рэальнага жыцця. Асноўнай мэтай інфармацыйнай работы павінна быць прапаганда прафсаюзных каштоўнасцей і ідэалогіі.

Репозиторий ВГУ

Такім чынам, усё вышэйсказанае дазваляе зрабіць наступную выснову. Прафсаюзы ў Рэспубліцы Беларусь, як і ў іншых краінах з рыначнай эканомікай, павінны знаходзіцца ў цесным узаемадзеянні з дзяржавай і бізнес-структурамі, будаваць свае адносіны з імі на аснове сацыяльнага партнёрства. Фарміруючы і ўмацоўваючы членскі склад і ўдасканальваючы механізм узгаднення інтарэсаў бакоў, прафсаюзы павінны ўзмацніць ахоўную дзейнасць сваіх членаў. Эфектыўныя дзеянні прафсаюзаў будуць спрыяць зніжэнню напружанасці ў грамадстве.

Найбуйнейшым нацыянальным прафсаюзным цэнтрам у краіне з’яўляецца Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. У арганізацыях, якія ўваходзяць у ФПБ, знаходзіцца большасць эканамічна актыўнага насельніцтва краіны. ФПБ падтрымлівае курс кіраўніка дзяржавы. Пытанне колькаснага і якаснага складу разглядаецца ў гэтым прафсаюзным аб’яднанні як вырашальны фактар, ад якога залежыць эфектыўнасць дзейнасці прафсаюзаў. Стварэнне першасных прафсаюзных арганізацый на прадпрыемствах з новымі формамі ўласнасці, уцягванне ў прафсаюзны рух работнікаў вытворчасці і вучнёўскай моладзі, развіццё іх актыўнасці – такія першачарговыя задачы, якія вызначаны кіраўніцтвам ФПБ сваім структурным звёнам. Гэты падыход варта прызнаць натуральным і рацыянальным. Ён дазваляе прафсаюзам аб’ядноўваць людзей у адзіную, цэласную, аптымальна структураваную арганізацыю, пашырае іх уплыў у грамадстве, узмацняе патэнцыял членаў прафсаюза для забеспячэння сацыяльнай стабільнасці ў працоўных калектывах, прымушае лічыцца з сабой дзяржаўныя і бізнес-структуры пры выкананні імі сваіх абавязацельстваў перад работнікамі.

Высокі ўзровень прафсаюзнага членства і салідарысцкая матывацыя сярод членаў прафсаюза – гэта важнейшы фактар, які падымае статус прафсаюзаў рэспублікі сярод іншых грамадскіх арганізацый, ўмацоўвае іх фінансавае становішча, пашырае магчымасці для вырашэння статутных задач па абароне наёмных работнікаў.

Паводле апытанняў рэспандэнтаў, прафсаюзы знаходзяцца ў ліку асноўных сацыяльных сіл грамадства. Да большасці членаў прафсаюзаў прыйшло ўсведамленне патрэбы ў аб’яднанні для абароны сваіх правоў і інтарэсаў (салідарысцкі і страховачны тыпы матывацыі, водападзел паміж якімі не вельмі вялікі, разам складаюць больш за 73%). На дадзеным этапе развіцця краіны, як паказала даследаванне, дамінантай прафсаюзнай матывацыі з’яўляецца рашэнне, перш за ўсё, першапачаткова закладзеных у падмурак гэтай арганізацыі мэт і задач з улікам зноў узнікаючых праблем: наёмныя работнікі чакаюць ад прафсаюзаў у меншай меры матэрыяльнай дапамогі, а ў большай, што і патрабуецца ад прафсаюзаў у цяперашніх умовах, – узмацнення іх уплыву на забеспячэнне сацыяльных гарантый і абароны ад магчымага самавольства наймальнікаў.

Навукова-прыкладныя даследаванні, якія раскрываюць прафсаюзную тэматыку, паказваюць, што імідж прафсаюзаў шмат у чым вызначаецца тыпамі матывацыі прафсаюзнага членства. Чым вышэй ступень членаў прафсаюза салідарысцкага тыпу матывацыі ў прафсаюзнай арганізацыі, тым вышэй адзнака яе дзейнасці. У той час як члены прафсаюза спажывецкага тыпу матывацыі

Рэпазіторый ВДУ

(некалькі менш інерцыйна-страхавой) даволі скептычна ацэньваюць магчымасці прафсаюзаў у вырашэнні надзённых праблем працоўных, знаходзяцца пераважна ў пасіўным стане, члены прафсаюза салідарысцкага тыпу матывацыі арыентуюцца на салідарную далучанасць да выканання праграмных палажэнняў прафсаюзнага руху і рашэнне бягучых задач. Таму фарміраванне прафсаюзнага членства салідарысцкага тыпу з'яўляецца асноўным і найважнейшым звяном арганізацыйнай працы, найважнейшым элементам умацавання ўнутранай устойлівасці прафсаюзаў усіх узроўняў.

Даследаваннямі даказана, што нават пры моцнай залежнасці ад средавых фактараў (сацыяльна-эканамічных, палітычных, прававых) самай пераканаўчай аргументацыяй пры ўсведамленні і карэкцыі тыпаў матывацыі з'яўляцца прафесіяналізм і кампетэнтнасць штатных прафсаюзных работнікаў, іх цвёрдасць у адстойванні прафесійных і сацыяльна-працоўных інтарэсаў работнікаў прадпрыемства, установы [6]. Аднак ахоўныя магчымасці прафсаюзаў (як і пры рэалізацыі іншых функцый) вызначаюць самі члены прафсаюза сваёй актыўнай пазіцыяй, рэальным уплывам на становішча спраў у працоўных калектывах і ў краіне ўвогуле.

**Літаратура**


1. Доклад председателя Федерации профсоюзов Беларуси Л.П. Козика VI съезду ФПБ «Отчет Совета Федерации профсоюзов Беларуси о проделанной работе за период после V съезда профсоюзов Беларуси, текущих и перспективных и Программе действий Федерации профсоюзов Беларуси на 2010–2015 годы» / Л.П. Козик // Беларускі час. – 2010. – 17–23 сент. – С. 4–8.
2. Мандрик, И.В. Социальная безопасность: место и роль профсоюзов в ее обеспечении / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2008. – № 2.
3. Лукашенко, А.Г. Наша цель – создать обновленный облик Беларуси (выступление Президента А.Г. Лукашенко на VI съезде Федерации профсоюзов Беларуси) / А.Г. Лукашенко // СБ. Беларусь сегодня. – 2010. – 18 сент.
4. По сообщениям пресс-службы Президента // СБ. Беларусь сегодня. – 2013. – 26 февр.
5. Азаренко, К.В. Одни экономят на зарплатах, другие возвращают недоплаченные деньги работникам / К. Азаренко, В. Симанович // Беларускі час. – 2013. – 22–28 февр. – С. 13.
6. Мандрик, И.В. Членская база профсоюзов, типы мотивации ее рядов / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2013. – № 2. – С. 4–11.


Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 15
## Прафсаюзныя кадры і актыў: стан, праблемы, адказ на выклікі часу

Аналіз сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь паказвае, што буйнамаштабныя, агульнадзяржаўныя задачы могуць быць вырашаныя толькі пры дапамозе павышэння агульнаадукацыйнага і культурна-тэхнічнага ўзроўняў працаздольнага насельніцтва краіны. Сёння чалавек, які атрымаў школьную і вышэйшую адукацыю, які заняў пэўнае месца ў структурах кіравання на вытворчых прадпрыемствах, адміністрацыйных органах, мае патрэбу ў пастаянным папаўненні сваіх ведаў і ўменняў. Сусветная тэндэнцыя грамадскага развіцця падцвярджае: пісьменным адмыслоўцам можа лічыцца толькі той, хто прыкладна адзін раз у тры гады павышае сваю кваліфікацыю, набывае самую новую інфармацыю. Адукаванасць чалавека, як правільна адзначаецца ў навуковай літаратуры, уключае перш за ўсё патрэбу ў самаразвіцці, самаўдасканаленні, якая павінна захоўвацца на працягу ўсяго жыцця.

У цяперашні час у Рэспубліцы Беларусь маецца аб'ектыўная неабходнасць для пастаяннай, бесперапыннай адукацыі кожнага чалавека. "Задачы грамадскага развіцця, – адзначаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка ў Пасланні Нацыянальнаму сходу і беларускау народу, – павінны ставіцца з улікам працяглай перспектывы. Беларускі народ павінен ведаць, дзеля якіх ідэй і каштоўнасцей ён жыве і працуе. Ідэі і сфармуляваныя на іх аснове доўгатэрміновыя задачы – наймагутны рэзерв і рэальная магчымасць ператварэння энергіі нашых людзей у канкрэтныя справы" [1, с. 1].

Змест выступлення Прэзідэнта пра разуменне ходу развіцця нашага грамадства яшчэ ў большай меры адносіцца да кіруючых кадраў краіны. Навуковыя даследаванні і вынікі практычнай дзейнасці пацвярджаюць: у любой галіне кадравы фактар аказвае моцны ўплыў на канчатковыя вынікі. Маецца настойлівая неабходнасць, каб кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў і ўстаноў увесь час знаходзіліся ў інфармацыйным полі, валодалі высокім інтэлектам. Не з'яўляюцца выключэннем у гэтым плане кадры прафсаюзаў. Кадры для прафсаюзнага руху, як і для сістэмы дзяржаўнага кіравання, – самае каштоўнае, што ёсць у прыродзе і грамадстве. Ператварэнне прафсаюзаў у эфектыўны інстытут рэгуляцыі сацыяльна-працоўных адносін і сацыяльна-эканамічнай абароны людзей працы ў аўтарытэтную і вонкава прывабную арганізацыю ў значнай ступені залежыць ад кампетэнтнасці іх кадраў. Кампетэнтнасць – гэта індывідуальна-асобасная характарыстыка чалавека, уладальнік якой здольны дамагацца высокіх вынікаў у працы. У навуковай літаратуры паказана, што абавязковымі складнікамі кампетэнцыі прафсаюзнага лідара з'яўляюцца ўпэўненасць у сабе; настойлівасць у рэалізацыі асноўных установак, якія стаяць перад арганізацыяй; уменне хутка ўсталёўваць кантакты з людзьмі; уменне пераконваць іншых і дасягаць кампрамісу (пры уласнай прынцыповай пазіцыі); адэкватнае рэагаванне на канфліктныя сітуацыі;



Репозиторий ВГУ

уменне граматна публічна выступаць. Уменне лідараў прафсаюзнага руху фарміраваць, вылучаць, абгрунтоўваць разумныя патрабаванні і адстойваць іх вядзе да арганізацыйнага ўмацавання прафсаюзаў, наладжванню канструктыўных адносін з органамі ўладных структур.

Аналіз пастаноў Прэзідыума Савета ФПБ паказвае, што падыходы да працы з кадрамі ў прафсаюзным руху ў поўнай меры стасуюцца з тымі, што зададзены кіраўніцтвам краіны. У іх усведамляецца неабходнасць навукова абгрунтаванай пастаноўкі адукацыі кадраў і яго развітога вучэбна-метадычнага забеспячэння.

Як пісаў старшыня ФПБ Л.П. Козік (працаваў на гэтай пасадзе да 2015 г.): "Ад прафсаюзных кадраў, – патрабуецца высокая кампетэнтнасць, уменне аналізаваць працэсы, якія адбываюцца, прымаць правільныя рашэнні ў складаных сітуацыях, весці канструктыўны дыялог з кіраўнікамі прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў" [2, с. 7]. З кантэкста выступлення кіраўніка прафсаюзнага руху вынікае, што сістэмнае адукацыя прафсаюзных кадраў і актыву не можа больш з'яўляцца асабістым жаданнем або прывілеем, яно было і застаецца сацыяльнай неабходнасцю. Сучасныя прафсаюзы не могуць функцыяніраваць без адукаваных кваліфікаваных кадраў, а таксама без пастаяннага пашырэння імі ведаў, якія рухаюць сучаснай цывілізацыяй. Удзел у адукацыйных праграмах, абмен вопытам, актыўная самаадукацыя – усё гэта дазваляе прафсаюзнаму работніку зірнуць на сваю працоўную дзейнасць крыху інакш і ўбачыць у ёй новыя магчымасці і новы інтарэс. Адмова ад пазнання тэарэтычных палажэнняў, пасіўнасць самаадукацыі – ёсць сіндром прафесійнага выгарання.

У дакладах і выступах на з'ездах ФПБ, у вывучаемы перыяд, пастаянна падкрэслівалася, што дзейнасць прафсаюзных выбарчых органаў і арганізацый увогуле знаходзіцца ў прамой сувязі з якасцю працы іх кіраўнікоў. Менавіта праз кадры прафсаюзы мелі намер зрабіць больш шырокае ўваходжанне ва ўладу, прадстаўляць прафсаюзны рух ва ўсіх уладных структурах. Адказам на новыя выклікі стала распрацоўка і прыняцце прэзідыумам ФПБ у сярэдзіне 1990-х гадоў шэрагу пастаноў, у якіх зроблены аналіз, дадзена ацэнка стану вучобы прафсаюзных кадраў, вызначаны задачы па яе ўдасканаленні.

У адпаведнасці з пастановай Прэзідыума Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі "Аб стане прафсаюзнай сістэмы адукацыі" падрыхтоўка і перападрыхтоўка прафсаюзных кадраў і актыву была ўскладзена на ўстанову адукацыі ФПБ "Міжнародны інстытут" «МІПСА»" (з 2010 г. Міжнародны ўніверсітэт "МІПСА"). Тут на кароткатэрміновых курсах у цэнтралізаваным парадку было арганізавана навучанне прафсаюзных кадраў і актыву. За 2002–2004 гады на кароткатэрміновых курсах прайшлі навучанне больш за 5 тысяч прафсаюзных актывістаў [4, с. 18]. Для арганізацыі комплекснага падыходу да навучання была створана навукова-метадычная рада, кіраваць якой даручылі старшыні Федэрацыі прафсаюзаў (у той час Л.П. Козіку, доктару эканамічных навук, прафесару).

У 1996 годзе праведзены набор прафсаюзных лідараў (57 чалавек, у асноўным кіраўнікоў рэспубліканскага і абласнога маштабу) у Віцебскі філіял "МІПСА" для атрымання другой вышэйшай адукацыі па юрыдычных



Рэпазіторый ВДУ

спецыяльнасцях. У 1999 годзе ім ўручылі дыпломы па спецыяльнасці “правазнаўства”.

Для прафсаюзных кадраў і актыву ў Віцебскім філіяле працавала школа майстэрства дзелавых зносін. Многія работнікі прафсаюзаў рэспублікі прымалі ўдзел у штогадовай міжнароднай канферэнцыі “Сацыяльнае партнёрства: канцэпцыя, вопыт, праблемы” [3, с. 204].

Да пазітыўных момантаў арганізацыі і правядзення вучобы прафсаюзных кадраў варта аднесці выкарыстанне актыўных формаў навучання: дыскусіі, выязныя паседжанні і правядзенне практычных заняткаў на базе перадавых прафсаюзных камітэтаў. У даследуемым перыядзе семінары па вывучэнні вопыту прафсаюзнай працы часцей праводзіліся ў рэспубліканскім камітэце работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў, прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, прафсаюза работнікаў лесу.

Па праблемах арганізацыі прафсаюзнай адукацыі ФПБ практыкавала правядзенне “круглых сталоў”. У лістападзе 2004 г. адбылося пасяджэнне «круглага стала» з удзелам старшыняў ўсіх галіновых прафсаюзаў рэспублікі. У ходзе дыскусіі паступалі канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні арганізацыі прафсаюзнай адукацыі з улікам патрабаванняў сучаснага этапу развіцця прафсаюзнага руху ў рэспубліцы, былі прыняты канкрэтныя рэкамендацыі. У прыватнасці, было вырашана стварыць інфармацыйны фонд лепшага вопыту работы прафсаюзных камітэтаў у выглядзе выдадзеных інфармацыйных і метадычных матэрыялаў. У ходзе “круглага стала” была арганізавана прэзентацыя навучальных праграм навучання прафсаюзных кадраў і актыву, распрацаваных выкладчыкамі “МІПСА” і яго філіялаў. Найбольшую цікавасць удзельнікаў “круглага стала” выклікала прэзентацыя электронных варыянтаў лекцый для прафсаюзнага актыву, падрыхтаваных выкладчыкамі Віцебскага філіяла [4, с. 19].

Больш змястоўна да падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі сваіх кадраў ФПБ пачала ставіцца з 2002 года. У 2002–2015 гг. рэспубліканскія прафсаюзныя органы прынялі арыентацыю на правядзенне 5-дзённых семінараў па 36-гадзіннай праграме з кантролем (залік) за узроўнем засвоенага матэрыялу і выдачай адпаведных сертыфікатаў.

Станоўчыя вынікі, дасягнутыя ФПБ і яе арганізацыямі ў галіне прымянення інтэрактыўных формаў навучання (правядзенне “круглых сталоў”, дыскусій, выязных семінараў, укараненне трэнінгавых праграм), дазволіла падняць якасць тэарэтычнай часткі адукацыйнага працэсу па фарміраванню ў навучэнцаў уменняў і навыкаў працы ў прафсаюзных калектывах для якаснага вырашэння прафесійных задач. Дадзеныя анкетнага апытання ў студзені 2006 года паказалі: усе 100% рэспандэнтаў (прафсаюзныя работнікі абласнога звяна) выказалі неабходнасць ў сістэмнай і якаснай адукацыі. 15,3% з іх падкрэслілі, што гэта дапамагае развіццю такіх якасцей, як уменне аналізаваць працэсы грамадскага развіцця, рабіць абагульненне, вылучаць галоўнае. Тое, што сістэмна арганізаваны навучальны працэс дапамагае фарміраваць і развіваць веды і навыкі для вырашэння задач, якія стаяць перад прафсаюзамі на сучасным этапе, адзначылі 76,9% [5, с. 95–96].

Вывучэнне паказала, што ў гэтыя гады ў прафсаюзных работнікаў праяўлялася цікавасць да пазнання, мелася разуменне таго, што сістэмна



Рэпазіторый ВДУ

арганізаваная вучоба рыхтуе кадры да самастойных рашэнняў і спосабаў пераадолення цяжкасцей, выяўляе адораных людзей. На думку рэспандэнтаў, якія ўдзельнічалі ў сацыялагічным даследаванні ў 2009 годзе (апытваліся члены прафсаюза ўсіх галін Віцебскай і Магілёўскай абласцей – каля 800 чалавек і вызваленыя работнікі прафсаюзаў – 63 чал.), самымі важнымі і значнымі кампетэнцыямі прафсаюзнага лідара з'яўляюцца фундаментальныя веды. Больш за 90% рэспандэнтаў паказалі, што ў прафсаюзнага работніка абласнога, гарадскога і раённага звяна незалежна ад галіновай прыкметы павінна быць вышэйшая, пераважна юрыдычная адукацыя, яшчэ лепш спалучэнне юрыдычнай і эканамічнай падрыхтоўкі. 69,2% рэспандэнтаў адзначылі, што ў іх (а гэта былі работнікі абласнога звяна) адчуваецца дэфіцыт прававой падрыхтоўкі. У прыярытэтны блок ведаў увайшлі веды сацыяльнай палітыкі ў сферы працоўных адносін, асновы псіхалогіі, гісторыі і тэорыі працоўнага і прафсаюзнага руху. Самыя высокія балы атрымалі прафсаюзныя лідары (у тым ліку ўзначальваючыя першасныя арганізацыі), якія на думку рэспандэнтаў, валодаюць уменнем тонка весці калектыўныя перамовы з дзяржаўнымі службоўцамі і наймальнікамі, дамагаюцца ажыццяўлення прынятых рашэнняў у строгай адпаведнасці з нарматыўна-прававой базай Рэспублікі Беларусь .

Як бачна, у адказах рэспандэнтаў назіраецца неабходнасць для прафсаюзнага работніка абавязковай наяўнасці такой кампетэнцыі, як высокая інтэлектуальная падрыхтоўка, якую магчыма атрымаць праз бесперапынную адукацыю. У адказах рэспадэнтаў слушна заўважана, што, абараняючы і адстойваючы сацыяльныя і працоўныя правы працоўных, прафсаюзны работнік павінен мабільна думаць, супастаўляць розныя пункты гледжання, весці дыскусіі са сваімі партнёрамі, знаходзіць эфектыўныя спосабы і метады ў рабоце, дамагацца прыняцця рашэнняў, якія садзейнічаюць прагрэсу.

Матывацыя і каштоўнасць адукацыі ў гэтым выпадку ўзрастаюць шматразова. Па дадзеных даследаванняў расійскіх і беларускіх вучоных, выдаткі на адукацыю грамадскага прафесійнаг дзеяча акупляюцца ў сярэднім у пяціразовым, а часам і ў дзесяціразовым памеры. Лідару грамадскай арганізацыі трэба ўлічыць, што больш за дзве трацiны ад атрыманых ім ведаў дастаецца грамадству і толькі адна трацiна – яму самому, гэта значыць пры пастаяннай сучаснай адукацыі ён прыносіць значную карысць сваёй арганізацыі.

Пры вызначэнні найважнейшых фактараў, якія спрыяюць больш поўнаму выкананню прафсаюзамі сваіх функцый, на першае месца рэспандэнты паставілі пазіцыю прафсаюзнага лідара, яго адукаванасць, сумленнасць, смеласць, прынцыповасць. Для выканання складаных функцыянальных абавязкаў і правільнай рэакцыі на ўзрастаючыя патрабаванні прафсаюзнаму лідару важна бачыць не фармальны бок адукацыі, яму патрэбны рэальныя веды. Толькі наяўнасць у прафсаюзнага лідара рэальных ведаў прымушае кіраўнікоў дзяржаўных і прыватных структур усур'ёз прымаць прапановы, якія зыходзяць ад працоўных, інтарэсы якіх прадстаўляюць прафсаюзы. Важным была прапанова рэспандэнтаў аб тым, што паляпшэнне якаснага складу прафсаюзных работнікаў павінна праходзіць праз стварэнне дзейснага рэзерву, амаладжэнне кадраў, пастаяннае павышэнне іх тэарэтычнага ўзроўню.

Што тычыцца такіх індывідуальных дадзеных, як узрост, пол, стан здароўя, то тут да людзей, якія займаюць кіруючае становішча ў прафсаюзах,



Репозиторий ВГУ

канкрэтных патрабаванняў не выстаўлялася. Праўда, 80% рэспандэнтаў адзначылі, што найбольш пажаданы ўзрост для абрання на вызваленую прафсаюзную працу знаходзіцца ў межах 30–50 гадоў, астатнія 20% дапускалі павелічэнне ўзроставага цэнзу вызваленых работнікаў да часу выхаду на пенсію.

На думку 65% рэспандэнтаў, гендэрная прыкмета пры выбары кіраўнікоў на прафсаюзныя пасады не з'яўляецца істотным. У той жа час чвэрць апытаных аддалі перавагу мужчынам і 10% жанчынам [6, с. 110–111].

Згодна даследаванню, безумоўна, на працу ў прафсаюз варта падбіраць найбольш яркіх, таленавітых, сацыяльна актыўных людзей. Патрэбна сістэма, якая дазволіць, па-першае, замацоўвацца ў прафарганізацыі маладым, актыўным, лідарам; па-другое, ісці наперад, рабіць кар'еру ў добрым сэнсе гэтага слова. Але не ўся справа ў моладзі. Трывогі з нагоды ўзросту ўзнімаць не варта. Шматлікія прафсаюзныя работнікі 50–60-гадовага і больш саліднага ўзросту (прыклад Віцебскай і Магілёўскай абласцей, дзе вывучалася дадзенае пытанне) валодаюць выключнай здольнасцю да самаразвіцця.

Вынікі анкетавання паказалі, што самыя высокія балы рэспандэнты выставілі прафсаюзным работнікам, якія валодалі нарматыўна-прававой базай дзейнасці прафсаюзаў і тонкасцямі вядзення калектыўных перамоў з кіраўнікамі дзяржаўных органаў і наймальнікамі, а таксама валодалі арганізацыйнымі пытаннямі прафсаюзнай працы. Безумоўна, неабходнымі элементамі, без якіх выконваць абавязкі прафсаюзнага лідара проста немагчыма, анкетуемыя назвалі ўменні будаваць узаемаадносіны з сацыяльнымі партнёрамі, арганізоўваць працу з прафактывам, дамагацца ажыццяўлення прынятых рашэнняў, заключаных пагадненняў, выступаць перад людзьмі. Вывучэнне пытання аб рабоце прафсаюзаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы прафсаюзных лідараў паказала, што пры намечаных станоўчых тэндэнцыях у дадзеным пытанні меліся пэўныя недахопы. Больш за палову апытаных радавых членаў прафсаюза адзначылі, што ўзровень прафесіяналізму і кампетэнтнасці прафсаюзных работнікаў у тым перыядзе адставаў ад патрабаванняў жыцця. У сілу розных прычын, больш за ўсё – аб'ектыўных, (крызіснае становішча прадпрыемстваў да 1995 г.) прафсаюзная работа на вызваленай пасадзе не з'яўлялася прэстыжнай. Ва ўмовах нестабільнасці прафсаюзы не змаглі забяспечыць свайму лідару годную заработную плату, дадатковыя матэрыяльныя даброты, надзейныя гарантыі сацыяльнай абароненасці. Гэтым самым зніжалася магчымасць прыцягнення да кіраўніцтва прафсаюзнымі арганізацыямі лепшых прадстаўнікоў грамадства, асабліва моладзі.

Сацыялагічнае даследаванне прафесіяграмы прафсаюзнага лідара дапамагло навукоўцам разгледзець трывожны сімптом: у значнай часткі (каля чвэрці) апытаных вызваленых работнікаў Віцебскай вобласці не было жадання ўключацца ў паслядыпломны бесперапынны навучальны працэс. Асобныя з іх выяўлялі поўную абыякавасць да вывучэння сучасных тэарэтычных палажэнняў, канцэпцый развіцця грамадства, прыроды. Так, толькі 5% кіраўнікоў раённых і абласных камітэтаў прафсаюза адзначылі ў анкеце аб жаданні авалодаць ведамі і ўменнямі па фарміраванню прыемнага маральна-псіхалагічнага клімату ў калектыве, кіраванню канфліктнымі сітуацыямі і іх вырашэнню (тут хутчэй бачыцца завышаная самаацэнка).

Рэпазіторый ВДУ

У абласных і некаторых рэспубліканскіх камітэтах прафсаюза назіралася ўстойлівая арыентацыя на ўстарэлыя падыходы да арганізацыі вучобы сваіх кадраў. Перавага пры арганізацыі вучобы аддавалася практыцы прафсаюзнай дзейнасці, тэарэтычныя ж веды ўспрымаліся як малазначныя і другарадныя. Прафсаюзныя камітэты тады імкнуліся да правядзення адна-двухдзённых семінараў з нязначнай колькасцю вучэбных гадзін. Такая вучоба ў большай ступені нагадвала нараду па бягучых пытаннях. Яна насіла больш інфармацыйны, пачуццёва-эмпірычны характар. Часцей за ўсё слухачам аднадзённага семінара (у межах 4–6 гадзін) даваліся пустыя рашэнні. Вынікам падобнай вучобы з'яўлялася толькі тое, што ляжыць на паверхні.

Некаторыя прафсаюзныя камітэты парушалі планы навучання прафсаюзных кадраў. Анкетнае апытанне выявіла прычыны такога падыходу ў павышэнні кваліфікацыі прафсаюзных кадраў і актыву. На наяўныя фінансавыя цяжкасці паказалі 69%, на арганізацыйныя (адсутнасць сістэмы навучання, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў і актыву) – 61,5% [6, с. 112].

Адсутнасць сістэмнай адукацыі негатыўна адбівалася на прафсаюзным руху. Абраным прафсаюзным лідарам было цяжка супрацьстаяць сваім апанентам (дзяржаўным чыноўнікам і адміністратарам прадпрыемстваў і арганізацый) у сілу таго, што тыя былі лепш арганізаваныя, інфармаваныя, да таго ж шырока выкарыстоўвалі сілавыя метады. Прафсаюзныя ж працаўнікі ў сілу спецыфікі працы (іх кіраўнічая дзейнасць заснавана на ўжыванні псіхалагічных механізмаў) былі абмежаваныя ў выкарыстанні адміністрацыйных рычагоў уздзеяння. Больш 10% апытаных адзначылі нездаволенасць асобаснымі якасцямі і ўласцівасцямі занятых на прафсаюзнай рабоце людзей. Больш за 30% паказалі на слабасць іх тэарэтычнай падрыхтоўкі. Больш увагі з боку прафсаюзных лідараў наёмныя работнікі хацелі б надаць распрацоўцы сацыяльна-эканамічных праграм, выпрацоўцы нарматыўна-прававых актаў, якія рэгулююць працоўныя адносіны на прадпрыемствах і асабліва ў рэгуляванні аплаты працы [6, с. 20].

Адным з найбольш праблемных пытанняў падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі прафсаюзных кадраў і актыву, які быў відавочны на час даследавання, з'яўляўся дэфіцыт выкладчыкаў, здольных якасна праводзіць навучальны працэс сярод дарослых людзей, занятых на пасадах у прафсаюзах.

Да 2010 года не было вырашана пытанне стварэння кафедры тэорыі і практыкі прафсаюзнай работы ва ўстанове адукацыі ФПБ, якая магла б сканцэнтраваць увагу на навукова-метадычнай распрацоўцы ўсяго спектра пытанняў і напрамкаў, звязаных з прафсаюзнай праблематыкай. У рэспубліцы не хапала спецыялістаў з глыбокай тэарэтычнай падрыхтоўкай для навучання слухачоў па арганізацыйна-масавай, вытворчай працы прафсаюзных камітэтаў у спецыфічных умовах.

Як уяўляецца даследчыкам, адукацыя прафсаюзных кадраў – аснова ўстойлівасці і стабільнасці прафсаюзнага руху, абавязковая частка эфектыўнай работы прафсаюзных камітэтаў і арганізацый. Для таго каб навучанне прафсаюзных лідараў стала фактарам ўласнага развіцця прафсаюзнага руху, адукацыя павінна быць адмысловым чынам арганізавана і пабудавана. Для прафсаюзнага лідара патрэба ў сістэмнай, бесперапыннай адукацыі, у

Рэпазіторый ВДУ

адрозненне ад радавога члена, узмацняецца некалькімі фактарамі: па-першае, неабходнасцю выканання складаных функцыянальных абавязкаў. Абараняючы і адстойваючы сацыяльныя і працоўныя правы працоўных, прафсаюзны работнік павінен знаходзіць для гэтага эфектыўныя спосабы і метады, якія вядуць да станоўчага вырашэння канкрэтнай задачы і дасягненні станоўчага выніку; па-другое, сучасныя веды прафсаюзнаму работніку патрэбныя не толькі для таго, каб адаптавацца да хуткіх змен. Яны больш важныя для магчымасці бачыць перспектыву, прагназаваць будучыню, удзельнічаць у фарміраванні прагрэсіўных зменаў на карысць грамадства і прафсаюзнага руху [7, с. 13].

Такім чынам, відавочна, што для якаснага выканання прафесійных абавязкаў прафсаюзным кадрах і актыву неабходна сістэмная, непарыўная па часе адукацыя. Толькі гэты падыход дазваляе прафсаюзнаму руху вызначыцца з траекторыяй далейшага прагрэсіўнага развіцця.

Кадры – асноўны здабытак прафсаюзнага руху. Пошук шляхоў фарміравання якаснага складу прафсаюзных лідараў ёсць галоўны складнік эфектыўнай работы самай масавай і аўтарытэтнай грамадскай арганізацыі, якой з'яўляецца Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. Для правядзення раўнапраўнага дыялогу з дзяржаўнымі чыноўнікамі і наймальнікамі прафсаюзным лідарам нельга дапускаць адставання ва ўдасканаленні свайго тэарэтычнага і прафесійнага ўзроўню. У цяперашніх умовах для прафсаюзаў асабліва важны падбор дасведчаных кіраўнікоў, якія добра падрыхтаваны тэарытычна. Да таго ж, сучасная абстаноўка патрабуе ад прафсаюзных лідараў стараннасці і высокай інтэнсіўнасці ў назапашванні і ўжыванні сучасных ведаў, а ад арганізатараў навучальнага працэсу – забеспячэння эфектыўнай і сучаснай мадэлі адукацыі.

Задача прафсаюзаў на сучасным этапе складаецца ў тым, каб дыялектычна злучыць у навучальным працэсе тэарэтычныя распрацоўкі навукоўцаў з практыкай прафсаюзнай работы, забяспечыць гнуткасць вучэбнага графіка, арганізаваць навучальны працэс як сумесную дзейнасць "інструктараў" і навучэнцаў. Адукацыю прафсаюзных кадраў трэба праектаваць і арганізоўваць такім чынам, каб у актыўнай пазіцыі быў і выкладчык, і кожны слухач. Патрабуецца прадугледзець і перыядычна праводзіць спецыяльную падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў, якія прыцягваюцца да арганізацыі і правядзення метадалагічных семінараў, трэнінгаў для прафсаюзных работнікаў. Варта асвойваць і будаваць навучальны працэс прафсаюзных кадраў на дыялагічных формах, дзе кожны занятак грунтуецца на сумесным творчым пошуку бакоў, улічваюцца асаблівасці цякучага часу: дынамізм, шматграннасць і супярэчлівасць. Такім чынам, жыццё падсказвае: у цяперашняй абстаноўцы найбольш паспяхова могуць развівацца тыя сістэмы (грамадскія таксама), якія праз адукацыю якасна ўдасканальваюць кадравыя рэсурсы. Гэты закон у поўнай меры адносіцца і да прафсаюза. Прафсаюзны лідар – прафесія адмысловая. Гэта чалавек, які функцыяніруе ў публічным асяроддзі. Ад таго, як ён умее думаць, абагульняць, якое ўражанне ён аказвае на навакольных (пазітыўныя ці негатыўныя), вызначаецца прэстыж арганізацыі ўвогуле. У гэтых умовах прафсаюзнаму руху рэспублікі патрэбныя лідары, якія здольныя асвойваць прынцыповыя, важныя задачы і метады працы, разбірацца ў тонкасцях новых, часам недастаткова закончаных і супярэчлівых з'яваў.

Рэпазіторый ВДУ

Відавочна, што развіццё прафсаюзнага руху, як і іншых грамадскіх сістэм, можа быць заснавана на ведах. Таму навучанне прафсаюзных кадраў і актыву не з'яўляецца чымсьці выключным. Яно ўсё больш запатрабавана жыццёвай неабходнасцю і дынамічным развіццём грамадства. Варта зразумець, што ў постіндустрыяльным грамадстве карысны пераход ад штодзённай свядомасці ўспрыманняў прафсаюзнай работы да навуковых метадаў яе ацэнкі, выкарыстання ў паўсядзённай дзейнасці навуковых дасягненняў тых дысцыплін, якія маюць аб'ектам свайго разгляду чалавека, сацыяльную палітыку, усе аспекты працы. Сродкі, затрачаныя на навучанне, – гэта не пустыя выдаткі, а інвестыцыі ў уласнае развіццё, якія пры правільнай пастаноўцы навучальнага працэсу акупляюцца цалкам.

Сучасную адукацыю прафсаюзных кадраў і актыву неабходна разглядаць як працэс фарміравання прафесійнай кампетэнцыі, заснаванай на перадавой методыцы, якая ўключае як прафесійныя веды, так і псіхалагічную гатоўнасць працаваць з людзьмі. Безумоўна, што дадзенае пытанне яшчэ патрабуе больш глыбокага асэнсавання і паслядоўнага рашэння як з пункту гледжання арганізацыі навучальнага працэсу, назапашвання ведаў, іх абнаўлення, так і з пазіцыі ўмення рэалізаваць гэтыя веды, з атрыманнем эфектыўнага выніку. Праблема падбору, расстаноўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі прафсаюзных кадраў на навуковым узроўні, на жаль, і на сёння застаецца малавывучанай. Аднак не патрабуецца доказаў таго, што забеспячэнне сістэмнасці ў навучанні прафсаюзных кадраў, як ступені сацыяльнай карыснасці, з'яўляецца падмуркам ўстойлівага развіцця прафсаюзнага руху Беларусі і залогам паспяховай пабудовы дэмакратычнай дзяржавы з эфектыўнай эканомікай.

**Літаратура**


1. Лукашенко, А.Г. «Ускорение и качество». Послание Президента А.Г. Лукашенко Национальному собранию и белорусскому народу / А.Г. Лукашенко // СБ. Беларусь сегодня. – 2004. – 15 апр. – С. 1.
2. Козик, Л.П. Новые профсоюзы для новой Беларуси / Л.П. Козик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2003. – № 1. – С. 7–11.
3. Возмитель, И.К. Очерки истории профсоюзов Витебщины / И.К. Возмитель, И.В. Мандрик; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2015. – 504 с.: ил.
4. Толкачев, В.И. Повышение тереотического уровня профсоюзных кадров и актива – настоятельные требования сегодняшнего времени / В.И. Толкачев, И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2005. – № 3. – С. 17–21.
5. Мандрик, И.В. Школа для профсоюзов / И.В. Мандрик // Беларуская думка. – № 10. – 2005. – С. 94–98.
6. Мандрик, И.В. Профессиограмма профсоюзного лидера: теоретический социологический аспект / И.В. Мандрик // Профсоюзы как школа социального образования: материалы междунар. конгресса, Минск, 24–25 мая 2001 г. / УО ФПБ «МИТСО». – Минск, 2001. – С. 109–113.
7. Функционирование системы трипартизма на социально-страцификационном уровне: аналитическая записка по материалам социологического исследования. – Витебск, 1995. – 15 с.


Репозиторий ВГУ

# ВЫСНОВЫ

Такім чынам, гісторыя вывучаемай праблемы паказвае, што арганізацыя ўстойлівага грамадскага жыцця насельніцтва на асобных тэрыторыях існавала задоўга да з'яўлення дзяржавы. Функцыі ўлады на раннім этапе станаўлення цывілізацый выконвалі лепшыя людзі роду, плямені. Дзяржава як устойлівы тып і сацыяльны інстытут грамадства сфарміравалася пазней. На асобных этапах (у перыяд свайго ўзнікнення і ранняга станаўлення) дзяржаўныя інстытуты больш спрыялі багатым людзям (як іх назавуць пазней эксплуататарскімі класамі) і мала праяўлялі клопату аб дабрабыце і ўстанаўленні свабод для большасці насельніцтва. Поўнае бяспраўе рабоў і цяжкае становішча беднякоў стваралі перадумовы для праяў пратэсту ў адкрытай і рэзкай форме, адбываліся сацыяльныя ўзрушэнні, якія падточвалі асновы існуючага сацыяльна-эканамічнага ладу, часам прыводзілі да гібелі дзяржаў і фармацый. У сувязі з гэтым асобныя прадстаўнікі палітычнай думкі сталі задумвацца аб асноўных крыніцах сацыяльных бед, якія зыходзілі ад дзяржавы, вялі пошук шляхоў зніжэння прыгнёту народных мас, устанаўлення больш прагрэсіўнага (справядлівага) грамадства.

Дзякуючы распрацаваным тэорыям з прапановамі арганізацыі і эвалюцыі палітычнай улады, структурызацыі грамадства і фарміравання развітых інстытутаў кіравання, напрыканцы XIX ст. у асобных дзяржавах саспелі ідэі для стварэння спрыяльных для існавання кожнага грамадзяніна ўмоў, забяспечанасці яго сацыяльнай абароненасці і саўдзелу ў кіраванні. У выніку тут паступова складваліся тэарэтычныя распрацоўкі, а разам з гэтым – умовы для развіцця сацыяльнай актыўнасці грамадзян, сацыяльных груп і супольнасцей.

На практыцы дэклараваныя ідэі клопату дзяржавы аб дабрабыце народа (што магчыма ў сацыяльнай дзяржаве) сталі ўпершыню ўкараняцца ў Нямеччыне ў 1871 годзе. У наступны час падобнае развіццё падзей мела месца ў Аўстрыі, Нарвегіі, Францыі, Швецыі, Новай Зеландыі, Канадзе, Італіі і іншых краінах свету. Тут сацыяльная палітыка з'яўляецца эфектыўнай, таму што яна сарыентавана на выніковую рэалізацыю прынцыпаў сацыяльнай дзяржавы і намечаных практычных мер па задавальненню сацыяльных патрэб насельніцтва і прыводзіць да забеспячэння годнага жыцця і свабоднага развіцця асобы.

У Расійскай імперыі большасць насельніцтва пастаянна сутыкалася з такімі формамі дзяржаўнасці, якія не адносіліся да спрыяльных. У пачатку XX ст. у краіне перапляталіся дабуржуазныя і буржуазныя формы вытворчых адносін. Новыя класы ў асобе гандлёва-прамысловай буржуазіі і працоўнага (пралетарыяту) знаходзіліся ў сітуацыі сацыяльных і палітычных супярэчнасцей. Сяляне мелі невялікія надзелы і былі абцяжараны разнастайнымі падаткамі і павіннасцямі. Законы, якія б абмяжоўвалі бязмерную эксплуатацыю рабочых і сялян, былі недасканалымі, значнага ўплыву на становішча рабочых не аказвалі. Яшчэ ў больш бяспраўным становішчы знаходзіліся ўскрайкавыя тэрыторыі, у тым ліку і беларускія губерні. Натуральна, што цяжкія жыццёвыя ўмовы станавіліся прычынай незадаволенасці, азлобленасці, жорсткасці і радыкальных дзеянняў.



Рэпазіторый ВДУ

Настойлівасць бальшавіцкіх сацыял-дэмакратычных арганізацый, папулярныя ў народзе на той час прапановы аб міры, зямлі, фабрыках, заводах, дэмакратычных свабодах мелі падтрымку і поспех, прывялі да рэвалюцыйнага выбуху.

Пасля пераходу ўлады да бальшавікоў савецкая краіна мела намер будаваць сацыяльную дзяржаву згодна марксісцкай сацыялістычнай ідэалогіі. У краіне вызначана стратэгічная мэта, у якой прадугледжвалася правесці індустрыялізацыю, кааперацыю насельніцтва, ажыццявіць культурную рэвалюцыю, увесці адказнасць дзяржавы за дабрабыт грамадзян, сфарміраваць асобу з актыўным удзелам у развіцці вытворчасці і грамадства.

У БССР, якая ўваходзіла ў саюзную дзяржаву, ішло будаўніцтва сучаснай прамысловасці, фарміраваліся новыя атрыбуты сацыяльнай палітыкі. Ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі, (час калі прымяняліся рыначныя механізмы) адбываўся даволі хуткі пад'ём дабрабыту і культуры працоўных. Адчуўшы перамены да лепшага, людзі імкнуліся да рэвалюцыйнага абнаўлення краіны і жылі неадольнай прагай стварэння.

Выключным напружаннем сіл, нягледзячы на дэфармацыі ў эканамічным і палітычным будаўніцтве ў час сталінскага кіраўніцтва, беларусам да 1991 года ўдалося стварыць эканамічны і навукова-тэхнічны патэнцыял еўрапейскага ўзроўню. Аднак замаруджванне росту эканомікі, якое адбылося ў сярэдзіне 70-х гадоў, звялося да абмяжаванага пад'ёму дабрабыту насельніцтва і адставання рэальнага жыццёвага ўзроўню ад патрабаванняў часу.

З набыццём незалежнасці, пераходам да рыначных адносін Рэспубліка Беларусь па волі большасці насельніцтва стала на шлях будаўніцтва сацыяльнай рыначнай дзяржавы. Сацыяльная накіраванасць нацыянальнай мадэлі эканамічнага развіцця была гістарычна абумоўлена аднолькавым для ўсіх людзей, пастаянным і не знікаючым ніколі імкненнем палепшыць сваё становішча. Аб правядзенні дзяржавай моцнай і актыўнай сацыяльнай палітыкі беларусы марылі на працягу доўгага часу. Такі накірунак быў абумоўлены гістарычна склаўшымся менталітэтам грамадзян і запатрабаваным імі звыклым грамадскім парадкам, а таксама неабходнасцю гарманізацыі і збліжэння з заканадаўствам і сацыяльнай практыкай краін СНД. Выбар такога накірунку абумоўлены дасведчанасцю беларусаў падзеямі мінулых эпох. Насельніцтву імпанавалі, распрацаваныя на больш, чым тысячагадовым этапе, тэорыі аб справядлівым грамадстве і практычныя дзеянні ў справе пабудовы сацыяльных дзяржаў у розных частках свету. Навуковы аналіз мінулых часоў, назапашаны вопыт указваў менавіта на такі шлях развіцця краіны на дадзены перыяд і будучыню.

Будаўніцтва сацыяльнай рыначнай дзяржавы ў Беларусі стала працягам савецкай сацыяльнай палітыкі на паступовае ўзрастанне дабрабыту насельніцтва і стварэнне даступных для грамадзян сістэм адукацыі, аховы здароўя, культуры, сацыяльнай абароны, падтрымкі малазабяспечаных пластоў насельніцтва. На гэта была скіравана дзейнасць рэспубліканскіх і рэгіянальных дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый незалежнай Беларусі. Але, па розных прычынах (аб'ектыўных і суб'ектыўных), на першым этапе, станаўленне рынача сацыяльнай дзяржавы праходзіла складана, супярэчліва, бессістэмна.

Рэпазіторый ВГУ

Разлікі на хуткі станоўчы вынік ва ўмовах рынку не апраўдаліся. Насельніцтва рэспублікі несла адчувальныя сацыяльныя страты. Асабліва цяжкае становішча назіралася ў пераходным перыядзе (1991–1995 гг.). Вельмі адчувальна на ўзровень сацыяльнага забеспячэння беларусаў паўплывалі падзеі на сусветных сыравінных і фінансавых рынках. З 1991 года наступіў перыяд рэзкага спаду вытворчасці, за ім – стан даволі глыбокага крызісу сацыяльнай сферы. Такое становішча магчыма патлумачыць як наступствам памылак, дапушчаных кіраўніцтвам рэспублікі, так і складанасцю пераходу на новую для краіны сістэму эканамічных і грамадскіх адносін.

У сярэдзіне 1990-х гадоў новае кіраўніцтва Беларусі паклала пачатак рэалізацыі эканамічнай мадэлі сацыяльнай арыентацыі патэрналісцкага тыпу, якая грунтуецца на свабодным суіснаванні розных формаў уласнасці, моцнай і эфектыўнай сацыяльнай функцыі дзяржавы. Роля дзяржавы ў вырашэнні пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны з гэтага часу рэзка ўзрасла. Дзяржава паставіла пад свой кантроль рэгуляванне прапарцыянальнага развіцця дзяржаўных і недзяржаўных формаў уласнасці, узаемаадносіны паміж гэтымі ўкладамі, падтрымку структурных прапорцый, якія забяспечваюць эканамічную стабільнасць, цэнаўтварэнне і выкарыстанне працоўных рэсурсаў, а таксама, што з'яўляецца самым галоўным, сацыяльна-эканамічную палітыку ў галіне аплаты працы і даходаў насельніцтва.

На дадзеным этапе дзяржава імкнулася стымуляваць эканамічны рост, абараніць людзей ад галечы і беднасці, гарантаваць кожнаму чалавеку мінімальная існаванне, забяспечыць людзям большую роўнасць з дапамогай сціранне адрозненняў ва ўзроўнях дабрабыту, забяспечыць абарону перад тварам непрадбачаных жыццёвых сітуацый (рызык). У рэспубліцы пастаянна індэксаваліся дзяржаўныя пенсіі, дапамогі і іншыя гарантыі сацыяльнай абароны. Адносна наяўнага становішча такі падыход дэманстраваў на гэтым этапе сваю жывучасць. Да 2000 года крызісны стан у вытворчай і сацыяльнай сферы рэспублікі быў пераадолены, забяспечваўся ўсталяваны гарантаваны мінімальны памер аплаты працы, ажыццяўлялася падтрымка сям'і, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, інвалідаў і пажылых грамадзян, развіццё сістэмы сацыяльных службаў.

Этап 2000–2008 гг. для Рэспубліцкі Беларусь ахарактарызаваўся дастаткова паспяховым у эканамічным развіцці і правядзенні эфектыўнай сацыяльнай палітыкі. У гэтым кароткім па гістарычных мерках перыядзе памер ВУП на душу насельніцтва па парытэту пакупніцкай здольнасці на душу насельніцтва павялічыўся амаль, што ў тры разы, больш чым у пяць разоў знізілася доля насельніцтва з даходамі ніжэй бюджэту пражытачнага мінімума.

Карэктывы ў станоўчую тэндэнцыю паспяховага вырашэння сацыяльных пытанняў насельніцтва рэспублікі ўнёс глабальны фінансавы крызіс 2008 года. Уплыў знешніх фактараў на эканоміку рэспублікі негатыўна адбіўся на выкананні прагназуемых паказчыкаў сацыяльнай сферы. Адбылася дэвальвацыя беларускага рубля, рост цэн на сацыяльна значныя тавары і прадукты. Назіралася высокая інфляцыя і зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. Эканамічны спад негатыўна паўплываў на забеспячэнне сацыяльных патрэб грамадзян рэспублікі, затармазілася вырашэнне прагназуемай задачы выхаду на сярэднееўрапейскі ўзровень дабрабыту насельніцтва.

Рэпазіторый ВГУ

Практыка функцыянавання перадавых краін сведчыць, што ажыццяўленне ідэі дасягнення высокіх стандартаў дабрабыту насельніцтва – гэта складаны і працяглы працэс. Укараненне сацыяльных функцый у дзяржаўную практыку тут адбывалася паступова. Аб сацыяльнай дзяржаве, як асаблівай палітыка-прававой рэчаіснасці, сталі гаварыць толькі ў сярэдзіне XIX ст., а сацыяльна арыентаваная палітыка, як асноўны напрамак дзяржаўнай дзейнасці, вызначылася і стала распаўсюджвацца на шырокае кола насельніцтва толькі ў першай палове XX ст. На пачатковай стадыі дзяржавы прымалі на сябе адказнасць за прадастаўленне сваім грамадзянам пражытачнага мінімуму. У далейшым, па магчымасці, у кожнай канкрэтнай краіне, пашырэнне сацыяльных даброт па забеспячэнню годнага ўзроўню жыцця насельніцтва адбывалася з рознай працягласцю па часе з улікам эканамічнага стану і палітычных абставін. Актыўнае развіццё сацыяльная сфера атрымлівае ў індустрыяльную эпоху, што і стала вынікам з'яўлення сацыяльных дзяржаў. Назваўшы сябе сацыяльнымі, дзяржавы выступалі ў якасці гаранта забеспячэння чалавека жыллём, умовамі побыту, узроўнем даходаў, умовамі працы, якаснай аховай здароўя, доступам да інфармацыі, адукацыі, культуры і сацыяльнай дапамогі. У гэтым кантэксце СССР, і ўваходзячыя ў саюз рэспублікі, маюць усе падставы называцца сацыяльна арыентаванай дзяржавай.

Сёння да сацыяльных па факце адносяць дзяржавы, у якіх дэклараваная ў дакументах палітыка па забяспечэнню высокага дабрабыту і справядлівасці, ператварылася ў рэчаіснасць. Адна з асноўных умоў фарміравання поўнавартаснай сацыяльнай дзяржавы – гэта гарманічнае спалучэння ў ёй прававых і сацыяльных норм. На мяжы трэцяга тысячагоддзя да сацыяльна-прававых дзяржаў па факце магчыма аднесці невялікую колькасць краін. Да аптымальнага тыпу арганізацыі грамадскага ладу ў вызначэнні сацыяльных дзяржаў, дзе дзяржава забяспечвае ўзровень жыцця і свабод годных чалавека, на гэты час наблізіліся толькі каля двух дзясяткаў дзяржаў. Гэты тып дзяржаўнага ўладкавання дазваляе забяспечыць раўнамернае размеркаванне матэрыяльных і духоўных добротаў, выраўнаваць з дапамогай сацыяльных стандартаў стартавыя магчымасці грамадзян, стварыць для іх годны чалавека сацыяльна-культурнае асяроддзе пражывання на працягу ўсяго жыцця. Функцыяванне сацыяльных дзяржаў, усіх яго органаў і дзяржаўных асоб, а таксама ўсіх грамадзян і сацыяльных суб'ектаў вядзецца строга ў рамках устаноўленага дэмакратычнага і прававога парадку. Сацыяльныя па факце дзяржавы ствараюць спрыяльную прастору грамадскіх магчымасцей, абароненых ад усялякага самавольства, гарантуюць магчымасць бесперашкоднага ўзаемадзеяння грамадзян і сацыяльных груп. Тыя ж краіны, дзе ў прынятых дакументах гаворка ідзе аб сацыяльнай арыентацыі з улікам сваёй спецыфікі, аб ўзмацненні ролі дзяржавы ў прыярытэтным развіцці ўсіх сегментаў сацыяльнай палітыкі і абароны насельніцтва, але цалкам асобныя сацыяльныя параметры не ўвасабляюцца на практыцы, больш правільна адносіць да сацыяльна развіваючых, сацыяльных па прызначэнню.

Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця апошніх гадоў (якасць жыцця грамадзян нашай рэспублікі за 2015 год ў параўнанні са стандартамі ў перадавых краінах, якія адносяцца да сацыяльных па факту) і дамінаванне грамадскай думкі, даюць магчымасць сфармуляваць выснову: змешчанае ў Канстытуцыі

Рэпазіторый ВДУ

Рэспублікі Беларусь вызначэнне нашай дзяржавы як сацыяльнай, варта разумець не як у поўнай меры завершаны выраз яе сучаснай сутнасці, а толькі як паступова рэалізуемую мэту па яе фарміраванню ў ходзе ажыццяўлення сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў. Рэальна сацыяльнай па факце нашу дзяржаву варта будзе называць тады, калі дэкларavаная ў дзяржаўных планах сацыяльна-эканамічная палітыка па забеспячэнню годнага ўзроўню жыцця насельніцтва на ўзроўні сярэднееўрапейскага стане рэачаіснасцю.

Беларусы, як і грамадзяне іншых краін, звязваюць надзеі на паляпшэнне сваіх жыццёвых умоў з паводзінамі дзяржаўнай улады і дзяржаўнай падтрымкай. Слушнае меркаванне заснавана на тым, што дзяржава валодае матэрыяльнымі сродкамі для правядзення сацыяльнай палітыкі (уласнасцю, бюджэтам, валютнымі запасамі і г.д.), ужывае сістэму падаткаў і пазык і, такім чынам, актыўныя паводзіны дзяржавы ў фарміраванні сацыяльных даброт з’яўляюцца важнейшымі. У той жа час, даследаванне падцвердзіла, што паспяховае выкананне кіраўніцтвам дзяржавы пэўных задач і адначасова рашэнне сацыяльных праблем залежыць ад трываласці партнёрскіх адносінаў дзяржавы з грамадскімі інстытутамі і перш за ўсё з прафесійнымі саюзамі краіны. Прафсаюз – самая масавая арганізацыя працоўных, іх законны прадстаўнік і паўнапраўны бок станаўлення грамадзянскай супольнасці.

Станаўленне і развіццё прафсаюзаў Беларусі, уся іх дзейнасць паказвае, што яны былі і засталіся адзінай грамадскай арганізацыяй, якая пранізлівае ўсе ўзроўні і сферы сістэмы органаў, дзе выпрацоўваюцца і прымаюцца сацыяльна-эканамічныя рашэнні, дзе вызначаецца і праводзіцца ў жыццё сацыяльная палітыка дзяржавы. Не без цяжкасцей, паступова ў інтарэсах захавання сацыяльнай стабільнасці паміж дзяржаўнымі структурамі, працадаўцамі (наймальнікамі) і прафсаюзамі ў працоўнай сферы краіны склалася супрацоўніцтва, вядомае як сістэма сацыяльнага партнёрства, якая адказвае спецыфіцы нацыянальнай эканомікі рэспублікі і ўсталяваўшымуся грамадска-палітычнаму жыццю. Асноўная задача прафсаюзных арганізацый на ўсіх узроўнях з часу іх стварэння заключалася ў тым, каб аб’яднаць работнікаў для калектыўнай абароны ад жорсткай эксплуатацыі, патрабаванняў права на працу, бяспечных умоў працы і годную яе аплату. Асабліва вялікая роля прафсаюзных арганізацый у развіцці вытворчай дэмакратыі, ажыццяўленні працэсу сумеснай дзейнасці людзей, якія рэалізуюць агульную праграмную мэту. Праз развіццё вытворчай дэмакратыі прафсаюзы спрыяюць стварэнню грамадзянскай супольнасці і тым самым удасканальванню сацыяльнай дзяржавы. Аднак комплексны аналіз дзейнасці прафсаюзных камітэтаў і арганізацый паказвае, што ў рыначных умовах патрабуецца больш якасная праца прафсаюзных арганізацый па забеспячэнню ў працоўных калектывах надзейнай сістэмы сацыяльнай і маральнай абароны працоўных, атмасферы ўважлівых адносін да чалавека працы. Застаючыся пасрэднікам паміж працадаўцам і працаўніком, паміж дзяржавай і грамадзянамі ў працоўных узаемаадносінах, прафсаюзны рух можа лепей выконваць сваю гістарычную ролю і грамадскае прызначэнне, калі будзе больш упэўнена і эфектыўна адстойваць інтарэсы чалавека наёмнай працы. Эфектыўная дзейнасць прафсаюзных арганізацый пры сацыяльна-эканамічнай абароне людзей працы ў значнай ступені залежыць ад

Рэпазіторый ВГУ

кампетэнтнасці іх кадраў. Уменне лідараў прафсаюзнага руху фарміраваць, вылучаць, абгрунтоўваць разумныя патрабаванні і адстойваць іх спрыяе арганізацыйнаму ўмацаванню саміх прафсаюзных камітэтаў і арганізацый, а таксама наладжванню канструктыўных адносін з органамі ўладных структур.

На сучасным этапе перад прафсаюзамі паўстае важнейшая задача, задача прынцыповага значэння – настойліва пераводзіць у рэчаіснасць абвешчаны сацыяльнымі партнёрамі тэзіс аб тым, што працаўнікі ў нашай краіне з'яўляюцца гаспадарамі вытворчасці, гаспадарамі краіны, што яны сапраўды кіруюць і распараджаюцца ўласнасцю, а размеркаванне даходаў ад працоўнай дзейнасці вядзецца па справядлівасці.

Як бачна, мадэль эканамічнага развіцця рэспублікі, якая на этапе 1991–2015 гадоў у большай ступені насіла патэрналісцкі характар, патрабуе карэкціроўкі. Каб справіцца з унутранымі і знешнімі прычынамі, негатыўна ўплываючымі на развіццё прамысловага і сельскагаспадарчага комплексу, структуры, якім аказаны давер на кіраўніцтва дзяржавай, павінны знайсці рычагі ўзмацнення магчымасцей існуючай мадэлі да саманастройкі з улікам выклікаў сусветнай эканомікі. Сітуацыя на міжнародным рынку патрабуе пераключэння дадзенай мадэлі на больш устойлівую для падтрымання тэмпаў развіцця на ўзроўні перадавых краін. Рэалізацыя канстытуцыйнай мэты па стварэнню прававой сацыяльнай дзяржавы для Беларусі на сёння з'яўляецца не проста жадаемым, пераважным, але і адзіна магчымым безальтарнатыўным варыянтам. Пры палітычнай волі органаў дзяржаўнай улады і ўдзеле ўсіх грамадскіх сіл (у першую чаргу прафсаюзаў). Гэта мэта павінна стаць агульнанацыянальнай ідэяй і праграмай дзейнасці ўсіх грамадзян краіны. У далейшым паспяховае беларускае грамадства можа развівацца толькі пры сапраўднай актыўнай ролі працоўных, менавіта яны здольны вывесці рэспубліку на перадавыя рубяжы эканамічнага, навукова-тэхнічнага і культурнага развіцця.

Рэпазіторый ВГУ

# З М Е С Т


| | | |
|---|---|---|
| **ПРАДМОВА** ……………………………………………………..………….. | | 3 |
| **ГЛАВА 1.** | Працэс дзяржаваўтварэння. Экскурс у мінулае ……………… | 9 |
| **ГЛАВА 2.** | Навуковая распрацоўка тэарэтычных асноў фарміравання сацыяльных дзяржаў ва ўмовах рынiачнай эканомікі …...…... | 14 |
| **ГЛАВА 3**. | Стварэнне дзяржаў сацыяльнага тыпу, паэтапнае ўзрастанне іх спецыфічных функцый ………………………………………… | 21 |
| **ГЛАВА 4.** | Беларусь на першапачатковым этапе пераходу да рынку (1991–1995) ………………………………………………………… | 31 |
| **ГЛАВА 5.** | Станаўленне беларускай сацыяльна арыентаванай эканамічнай мадэлі ……………………………………………... | 39 |
| **ГЛАВА 6.** | Сацыяльная палітыка, яе сутнасць і асаблівасці ……..……… | 47 |
| **ГЛАВА 7.** | Крызіс сацыяльнай сферы ў постсавецкай Беларусі ……..….. | 55 |
| **ГЛАВА 8.** | Сацыяльная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь у 1996–2015 гг. .. | 60 |
| **ГЛАВА 9.** | Праблемы структурнага характару беларускай эканамічнай мадэлі ……………………………………………………..……..… | 70 |
| **Раздзел А.** | Акцыянаванне, дэмаграфія, падрыхтоўка рабочых: аналіз рэчаіснасці ……………………………..………….………….. | 70 |
| **Раздзел Б.** | Адукацыя: стан, праблемы, шляхі іх вырашэння …….……… | 76 |
| **ГЛАВА 10.** | Прафсаюзы ў грамадска-палітычнай сістэме дзяржавы, пераход ад канфрантацыі да партнёрскіх адносін ……………. | 83 |
| **ГЛАВА 11.** | Адаптацыя прафсаюзнага руху рэспублікі да новых умоў: складанасці першага перыяду ……………………..………... | 97 |
| **ГЛАВА 12.** | Сацыяльнае партнёрства ва ўмовах стабілізацыі эканомікі рэспублікі ………………………………………..…………… | 102 |


Репозиторий ВГУ

**ГЛАВА 13.** Месца і роля прафсаюзаў у забеспячэнні сацыяльнай бяспекі і згуртаванасці грамадскай супольнасці ………………………. 110

**Раздзел А.** Сацыяльная справядлівасць – аснова грамадскага пагаднення 110

**Раздзел Б.** Прафсаюзы – суб’ект сацыяльнай згуртаванасці грамадства .. 118

**ГЛАВА 14.** Членская база прафсаюзаў, тыпы матывацыі яе радоў ……… 125

**ГЛАВА 15.** Прафсаюзныя кадры і актыў: стан, праблемы, адказ на выклікі часу ………………………………………………………... 140

**ВЫСНОВЫ** ……………………………………………………………….. 148

Репозиторий ВГУ

Навуковае выданне

**МАНДРЫК** Іван Уладзіміравіч

# ГІСТАРЫЧНАЯ АБУМОЎЛЕНАСЦЬ БУДАЎНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ САЦЫЯЛЬНА АРЫЕНТАВАНАЙ МАДЭЛІ РЫНАЧНАЙ ЭКАНОМІКІ: ПАЗНАЧАНЫ КУРС, СКЛАДАНАСЦІ, ВЫНІКІ

Манаграфія

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Карэктар *Т.У. Образава*
Камп'ютарны дызайн *Т.Я. Сафранкова*

Падпісана ў друк .2017. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 9,06. Ул.-выд. арк. 11,47. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 ад 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.

Репозиторий ВГУ